Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
___________ І. Ф. Штэйнер

УЗГОДНЕНА

Дэкан факультэта
_____________ А. М. Палуян

МОДУЛЬ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ”

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС**
**ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМПАНЕНТА**

**Гісторыя беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя**

для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)

Складальнік: Фіцнер Т.А.

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні навукова-метадычнага савета
ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” 29 04 20 23 г.,
пратакол № 8

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Электронны навукова-метадычны комплекс па дысцыпліне дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” / Аўтар-складальнік Т.А. Фіцнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023.

Рэцэнзенты:

кафедра славянскіх моў і рамана-германскай філалогіі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарта”;

Паплаўная Л.В., дацэнт кафедры замежных моў УА “Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аўтар-складальнік Фіцнер Т.А. 2023

ГДУ імя Ф.Скарыны, 2023

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
__________ І. Ф. Штэйнер

УЗГОДНЕНА

Дэкан факультэта
____________ А. М. Палуян

МОДУЛЬ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ”

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС**
**ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМПАНЕНТА**

**Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя**

для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)

Складальнік: Фіцнер Т.А.

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні навукова-метадычнага савета
ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” ___ ____________ 20__ г.,
пратакол №___

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Электронны навукова-метадычны комплекс па дысцыпліне дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” / Аўтар-складальнік Т.А. Фіцнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023.

Рэцэнзенты:
кафедра славянскіх моў і рамана-германскай філалогіі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарта”;
Паплаўная Л.В., дацэнт кафедры замежных моў УА “Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аўтар-складальнік Фіцнер Т.А. 2023
ГДУ імя Ф.Скарыны, 2023

**Змест**

Тлумачальная запіска
1 Тэарэтычны раздзел ЭВМК. Тэксты лекцый
1.1 Беларуская літаратура пач. XX ст.: агульная характарыстыка
1.2 Ядвігін Ш.
1.3 Цётка (Алаіза Пашкевіч)
1.4 Янка Купала
1.5 Якуб Колас
1.6 Максім Багдановіч
1.7 Максім Гарэцкі
1.8 Змітрок Бядуля
1.9 Алесь Гарун
1.10 Вацлаў Ластоўскі
1.11 Цішка Гартны
1.12 Масавая беларуская літаратура пачатку XX ст.
2 Практычны раздзел ЭВМК
2.1 Пытанні і заданні да практычных заняткаў
3 Раздзел кантролю ведаў ЭВМК
3.1 Прыкладныя пытанні да экзамена
4 Дапаможны раздзел ЭВМК
4.1 Вучэбная праграма па дысцыпліне кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)
4.2 Рэкамендаваная літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс вучэбнай дысцыпліны дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя” прызначаны студэнтам 2 курса філалагічнага факультэта завочнай формы навучання спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць) і з’яўляецца актуальным і карысным для студэнтаў на сучасным этапе развіцця літаратуразнаўства і грамадства ў цэлым. ЭВМК паспрыяе засваенню курса, дапаможа будучаму спецыялісту ўзброіцца веданнем велізарнага масіву фактычнага і эмпірычнага матэрыялу пра змест і асноўныя кірункі развіцця нацыянальнага літаратурнага працэсу пачатку XX стст., высветліць мастацка-крэатыўную ролю ў ім творчых індывідуальнасцей (пісьменнікаў), паспрыяе у далейшым высокапрафесійнай працы ў навучальных установах, а таксама ў магчымай навукова-даследчай дзейнасці.

*Мэта* вучэбна-метадычнага комплекса – забеспячэнне студэнтаў тэарэтычнай і практыка-арыентаванай падрыхтоўкай па вучэбнай дысцыпліне.

*Задачы* вучэбна-метадычнага комплекса: забеспячэнне эфектыўнага засваення тэарэтычнага матэрыяла па дысцыпліне; актывізацыя вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў у галіне беларускага літаратуразнаўства; удасканаленне уменняў і навыкаў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне; спрыянне творчай актыўнасці студэнтаў пасродкам выканання разнастайных відаў творчых заданняў.

У структурным плане вучэбна-метадычны комплекс уключае ў сябе чатыры раздзелы: тэарэтычны, практычны, раздзел кантролю ведаў і дапаможны.

*Тэарэтычны раздзел* утрымлівае лекцыйны матэрыял, што ўключае ў сябе ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай тэмы, прызначаныя для аўдыторнай работы са студэнтамі (лекцыі выкладчыка – 12 гадзін). Лекцыйны матэрыял дазваляе пазнаёміцца з біяграфіямі, светапоглядам і ідэйна-фармальнымі пошукамі найбольш значных пісьменнікаў, разумець ролю класікаў беларускай літаратуры ў станаўленні характэрных рыс айчыннага мастацтва слова; засвоіць асноўныя заканамернасці, тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры, асноўных літаратурных напрамкаў, стыляў; прасачыць мастацкія пошукі беларускіх пісьменнікаў у агульнаславянскім і еўрапейскім кантэкстах.

*Практычны раздзел* уключае ў сябе ў адпаведнасці з вучэбным планам дысцыпліны тры практычныя заняткі. Кожная тэма такіх заняткаў складаецца з пераліку пытанняў для вуснага абмеркавання зместу лекцыйнага матэрыялу, індывідуальных заданняў для пісьмовага кантролю ведаў па творчасці пэўнага пісьменніка, тэставых заданняў. Па кожнай тэме даецца спіс асноўнай і дадатковай літаратуры для самастойнага вывучэння і больш глыбокай падрыхтоўкі да практычных заняткаў. Прапаноўваюцца разнастайныя формы работы са студэнтамі на практычных: вуснае апытанне,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

міні-даклад, самастойная работа, групавая дыскусія. Названыя формы работы садзейнічаюць засваенню і рэпрадуктыўнаму ўзнаўленню ведаў, таксама вучаць творчаму засваенню і прымяненню набытых тэарэтычных ведаў.

*Раздзел кантролю ведаў* прадстаўлены прыкладамі тэставых заданняў і прыкладнымі пытаннямі да экзамена.

*Дапаможны раздзел* складаецца з вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне дзяржаўнага кампанента "Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя" ўстановы адукацыі з тлумачальнай запіскай, зместам вучэбнага матэрыялу, картай ЭВМКД і рэкамендаванай літаратурай.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне "Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя" складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта Рэспублікі Беларусь, створанай у адпаведнасці з ім тыпавой праграмай, зацверджанай 30.04.2012 г., рэгістрацыйны нумар ТД-D.206/тып., вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі і вучэбным планам спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), рэгістрацыйны № Д 21-09-21/ЗФ ад 10.07.2021 г.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца агульная колькасць гадзін – 120 (3 заліковыя адзінкі); аўдыторная колькасць гадзін для *дзённай* формы навучання – 70, з іх: лекцыі – 40 гадзін, практычныя заняткі – 30 гадзін; аўдыторная колькасць гадзін для *завочнай* формы навучання – 18, з іх: лекцыі – 12 гадзін, практычныя заняткі – 6 гадзін. Форма справаздачы – экзамен (4 семестр).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 1 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ЭВМК. ТЭКСТЫ ЛЕКЦЫЙ

## 1.1 БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧ. ХХ СТ.: АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

1 Агульная ацэнка перыяда.
2 Штотыднёвік "Наша доля".
3 Газета "Наша ніва"; дыскусія 1913 года аб шляхах развіцця беларускай літаратуры.

**1 Агульная ацэнка перыяда**

Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. – заключны і вельмі кароткі этап у развіцці новай беларускай літаратуры дарэвалюцыйнага часу. Кароткі таму, што на сваё рэальнае развіццё літаратура мела толькі час паміж рэвалюцыяй 1905 г. і першай сусветнай вайной – 7-8 гадоў – а не ўсе 17.

Узлёт новай беларускай літаратуры тлумачыцца сацыяльным пратэстам народных слаёў, і іх барацьбой за нацыянальнае вызваленне, за права на родную мову, на літаратуру на гэтай мове. Гэтаму спрыяла рэвалюцыя 1905 г., якая прыняла сацыяльна-палітычны рух на Беларусі і беларускі нацыянальна-вызваленчы рух да палітычнага самаафармлення. У 1903 г. (па іншых звестках у 1902 г.) узнікла Беларуская рэвалюцыйная грамада (БРГ). Узнікла яна на аснове культурна-асветнага гуртка беларускіх студэнтаў у Пецярбурзе "Круг беларускай народнай прасветы". На сваім з'ездзе ў 1905 г. БРГ была перайменавана ў Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ). Яе членамі былі браты Іван і Антон Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч, Вацлаў Іваноўскі (Вацюк Тройца), Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Вацлаў Ластоўскі, Францішак Умястоўскі (Дзядзька Пранук), Аляксандр Уласаў і інш. Фактычна яны сталі арганізатарамі першых беларускіх газет пачатку ХХ ст. "Нашай долі" і "Нашай нівы". "Спад першай рускай рэвалюцыі прымусіў БСГ шукаць іншых, больш дзейсных шляхоў і сродкаў палітычнай работы сярод беларускага насельніцтва" [17, IX, с. 71], – зазначае П.Навойчык. "Цэнтрам беларускага адраджэння стала спрадвечная сталіца Беларусаў – старажытная Вільня" [10, V, 35], дзе ў свой час пабачылі свет кнігі Скарыны, "Статут..." і многія помнікі беларускай культуры XIX–XX стст.

*паводле В.Максімовіча*:

Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. адкрыла новую старонку ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. За кароткі час яна змагла "вылучыць яркія творчыя індывідуальнасці, стварыць непераўзыйдзеныя класічныя ўзоры мастацтва, падняцца да ўзроўню высокаразвітых літаратур і актыўна ўключыцца ў сусветны літаратурны працэс".

Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. – з'ява унікальная, своеасаблівая, фенаменальная. Яна склала самастойны адрэзак гісторыі беларускай літаратуры, які мае сваю ўнутраную цэласнасць і завершанасць. У складзе новай узнікаючай беларускай культуры з прычыны неразвітасці іншых формаў грамадскай свядомасці (палітычных, ідэалагічных, філасофскіх, гістарычных) літаратура першапачаткова выконвала асабліва важную культураўтваральную функцыю. Славеснасць стала той галіной, у якой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выпрацоўваліся першаасновы новай культурнай свядомасці, пачатковыя формы культуралагічнай рэфлексіі аб уласным – нацыянальным – свеце, ідэі культурнай і ідэалагічнай аўтаноміі [14, с. 21–22].

*–адметнасці бел. літ. пач. XX ст.:*

– паскоранасць (В.Каваленка). Яе дастаткова адчувалі і асэнсоўвалі самі ўдзельнікі літаратурнага працэсу. Так, ужо ў 1914 г. Я.Купала ў артыкуле “А ўсё ж мы жывём!..” зазначаў: “*У некалькі год мы зрабілі тое, што ў палякаў і расійцаў рабілася чуць не цэлымі сталеццямі*”. А праз год М.Багдановіч у артыкуле “Забыты шлях” скажа наступнае*: “...За восем-дзевяць год свайго праўдзівага існавання наша паэзія прайшла ўсе шляхі,.. каторыя паэзія еўрапейская пратаптывала болей ста год... Сентыменталізм, рамантызм, рэалізм і натуралізм, урэшце мадэрнізм –усё гэтае... адбіла наша паэзія...”.*

– узаемасувязь беларускай літаратуры з інш. еўрапейскімі літаратурамі (развівалася ў еўрапейскім кантэксце, а не адасоблена, не ізалявана);

– эстэтычная шматграннасць беларускай літаратуры гэтага перыяду. Мадэрнісцкія тэндэнцыі. Дынаміка мастацкіх плыняў: рамантызм, рэалізм, сімвалізм, імпрэсіянізм і інш. (*гл.* У.Казбярук На хвалі бел. адраджэння. Бел. літ. пач. XX ст. // РС. – 1993. – № 7. – С. 39–40.)

– у бел.літаратуры наспелі ўнутраныя прадпасылкі для ўзнікнення розных літаратурных напрамкаў (побач з рэалізмам і рамантызмам плённа развіваўся мадэрнізм (Купала, Колас, Цётка, Бядуля, Гарэцкі, Багдановіч…)

– масавасць (асабліва паэзіі) побач з класікамі тварылі малавядомыя і невядомыя аўтары;

– многія пісьменнікі свядома выступалі адначасова ў разнастайных жанрах: і як празаікі, і як паэты, і як драматургі, і як літаратуразнаўцы, і як крытыкі, і як тэарэтыкі літаратуры, і як перакладчыкі.

*– метад і стыль:*

Беларуская літаратура пачатку XX ст. апіралася не на адзін які-небудзь метад і ў стылявых адносінах была таксама шматаблічнай. Гэта была літаратура розных ідэйна-эстэтычных кірункаў і стыляў. Найбольш прадукцыйнымі былі прынцыпы рэалізму і рамантызму, выпрабаваныя ў класічных суседніх літаратурах і больш-менш асвоеныя беларускай літаратурай XIX ст., аднак не пазбегла яна (і гэта натуральна, бо літаратура не можа развівацца ізалявана) і мадэрнісцкіх уплываў (у прыватнасці сімвалізму). Па Гніламёдаву, мадэрнізм – гэта неа- ці пострамантызм. (дадаткова гл. арт. У.Казберука (№ 7, с. 39–40).

**2 Штотыднёвік “Наша доля”**

Газета “Наша доля” выдавалася напрыканцы 1906 г., выйшла ўсяго толькі шэсць яе нумароў, чатыры з якіх былі канфіскаваны. “Нд” была адкрыта рэвалюцыйнай газетай. Яе ініцыятарамі з’яўлялася БСГ, хаця рэдактарам лічыўся інжынер Іван Тукеркес. “Нд” аб’яўляла сябе газетаю “для вясковага і мястовага рабочага народу” і ў сваім праграмным артыкуле, змешчаным у першым нумары, падкрэслівала, што будзе бараніць справы вясковых людзей, змагацца з цемнатой і бяспраўнасцю мужыка. Газета аб’яўляла вайну ўсім цёмным сілам, якія карысталіся безграматнасцю сялян, яго нядоляй: *“У дзісейшы вялікі момант, калі ўсе народы гасударства Расійскага, аб’явіўшы*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*вайну старым парадкам, напрагаюць усе свае сілы, каб дабіцца свабоды і лепшай долі, мы будзем разам з імі”,* – абвяшчала газета. Яна спрыяла і развіццю маладой беларускай літаратуры, так у “Нд” надрукаваў свае першыя вершы і апавяданні Я.Колас; Цётка змясціла верш “Наш палетак” і апавяданне “Прысяга над крывавымі разорамі” – рэквіем па задушанай рэвалюцыі; моцнай была і публіцыстыка, змешчаная на старонках газеты.

**3 Характарыстыка газеты “Наша ніва”.**

Паколькі лёс “Нашай долі” складваўся неспрыяльна, большасць супрацоўнікаў выйшлі з рэдакцыі і ўтварылі новую газету “Наша ніва”. Ініцыятарамі і выдаўцамі газеты былі кіраўнікі БСГ, дзеячы беларускага адраджэнска-дэмакратычнага руху браты Іван і Антон Луцкевічы. «“Наша ніва” была не менш рэвалюцыйнай газетай, чым “Наша доля”. Толькі нашаніўцы добра разумелі, што і без рэвалюцыйнай фразеалогіі можна тварыць важную рэвалюцыйную справу, чым і было нацыянальнае адраджэнне беларусаў…» [7, с. 167].

Менавіта гэтай газеце суджана было стаць у міжрэвалюцыйнае дзесяцігоддзе “выразніцай думак і настрояў беларускага народа і тым нацыянальна-культурным асяродкам, дзе гуртаваліся лепшыя тагачасныя інтэлектуальныя і патрыятычныя сілы адраджэння” [4, с. 74]. “Нн”, якая выходзіла штотыднёва і амаль беаперапынна з 2 снежня 1906 г. да жніўня 1915 г. (была закрыта ў сувязі з прыбліжэннем фронту, а не па прычынах унутранага характару, тыпу страта папулярнасці ў чытачоў і іх падтрымкі ці ідэйныя непрымірымыя рознагалоссі ўнутры рэдакцыі), стала цэлай **эпохай** у беларускім культурна-грамадскім жыцці. На старонках газеты шырока асвятляліся грамадска-палітычныя і сацыяльныя праблемы, з дэмакратычных пазіцый давалася іх ацэнка. Слушна яшчэ ў 1927 г. Ігнат Дварчанін заўважаў, што тэрмін “нашаніўскі перыяд” адносіцца не столькі да літаратуры, колькі да ўсяго духоўнага жыцця беларусаў. “Нн” выхоўвала ў сваіх чытачоў “павагу да правоў і годнасці чалавека, выступала за права паняволеных народаў мець сваё культурна-гістарычнае развіццё, спрыяла пашырэнню беларускага слова і ідэі беларускага адраджэння сярод шырокіх колаў насельніцтва (пераважна сялянства), абуджала пачуццё нацыянальнай самасвядомасці і натуральную прагу самавызначэння ў свеце” [4, с. 74]. Так, рэдакцыя “Нн”, пазбягаючы сацыяльна-класавай замкнёнасці і бачачы шырока праблему адраджэння беларускага народа ў кантэксце еўрапейскага гістарычнага развіцця, пісала ў *першым* нумары: *“Не думайце, што мы хочам служыць толькі ці панам, ці адным мужыкам. Не, ніколі не! Мы будзем служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу, пастараемся быць люстрам жыцця, каб ад нас, як ад люстра, свет падаў у цёмнасць... Мы будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусыі людзі, каб пазналі свае правы”.* Варта падкрэсліць, што абранага кірунку газета трымалася на працягу ўсяго свайго існавання, ставячы дзяржаўна-палітычнае, сацыяльнае і культурна-нацыянальнае адраджэнне свайго краю ў цэнтр увагі, узнімаючы па традыцыі, перададзенай Ф.Багушэвічам, значэнне роднай мовы ў справе асветы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і росту самасвядомасці беларускага народа (артыкулы К.Каганца, Цёткі, Л.Гмырака, С.Палуяна, Ф.Шантыра, В.Ластоўскага, Я.Купалы, М.Багдановіча і інш.).

Папулярнасць “Нн” сярод чытачоў была вялікая і расла з года ў год. Газета даходзіла ў самыя аддаленыя куткі Беларусі. А ў асобах чытачоў мела сваіх шматлікіх карэспандэнтаў, якія выказвалі меркаванні пра змешчаныя ў газеце публікацыі, прысылалі свае допісы, дзяліліся ўражаннямі пра абраны газетай кірунак дзейнасці.

Паколькі “Нн” была пэўны час адзінай універсальнай беларускай газетай, яна шырока асвятляла гаспадарчыя праблемы, хутарызацыю і малазямельнасць сялянства, давала ацэнку царскім рэформам і дзейнасці Думы. Закранала таксама бытавыя, маральна-этычныя, агранамічныя і нават санітарна-гігіенічныя пытанні. Найбольшая ж увага аддавалася нацыянальнаму адраджэнню.

Неацэнным быў уклад “Нн” ў працэс *станаўлення і развіцця* новай беларускай літаратуры. Асабліва шчодрымі нумары газеты былі на **вершы**, таксама шмат друкавалася **прозы**, **публіцыстыкі,** з’яўляліся **творы драматургіі**. Па слушнай заўвазе М.Ермаловіча, газета “у значнай ступені стрымала ўцечку талентаў у іншыя літаратуры, што назіралася ў ранейшыя часы, і з’яўлялася, бадай, ці не самай балючай нашай ранай” [7, с. 168]. Сапраўды, газета спрыяла таму, што разрозненыя пісьменніцкія сілы аказаліся аб’яднанымі на яе старонках. Магчымасць друкавацца на роднай мове была падставай стварэння *трывалага мацерыка беларускай літаратуры, замацавання яе эстэтыкі і традыцый*, што і адбылося за паўтара дзесяцігоддзя. У “Нн” рэгулярна друкаваў свае вершы Янка Купала. Да ўсяго ён быў супрацоўнікам газеты ў 1908-1909 гг., а з 1914 г. да яе закрыцця – рэдактарам. Вершы і проза Я.Коласа таксама з’яўляліся на старонках “Нн” амаль у кожным нумары, а ў 1907 г. ён працаваў у рэдакцыі газеты. Пастаяннымі аўтарамі “Нн” і яе супрацоўнікамі ў розныя часы былі З.Бядуля, Ядвігін Ш., В.Ластоўскі. Антон Луцкевіч (Навіна) быў яе палымяным публіцыстам, захаваў і частку архіва газеты. У 1907 г. у “Нн” адбыліся літаратурныя дэбюты М.Багдановіча і А.Гаруна. Складалі бясцэнны набытак беларускай паэзіі, што развівалася найбольш інтэнсіўна і плённа, вершы Ц.Гартнага, К.Буйло, Я.Журбы, Г.Леўчыка, М.Арла, А.Гурло, вершы і байкі А.Паўловіча. Праз газету адбывалася і жанравае станаўленне беларускай прозы ў творах Ядвігіна Ш., К.Каганца, Я.Коласа, М.Гарэцкага, У.Галубка, Ф.Шантыра і інш. На старонках “Нн” паўстала і ўзмужнела ў развагах і дыскусіях беларуская крытычная і эстэтычная думка, прадстаўленая асобамі М.Багдановіча, Я.Купалы, С.Палуяна, Л.Гмырака, В.Ластоўскага, У.Самойлы, А.Бульбы. “Нн” друкавала пераклады твораў Горкага, Л.Талстога, Чэхава, Міцкевіча, Ажэшкі, Шаўчэнкі, Сыракомлі і інш., адзначала юбілеі знакамітых людзей. Як удала адзначыла І.Багдановіч: “Наша ніва” ўзрасціла цэлае суквецце талентаў, за кароткі тэрмін стварыўшы такую літаратуру на занядбанай столькі часу беларускай мове, якая годна ўпісалася ў агульнаеўрапейскі культурны кантэкст. Нашаніўскі перыяд быў у поўным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сэнсе класічным (узорным) перыядам беларускай літаратуры, паколькі ўсе сферы народнага жыцця ўпершыню былі адлюстраваны і ўвасоблены ў прафесійнай выяўленчай і рытміка-інтанацыйнай форме з апорай на папярэднюю фальклорную і літаратурную традыцыю, а таксама з увагай да літаратурных набыткаў суседніх і больш далёкіх культур. Вялікая заслуга "Нашай нівы" была і ў тым, што на яе старонках адбываўся працэс *далейшага ўнармавання беларускай літаратурнай мовы і правапісу*" [4, с. 77–78]. Да ўсяго значную ролю адыграла газета ў выданні і прапагандзе беларускіх кніг. Ацэньваючы значэнне "Нн", М.Багдановіч пісаў наступнае: "Для многіх людзей яна з'явілася першай газетай, прачытанай імі, першай крыніцай ведаў, якая не мела афіцыяльнага адбітку і была выкладзена простай і яснай мовай. Да беларускага селяніна, які зжыўся з думкай, што ён – хам, а яго мова – хамская, "Наша ніва" друкаваным чынам звярнулася на гэтай "мове", выклікаючы ў ім тым самым павагу да яе і да самога сябе, абуджаючы ў ім пачуццё ўласнай годнасці".

Газета знайшла водгук не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Водгукі, безумоўна, былі як станоўчыя, так і адмоўныя. Так, газету падтрымалі рускія дэмакратычныя сілы, а М.Горкі ўжо ў 1910 г. прасіў залічыць яго ў падпісчыкі... На Беларусі падтрымлівала справу беларускага адраджэння газета "Минский курьер". Аднак былі і тыя, што не прынялі "Нн" [17, X, 75].

Пасля закрыцця газеты "Нн" беларускі друк быў перарваны толькі на паўгода. З лютага 1916 г. у Вільні пачынае выдавацца газета "Гоман" (рэд. В.Ластоўскі). А на працягу лістапада-снежня гэтага ж года наладжваецца выпуск яшчэ дзвюх беларускіх газет – "Дзянніца" (рэд. Ц.Гартны) і "Светач" (рэд. Э.Буцька), апошняя выдавалася лацінкай. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у галіне перыядычных выданняў, можна з поўным правам зрабіць такую выснову, не занепадаў у цяжкіх гістарычных абставінах, але набываў новыя формы, выбіраючы шлях сярод гэтых абставін, каб не страціць і яшчэ больш узмацніць ідэю нацыянальнага адраджэння.

**– *Дыскусія 1913 г. на старонках "Нн"***

Штат рэдакцыі газеты, на думку А.Лойкі, падзяліўся на так званыя дзве палаты – верхнюю і ніжнюю. У першую ўваходзілі браты Луцкевічы, Альгерд Бульба (псеўд. Вітаўта Чыжа), Аляксандр Уласаў, падтрымліваў Ядвігін Ш., у другую – Купала, Колас, Бядуля, Власт.

Дыскусію, на думку даследчыкаў, справакавала творчасць М.Багдановіча. Па словах М.Мушынскага, яна прысвечана "абмеркаванню шляхоў развіцця нацыянальнага слоўнага мастацтва" [3, с. 76]. Яе пачаў Ю.Верашчака (В.Ластоўскі) артыкулам "Сплачывайце доўг", у якім пісаў наступнае: *"...Маё штодзённае жыццё шэрае, цяжкое, і я хачу з вашых твораў навучыцца бачыць каля сябе красу, каторую я чую, што ёсць, але мая душа не так чутка, каб улавіць яе"* ("Нн", №№ 26-27). Па сутнасці, аўтар дакараў беларускіх пісьменнікаў за тое, што іх творы прасякнуты матывамі смутку, тугі, расчаравання, нараканнямі на гаротны лёс. Харавства і прыгажосці роднага краю песняры не бачаць, як не бачаць і светлых момантаў жыцця селяніна, не будзяць актыўны пачатак у характары беларуса. "Крытык лічыў, што пры аднабаковым поглядзе на рэчаіснасць істотна звужаецца функцыя літаратуры, яе грамадска-пераўтваральная роля, недаацэньваюцца і творча-патэнцыяльныя магчымасці народа" [3, с. 76].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Яго апанентам выступіў Я.Купала (ёсць, аднак, меркаванні, што і “Адказ...” напісаў В.Ластоўскі) пад псеўданімам “Адзін з “парнаснікаў”, надрукаваўшы востры артыкул пад назвай “Чаму плача песня наша? Адказ Юрку Верашчаку”. У ім аўтар дае кажа наступнае: *“Не думайце, што “парнаснікі” не бачылі і не адчувалі ўсёй багатай красы нашай зямелькі з яе горамі, далінамі, рэчкамі і лясамі. Але што маглі казаць, калі большая палавіна гэтага прыроднага багацця, гэтай неапетай красы была і ёсць не наша, а нашых сытых “культурнікаў”, крывавай працай на каторых беларус асляпіў сабе вочы, атуманіў думкі. Гледзячы на гэту несправядлівасць, у паэты радзіўся толькі жаль, што побач з лішняй раскошай народ яго гібее... Невясёлая цяпершчына не магла настроіць у вясёлы тон думку паэты... І паэта воляй-няволяй не можа абмінаць і замоўчваць цяперашняга жыцця. Не да пацераў, калі хата гарыць”*. Гэтыя радкі – яркае сведчанне адстойвання багушэвічаўскіх традыцый у беларускай літаратуры, літаратуры сацыяльна значнай, свядома пастаўленай на службу працоўнаму народу, яго сацыяльнаму і нацыянальнаму вызваленню. Купала такім чынам адмаўляе мастацтва для мастацтва, дае “адпор эстэтызму” (А.Лойка). Разам з тым “адзін з парнаснікаў” часткова пагаджаецца з папрокамі апанента і выказвае упэўненасць у тым, што беларускі народ прачнецца да новага жыцця, а яго паэты “будуць пяяць аб вялікім багацці і красе сваёй бацькаўшчыны”. Погляды удзельнікаў дыскусіі, як бачна, істотна разыходзяцца: ці заклікана мастацтва адлюстроўваць негатыўныя з’явы рэчаіснасці, ці яго мэты і функцыі больш шырокія – адбіваць увесь спектр жыцця, і ідэальны пачатак, духоўную субстанцыю ў тым ліку. “Фактычна гаворка тут ішла пра філасофскую канцэпцыю мастацтва, яго сутнасць, прызначэнне, пра канцэпцыю нацыянальна-самабытнай літаратуры” [3, с. 76-77].

Пазіцыя кожнага з удзельнікаў дыскусіі мела як моцныя, так і слабыя бакі. Так, Ю.Верашчака быў несправядлівы ў сваіх сцвярджэннях, бо на той час беларуская літаратура выявіла высокі эстэтычны ўзровень і жанравую разнастайнасць (зб-к Купалы “Гусляр”, паэмы “Курган”, “Бандароўна”, “Сон на кургане”, камедыя “Паўлінка”; сацыяльна-псіхалагічныя апавяданні Коласа, пачатковыя раздзелы “Новай зямлі”; выдатныя ўзоры пейзажнай, філасофскай, інтымнай лірыкі Багдановіча, Купалы, Коласа, Гаруна, Бядулі, Буйло і інш.). Не зусім зразумела, чаму прымае папрокі наконт празмернага песімізму і аднастайнасці беларускай паэзіі апанент Ю.Верашчакі. На думку М.Мушынскага, гэта звязана з імкненнем В.Ластоўскага “ўзбуйніць маштаб дыскусіі з мэтаю паглядзець на беларускае слоўнае мастацтва ў далёкай перспектыве... Логіка палемічнай барацьбы такое дазваляла” [3, с. 77]. Дапушчэнне, што “Адказ...” быў напісаны таксама В.Ластоўскім ці яго аднадумцам з рэдакцыі “Нн” у святле прыведзеных фактаў, выглядае цалкам лагічным.

Купалу (??) праз некаторы час (“Нн”, №№ 33, 34 за 1913 г.) падтрымаў крытык і публіцыст, “радыкальны народнік” Л.Гмырак (літ.псеўд. Мечыслава Бабровіча; 1891–1915) артыкулам “Яшчэ аб сплачваньні доўгу”. Супрацьпастаўляючы рэалізм сучасных яму беларускай і ўкраінскай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

літаратур дэкадэнцтву заходнееўрапейскай і расійскай, ён выказаўся наступным чынам: «*Асобныя пісьменнікі-дэкадэнты з часам, калі больш пашырыцца наш рух, калі шырэй ахопіць ён грамадства, можа, і явяцца, але перамагаючая большасць пісьменнікаў, усе лепшыя сілы будуць ісці, як і дагэтуль ішлі, "шляхам жыцця"…*»

У сваю чаргу, Максім Гарэцкі, фармальна не прымаючы пазіцыю ніводнага з бакоў, выказаўся ў "Велікоднай пісанцы на 1914 год". Паводле Гарэцкага, беларуская літаратура павінна была – у дадатак да таго, што яна ўжо мела, – не толькі ствараць паэзію "чыстай красы", а і па-сапраўднаму інтэлектуалізавацца.

У цэлым літаратурная палеміка 1913 г. сведчыла пра тое, што наша прыгожае пісьменства пачало выразна ўсведамляць сваю прыналежнасць да паўнавартасных нацыянальных еўрапейскіх літаратураў.

**Літаратура:**

**Асноўная**

1. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. – Мн., 1989.
2. Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мн., 1998.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мн., 1999.

**Дадатковая**

4. Багдановіч І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мн.: Бел навука, 2001.
5. Гаранін Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пач. XX ст. – Мн., 1996.
6. Для друку / не для друку. Інтымны дзённік Багдановіча // Наша ніва. – 2002. – 25 студзеня.
7. Ермаловіч М. Слова пра "Нашу ніву" // Полымя. – 1990. – № 2.
8. Івашын В. Тады з'яўляюцца прарокі // Полымя. – 1992. – № 7.
9. Каваленка В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. – Мн., 1975.
10. Казбярук У. На хвалі беларускага адраджэння. Беларуская літаратура пачатку XX ст. // Роднае слова. – 1993. – №№ 5,7.
11. Казбярук У. Прарок беларускага адраджэння // Полымя. – 1993. – № 10.
12. Кветка Вітан. "Наша ніва" і Іван Луцкевіч // На суд гісторыі. – Мн., 1994. + З гісторыяй на "Вы". Вып. 3. – Мн., 1994.
13. Макарэвіч А. Асаблівасці мастацкай формы апавядальных гісторый, абразкоў і навел пачатку XX ст. // Роднае слова. – 1999. – № 11.
14. Максімовіч В.А. Эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры пачатку XX ст.: Дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ. – Мн., 2000.
15. Максімовіч В.А. Беларускі мадэрнізм: эстэтычная самаідэнтыфікацыя літаратуры пачатку XX ст. – Мн., 2001.
16. Максімовіч В. Купалаўская міфатворчасць і мадэрнісцкая паэтыка ў пач. XX ст. // Роднае слова. – 1997. – № 4.
17. Навойчык П. Дзве плыні ў "нашаніўскім руху" // Роднае слова. – 1993. – №№ 9, 10, 12.
18. "Наша ніва" // Крыніца. – 2000. – № 11-12 (60). – С. 133 – 235.
19. Шаруха І. Браніслаў Эпімах-Шыпіла: 135 гадоў з дня нараджэння // Роднае слова. – 1994. – № 9.
20. Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Кн. 2: Пачатак XX ст. 1900 – 1917. – С. 5. (у асноўную).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.2 ЯДВІГІН Ш. (1868 - 1922)

1 Біяграфія пісьменніка.
2 Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы Ядвігіна Ш.
3 “Золата” як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы.
4 Паэма “Дзед Завала”, нарысы, успаміны, артыкулы.

*“З усёй кагорты пісьменнікаў-адраджэнцаў пачатку XX ст. постаць гэтага пісьменніка застаецца ў зацемках з прычыны сваёй загадкавасці, нашай слабай культурна-гістарычнай дасведчанасці, а ягоная творчасць належным чынам не запатрабаваная, не прыцягнутая ў сферу навуковага і практычна-азнаямленчага ўжытку. Хоць заслугі гэтага выбітнага дзеяча беларускай культуры і літаратуры бясспрэчныя. Абсалютна справядлівай і слушнай з’яўляецца думка, што “па арыгінальнасці і мастацкай форме ўвасаблення ў творчасці ментальнасці беларуса Ядвігіну Ш. няма роўных* [5, с. 92]” .

### 1 Біяграфія пісьменніка.

Ядвігін Ш. з’яўляецца адным з пачынальнікаў беларускай прозы. Жыццёвы шлях яго быў своеасаблівым і складаным, нялёгкай творчая біяграфія [3]. Сапраўднае імя Ядвігіна Ш. – Антон Іванавіч Лявіцкі (выбар псеўданіма пісьменнікам навукоўцы звязваюць з імем яго каханай дзяўчыны з Радашковіч Ядвігай Шабуневіч).

Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 1868 г. | **Ядвігін Ш.** нарадзіўся ў маёнтку Добасня, на Рагачоўшчыне, але яшчэ ў дзіцячым узросце разам з бацькамі пераехаў на Міншчыну. |
| 2 | 1877–1878 гг. | наведваў прыватную школу ў фальварку Люцынка, заснаваную дачкой В.Дуніна-Марцінкевіча. |
| 3 | 1880-я гг. | вучыўся ў Мінскай гімназіі, пасля заканчэння якой паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. |
| 4 | сакавік 1890 г. | за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў зняволены ў маскоўскай Бутырцы. |
| 5 | 1890 г. | быў выключаны з універсітэта, замест дыплома доктара атрымаў пасведчанне аптэкарскага практыканта (памочніка правізара), здаўшы адпаведны экзамен, і прайшоў практыку ў адной з маскоўскіх аптэк; вярнуўся на Беларусь, пачаў працаваць у Радашковічах (непадалёк ад родавага маёнтка Лявіцкіх, фальварка Карпілаўка) як памочнік правізара. |
| 6 | 1891 г. | выдаў у Маскве перакладзенае яшчэ ў турме апавяданне Гаршына “Сігнал”, гэты факт прынята лічыць пачаткам літаратурнай дзейнасці пісьменніка. |
| 7 | 1892 г. | Напісаў камедыю “Злодзей”; не была пастаўлена, падпала пад забарону; тэкст не захаваўся. |
| 8 | 1894 г. | ажаніўся з Люцыяй Аляксандраўнай Гнатоўскай; у шлюбе нарадзілася чацвёра дзяцей. |
| 9 | 1897 г. | Перабраўся з сям’ёй у Карпілаўку і заняўся садоўніцтвам. |
| 10 | 1903–1904 гг. | Пачынае друкавацца ў віленскіх і мінскіх прагрэсіўных газетах. |
| 11 | 1906 г. | у “Нашай долі” (№3) было надрукавана першае апавяданне на беларускай мове – “Суд”. |
| 12 | 1906–1914 гг. | актыўна друкуецца ў “Нашай ніве”, самы плённы перыяд. |
| 13 | 1909–1910 г. | жыў у Вільні, працаваў сакратаром, а затым загадчыкам літаратурнага аддзела «Нашай нівы». |
| 14 | 1912 г. | выдае зборнік прозы “Бярозка”. |
| 15 | 1913 г. | працаваў у рэдакцыі газеты “Беларус”. |
| 16 | Лістапад 1913 – | тэхнічны рэдактар бел. сельскагаспадарчага часопіса “Саха” і бел. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | студзень 1915г. | часопіса для дзяцей і моладзі “Лучынка” ў Мінску. |
| 17 | 1914 г. | выдае зборнік прозы “Васількі”; у час вайны з’яўляецца арганізатарам Бел.таварыства дапамогі ахвярам вайны. |
| 18 | 1918 г. | хварэе на сухоты, лечыцца ў Мінскім шпіталі, пасля пераязджае ў Карпілаўку. |
| 19 | 1920 г. | супрацоўнічае з газетай “Беларусь”, друкуе там аповесць/раман “Золата” (застаўся незакончаным); восенню выязджае ў Вільню. |
| 20 | 1920 г. | у Вільні выдае першую частку “Успамінаў”, засталіся незакончанымі. |
| 21 | люты 1922 г. | смерць напаткала **Ядвігіна Ш.** у Вільні на бальнічным ложку. |

“У гісторыю новай беларускай літаратуры Ядвігін Ш. увайшоў і як аўтар аднаго з першых раманаў “Золата” (апублікаваны ў 1920 г.). Гэты твор стаіць каля вытокаў нашай псіхалагічнай прозы; у ім зробленыя пэўныя адкрыцці, што паклалі пачатак нацыянальнай раманнай традыцыі – ад Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і Кузьмы Чорнага да Івана Мележа, Вячаслава Адамчыка, Івана Пташнікава і Віктара Казько.

Акрамя вышэйзгаданых твораў, пяру Ядвігіна Ш. належыць вершаванае апавяданне “Дзед Завала” (1909) – своеасаблівае развіццё лучынаўскай традыцыі “Паляўнічых акварэлек з Палесся”...” [4, с. 166–167].

М.Гарэцкі ў “Гісторыі беларускае літаратуры” адзначаў, што творчасць Ядвігіна Ш. “стаіць у нашай літаратуры на пераходзе ад народніцкае, да нашаніўскае пары” [6, с. 287].

## 2 Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы Ядвігіна Ш.

Плён больш як дваццацігадовай працы Ядвігіна Ш. у прозе знайшоў сваё адлюстраванне ў зборніках “Бярозка” (1912) і “Васількі” (1914).

“Празаічная спадчына пісьменніка надзвычай шматгранная, вылучаецца жанрава-стылявой разнастайнасцю, багаццем вобразна-мастацкіх сродкаў, адметнасцю прынцыпаў мастацкай тыпізацыі. Творы строга рэалістычныя, з заглыбленым аналізам сацыяльна-побытавай дамінанты жыцця, лірыка-філасофскія імпрэсіі з налётам сапраўднага рамантызму, псіхалагічныя, гумарыстычныя і сатырычныя навелы, алегарычныя апавяданні, прытчы – вось далёка не поўны пералік пісьменніцкага набытку” [9, с. 145].

Павярхоўнае прачытанне яго твораў, калі ўвесь змест іх зводзіцца да выразна стылізатарскай, пераймальніцкай сутнасці – “вырастання з фальклору” – адна з прычын таго, што творчасць Ядвігіна Ш. не набыла і не набывае шырокага грамадскага рэзанансу. Напрыклад, алегарычныя апавяданні пісьменніка ўспрымаюцца не больш як літаратурная апрацоўка народных гутарак, казак, легендаў і паданняў. Пры гэтым не прымаецца пад увагу той факт, зазначае В.Максімовіч, што літаратура пачатку XX ст. “абсалютна новы ў ідэйна-эстэтычных адносінах этап мастацкага засваення жыцця”, калі разгортваўся працэс, які суправаджаўся, па словах В.Каваленкі, “узмацненнем сімвалічных формаў паэтычнай мовы, паглыбленнем літаратурнай міфалагізацыі вобразнага мыслення... І гэты працэс не абавязкова азначаў актывізацыю ўнутранага звароту да традыцыйнага міфа і казкі. Хутчэй – наадварот. У пачатку XX ст. адкрытага звароту да міфалогіі і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

фальклору... наглядаецца мала і ў вельмі вузкім маштабе. Сувязь... захоўваецца, але яна ўжо **ўскладненая літаратурнай традыцыяй**, пераўтвораная шматлікімі эстэтычнымі напластаваннямі, прыхаваная, урэшце, публіцыстычнай надзённасцю мастацкага вырашэння агульнанародных жыццёвых праблем” [7, с. 127].

У алегорыі Ядвігіна Ш. даследчыкі заўважаюць тыпалагічныя рысы пародыі, а таксама адзначаюць, што алегорыя ў пісьменніка “паступовa перарастае ў сімвал” [9, с. 146–147], а менавіта алегорыка-сімвалічныя вобразы ўвасабляюць спрадвечную адметнасць народа, яго “мысленне”, антынамічнае па сваёй прыродзе (“мысленне раба і пана”). “Своеасаблівай квінтэсенцыяй гэтых роздумаў стала апавяданне Ядвігіна Ш. “Падласенькі”... Метаідэя (звышідэя – Т.Ф.) гэтага твора заключаецца ў пошуку шляхоў грамадскага развіцця. У ім пісьменнік сродкамі фантастычнага, сатырычнага пісьма бязлітасна высмеяў патрыярхальныя ўстоі грамадства” [9, с. 147], яго беспадстаўныя “спадзяванні на хуткі і лёгкі шлях набыцця адукацыі як панацэі ад усіх бедаў” [9, с. 147]. <u>Наогул пісьменнік з насцярогай ставіўся да радыкальных мер абнаўлення грамадства.</u> Лічыў, што ўмяшанне чалавека ў натуральную эвалюцыю дзеля яе паскарэння (апавяданне таму пацверджанне) не дае жаданых вынікаў, не прыводзіць да фарміравання культурнага, высокаразвітога чалавека. Больш таго, у творы адчуваецца сумнеў у магчымасці хуткага выхавання “новага чалавека” нават пры істотнай змене грамадскіх умоваў. Ядвігін Ш. быў перакананы, што толькі ўпартая і самаадданая праца, разлічаная на доўгую перспектыву, можа прывесці да станоўчых зменаў у грамадстве. Ускосна ў творы паўстае праблема разумнага грамадскага падзелу працы, калі кожны павінен выконваць свой абавязак на сваім месцы. Сваімі “баечнымі” апавяданнямі пісьменнік спрагназаваў **тып** людзей, які, валодаючы мізэрным запасам унутраных якасцей, можа прэтэндаваць на ролю “вяршыцеляў лёсу”. “Пры гэтым пісьменнік гратэскна трансфармаваў сапраўдны стан рэчаў, сатырычна гіпербалізаваў сітуацыю” [9, с. 147]. Падласенькі пасля няўдалай спробы “рыхтавання на чалавека” заяўляе бацькам: “*Гэта я...толькі так – да часу, а калі хочаце, каб саўсім стаўся чалавекам, то на навуку не адну, а тры скуры спусціце...*” [15, с. 14]. Ядвігінская алегорыя набывае ў гэтым творы, на думку В.Максімовіча, усе якасці <u>антыутопіі</u>, песімістычнага прагназавання будучыні. Пісьменнік, дзякуючы сваёй мастакоўскай празорлівасці, папярэджваў аб небяспецы з’яўлення пэўнага <u>тыпу</u> людзей, якім у далейшым была дадзена мянушка шарыкавых (“Сабачае сэрца” М.Булгакава). Ядвігін Ш. указаў на тыя небяспечныя грамадскія перадумовы, якія маглі выклікаць да жыцця звязаныя з нізкімі інстынктамі чалавека ўчынкі тыпу заведама паклёпніцкі данос, шкурніцтва, перараджэнства, прадажніцтва (“Зарабіў”), правакатарства (“Сабачча служба”, “Пратэст”). Так, у апавяданні “Пратэст” “сродкамі палітычнай сатыры выкрываецца сумленнымі сабакамі правакацыйная брахня прадажных іх суродзічаў” [9, с. 148]: “*Гэткі гад у нас, так, як і ў вас, завецца правакатарам. Розніца толькі ў тым, што ў вас гэткаму пану кланяюцца, вітаюцца з ім і грошы плацяць, а наш брат, калі свайго гэткага спаткае, дык*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*і хвастом не кране...*” [15, с. 71].

(Узгадваючца “Думкі з падарожы”, дзе аўтар, ставячы праблему адукацыі – не на роднай мове і адсутнасць прафесіянальных школ – гаворыць што лепшыя сыны вёскі “шукаюць хлеба на чужыне”).

“У філасофскіх апавяданнях Ядвігіна Ш. алегорыя выступала ў якасці пэўнага літаратурнага прыёму, які даваў магчымасць паразважаць над унутранай сутнасцю чалавека, жыцця. Але гэта ў меншай ступені прыём, які дазваляў асуджаць, крытыкаваць стан дарэвалюцыйнага грамадства, як гэта сцвярджаецца некаторымі даследчыкамі. Хутчэй за ўсё ў гэтым выявіла сябе абвостранае бачанне ўсяго чалавечага шляху ў яго адзінстве, у непарыўнай сувязі ўсіх часоў. Таму прывязваць алегарычнае апавяданне Ядвігіна Ш. да сацыяльнай канкрэтыкі, да пэўных формаў жыцця па меншай меры неабачліва. Форма ўмоўная, фальклорна-міфалагічная адкрывала пісьменніку магчымасць універсалізацыі зместу, складаных абагульненняў, высноваў, філасофскага маралізатарства. Вынайдзеная мастацкая форма алегорыі, іншасказання з’яўлялася адным са шляхоў у агульным рэчышчы літаратуры, якая ставіла перад сабой задачу “...адкрыць селяніну вочы на складаны навакольны свет, каб ён ведаў праўду часу. Але гэта можна было зрабіць толькі праз глыбокае раскрыццё яго ўласнага ўнутранага свету, праз самапазнанне селяніна” [7, с. 128]. Шлях адвольных абстракцый , шырокіх абстрагаванняў у дадзеным выпадку меў мала шанцаў на поспех: канкрэтна-вобразнае мысленне народа не змагло б правільна ўспрыняць абстрактна-абагульненую думку, ды і проста зразумець сэнс пачутага, прачытанага. Такой магчымасці непаразумення стараўся ўнікнуць Ядвігін Ш.” [9, с. 148-149]. Пра даступнасць друкаванага слова для селяніна-беларуса пісьменнік гаварыў і ў сваёй публіцыстыцы – артыкул “Людзі – людзьмі забытыя” (1905) (“даступнае па форме выкладання і на зразумелым яму дыялекце”).

Алегорыя Ядвігіна Ш. своеасаблівая, яна адрозніваецца ад “сапраўднай”, класічнай, якая імкнецца да <u>адназначнага іншасказання</u>, сэнсавай дакладнасці і выступае прасцейшай формай паэтычнага вобраза. “У алегарычных апавяданнях Ядвігіна Ш. размова ідзе не пра асобнае чалавечае жыццё (хоць і гэта можа ўгадвацца на паверхні вобраза), а пра быццё цэлага народа, нават усяго чалавецтва; не столькі пра дзень сённяшні, як пра сутнасць цэлай эпохі. Мала ў ядвігінскай алегорыі назіраецца падабенства і з класічным міфам, дзе, як слушна заўважае В.Каваленка, ператварэнне чалавека ў жывёлу надавала яму сілы, велічы і таямнічай магутнасці” [9, с. 149]. “У творах Ядвігіна Ш. – усё наадварот. Аблічча быка – гэта знак ніжэйшасці, адкрытае ўказанне на жывёльны пачатак у жыццёвым ладзе” [7, с. 132]. “Адсюль становіцца зразумелым, што значэнне і функцыя алегарычнага вобраза ў Ядвігіна Ш. намнога пашыраліся. <u>Сэнс такога вобраза звязваўся не толькі з выкрыццём нейкай чалавечай слабасці, заганы, але і з цяжкасцю, амаль немагчымасцю выкараніць яе з прыроды чалавека, таму што яна стала адным з важных складнікаў яго ўнутранай сутнасці, уласцівасцю душы</u>” [9, с. 149]. Калі алегорыя баечнага тыпу прама паказвае на пэўную чалавечую слабасць (ляноту, баязлівасць, высакамарнасць і інш.), якая суправаджаецца прыхаванай надзеяй на мажлівасць яе выкаранення, то ядвігінская алегорыя падае ўсе людскія хібы як іманентныя (*унутрана*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*ўласцівыя к.-н.*), арганічна ўласцівыя чалавечай істоце, спрадвечныя, што ўсведамляецца самімі ж баечнымі тыпамі *“...з практыкі жыццёвай ведаў добра стары Падласы, што цяперашнім часам з бычачым розумам далёка не зайдзеш*” [15, с. 12]. Пераход звяроў у людзей, што адбываецца з многімі жывёльнымі персанажамі Ядвігіна Ш., – яскравае таму сведчанне. Так, апавяданне “Вучоны бык” будуецца па прынцыпе сэнсавай узаемаабарачальнасці, калі якасці, уласцівасці, звычкі жывёлаў праецыруюцца на чалавечую асобу і наадварот. Гэтым самым падкрэсліваецца нязменны характар унутраных дэтэрмінантаў, абсалютная адсутнасць магчымасці і ўмоваў змянення, перайначвання. Здольнасць пераходу са стану жывёльнага ў стан чалавечы ёсць відавочнае сведчанне марнасці зямной рэінкарнацыі, якая са зменай фармальнай ніколі не выклікае змены сутнаснай, змястоўнай. “Вучоны бык”, які “*зусім падабнюсенькі стаўся да чалавека*” [15, с. 11], – “гэта толькі літаратурная парабала (іншасказальнае павучанне, прытча – Т.Ф.), звязаная з выкрыццём сутнасці чалавечай істоты, яе антынамічнай прыроды” [9, с. 150].

Ядвігін Ш. такімі творамі, як “Гадунец” і “Заведзеная надзея” паказваў вынік ніцшэанскай ідэі “воля да ўлады”. Тут пісьменнік па-сутнасці гіпатэтычна спрагназаваў рэалізацыю ніцшэанскай ідэі звышчалавека. Аўтар падрабязна “вымаляваў усе этапы станаўлення, выспявання гэтай ідэі адпаведна ў свеце прыроды і ў свеце людзей, паказаў яе верагодныя наступствы” [9, с. 154]. Цяжка жылося кусцікам (“Гадунец”) пад узгоркам каля крыжавых дарог, дзе яны узраслі: кожны пры нагодзе стараўся ім нашкодзіць – зламаць галінкі, прыціснуць да зямлі. Таму вырашылі яны агульнымі намаганнямі ўзрасціць вялікае дрэва, якое б абараніла іх ад усіх жыццёвых нягодаў. Аднак добрая ідэя абарочваецца ў выніку для кусцікаў трагічна: “*Таўстое карэнне, вялікія галіны, густыя лісты баранілі іх ад ворагаў: паводак, навальніц, ветраў, – але гадунец гэты закрыў ім і... сонца. І – пагінулі кусцікі!*” [15, с. 58]. Тут праглядваецца і падспудная згода з наступным выказваннем Ніцшэ: “З чалавекам адбываецца тое самае, што і з дрэвам. Чым больш ён імкнецца ўгору, да святла, тым мацней карані яго імкнуцца ўглыбіню зямлі, уніз, у зло” [10, с. 42].

У апавяданні “Заведзеная надзея” (эпіграф да твора: “*Не тудой дарога*”) аўтар вырашае падобную сітуацыю з праекцыяй на чалавечае грамадства. Жыццё людзей аднаго краю сталася зусім невыносным: “*З лясоў-пушч вырываўся звер і глуміў дабытак, і з лугоў-стэпаў выплывалі прагавітыя свежай крыві ястрабы і знішчожывалі дробязь; з-за гор-граніц навалай наступаў крапчэйшы сілай вораг і няволіў слабейшых братоў сваіх*” [15, с. 82]. Таму на сваёй галоўнай радзе людзі пастанавілі ўзгадаваць сабе абаронцу, веліч і сіла каторага “*змагла б усіх ворагаў беднага люду*”. Вынік нечалавечых высілкаў народа несуцяшальны: аддаў народ свайму гадунцу ўсё, што мог і пачаў выкладаць яму свой жаль і крыўду, каб гадунец заступіўся за іх. “*Але як гром з яснага неба, неспадзяванае няшчасце знішчожыла ўжо надзею абяднеўшага народа: яго стогн каціўся па зямлі, але не шыбаў у гару, дзе бы пачуў народны выбранец, а той, спаглядаючы з*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*гэтай вышы ўніз, не мог дагледзець потам і крывёй злітай зямлі, па каторай варушыліся яго маленькія кармільцы*" [15, с. 82]. Ідэя твора празрыстая і мае ў аснове сваёй вечную значнасць, зайздросную універсальную прыроду сваёй гістарычнай паўтаральнасці.

"Ядвігін Ш. таксама ў многіх апавяданнях з найглыбейшым спачуваннем абмалёўвае пакутлівы лёс вясковых жанчын або дзяцей-сірот ("Бярозка", "Зарабляюць", "Гаротная")..." [8, с. 41].

Варта ў гэтым кантэксце ўзгадаць творчасць Цёткі (вершы "Вясковым кабетам", "Сіраціна", "Сынок маленькі", "Сіраціна слёзкі лье..."; апавяданні "Міхаська", "Сірата") і З.Бядулі ("Малыя дрываseki", "Велікодныя яйкі" і інш.).

## 3 "Золата" як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы.

Надрукаваны ўпершыню ў 1920 г. у газеце "Беларусь", дзе на той час супрацоўнічаў Ядвігін Ш. Па сутнасці, гэта адзін з першых твораў буйнога эпічнага жанру ў беларускай літаратуры. Некаторыя даследчыкі (Голубева Л.) вызначаюць жанр твора як аповесць [3].

Бясспрэчна тое, што "Золата" – сур'ёзная спроба стварэння псіхалагічнага рамана. У творы ёсць у наяўнасці напружаны драматычны сюжэт (унутраны драматызм), логіка развіцця характараў, цікавыя псіхалагічныя даследаванні. Жыццёвыя з'явы пададзены з поўнай глыбінёй, з падтэкстам. Аўтар свядома выкарыстоўвае няўласна-простую мову з мэтай стварэння аб'ёмнасці слоўнага малюнка. Ядвігін Ш. пры гэтым "не паглыбляецца ў сацыяльна-класавыя канфлікты, што апаноўвалі пареформенную вёску" [1, с. 295], – сцвярджае А.Лойка.

"Грошы, улада, золата – вось той д'ябал, які так заблытаў чалавечыя адносіны і прывёў да трагічнай развязкі.

Тэма "ўлада грошай" не новая ў сусветным мастацтве. Але Ядвігін Ш. раскрывае яе на новым жыццёвым матэрыяле, падае характары ў спецыфічных нацыянальных абставінах. У аповесці апісаны побыт, норавы, патрэбы, спадзяванні беларускага селяніна, ярка намаляваны асноўныя рысы сялянскай псіхалогіі, узаемаадносіны мужыка з местачковым мяшчанствам" [3, с. 102]. Аўтар у рамане даследуе душэўны свет герояў. Па-мастацку пераканаўча падаюцца ўзаемаадносіны галоўных герояў твора Васіля Дубінскага і Зосі Стрончык – ад першага іх знаёмства да трагічнай смерці першага.

Такім чынам, раман "Золата" – значнае дасягненне маладой беларускай прозы на пачатку XX стагоддзя. Даследчыкі звяртаюць увагу на гнуткасць, выразнасць, экспрэсіўнасць мовы рамана.

## 4 Паэма "Дзед Завала", нарысы, успаміны, артыкулы.

Асобна ў творчасці Ядвігіна Ш. стаіць паэма (вершаванае апавяданне) "Дзед Завала". У панараме развіцця новай беларускай літаратуры яно не з'яўляецца выпадковым. Блізкім папярэднікам Антона Завалы быў паляўнічы дзед Грышка з твора Я.Лучыны "Стары ляснік", а блізкім яго наступнікам стаў паляшук дзед Даніла – ахоўнік княжацкага саду ў паэме Я.Коласа "Сымон-музыка".

Завала – былы ўдзельнік паўстання 1863 г., усім жыццём і душой зліты

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з беларускай пушчай. Мы сустракаем героя ў той момант, калі ён на золку збіраецца ў пушчу, бо дома яго ніхто (ужо памерла і жонка) і нішто (гаспадаркі амаль няма) не трымае. У гэтым творы пушча найбольш апаэтызавана Ядвігіным Ш., пра якую пісьменнік пісаў і ў апавяданнях, і ў “Лістах з дарогі”. Гэта тычыцца легенды пра матачнік – тых мясцін у пушчы, згодна з народным уяўленнем, куды звяры ішлі дажываць свой век. У Ядвігіна Ш. паэтызацыя матачніка – паэтызацыя народна-сялянскіх уяўленняў аб шчаслівым агульнажыцці людзей увогуле, аб шчаслівай забяспечанай старасці.

У свой час М.Гарэцкі зазначаў, што “вершаванае апавяданне “Дзед Завала” сведчыць аб малай версіфікатарскай спрактыкаванасці аўтара, але вызначаецца мастацкімі апісаннямі, у якой чуюцца прыемныя пакевы старой паэтычнай душы” [6, с. 288].

Нататкі **“Лісты з дарогі**” па жанраваму вызначэнню – публіцыстычны нарыс (у той час малады жанр у беларускай прозе). Напісаны яны былі ў 1910 г. падчас падарожжа Ядвігіна Ш. па родным краі (цягнулася з канца мая па канец верасня; у кірунку з Вільні па Ашмянскім тракце; працягласць – 400 вёрст). У гэтых нататках выкладзены “пісьменніцкія ўражанні, грамадзянскі роздум над эканамічнымі і нацыянальнымі праблемамі жыцця беларускага селяніна” [3, с. 95]. Закранае ён і праблему народнай асветы.

“Думкі з падарожы” – апошні ліст з нататак “Лісты з дарогі”. У ім аўтар выказвае “*сваё агульнае ўражанне*” [15, с. 194] ад убачанага, робіць рашучыя вывады аб тым, што:

– народ ужо не такі, як 10-15 гадоў таму, што “*не такімі вачамі глядзіць ужо ён на свет*” [15, с. 194]: з аднаго боку асцярожны беларус зрабіўся яшчэ больш непрыступным да сваёй душы і думак, з другога – зразумеў, што жыць так, як раней – нельга; таму ён шукае новых дарог і варта паказаць народу гэту дарогу, пры гэтым варта “пратаптываць” яе побач з беларусам , бо той страціў веру ў слова;
– “*Моладзь ірвецца да прасветы, але тыя рамкі, у якія ўціснута цяпер навука нашых школ, даюць столькі карысці, колькі можа мець яе галодны чалавек, калі яму вымазаць вусны салам*” [15, с. 194];
– “*Беларускі мужык дасканальна знае сваю зямлю і вырабляе яе так, як толькі можна вырабіць на шнуры, дзе і з бараной трудна завярнуцца... І ўсё ж такі з сваёй цяжкай працы пры найлепшым ураджаі выжыць сямейнаму селяніну з сваёй гаспадаркі... нельга... Але каб падняць даходнасць зямлі, трэба перакуліць варункі не толькі гаспадаркі, але і варункі самога жыцця нашага мужыка. А на гэта трэба працы і часу. Працы – пакуль мужык не стане добра свядомым; часу – пакуль мужык не стане свабодным*” [15, с. 194–195].

“Успаміны” – выдадзены ў Вільні ў 1921 г. Засталіся незакончанымі. Першая частка, якая была надрукавана, “ахоплівае студэнцкія гады пісьменніка, арышт і знаходжанне ў Бутырках” [3, с. 102]. Гэта твор мемуарнага жанру, “усхваляванае апавяданне пра тое, што перажыта сэрцам чалавека грамадзяніна. Студэнцкія хваляванні падаюцца то з лірычнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

усхваляванасцю, то з гумарам і жартам, то з непазбыўнай тугой” [3, с. 102].

**Значэнне постаці Ядвігіна Ш. у гісторыі беларускай літаратуры.**

“Як зазначае літаратуразнаўца і педагог Лідзія Голубева, Ядвігін Ш. «узбагаціў беларускую прозу новымі жанрамі, унёс магчымую на тым этапе стылявую разнастайнасць у розныя віды апавядання, быў адным з пачынальнікаў буйнога эпічнага палатна і мастацкай публіцыстыкі»” [цыт.па: 4, с. 167].

**Літаратура:**


**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989.

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 86–102.

**Дадатковая**

4 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 166–167.

5 Верціхоўская М., Цялкова В. “Зрячій посох”, або Спроба прачытаць Ядвігіна Ш. // Роднае слова. – 1997. – № 4. – С. 92.

6 Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі / Уклад. і падрыхт. тэксту Т.С. Голуб. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992.

7 Каваленка, В.А. Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мінск: Нав. і тэхн., 1981. – 320 с.

8 Казбярук, У. На хвалі беларускага адраджэння. Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя У.Казбярук // Роднае слова. – 1993. – № 7. – С. 37– 44.

8 Максімовіч, В. “Алегарычнае” апавяданне Ядвігіна Ш. / В.Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пач. XX стагоддзя. – Мн., 2000. – С.145–155.

9 Ніцшэ, Ф. Так сказаў Заратустра: Кніга ўсім і нікому. – Мінск, 1994.

10 Нямковіч, Н. Некаторыя рысы стылю Ядвігіна Ш. / Н. Нямковіч // Роднае слова. – 1998. – № 2. – С. 86–90.

11 Содаль, У. Вугельчыкі з попелу (пра жыццё і дзейнасць Ядвігіна Ш.) / У. Содаль // Роднае слова. – 1999. – № 4. – С. 180–188.

12 Содаль, У. Пачынальнік. Да 140-й гадавіны з дня нараджэння Ядвігіна Ш. / У. Содаль // Полымя. – 2009. – № 1 – С. 181–182.

13 Ткачова, П. Жанравая спецыфіка твораў Ядвігіна Ш. / П. Ткачова // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 2 – С. 48.

14 Ядвігін, Ш. Выбраныя творы / Ядвігін Ш. – Мінск: Маст. літ., 2006 – 239 с.

**Электронныя рэсурсы**

15 Ядвігін Ш. Творы. Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jadvihin_S/


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.3 ЦЁТКА (Алаіза Пашкевіч) (1876 - 1916)

1 Біяграфія, творчая і грамадская дзейнасць.
2 Паэзія Цёткі: традыцыі і наватарства.
3 Проза і публіцыстыка Цёткі.
4 Значэнне дзейнасці Цёткі ў развіцці беларускай культуры і літаратуры.

### 1 Біяграфія, творчая і грамадская дзейнасць.

Адна з пачынальніц навейшай беларускай літаратуры. Творы яе з’яўляюцца хрэстаматыйнымі.

Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніцы пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 3 ліпеня 1876 г. | **Цётка** (Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч) нарадзілася ў вёсцы Пешчына недалёка ад Ліды ў дробнай шляхецкай сям'і (цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобласці). |
| 2 | 1879–1885 гг. | дзіцячыя гады правяла ў бацькоў бацькі (фальварак Тарэсін). Там навучылася чытаць і пісаць па польску; ад старой няньккі пераняла любоў да жывой народнай творчасці; пасля смерці бабулі жыве з бацькамі ў Старым Двары, вучыцца ў хатніх настаўнікаў. |
| 3 | 1894 г. | паступіла ў 4 клас прыватнай жаночай гімназіі В.Прозаравай у Вільні; пачынаюцца праблемы са здароўем (сухоты). |
| 4 | 1901 г. | скончыла поўны курс гімназіі. |
| 5 | 1902 г. | атрымала (пасля спецыяльных іспытаў) пасведчанне на званне хатняй настаўніцы. |
| 6 | 1903 г. | пачала вучобу на Курсах выхавальніц і кіраўніц фізічнай адукацыі П.Ф.Лесгафта ў Пецярбурзе; становіцца ўдзельніцай гуртка студэнтаў-беларусаў “Круг беларускай народнай прасветы”, пазней – сябрам “Беларускай рэвалюцыйнай грамады” (БРГ). |
| 7 | 1904 г. | курсы Лесгафта Цётка не скончыла, але здала спецыяльныя іспыты ў Аляксандраўскай жаночай гімназіі, а таксама атрымала пасведчанне аб здачы лацінскай мовы ў аб’ёме гімназічнага курса; вярнулася ў Вільню і распачала актыўную прапагандысцкую працу сярод віленскіх рабочых. |
| 8 | 1905 г. | удзельнічала ў жаночым з’ездзе ў Маскве як дэлегатка ад беларускіх жанчын; працавала ў Нова-Вілейцы сястрой міласэрнасці ў псіхіятрычным шпіталі. |
| 9 | 1906 г. | прымала ўдзел у 2-м з’ездзе БРГ ў Менску, на якім было высунута ў якасці праграмнага пытанне аб стварэнні незалежнай беларускай рэспублікі; спрычынілася да выдання першых беларускіх газет “Наша доля” і “Наша ніва”. |
| 10 | Сярэдзіна 1906 г. | пачынаюцца эміграцкія вандроўкі Алаізы. Спачатку Цётка наведала Львоў, відаць, таму, што туды яе запрасіў І.Свянціцкі – вядомы ўкраінскі славіст, знаўца беларускай літаратуры. |
| 11 | 1906 г. | пры садзейнічанні І.Свянціцкага ў выдавецтве Базыльянскага кляштара ў мястэчку Жоўква (цяпер г. Несцераў) непадалёку ад Львова пабачылі свет паэтычныя кнігі Цёткі кірыліцай “Хрэст на свабоду” і “Скрыпка беларуская”; Цётка-асветніца рыхтуе таксама “Першае чытанне для дзетак-беларусаў”. |
| 12 | 1907 г. | абвастрыліся сухоты, і Цётка на некалькі месяцаў выехала на лячэнне ў Закапанэ. |
| 13 | 1908 г. | залічана на летняе паўгоддзе на філасофскі факультэт Ягелонскага ўніверсітэта (г. Кракаў), працягвае вучобу там і ў зімовае паўгоддзе, мае дачыненне да рэвалюцыйнай маладзёжнай арганізацыі “Спуйня”;<br>разам з жонкай І. Білюнаса падарожнічае па Італіі. |
| 14 | 1910 г. | Цётка была “надзвычайнай” слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага ўніверсітэта; хадайнічала аб залічэнні яе ў “звычайныя” слухачкі (на стацыянарнае аддзяленне) і дзеля гэтага брала ўрокі грэчаскай мовы ў І.Свянціцкага і здавала іспыт па ёй |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | | ў Пецярбурзе; брала ўдзел у стварэнні беларускага тэатра І.Буйніцкага, сама была выдатнай драматычнай актрысай, сыграўшы ў гэтым тэатры некалькі роляў. |
| 15 | Люты 1911 г. | адбыўся шлюб Алаізы Пашкевіч са Сцяпанам Кайрысам, літоўскім інжынерам, дзеячам літоўскай сацыял-дэмакратыі. |
| 16 | 1912/13 навуч. г. | стала “звычайнай” слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага ўніверсітэта; збірала матэрыялы і мелася пісаць даследчую працу аб беларускай батлейцы. |
| 17 | 1913 г. | Цётка назусім вяртаецца ў Беларусь. |
| 18 | 1914 г. | фактычна рэдагуе ч-с для моладзі “Лучынка” (афіцыйным рэдактарам лічыўся А.Уласаў); у сакавіку папраўляе здароўе ў Фінляндыі; улетку падарожнічае ў Швецыю з той жа мэтай. |
| 19 | 1915 г. | грамадская дзейнасць Цёткі цесна злучана з Беларускім таварыствам дапамогі ахвярам вайны; шмат працуе па арганізацыі беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні; як сястра міласэрнасці даглядае хворых у тыфусовым бараку ў Вільні, дапамагае ў арганізацыі дзіцячых прытулкаў. |
| 20 | Студзень 1916 г. | Цётка атрымала паведамленне аб смерці бацькі і выехала на пахаванне яго ў Ліду; пасля наведала Стары Двор, дзе заразілася і захварэла на тыфус. |
| 21 | У ноч з 4 на 5 лютага 1916г. | **Цётка** памерла пад дахам роднага дома; пахаваная ў Старым Дварах. |

## 2 Паэзія Цёткі: традыцыі і наватарства.

Паэзія Цёткі прадстаўлена двума зборнікамі “Скрыпка беларуская” і “Хрэст на свободу” (абодва выдадзеныя ў 1906 годзе ў Жоўкве паблізу Львова), а таксама вершамі розных гадоў, якія не ўвайшлі ў згаданыя зборнікі.

Лічыцца, што паэтка працягвала ў сваёй творчасці традыцыі Ф.Багушэвіча. Гэта відаць нават на ўзроўні назваў зборнікаў і запавета класіка, выказанага ў знакамітай “Прадмове” да зборніка “Смык беларускі”: “Смык ёсць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была “Дудка” – вот мы і зробім музыку, як тыя жыдкі, што на цымбалах іграюць” [5].

У пацверджанне гэтай высновы прывядзём выказванне В.Максімовіча: “Феномен Цёткі – у неардынарным характары яе творчасці, дзе судакрануліся дзве літаратурныя плыні, дзве гістарычныя эпохі: адна, звязаная з творчасцю Ф.Багушэвіча і паэтаў народна-дэмакратычнага напрамку (А.Гурло, Я.Лучына, А.Гурыновіч), і другая, у многім шмат адрозная ад першай, “заканадаўцамі” і паўнамоцнымі прадстаўнікамі якой сталі Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, З.Бядуля і, вядома, сама “паэтка рэвалюцыі”. Адметнай асаблівасцю другога кірунку <...> з’явіліся абсалютна іншыя адносіны да рэчаіснасці, да спосабу рэалізацыі “Эстэтычнага ідэалу”, само стаўленне да жыцця. Калі народніцка-дэмакратычны кірунак літаратуры быў прадстаўлены амаль абсалютнай маналітнасцю тэм, вобразаў, ідэй (пераважна грамадзянскага і сацыяльна-крытычнага гучання), то другі кірунак <...> часцей “выбіваўся” са звыклага кола тэм і праблем” [8, с. 231].

Слушна наконт наватарскіх тэндэнцый у паэзіі Цёткі выказаўся В.Максімовіч “Творчай манеры Цёткі ўласцівы празмерны дынамізм, ярка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выражанае ультрарамантычнае непрыманне ўсярэдненасці, звычаёвасці, імкненне парушыць заведзена-звычны ход жыцця, скіраваць яго ў рэчышча несумненна жаданага для паэткі стану выключнасці, павышанай экзальтацыі, а часам і яўнай эксцэнтрыкі. Менавіта ў гэтым бачыцца прыкмета новага мастацкага мыслення дваццатага стагоддзя" [8, с. 232].

Самымі раннімі паэтычнымі творамі Цёткі лічацца вершы "Лета" і "Восень", датуюцца яны 1902–1903 гг., якія былі надрукаваныя толькі ў "Скрыпцы беларускай". У іх аўтарка "ўзнаўляе асноўныя моманты сялянскай летняй і восеньскай працы, малюе адметнасці кожнага календарнага часу, апісвае летняе ігрышча, восеньскі кірмаш" [1, с. 106]. Даследчыца І.Багдановіч характарызуе іх як "сапраўдны жывапіс словам", а таксама акцэнтуе ўвагу на насычанасці кожнага "цётчынага" радка дзеясловамі, што ў свой час падкрэсліваў Р.Бярозкін. Што да першых друкаваных вершаў, то гэта "Мужык не змяніўся" ("Калядная пісанка", 1903), "Нямаш, але будзе" і "Музыкант беларускі" (абодва ў "Велікоднай пісанцы", 1904).

І.Багдановіч лічыць Цётку тыповай постацю "беларускага адраджэнца з палымянаю душою" [1, с. 108], а не рэвалюцыянеркай. Разам з тым даследчыца адзначае, што "будучы натурай страснай, з вострым адчуваннем калізій свайго часу, Цётка стварае шэдэўры рэвалюцыйна-агітацыйнай паэзіі (вершы "Хрэст на свабоду", "Мора", "Пад штандарам"), якія даследчыкі слушна прыроўніваюць па эфекту ўздзеяння на масы да палітычнай публіцыстыкі К.Каліноўскага" [1, с. 108].

Усё ж вызначальнай у паэзіі Цёткі была адраджэнская тэматыка (верш "Наш палетак"), а таксама вершы, у якіх падкрэслівалася "важнасць пяснярскай справы" падчас абуджэння народа "да гістарычнага жыцця" (вершы "Скрыпка", "Музыкант беларускі", "Артыст грайка", "На магіле", "Грайка"). Не абышла ў сваёй творчасці паэтка, якая правяла пэўны час свайго жыцця ў эміграцыі, "матыў чужыны і настальгічнага апявання Бацькаўшчыны" (вершы "На чужой старонцы", "З чужыны"). Звярталася пісьменніца да тэмы дзяцінства і сіроцтва (вершы "Сынок маленькі", "Сірацінка"), а таксама асэнсоўвала спрадвечную долю жанчыны-сялянкі ("Вясковым кабетам").

Згодна з даследчыцай А.Петрушкевіч, адным з вядучых у паэзіі Цёткі з'яўляецца матыў балю, бяседы, ігрышча [9, с. 13–20]. "Ад самага пачатку сваёй творчасці Алаіза Пашкевіч усклала на сябе абавязак граць на беларускім балі-бяседзе, падказваючы і прадказваючы, пакутуючы і радуючыся, ператвараючыся ў створанага ейным уяўленнем артыста грайку, што тварыў цуды" [9, с. 20]

**3 Проза і публіцыстыка Цёткі.**

"Празаічныя творы Алаізы Пашкевіч – арыгінальная з'ява ў беларускай літаратуры найперш таму, што створаны яны майстрам паэтычнага слова. Аўтарка надавала вялікую ўвагу мастацка-выяўленчым сродкам, якія і вызначаюць адметнасць яе прозы" [9, с. 26].

Раннія празаічныя творы Цёткі прысвячаліся дзецям і ўвайшлі ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“Першае чытанне для дзетак-беларусаў” (1906 г.). Яны розняцца ў жанрава-стылявых адносінах. Абразок “З прыску ды ў агонь” І.Багдановіч лічыць байкай у прозе, “Гутарку асота з крапівою” – прыпавесцю, казку “Журавель і чапля” – апрацоўкай з народнага. Апавяданне “Сварба” – казачна-алегарычным, з персаніфікаванымі вобразамі Зімы і Вясны. “Вылучаецца сярод гэтых твораў апавяданне “Сірата”, сюжэт якога звязаны з лёсам дзяўчынкі-сіраты Настулі. Разам з сацыяльна-бытавым фонам у творы прысутнічае элемент фальклорна-фантастычны – вобраз старой жабрачкі <...> З’яўленне гэтай старой <...> стала пераломным у лёсе Настулі, якая знайшла апеку, выгадавалася і нават вывучылася на настаўніцу. Светлы тон апавядання, установка на пазітыўнае <...>, мелі тонкі выхаваўчы падтэкст: Цётка пісала для дзяцей, улічваючы дзіцячую псіхалогію, схільную ўспрымаць свет у казачна-шчаслівых варунках, без згушчанасці ў ім адмоўнага і жорсткага” [1, с. 114].

В. Максімовіч таксама адзначае жанрава-тэматычную разнастайнасць прозы Цёткі: “У празаічнай спадчыне пісьменніцы можна сустрэць апавяданні асветніцка-пазнавальнага *(“Сварба”, “Гутарка асота з крапівою”, “Журавель і чапля”)*, павучальна-дыдактычнага *(“З прысаку, ды ў агонь”)*, і нават анекдатычнага *(“Разумныя ды не на дурня напалі”)* характару. Цётка спрабавала сябе і ў жанры мастацка-эпісталярнага пісьма *(“Навагодні ліст”)*, і ў жанры падарожных нататак *(“З дарогі”, “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю”)*. Акрамя таго, сустракаюцца навуковыя артыкулы, даследаванні, рэпартажы. Але асобае месца ў творчай спадчыне пісьменніцы займае суб’ектывізаваная проза, дзе яскрава выявілася майстэрства псіхалагічнага аналізу *(“Асеннія лісты”, “Лішняя”, “Зялёнка”, “Міхаська”)*” [8, с. 253]. Гэтаму спрыяла сталенне самой пісьменніцы (і яе таленту), разуменне таго, што ў жыцці не ўсё складваецца так, як бы хацелася. Усё больш настойліва і ўпарта сталі заяўляць аб сабе сухоты. Таму “самі сабой узнікалі пытанні пошуку спрадвечнай існасці, сэнсу жыцця. <...> Сведчаннем няўцешна-трывожнага стану, неадольнага духоўнага скепсісу, тужлівай адзіноты душы і з’явіліся апавяданні Цёткі 1910 – 1914 гг.” [8, с. 253].

Пачаткам ***празаічнай*** творчасці Цёткі стала апавяданне сімволіка-алегарычнага зместу “Прысяга над крывавымі разорамі”, змешчанае ў першым нумары газеты “Наша доля”. “Форма адлюстравання – сон героя – надае твору алегарычны характар. Шматлікія вобразы-сімвалы, што ўзаемазвязаны між сабой, ствараюць цэласную карціну, у якой – разуменне аўтаркай тагачаснай сітуацыі ў краіне. Апавяданне выклікана да жыцця непасрэдным удзелам Цёткі ў рэвалюцыйных падзеях. <...> гэта адзіны празаічны твор Алаізы Пашкевіч ярка выражанага сацыяльнага зместу, рэвалюцыйнай пафаснасці” [9, с. 23].

“Асеннія лісты”, “Лішняя”, “Зялёнка”, “Міхаська” – творы, у якіх пісьменніца даследуе ўнутраны свет, псіхалогію герояў, іх трагічную экзістэнцыю. “Характэрна тое, што фабула ўсіх названых апавяданняў звязана з героямі, якія перажываюць найвялікшыя і найтрагічнейшыя моманты свайго жыцця. Яны паказаны у момант найвышэйшага ўзлёту іх душэўных сіл. Усіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

герояў паяднoўвае высокае пачуццё гуманнасці, вялікаснасці душы, нягледзячы на гэта яны не ў стане супрацьстаяць злой сіле, фатуму, які павіс над імі і паступова падводзіць іх да безвыходнасці, жыццёвага тупіка” [8, с. 254].

“Як правіла, апавяданні Цёткі маюць адну тэму, будуюцца на адным жыццёвым здарэнні, адной жыццёвай калізіі, якая дапамагае раскрыць галоўнае ў характары свайго героя, яго стан душы. Цётка паслядоўна і свядома суб’ектыўная: у абраных ёю героях яна шукае толькі тое, што сугучна з яе настроем, што адпавядае яе этычным запатрабаванням. Таму доля ўмоўнасці, тэндэнцыйнасці ў вырашэнні задач мастацкага ўзнаўлення жыцця – відавочная” [8, с. 255].

Па сваёй жанрава-стылявой структуры апавяданні Цёткі, згодна з В.Максімовічам, набліжаюцца да псіхалагічнай навелы. Пабудова іх тыповая: “амаль кожнае пачынаецца з адлюстравання нязначных падзей, нічым не адметных на першы погляд герояў. Фабула твораў вылучаецца выразным і нечаканым паваротам падзей, што вядуць да нечаканай развязкі, сутыкнення звычаёва-празаічнага і высокапачуццёвага, звышэкзальтаванага, што мяжуе са шчырасцю трагічнага светаадчування” [8, с. 255]. “Тэма амаль кожнага твора пісьменніцы звязана з праблемай чалавечых зносін, разумення людзьмі адно аднаго” [8, с. 255].

Што да ***публіцыстыкі,*** то найперш варта ўзгадаць працу Цёткі ў часопісе “Лучынка”. Там яна змясціла шэраг твораў на розныя тэмы. А таксама падарожныя нарысы “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю” і “З дарогі”. Даследчыца І.Багдановіч зазначае, што гэтыя творы мелі “вялікае значэнне для ўзнаўлення ў беларускай літаратуры мемуарнага жанру” [1, с. 119]. “Цётка надавала асаблівы эстэтычны сэнс падарожжу як спосабу шырэйшага пазнання свету і самавызначэння” [1, с. 119].

“Адна з пачынальнікаў беларускай нарысістыкі, Алаіза Пашкевіч пакінула свае дарожныя нататкі «З дарогі» і «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю». Новыя далягляды, цікавыя краявіды, убачаныя ёю на чужыне, рассцілаюцца і перад нашымі вачыма. Бо апавядаецца пра гэта цікава, яскрава, праз параўнанне з родным, беларускім” [9, с. 7] – зазначае літаратуразнаўца А. Петрушкевіч.

“З дарогі”: “Апісанне падарожжа ў Нямеччыну суправаджае лірычны, настальгічна афарбаваны настрой, а таксама элегічны душэўны смутак з прычыны хваробы...” [1, с. 119]. “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю” “можна лічыць грунтоўным этнаграфічным нарысам з жыцця фінаў, а таксама гімнам фінскаму культурна-гістарычнаму адраджэнню, за якім паралеллю праглядваецца запаветная мара Цёткі аб адраджэнні беларусаў” [1, с. 119].

Папраўляючы здароўе ў Фінляндыі, Цётка назірае за жыццём фінаў і, безумоўна, супастаўляе яго з жыццём беларусаў. І тут, акрамя ўсяго іншага, яе ўвага скіравана на адносіны да жанчыны ў грамадстве і сям’і. Параўнанне не на карысць свайму народу: “Фінляндскі народ першы ў Еўропе прызнаў роўныя правы кабетам. Кабета-матка – свядомая фінляндка-патрыётка – яшчэ ў калысцы пачне навучаць свае дзеткі любіць родны край, родны народ,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

любіць і паважаць справядлівасць роднага народа” [12, с. 141]. Таму звяртаецца пісьменніца “Да дзяўчатак”, будучых жанчын, з верай, што калі яны навучацца паважаць сябе самі, то гэтым заслужаць павагу іншых. Цётка выхоўвае ў іх пачуццё прыгожага і вучыць ствараць прыгажосць вакол сябе: саджаць кветкі, дрэўцы, падтрымліваць чысціню, заахвочваючы “гасцінцамі” – насеннем кветак.

**4 Значэнне дзейнасці Цёткі ў развіцці беларускай культуры і літаратуры.**

“Значэнне творчасці Цёткі ў станаўленні беларускай літаратуры пачатку XX ст. заключаецца ў тым, што яна была непасрэдным водгукам на канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, сфармуляваную Ф.Багушэвічам. Цётка была адной з першых яе пераемніц як у мастацкай творчасці, так і на полі грамадскай дзейнасці, ствараючы і пашыраючы <...> на гэтай ніве ідэалогію і эстэтыку нацыянальнага адраджэння на пачатку XX ст. Гэтым было абумоўлена наватарства яе паэтыкі, распрацоўка новых тэм і матываў у паэзіі, прозе, публіцыстыцы” [1, с. 119–120].

«Свае культурна-асветніцкія ідэі Алаіза Пашкевіч увасобіла ў паэзіі з багатай палітрай артыстаў-грайкаў і музыкаў, жанчын як найярчэйшых кветак зямлі нашай і дзяўчынкі Касі – “*багіні, царэўны*”. Менавіта Цётка як педагог і як “*палкая і вечна маладая Маці беларускіх паэтэс*” (Е.Лось) падарыла першыя чытанкі для дзяцей” “Беларускі лемантар, або першая навука чытання” (1906), “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (1906), “Гасцінец для малых дзяцей” (1906)”. Думаецца, найбольш поўна асветніцка-педагагічныя ідэі Алаіза Пашкевіч увасобіла ў першым беларускім часопісе для дзяцей і моладзі, які меў вабна-непасрэдную, ласкавую назву – “Лучынка”» [10].

Ролю Цёткі ў гісторыі беларускай культуры вызначыў М.Ермаловіч наступнымі словамі: “Цётка як бы аб’ядноўвала ў сабе дзвюх выдатных жанчын нашай старажытнасці: Рагнеду і Ефрасінню Полацкую. Як першая, яна была барацьбітом за волю радзімы і, як другая – асветніцай свайго народу” [цыт.па: 1, с. 120].

**Літаратура:**


**Асноўная**

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 103–120.

**Дадатковая**

2 Арабей, Л. Стану песняй: Жыццё і творчасць Цёткі / Л.Арабей. – Мінск, 1990.

3 Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя... / І. Э. Багдановіч. – Мінск: Беларуская навука, 2001. (Раздзел: “Алаіза Пашкевіч (Цётка) і браты Іван і Антон Луцкевічы”). – С. 116–129.

4 Багдановіч І. Э. Авангард і традыцыя... І. Э. Багдановіч – Мінск: Беларуская навука, 2001. (Раздзел: “Дзве стыхіі ў творчасці Цёткі”). – С. 130–149.

5 Багушэвіч, Ф. Прадмова да “Смыка беларускага” / Ф.Багушэвіч [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Francisak_Bahusevic/Pradmova_da_Smyka_bielaruskaha.html.

6 Коўтун, В. На касмічнай карце бацькаўшчыны (З радаводу Цёткі) / В. Коўтун // Роднае слова. – 1998. – № 12. – С. 165–171.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Коўтун, В. Стала песняю ў народзе. Асоба і творчасць Цёткі ў кантэксце станаўлення беларускай класікі / В. Коўтун. – Мінск: Народная асвета, 2000. – 143 с.

8 Максімовіч, В. Творчасць Цёткі (А.Пашкевіч) у грамадска-культурным кантэксце пачатку ХХ ст. // В. Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. – Мінск, 2000. – С. 228–260.

9 Петрушкевіч, А.М. Некаторыя старонкі беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя: дапам. / А.М. Петрушкевіч; пад рэд. І.В. Жука. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 147 с.

10 Сабуць, А. “Лучынка” злучыла стагоддзі: асоба Цёткі як педагога і публіцыста /Аліна Сабуць: http://pisateli.by/2016/luczinka_sabut.pdf

11 Стэпонас, К. З маіх успамінаў пра Цётку / Кайрыс Стэпонас // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. прадм., звесткі пра аўт. Б.І. Сачанкі. – Мінск: Маст. літ., 1994.

12 Цётка. Выбраныя творы / Цётка; уклад. прадм. В. Коўтун; камент. С. Александровіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001 – 336 с.

**Электронныя рэсурсы**

13 Цётка. Творы / Цётка // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ciotka/

14 Цётка. Цікавыя звесткі: https://belarusianheroes.com/alaiza.pashkievich

## 1.4 ЯНКА КУПАЛА (1882 - 1956)

1 Біяграфія; набыткі і дасягненні купалазнаўства.
2 Мастацкая эвалюцыя Я.Купалы ў зб-ках “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”; зб-к “Спадчына”.
3 Рамантычныя паэмы 1910–1913 гг., іх мастацкія адметнасці.
4 Драматычныя паэмы: праблематыка, мастацкія асаблівасці; драматургія: літаратурныя традыцыі і эстэтычныя вытокі.

*Янка Купала – “культавая постаць беларускай нацыі, годны яе прадстаўнік у сусветнай культурнай супольнасці. Геній Купалы вышэйшы за нацыянальны пафас яго творчасці, а яго мастацкія адкрыцці значныя як для Беларусі, гэтак і для універсуму. Ён належыць да таго тыпу творцаў, што не толькі жылі ў сваю гістарычную эпоху, адлюстроўвалі яе, але і пераадольвалі свой час дзеля будучыні” [5, с. 172].*

### 1 Біяграфія; набыткі і дасягненні купалазнаўства.

Янка Купала – народны паэт Беларусі (1925), класік беларускай літаратуры. Асноўныя звесткі з біяграфіі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 7 ліпеня 1882 г. | **Янка Купала** (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся ў фальварку Вязынка Мінскага павета Мінскай губерні (цяпер вёска Вязынка Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.). Бацькі – Дамінік Ануфрыевіч і Бянігна Іванаўна – паходзілі з дробнай чыншавай шляхты. |
| 2 | 1888 – 1890 гг. | вучыўся ў вандроўных настаўнікаў, займаўся ў Сенніцкім народным вучылішчы, у прыватнай падрыхтоўчай школе ў Мінску. |
| | 1997/1998 г. | У 16-гадовым узросце скончыў поўны курс (два класы за адзін год) Бяларуцкага народнага вучылішча. |
| | З 1895 да 1904 г. | сям'я жыла ў засценку Селішча (цяпер у Лагойскім раёне Мінскай вобласці). |
| | 1902 г. | памірае бацька Купалы, а праз паўгода адзіны брат і дзве сястры. |
| | 1902 –1908 гг. | Купала працуе хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага, прыказчыкам у панскім маёнтку, чорнарабочым, памочнікам вінакура на броварах;<br>пачынае пісаць вершы на польскай мове. |
| | 1904 г. | першы беларускамоўны верш “Мая доля”, які быў напісаны лацінкай. |
| | 1905 г. | у мінскай *рускамоўнай* газеце “Северо-Западный край” |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | | надрукаваны па-беларуску верш “Мужык”, падпісаны псеўданімам “Я. Купала”, гэта было першае выступленне паэта ў перыядычным друку. |
| | 1907 г. | у газеце “Наша ніва” змешчаны верш “Касцу”, які стаў першым выступленнем Купалы ў *беларускамоўным* друку. Пасля гэтага Купала ў “Нашай ніве” друкаваўся рэгулярна. |
| | 1908 г. | у Санкт-Пецярбургу ў беларускім выдавецтве “Загляне сонца і ў наша аконца” выйшаў першы зборнік Я. Купалы – “Жалейка”, дзе быў змешчаны верш “А хто там ідзе?”, які адразу набыў статус нацыянальнага гімна. |
| | 1908–1909 гг. | жыў у Вільні, працаваў у рэдакцыі газеты “Наша ніва” і адначасова бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы;<br>напісаў першую драматычную паэму “Адвечная песня”. |
| | 1909–1913 гг. | па запрашэнні прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы пераязджае з Вільні ў Пецярбург, дзе жыве звыш трох гадоў, наведвае заняткі вячэрніх агульнаадукацыйных курсаў А.Чарняева. |
| | 1910 г. | Купала выдае зборнік “Гусляр” і драматычную паэму “Сон на кургане”, адзін з самых таямнічых твораў пісьменніка, у якім увасоблены беларускі шлях да самапазнання і спасціжэння Бацькаўшчыны. |
| | 1912 г. | Купала напісаў першы ўласна драматургічны твор – камедыю “Паўлінка”; упершыню была пастаўлена ў Вільні ў 1913 г. |
| | 1913 г. | у выдавецтве “Загляне сонца і ў наша ваконца” выйшаў зборнік “Шляхам жыцця”. Побач з творамі выразнай грамадзянскай, патрыятычнай накіраванасці сюды ўвайшлі шэдэўры Купалавай філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыкі; напісаны рамантычныя паэмы “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”, сцэнічны жарт “Прымакі”, драма “Раскіданае гняздо”. |
| | З кастрычніка 1913 да жніўня 1915 г. | вяртаецца ў Вільню, працуе ў “Нашай ніве” спачатку супрацоўнікам, а з 1914 г. рэдактарам-выдаўцом;<br>з закрыццём газеты выязджае (верасень 1915 г.) у Маскву. |
| | Восень 1915 г. – 1916 г. | вучыцца ў Маскоўскім гарадскім народным універсітэце імя А. Шаняўскага (слухач гісторыка-філасофскага цыкла);<br>сустракае Уладзіславу Станкевіч, знаёмы з якой быў з 1908 г., бярэ з ёй шлюб;<br>мабілізаваны ў армію, служыць у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін у Полацку. |
| | 1917 – 1918 гг. | пераехаў у Смаленск, дзе служыць агентам па нарыхтоўцы прадуктаў. |
| | студзень 1919 г. | пераехаў у Мінск, дзе жыў да пачатку ВАв, падчас якой эвакуіраваўся. |
| | З 1921 да 1930 г. | актыўна ўдзельнічаў у літаратурна-грамадскім і культурна-мастацкім жыцці, у тым ліку ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў, уваходзіў у склад камісіі па стварэнні Інбелкульта. |
| | 1922 г. | выдае зборнік “Спадчына”, які складаецца з вершаў і паэм, напісаных у 1913–1919 гадах. Усе творы знітаваныя ідэяй адраджэння і незалежнасці Бацькаўшчыны, праблемай выбару свайго шляху на зломе гісторыі і адказнасці за гэты выбар;<br>напісаў трагікамедыю “Тутэйшыя”, дзе адлюстраванна жыццё беларусаў у гады грамадзянскай вайны. |
| | 1924 г. | выдае паэму “Безназоўнае”, праз год выходзіць зб-к з такой назвай. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | 1925 г. | з нагоды 20-годдзя літаратурнай дзейнасці нададзена ганаровае званне народнага паэта Беларусі з прызначэннем пажыццёвай пенсіі. |
| | 1927 г. | узначальвае літаратурную суполку “Полымя”, якая аб’яднала пісьменнікаў-“адраджэнцаў”. |
| | 20 лістапада 1930 г. | Купала робіць спробу самагубства, але застаецца жывы. |
| | снежань 1930 г. | у газеце “Звязда” быў апублікаваны так званы “пакаянны” ліст Купалы, напісаны, на думку многіх даследчыкаў, пад дыктоўку, у якім паэт вымушаны быў прызнавацца ў “памылках” і “шкодных поглядах”, абяцаў “аддаць усе свае сілы сацыялістычнаму будаўніцтву”. |
| | 1941 г. | у час Вялікай Айчыннай вайны паэт жыў у Маскве, потым у пасёлку Пячышчы каля Казані. |
| | 1942 г. | быў раптоўна выкліканы ў Маскву тэлеграмай ад старшыні Саўнаркаму БССР І. С. Былінскага |
| | 28 чэрвеня 1942 г. | **Купала** трагічна загінуў, упаўшы з лесвічнай пляцоўкі дзевятага паверха гасцініцы “Масква”;<br>быў пахаваны на Ваганькаўскіх могілках у Маскве. |
| | 1962 г. | урна з прахам паэта перавезена ў Мінск і пахавана на Вайсковых могілках. |

Да асэнсавання творчасці Я.Купалы звярталіся розныя пакаленні літаратуразнаўцаў і крытыкаў. На сённяшні дзень цікавасць да яе не зменшылася. Змяняюцца толькі акцэнты ўспрыняцця спадчыны класіка. На сучасным этапе развіцця айчыннага літаратуразнаўства да асэнсавання спадчыны Я.Купалы звярталіся В.Рагойша, У.Гніламёдаў, І.Навуменка, М.Тычына, І.Багдановіч, П.Васючэнка, В.Максімовіч, Дз.Санюк і мн. інш. даследчыкі (гл. Спіс літаратуры ў канцы лекцыі).

**Стыль Купалы:** “Складанасць купалаўскага стылю – даўнейшы прадмет спрэчак у купалазнаўстве; найбольш важкія аргументы прыведзены на карысць тае версіі, што вызначае гэты стыль як сінтэтычны” [8, с. 92]. “Сінтэтычны метад купалаўскага пісьма спалучыў у сабе творча актыўныя, дзейсныя, сугучныя часу элементы такіх стыляў, як рамантызм, сімвалізм, рэалізм. Міфалагічная аўтэнтыка, асаблівы паэтычны тэмперамент і віталізм пазначаюць купалаўскую стылёвую самабытнасць” [7, с. 92].

У свой час В.Каваленка, разважаючы пра стыль “ранняга” Купалы, пісаў: “Ён сінтэтычны і невыразны, цьмяны, недастаткова прасветлены. Паэтычны голас Купалы адначасова смутны і вясёлы, зямны і пафасны, публіцыстычны і аналітычны...” [11, с. 237].

## 2 Мастацкая эвалюцыя Я.Купалы ў зб-ках “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”; зб-к “Спадчына”.

*Мастацкую эвалюцыя Я. Купалы ў зборніках “Жалейка” (1908), “Гусляр” (1910), “Шляхам жыцця” (1913) даследчыкі вызначаюць наступным чынам: ад канкрэтна-побытавага паказу жыцця, ад тэм і матываў пераважна сялянскіх, ад парадаксальна складанай прастаты да індывідуалізаванага, вытанчанага, артыстычнага, паглыбленага і энцыклапедычнага выяўлення асобы паэта і духоўнага вобліку яго героя.*

**“Жалейка”** (1908 г.) населена беларускімі тыпамі. Гэта – мужык-земляроб, пан – уладальнік маёнтка, шматлікія падпанкі, жнеі, рамеснікі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

старцы. У “Жалейцы” мастацка-паэтычнай увагай і прызнаннем песняра адзначаны самыя звычайныя прадметы сялянскай працы і побыту: саха, каса, тапор, лапці, хатка, дрэвы – ліпа, вольха, бяроза… Яны ўвасабляюць яго жыццёвую долю, аднак у гэтых дэталях раскрываюцца і замацоўваюцца не столькі рэальна-побытавыя падрабязнасці сялянскага жыцця ў натуральнасці іх зместу, колькі вобразныя згусткі паэтычных эмоцый аўтара. Ужо ў “Жалейцы” многія вобразы сведчылі пра ўменне аўтара зазірнуць за гарызонт будзённага жыцця, ўзвысіць духоўны пачатак (напр., верш “А хто там ідзе?”). Гніламёдаў падкрэслівае сувязь верша з Бібліяй. Прарочы дар Купалы выявіўся ў тым, што праблемам беларускай гісторыі ён надаваў абагульняючы характар, паказваючы іх як праблемы агульначалавечыя. Беларускі народ параўноўваецца са старажытна-яўрэйскім, што трапіў у егіпецкі палон, страціў сваю свабоду і самастойнасць. “Ворагам беларушчыны”, “Я не паэта”, “Я мужык-беларус”, “Гэта крык, што жыве Беларусь!..”, “Паніч і Марыся” і  інш. Пэўнае месца ў “Жалейцы” заняла інтымная і пейзажная лірыка. [8, с. 14–15].

Зборнік **“Гусляр**” (1910 г.) працягвае і развівае першую кнігу. У лірычным перажыванні ўсё больш адлюстроўваецца ўнутраны стан паэта, верш вызваляецца ад традыцыйнай для беларускай паэзіі сюжэтнасці і апісальнасці. Адна з цэнтральных тэм зборніка – мастак і свет, мастак і народ. Яна гучыць у вершы “Сон” (“Дарогай змучаны далёкай...” і інш.).

Праграмныя вершы “**Сон”, “Гусляр**” і некат. інш. былі, думаецца, напісаны не без уплыву У. Самойлы, эстэтычныя погляды якога фарміраваліся пад уздзеяннем рускага сімвалізму... У “Гусляру” знаходзім глабальнае адчуванне эпохі, глыбіні і маштабу яе канфліктаў і катаклізмаў.

Паэт высока цэніць пачуццё асабістай свабоды... Аўтар пратэстуе супроць усякага прыгнёту і ўціску – гаворка ідзе не толькі пра ўціск грамадства і дзяржавы, але і аб саміх асновах светаўладкавання. У сваіх духоўных памкненнях купалаўскі лірычны герой перасягае сацыяльна-палітычныя і побытава-эканамічныя межы і ўяўленні і набывае касмаганічныя рысы (“**Песня і сіла**”).

Пясняр прагне стварыць сваю паэтычную мадэль светабудовы, якая павінна даць чалавеку схрон і ахову ад зла і безвыходнасці, што акружаюць яго сярод зямной юдолі. Касмізм Купалы – гэта яго балючае рэагаванне на трагічную алагічнасць жыцця. За гэтым трэба думаць, стаіць і горкае расчараванне ў спадзяваннях на хуткія рэвалюцыйныя перамены і крызіс веры ў магчымасць такіх перамен... узбуйненне постаці лірычнага героя надае незвычайны размах вобразна-эмацыянальным абагульненням, пашыраючы іх да філасофскіх абсягаў. Філасафічнасць пошукаў паэта абумоўлена імкненнем зазірнуць у таямніцу часу, зразумець рух гістарычнага працэсу. У некаторых момантах ён наследуе біблейскаму Эклезіясту, які канстатаваў бяссілле чалавека перад тварам Часу. Гэта тычыцца такіх вершаў, як “**Ноч за ночкай...”, “Адцвітанне”, “Воўк”, “Грабар”, “Запушчаны палац”, “За годам год**” і інш. з іх высокім рамантызмам, абумоўленым не толькі сваім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нацыянальным болем, але і тым, што пецярбургскія сімвалісты называлі “мировой скорбью”.

Нічога вечнага на свеце
Няма для шумнага жыцця;
Здарэнні, многія сталецці
Ідуць пад века забыцця. (“*Кругазварот*”)

Чалавек падпарадкаваны гэтаму вечнаму кругазвароту, і ніштo, здаецца, не дае яму магчымасці, ўзняцца над ім – ні сіла духу, ні высакароднасць, ні дабрыня. Аднак нагадвае пра сябе думка, падказваемая ўсё той жа светабудовай, якая так блізка падпусціла паэта-касміста да разгадкі сваіх таямніц:

Плача сонца маладое
Над планетай над старою
 Іскры сыплюцца цурком,
Што не тымі пуцінамі
Ходзяць леты за лятамі
 Ў вечным зладзе з курганом (“*Знямога*”)

Сонца плача іскрамі – цікавы, адраджэнскі па сваёй паэтычнай энергетыцы вобраз. І вельмі хацелася Купалу верыць у прадказанні гэтага іскрыстага сонца, якое абяцала шчаслівыя змены і ў сацыяльна-гістарычным абліччы [8, с. 17–19].

Зборнік **“Шляхам жыцця”** (1913 г.) – адна з вяршыняў беларускай паэзіі пачатку ХХ ст. Аўтар пацвердзіў, што адраджэнская мара яго і нацыянальны ідэал застаюцца ранейшымі – вярнуць свой народ з шляху смерці на шлях жыцця.

“**Прарок**” – у ім, здаецца, упершыню ў Купалавай творчасці прагучала ідэя вялікага ўсенароднага сходу. Аднак верш заканчваецца на горка-іранічнай ноце: народ з недаверам глядзіць на сваіх прарокаў, сумняваецца ў іх закліках. Аднак гэта тлумачыцца не толькі неразвітасцю нацыянальнай свядомасці, а і адчуванні чалавека на пачатку ХХ ст., калі стварылася новая духоўная сітуацыя, якая ў сваю чаргу азначала крах традыцыйнай гуманістычнай свядомасці, расчараванасць у жыцці, асуджанасць усякіх спроб змяніць жыццё да лепшага. У паэзію Купалы таксама шырока ўвайшло адчуванне катастрафічнасці перажываемай эпохі, маральнай неўладкаванасці і дэгуманізацыі свету і чалавека.

У творчасці Купалы... адначасова спалучыліся дзве эпохі развіцця літаратуры – ХІХ і ХХ стст... Яго ўжо не мог задаволіць стары, Багушэвічаў пазітывісцкі рэалізм. Больш смела...заглыбляецца ён ва ўласную прыроду чалавека, шукаючы ў ёй апору для сваіх творчых азарэнняў. ХХ ст. несла шмат новага. Аказалася, што магчымасці асветніцка-разумовага вытлумачэння навакольнай рэчаіснасці недастатковыя, каб спасцігнуць усе яе відочныя і нябачныя глыбіні і супярэчнасці.

Гэтае адчуванне перададзена ў зб-ку “Шляхам жыцця”, пра што сведчыць не толькі прарок, але верш “**Чалавеку**” і іншыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Своеасаблівасць Купалы як паэта-рамантыка ў тым, што яму давялося жыць і тварыць у пострамантычную эпоху. Самыя верхнія рэгістры яго рамантызму ўступалі ў сугалоссе з тагачаснымі мадэрнісцкімі павевамі. Уласна кажучы, мадэрнізм – гэта і ёсць рамантызм XX ст., або пострамантызм (у адрозненне ад рамантызму XIX ст.) абумоўлены новым разуменнем чалавека ў яго суадносінах з жыццём, прыродай, космасам.

У творчасці Купалы і інш. бел. пісьменнікаў настойліва сцвярджае сябе той разнастайны мастацка суб'ектыўны стыль, без якога нельга потым уявіць літаратуру XX ст. Мадэрністы падыходзілі да жыцця, прызнаючы ўласцівую яму ірацыянальнасць і непазнавальнасць. У гэтым сэнсе Купала, Гарэцкі, нават Колас у шмат якіх творах звяртаюцца якраз да звышпрыроднага, пазапачуццёвага, "патаемнага", што не дадзена чалавеку ў яго рэальных адчуваннях. Розум інтэлект падспудна адчуваюць перавагу стыхійных сіл жыцця, бесперспектыўнасць спробы падпарадкаваць іх сабе. Рацыянальна-абстрактную думку замяняюць творчыя сполахі, усплёскі фантазіі, велічныя ідэі і сімвалы. Актыўна развіваецца індывідуальны пачатак, пашыраюцца далягляды асобы з уласцівым ёй пачуццём унутранай свабоды. Як паэзія, так і проза ўзбагачаюцца рысамі рэфлексіі, настраёвасці. Разам з тым Купала... не адрываецца ад зямлі, ад рэалізму з яго "здаровым сэнсам", дапаўняючы апошні элементамі падсвядомага, інтуітыўнага, шырока ўводзячы ірацыянальныя моманты ў сваю паэзію. Традыцыі "старога" рэалізму, т.ч., не паміраюць у яго творчасці, таму што ў рэшце рэшт рэалізм і мадэрнізм маюць пільную патрэбу адно ў адным. У гэтым сэнсе вельмі адметны ў зб-ку "Шляхам жыцця" раздзел "Па межах, па родных..." (в. "**Ваўкалак", "Хохлік", "Ў вечным бары**" і інш.)

Мадэрнізм, т.ч., дапамагае перадаць адчуванне неўладкаванасці свету, яго супярэчнасці і няўстойлівасці [8, с. 23–25].

**3 Рамантычныя паэмы 1910–1913 гг., іх мастацкія адметнасці.**

"Купала ў гэты перыяд паўстае як паэт-філосаф, рамантык і сімваліст, творца вялікага мастацкага сінтэзу" [5, с. 175].

Асноватворнай прыкметай рамантызму аўтары папулярных нарысаў "Беларуская літаратура і свет" называюць "тварэнне мастацкага "іншасвету", у якім матэрыялізуюцца мроі, летуценні, сны, дзейнічаюць выключныя (эксклюзіўныя) героі, не абавязкова станоўчыя, якія ўзвышаюцца над натоўпам" [5, с. 176]. Гэта ўпартая і непакорная Бандароўна, бескампрамісны гусляр, крыважэрны Машэка.

З кожным героем звязана аўтарская канцэпцыя, якая датычыцца глабальных, універсальных праблем чалавечага быцця. Так, *Гусляр* (п. "Курган") – не проста 1) змагар з класавай несправядлівасцю… 2) Ён змагаецца за незалежнасць мастацтва і мастака ад волі тырана, дэспатычнай улады і грошай ("Поўны гуслі насыплю дукатаў" – абяцанне князя).

Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сонцу, зорам, арлам толькі роўна…

*Бандароўна*, з аднайменнай паэмы, 1) адстойваючы сваю чалавечую і дзявочую годнасць, становіцца адначасна і 2) змагаром з сацыяльнай несправядлівасцю, будзіць дух барацьбы ў народзе (як вядома, яе бацька Бандарэнка ўзнімае паўстанне супраць пана Патоцкага.) "У аснову пакладзены гістарычны сюжэт. Падзеі, якія згадваюцца ў паэме, адносяцца да 17 ст. Паэт бачыў пільную патрэбу ў героях, якія б паспыталі смак свабоды. Свабодны чалавек <...> ужо не згодны будзе ізноў трапіць пад уціск. Адна з такіх гераінь – Бандароўна, якая ў паэме кідае выклік самому пану Патоцкаму" – зазначае даследчык Ул.Гніламёдаў [8, с. 25].

"У духу неарамантызму (непазнавальнасць жыцця, ірацыянальнасць – Т.Ф.) трансфармуецца Купалам легендарны сюжэт пра крывавага разбойніка Машэку і заснаванне Магілёва. Машэка ў гэтым творы губляе арэол высакароднага змагара за сацыяльную справядлівасць. Ён надзяляецца рысамі ніцшэанскага "звышчалавека", помсціць за здраду сваёй каханай Натальці ўсяму свету. У гэтым творы прадбачацца грамадскія наступствы ідэалогіі ніцшэанства. Купала папярэджвае пра небяспеку культу асобы, самаўзвелічэння. Даводзіць ірацыянальнасць калектыўнай свядомасці: у гонар Машэкі, нібы нацыянальнага героя, насыпаюць пасля яго смерці курган" [5, с. 176]. Машэка, на думку Ул.Гніламёдава, "індывідуаліст, яму цяжка суіснаваць з падобнымі сабе. Купала, будучы прыхільнікам ідэі асабовай свабоды чалавека, рашуча не прымаў індывідуалізму" [8, с. 25].

"Асаблівае месца ў Купалавай творчасці займае паэма «Яна і я» (1913)" [1, с. 147]. Гэта гімн чалавечай працы, каханню і прыгажосці прыроды. Як і "Адвечная песня", паэма пабудавана на звычайным матэрыяле – каляндарнае кола сялянскіх заняткаў, рэдкіх святаў, бясконцых будняў. Але будзённае тут узнята на п'едэстал вечнасці (як і ў "Адвечнай песні"). Толькі намалявана іншымі фарбамі. Атмасферай паэтызацыі утылітарнага (прылад працы, прадметаў штодзённага ўжытку) Купалава паэма вельмі блізкая да "Новай зямлі" Я.Коласа. (Некаторыя даследчыкі бачаць у ёй біблейскія матывы, паралель з Адамам і Евай і іх райскім жыццём). Ад паэмы "патыхае духам сівой мінуўшчыны <...>. Народны паэтычны свет з яго міфалогіяй, антрапамарфізмам, "язычніцкім" здзіўленнем перад невымерным багаццем жыцця прыроды стаў светам паэзіі Купалы" [1, с. 148].

Паэму называюць пастаральным раманам, вытокі якога ў антычнасці (У.Гніламёдаў), паэмай-ідыліяй, "самай сонечнай і язычніцкай з купалавых паэм" [5, с. 176], адзначаюць своеасаблівы русаізм Купалы, зазначаюць, што ў паэме "Яна і я" "Купала здымае адчужанасць чалавека і прыроды" (чым нагадвае і "Новую зямлю" Я.Коласа.

**4 Драматычныя паэмы: праблематыка, мастацкія асаблівасці; драматургія: літаратурныя традыцыі і эстэтычныя вытокі.**

Лічыцца, што **"Адвечнай песняй"** (1908 г.) завяршаецца першы перыяд творчасці Я.Купалы, што ў паэме (*драматычнай паэме, містэрыі*) прадстаўлены тыя ж вобразы, матывы, праблемы, што і ў зб-ку "Жалейка",

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

толькі ўзнятыя на вышыню філасофскага абагульнення, пададзеныя на скрыжаванні рэальна-бытавога плана і ўмоўна-фантастычнага.

"У першым драматычным творы Я.Купалы знаходзім, нароўні з рэальнымі, прыземленымі дэталямі, другі план – сферу адцягненай, напаўмістычнай сімволікі, вобласць не акрэсленага, не вымаўленага да канца. Па сутнасці, новае для Купалы выглядала звыклым, апрабаваным у драматургіі паслядоўных прыхільнікаў сімвалізму – у Ібсэна, Метэрлінка, Стрындберга, Л.Андрэева ("Жыццё чалавека" – Т.Ф.). Іншая рэч, што купалаўскі сімвалізм стаўся адметным, узбагаціўся рысамі беларускай фальклорнай ды літаратурнай традыцыі" [6, с. 20].

Як і яго папярэднік Л.Андрэеў, "Купала паказвае дваістасць чалавечай прыроды, робіць свайго героя – Мужыка – адначасова царом і рабом прыроды. Жыццёвы шлях купалаўскага героя ўяўляе сабой зачараванае **кола**, якое замыкаецца разам са смерцю персанажа. Але ў рускага драматурга «заводзіць» гэтае кола Нехта ў шэрым, персаніфікаваны вобраз аўтарскай міфатворчасці. Купала прыгадвае язычніцкіх Рожаніц, якія прадвызначаюць лёс будучага чалавека. У паэме яны паўстаюць у абліччы «ценяў» – Жыцця, Долі, Бяды, Голаду, Холаду.

Жыццёвае кола, у якім існуе Мужык, **падвойнае**: дзяцінства, маладосць, сталасць, старасць і смерць героя звязаныя з эпізодамі, якія адбываюцца ўвесну, улетку, увосень і ўзімку.

Канцэптуальнае адкрыццё Купалы звязана са спробай **прарыву** падвойнага экзістэнцыйнага кола: у праяве XII «На могілках» Цень Мужыка паўстае з магілы, каб пагледзець, што памянялася ў свеце пасля ягонай смерці. Агледзіны не прыносяць яму палёгкі: дзеці Мужыка цягнуць тую ж лямку цяжкога і вонкава марнага існавання.

Але ў тым, што падвойнае кола замкнулася, няма трагедыі, як няма і смерці, ёсць адвечны ўзаемапераход жыццяі смерці.

Постаць «селяніна худзенькага» ўзбуйняецца, вырастае ў абагульнены вобраз Мужыка, які суіснуе разам з сіламі Сусвету ў касмічнай містэрыі быцця" [7, с. 12].

"У "Адвечнай песні" Купалы планіду Мужыка вызначае не Бог, не ягоны займеннік-сімвал (як у Андрэева, *нехта Шэры*), а тыя самыя цені, што ўвасабляюць містычныя, стыхійныя сілы Сусвету. Дзейства творыцца паводле іхняга сцэнару, вядучыя акторы ў ім – тыя ж самыя Жыццё, Доля, Голад, Холад, Бяда; яшчэ – Вясна, Лета, Восень, Зіма. Такім чынам, разыгрываецца **містэрыя**" [6, с. 28]. (Містэрыя – тайна, таінства; тайныя рэлігійныя абрады ў ст. грэкаў. рымлян, народаў ст.усходу, да удзелу у якіх дапускаліся толькі абраныя). У свой час такое вызначэнне жанру купалаўскай "Адвечнай песні" зрабіў Р.Бярозкін. П.Васючэнка лічыць такое вызначэнне найбольш удалым. І дадае, што "свет "Адвечнай песні" адчыняецца, з аднаго боку, у літаратурную традыцыю сімвалізму, з другога – у сферу паганскай міфалогіі" [6, с. 29]. Зварот да паганскіх вытокаў – звычайная з'ява ў мастацтве сімвалізму.

Многія ў "Адвечнай песні" хацелі бачыць сацыяльную алегорыю, а не містэрыю. Безумоўна, у паэме-містэрыі прысутнічаюць сацыяльныя матывы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

"Але зводзіць да іх усю жыццёвую філасофію твора, значыць збядняць яго" – зазначае П.Васючэнка.

Заключныя словы Цені Мужыка – ёсць вырашэнне глабальнага, адвечнага пытання, якім абцяжарана містэрыя, пытання, пастаўленага ў свой час Шэкспірам: "Быць ці не быць?". Упершыню на гэта звярнуў увагу І.Навуменка. Але вырашаецца яно Купалам па-іншаму: яго героя страшыць не смерць, перад якой усё губляе сэнс, ён баіцца жыцця, ад яго ён гатовы шукаць паратунку ў магіле, у смерці.

На думку І.Багдановіч, "Адвечная песня" Купалы нагадвае хутчэй антычную драму, чым выяўляе падабенства з творам Л.Андрэева".

"**Сон на кургане**" – другая драматычная паэма Купалы, напісаная ў 1910 г. Галоўны герой Твора – Сам. Згодна з даследчыкам П.Васючэнкам, "у гэтым творы назіраем паступовую, пакутлівую трансфармацыю сімвалічнага вобраза: **кола** змяняецца ў **шлях** – [6, с. 57]". Напачатку гэта шлях заблудзіўшага падарожніка, які ніяк не можа патрапіць дахаты. Так яно і будзе датуль, пакуль Сам не ўбачыць прарочы сон, пакуль ягоны ўласны шлях не стане больш асэнсаваным.

"Сам разрывае сувязі з людзьмі і чалавецтвам і ў адзіноце распачынае трансцэндэнтальна-містычнае **падарожжа**, якое адбываецца ў бясконцым сне, насланым русалкамі. Працягваецца канцэптуальная лінія, вынайдзеная Г.Ібсенам у драме «Пер Гюнт» (1867). Містычная вандроўка цэнтральнага персанажа ібсенаўскай п'есы завяршаецца вяртаннем да радзімы і каханай жанчыны, увасобленых у вобразе Сольвейг. Герой купалаўскай паэмы Сам па заканчэнні падарожжа-трызны высвятляе, што яго жанчына памерла; ібсенаўскі матыў вяртання разыгрываецца тут у трагічнай версіі" [7, с. 13].

Асноўныя вобразы-сімвалы "Сну на кургане" – **шлях, скарб (**золата**), курган,** сюды варта дадаць **пажар, вяселле**. Вобразы Сама, Чорнага, відмаў, русалак таксама глыбока сімвалічныя. Так, адносна Сама ёсць некалькі версій: 1)селянін-праўдашукальнік (М.Ярош), 2) рэвалюцыянер (у ягоных руках сякера – "зброя" бунтаўніка), 3) Сам – Купала (М.Арочка).

Найперш, **Сам** не звычайны селянін, які шукае грошы, не рэалістычна-бытавы вобраз, а персанаж рамантычнага абагульнення, герой, які ўвасабляе рысы рэвалюцыянера – шукальніка свабоды для народа. Ад летаргічнага сну яго абудзіў покліч гісторыі... Сам шукае скарб, тым самым намерваецца ашчаслівіць людзей. Бляск золата слепіць яму вочы (бо гэта зманлівае святло) і таму ён не заўважае Чорнага. Наўрад ці такі скарб можа прынесці шчасце, ён хутчэй "скурганіць" душу. Гэта адно з выпрабаванняў Сама, якое ён праходзіць дастойна. Наступнае яго выпрабаванне (пастка) – ва ўнутранай барацьбе дабра і зла ў чалавечай душы. Адзінота плённая тады, калі чалавек не хавае сам ад сябе сваіх прытоеных, разбуральных намераў. Калі ж ён такія намеры выдае за агульную карысць і пры гэтым падкрэслівае сваю выключнасць, то гэта шлях да ілжэпрароцтва, фарысейства, звышчалавека, бязбожніцтва. Гэтая пагроза для Сама ў творы выразна акрэсленая – ён у запале, з горыччу кажа пра нікчэмнасць усіх астатніх людзей. Плённы шлях

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

для чалавечае індывідуальнасці – вылучыцца з натоўпу, а не ўзняцца над ім [6, с. 70–72].

Кульмінацыйным момантам “Сну на кургане” даследчык П.Васючэнка лічыць фінальную мізансцэну, калі пасярод п’янага тлуму двое мужчын паведамляюць пра кабету, што змерзла пад вокнамі шынкоўні. У кабеце Сам і Стражнік пазнаюць адпаведна жонку і маці. Азарэнне й працверазенне Сама і Стражніка – ёсць паварот да занядбанай, закінутай Бацькаўшчыны... Азарэнне Сама ў фінале – сапраўднае абуджэнне, вяртанне да згадкі пра сям’ю, хату, вёску. “Але гэта не зварот у замкнёнае кола, бо Сам вярнуўся з вялікім духоўным досведам, з думкаю пра Бацькаўшчыну. Ён ужо ўсведамляе, што багацце (скарб), улада, здабытая праз гвалт, кроў і рэзрух (пажар), не дадуць жаданае волі і долі народу. Праўдзівы ж скарб народа – яго духоўная спадчына: гісторыя, мова, культура, звычай, памяць, што перадаюцца “ад прадзедаў”. Сам таксама ведае пра перашкоды на шляху самаўдасканалення – пра небяспеку халоднай адчужанасці ад людзей і пра спакусу бяздумнага зліцця з масай (ачмурэнне)” [6, с. 82– 83].

Уласна драматургічных твораў у Я.Купалы *чатыры*: камедыя “Паўлінка”, сцэнічны жарт “Прымакі”, драма “Раскіданае гняздо” і трагікамедыя “Тутэйшыя”.

П’еса “**Паўлінка**” (напіс. у 1912 г.) была пастаўлена ўжо ў 1913 г. спачатку Першым беларускім таварыствам у Вільні, пасля ў драматычным гуртку беларускіх студэнтаў у Пецярбургу.

Сюжэт яе традыцыйны, архетыповы (еўрапейская антычная ды сярэднявечная культура, навелы Бакачыо, шэкспіраўскія камедыі ды трагедыі (“Рамэо і Джульета”); у беларускай традыцыі – “Пінская шляхта” В.Дуніна-Марцінкевіча). Жанр даследчыкі вызначалі, як “бытавая камедыя” (А.Навіна), “невялікая комедыйка” (І.Замоцін); П.Васючэнка зазначае, што ў *завязцы* “Паўлінкі” Купала ідзе ў рэчышчы знаёмага сюжэта, але нечакана збочвае, таму *фінал* нечаканы (разыходзіцца з канонам бытавой камедыі, які прапаноўвае ў якасці развязкі *вяселле*); Купала, т.ч. прапаноўвае якуюсьці *няпэўнасць*. Што да *праблем* п’есы, то можна вылучыць такія, як 1)канфлікт пакаленняў, 2)высмейванне пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці засцянковай шляхты, 3)шлях Маладой Беларусі (тычыцца 2-га плана п’есы).

*Вобразы*: **Паўлінка** – рашучая, упартая, але не супраціўніца патрыярхальнаму сялянскаму звычаю і ладу жыцця; адважваецца на ўцёкі з бацькоўскага дому не з “ідэйных перакананняў”, а таму, што “*татка і мамка праз дзверы не пускаюць*”; не падзяляе бацькоўскага погляду на шляхецтва; увасабляе Маладую Беларусь (2-гі план п’есы).

**Якім** – шчыра кахае Паўлінку і прапаноўвае ёй кампраміс: *абвянчацца – і ў ногі да бацькоў*; вясковы ітэлігент, перакананы гуманіст хрысціянскага кшталту; у ім ёсць глыбінная, унутраная шляхетнасць, не пацверджаная паперамі, разуменню Крыніцкага недаступная; даследчыкі адзначаюць унутранае падабенства Якіма і Купалы; ціхмяны, інтэлігентны Якім становіцца палымяным рэвалюцыянерам: адзіны доказ гэтага – “Песня пра Сокала” М.Горкага, уведзена ў 1927 г. *на сцэне*, а не ў *тэксце* п’есы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Сцяпан Крыніцкі –** прадстаўнік "шарачковай" шляхты, для якой гонар шляхецтва вышэй за колькасць валокаў зямлі (*мае тры валокі ворнай зямлі, сярэдні для вясковай сям'і дастатак*); па-свойму любіць і жонку, і адзіную дачушку; адно іграе ролю хатняга дэспата; мае прыроджаную *зацятасць*; крыху *жмінда*; хоча мець за зяця шляхціца Адольфа Быкоўскага; дрэнна ставіцца да настаўніка Якіма Сарокі *(перамена ў адносінах адбылася пасля таго, як Якім і Паўлінка пакахалі адно аднаго*); заляцанні Якіма да Паўлінкі лічыць "*няўдзячным вераломствам*".

**Адольф Быкоўскі –** самы пацешны персанаж: гэта смех неадпаведнасці паміж невымернымі прэтэнзіямі ды мізэрнымі магчымасцямі; у фінале пакараны куды больш жорстка, чым таго заслугоўваў; зносіць кпіны Паўлінкі, бо *закаханы* ў яе; іронія ў адносінах Купалы да Быкоўскага ёсць пэўным чынам *самаіронія*.

Камедыйнае і драматычнае ў п'есе: камедыйнае пранізвае наскрозь увесь твор (гэта паводзіны і мова герояў, жарты і кпіны, дасціпны гумар, танцы і прыпеўкі)...; драматычнае выяўляецца ў праяўленні таго несвядомага зла, якое да часу "дрэмле" ў глыбінях душы чалавека.

Даследчык П.Васючэнка вылучае ў п'есе "Паўлінка" *другі план*. Так, Паўлінка ўвасабляе Маладую Беларусь. Аднак маладосць Паўлінкі даследчык атаясамлівае не толькі з маладым насельніцтвам Беларусі, але і з новымі, *адраджэнскімі* ідэямі... Самастойнасць Паўлінкі – гэта мара пра незалежнасць Беларусі, яе пачэсны "пасад між народамі". Але Паўлінчына вяселле не можа адбыцца без бласлаўлення бацькоў: Маладая Беларусь не абыдзецца без Старой, без спрадвечнага гістарычнага дому [6, с. 103].

П'еса **"Раскіданае гняздо"** (1913 г.) – "твор рэалістычны, тым не менш ён нясе на сабе прыкметныя адзнакі рамантычнай выключнасці, сімвалісцкай умоўнасці" [3, с. 143]. Жанр п'есы сам Купала вызначыў як "драма". Аднак некаторыя з даследчыкаў знаходзяць у творы рысы трагедыі. П.Васючэнка, падагуліўшы вопыт даследчыкаў, адносна выказаўся наступным чынам: "У першым акце – трагедыя, у чатырох астатніх – драма; такая складаная жанравая прырода купалаўскага твора" [6, с. 122].

*Праблематыка п'есы:* цэнтральнай філасофскай праблемай драмы "Раскіданае гняздо" з'яўляецца праблема шчасця; асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Я. Купала паказаў у творы шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны, зямлі і волі; твор вызначаецца самай запаветнай ідэяй жыцця песняра – ідэяй нацыянальнага вызвалення і адраджэння, якую ён рэалізоўваў і ў паэзіі, і ў драматургіі, і ў публіцыстыцы.

"Кожны з герояў твора – Лявон Зяблік, Сымон, Зоська, Марыля, Данілка – цярэбіць свой шлях да ісціны: у прыватнасці, Зоська і Сымон выпраўляюцца на «Вялікі сход, па Бацькаўшчыну». Шлях Марылі – жабраванне, Лёс Данілкі – служэнне мастацтву. Кожны з варыянтаў выбару не аспрэчваецца і не закрэсліваецца Купалам. Варыябельнасць, магчымасць выбару, няпэўнасць – рысы сімвалісцкага стылю, у рэчышчы якога створаная драма" [5, с. 177].

**Лявон** – адметны тым, што адчувае не толькі сваю *знітаванасць* з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зямлёй, але і *адчужанасць* ад яе (*1)"Чалавек з зямлёй зрастаецца, як гэта дрэва: ссячы дрэўца – засохне, адбяры ў чалавека зямлю – згіне". 2) "Зямля гоніць тых ад сябе, што з веку ў век свенцяць яе сваёй крывёй гарачай і потам салоным! І за што?"*); Лявону не хапіла жыццёвай сілы ды розуму, каб знайсці праўду ў жыцці; яго сыход з жыцця – кароткі тупіковы шлях; такі выбар нельга ўхваліць.

**Сымон** – бунтар, падзвіжнік, правадыр; паяднаны з вобразам Сама: абодва шукаюць волю і долю не толькі для сябе, а і для сваіх блізкіх; рашучы, імпульсіўны, аднак яму не хапае адчування свае людскоe адметнасці, непаўторнасці, умення жыць сваім розумам (па словах Зоські, яму "*не дадзена крылле*"); сувязь з зямлёю ў яго моцная, як і ў бацькі, таму, калі яна рвецца, ён гатовы нават на забойства, чаго і сам пужаецца (*"Без зямлі, без свае хаты чалавек, што шалёны сабака...*"). Менавіта ў такім стане ён падпальвае панскі маёнтак, помсціць (не ўсвядомлены ўчынак); на Вялікі Сход, яго вядзе чужая, мацнейшая воля. У драме гэта *адзін з варыянтаў* пошуку, але *не адзіны*.

**Зоська** – ідзе тым жа шляхам, што і Сымон, хаця мала падобная на яго; але прыйшла да яго праз сны, праз напаўмістычныя азарэнні, а не дзякуючы Незнаёмаму; яе лятункі і мроі прасякнуты рэлігійна-містычнымі матывамі (хрысціянскімі і дахрысціянскімі); ідучы ў адным з братам кірунку, яна ідзе сваім адметным шляхам (*"Не кажы, браток, што я тапчу тое, што ты сееш. Хто ведае – можа, ты горай сваёй гордасцю топчаш тое, што сею я сваім сэрцам дзявоцкім? Хто ведае?"*).

**Марыля** – носьбіт такіх хрысціянскіх якасцяў, як набожнасць, міласэрнасць, ахвярнасць; не пачынае ніякай справы без імя Бога ў вуснах; імкнецца перадаць Сымону часцінку свае веры, веры ў тое, што зацвітуць на душы светлыя краскі спакою ў той час, як зацвітуць яны на магіле бацькі; раней у яе характары бачылі толькі рысы цярплівасці, пакорлівасці лёсу, нават забітасці.

**Данілка** – найменш залежны ад чужых уплываў; неардынарны, не падобны да іншых, адораны душой і сэрцам, розумам, праніклівы; успрымаецца як дурнаваты, блазан; яму выгадна быць такім, бо з яго меншы спрос (*"Няхай сабе кажуць, што я дурнаваты... Але я ўсё бачу і ўсё разумею. Не хачу толькі наверх вылазіць з сваім розумам, бо з ім цяпрашнім светам далёка не зойдзеш"*); для яго важная не канчатковая мэта шляху, а *сам шлях*, магчымасць убачыць вялікі свет і ўдосталь награцца на новай скрыпачцы; яго шлях – шлях музыкі, адметнага, зразумелага далёка не для ўсіх творцы; па натуры касмапаліт (грамадзянін свету).

**Старац** – носьбіт талерантнасці, цярпімасці да розных поглядаў, шляхоў, варыянтаў выбару (*"Цэлы свет – хата мая, усе людзі – радня мая, уся зямелька – поле маё роднае".*).

**Незнаёмы** – толькі вястун ("*Я нікога, маці, не ваблю! Я толькі кліч клікаю і разношу гэтую весць усім чыста ад хаты да хаты*").

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Паніч** – ліха, увасобленае ў чалавеку; яго асуджаюць за ліха / няшчасце, якое ён прычыніў сям'і Зяблікаў, а не за прыналежнасць да пэўнага класа.

**Вобразы-сімвалы** – **Шлях** (адвечны шлях Бацькаўшчыны); **Вялікі Сход** (мажлівае месца, дзе спраўдзіцца пошук героямі свае долі, свае Бацькаўшчыны; **Цмок-упыр** (увасабленне метафізічнага, суцэльнага ліха; існуе па-за межамі сцэнічнага дзеяння); тапор (сякера), вянок, скрыпка; **Вобраз жабрацтва** (шматзначны: 1) прыніжэнне, бясхацце, беззямелле, нястача, 2) разняволенасць, выратаванне ад страху страціць сваё жытло, працу, кавалак хлеба). У свеце купалаўскіх твораў жабрацтва трансфармуецца ў "*паязджанства*" – стан, у якім людзі губляюць здольнасць да выбару, робяцца пакорлівымі й вечнымі нявольнікамі шляху, няздольнымі ўжо зарыентавацца ў гістарычнай прасторы, знайсці сябе ў шматнацыянальным чалавечым космасе ("Паязджане"). Паязджанаства – верагодны, але не абавязковы вынік вандроўкі для Марылі і дзяцей [6, с. ?–?].

Трагікамедыя **"Тутэйшыя"** (1922 г.). Доўгі час была пад забаронай, пачынаючы 1927 г. усе зборы твораў Купалы друкаваліся без гэтай п'есы.

"У «Тутэйшых» падагульняецца досвед смутных дзён у гісторыі Беларусі, калі змяняліся ўлады, сцягі, рэжымы, войскі, а менчукі заставаліся ўсё тымі ж, інертнымі і як быццам абыякавымі да свайго лёсу. Галоўны «тутэйшы», Мікіта Зносак, які марыць стаць асэсарам пры любой уладзе, вучыць нямецкую мову за нямецкай акупацыяй, апранае фуражку з белым арлом за палякамі, махае чырвонай анучай падчас наступу Саветаў, спекулюе, прамышляе, падрабляе, хаўрусуе з рознай набрыддзю – і ў выніку ўсё ж прайграе змаганне за дабрабыт і жыццё. Купала паказвае віну і бяду «тутэйшага», сутнасць якіх – не адчуваць сябе беларусам і не называцца ім. «Тутэйшасць», якая, безумоўна, ёсць сацыяльнай хваробай, расшыфроўваецца як сіндром нацыянальнага імунадыфіцыту, свайго кшталту нацыянальны СНІД.<> Янка Здольнік, Ганулля, Спічыні, Наста Пабягунская ды іншыя персанажы трагікамедыі ў той альбо іншай ступені надзеленыя сімптомамі гэтай хваробы, нягледзячы на сваю становучасць альбо адмоўнасць" [5, с. 179].

У ідэйна-мастацкім плане "Тутэйшыя", на думку І.Навуменкі, гэта "роздум аб шляхах-пуцявінах роднага народа, аб яго будучыні" [3, с. 164].

*Час дзеяння* ў творы: люты 1918 – чэрвень 1920 гг. Згадваюцца такія падзеі гісторыі, як разгон Першага Усебеларускага кангрэса, утварэнне БНР, нямецкая і польская акупацыі, прыход бальшавікоў, прыезд Чарвякова… *Месца дзеяння* – кватэра Мікіты Зносака, Катэдральны пляц (Брахалка) у Мінску, увесь Мінск пач. 20-х гадоў. А ў дыялогу паміж Усходнім і Заходнім вучонымі і Здольнікам паняцце дома, гаспадаркі разрастаецца да межаў усяе Беларусі; апошняя ўяўляецца ўжо на мапе Еўразіі, усяго свету. Беларусь пераймяноўваецца то ў "Русский Северо-Западный край", то ў "Польскія Крэсы Всходнія"… Усе геаграфічныя аб'екты так ці іначай размяшчаюцца ўздоўж аднае выразнае лініі: *Усход – Захад* (узгадаць інш. пісьменнікаў).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Жанравая адметнасць*: “трагічна-смяшлівыя сцэнкі” (Я.Купала), трагікамедыя (жанр абавязвае шукаць ахвяру (смешную і няшчасную); ахвяра звычайна выяўляецца ў фінале, дзе мусіць адбыцца катастрофа; п’еса завяршаецца бядою Зносака: яго выводзяць з хаты пад рулямі стрэльбаў пад галашэнне маткі).

*Праблематыка п’есы* – выкрыццё нацыянальнага нігілізму і рэнегацтва (адступніцтва, здрадніцтва), польскага і рускага шавінізму; выкрыццё “тутэйшасці”.

*Вобразы*: **Мікіта Зносак** – смешны чалавек, мітуслівы абывацель, чапляецца за жыццё, за сваё эфемернае “асэсарства”, каб неяк ацалець, захавацца ў віхуры сацыяльных зрухаў; Мікіту “карае” не чырвонаармейскі патруль, не рэўтрыбунал або ЧК, а неўтаймоўная стыхія (“завіруха”, “паводка”), што абрынулася на маленькага чалавека ўсім сваім цяжарам; Мікіта – “яблычак”, што адарваўся ад роднае галінкі і <...> заблукаў у гісторыі; яго лёс – не вярнуцца.

**Янка Здольнік** – духоўны спадкаемца вясковага інтэлігента Якіма Сарокі; Купала даверыў яму некаторыя запаветныя свае думкі – *будаваць незалежную Беларусь*; свае тэзы пракламуе *па-бальшавіцку просталінейна*; пачуваецца ў Менску дыскамфортна, з’язджае ў вёску.

**Аленка** – вучаніца Янкі Здольніка; потым яго калега, а пазней і жонка; увасабляе (разам з Янкам) Маладую Беларусь, якая ідзе сваім нязведаным ды драматычным шляхам.

**Усходні** і **Заходні вучоныя** – ні акупацыя, ні інш. перашкоды не замінаюць ім пранікаць на сцэну, у Мікітаву кватэру, дзе яны пачуваюцца, *як у сябе дома*; дэфармацыя нацыянальных пачуццяў у вучоных заходзіць так далёка, што, абалваненыя самі, яны пачынаюць абалваньваць іншых.

**Гер Спічыні** – “настаўнік” Мікіты, вучыць яго нямецкай і польскай мовам, аратарскаму мастацтву; майстар “**ад**беларушваць”.

**Вобразы-сімвалы** – **Дом** (1)вобраз усяго “забранага краю”, 2) “калідору” па якім праносяцца гістарычныя скразнякі з Захаду і з Усходу); ***Шлях*** (трансфармаваўся у калідор паміж Усходам і Захадам, у фінале абарочваецца тупіком (небыццём) для Зносака і няпэўнасцю – для астатніх); ***Вяселле*** (адкладваецца, пакуль апошняга акупанта не вывезуць з роднай зямлі); ***Вёска*** (уцёкі ў яе Янкі і Аленкі сімвалізуе “ўнутраную эміграцыю” інтэлігенцыі); ***Кола*** (звужваецца і над героямі п’есы, і над яе аўтарам: Купала не напіша больш ніводнага драматургічнага твора).

“**Тутэйшасць**” – на яе хварэюць **усе** “станоўчыя” і “адмоўныя” персанажы п’есы; у кожным з персанажаў хвароба развілася неаднолькава; віна “тутэйшых” не ў тым, што яны “кепскія”, “ліхія”, “баязлівыя”; бяда ў тым, што “тутэйшыя” *заблукалі* ў гістарычным часе, гэтаксама як “паязджане” ў прасторы.

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989. – С. 351–363.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 121–175.

**Дадатковая**

4 Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – С. 150–170, 194–203.

5 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Асоба і творчасць Янкі Купалы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына // Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 172–181.

6 Васючэнка, П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П.Васючэнка. – Мінск, 1994.

7 Васючэнка, П.В. “А проста я тутэйшы чалавек!” (Трагікамедыя “Тутэйшыя” Янкі Купалы) / Пятро Васючэнка // Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы. – Мінск : Галіяфы, 2009. – С. 89–102.

8 Гніламёдаў, У. Прарок нацыянальнага адраджэння / У. Гніламёдаў // Купала, Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Т.1. Вершы, пераклады 1904–1907. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1995. – С. 7–46.

9 Жук, І. Прыхінуцца да крыніцы / І.Жук. – Гродна: ГрДУ імя Я.Купалы, 2017. – 235 с.

10 Максімовіч, В.А. Эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры пачатку XX ст.: Дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ / В.Максімовіч. – Мінск, 2000. – С. 70–113, 114–144.

11 Каваленка, В. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць / В.Каваленка. – Мінск, 1975.

12 Рагойша В. Бацька нацыі / В.Рагойша // Полымя. – 1992. – № 6.

13 Сабуць, А. “Жыў беларус – ў будзе жыць” Купалавым шляхам жыцця / А.Сабуць // Роднае слова. – 2019. – № 3. – С. 12–13.

14 Санюк, Зм. Харызматычны статус творчасці Янкі Купалы / Зміцер Санюк // Роднае слова. – 2000. – № 1.

**Электронныя рэсурсы**

15 Купала, Я. Творы / Я.Купала // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Janka_Kupala/

16 Купала, Я. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/yanka.kupala

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.5 ЯКУБ КОЛАС (1882 – 1956)

1 Біяграфія, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.
2 Лірыка Я.Коласа: асноўны пафас, этапы развіцця, мастацкія асаблівасці.
3 Паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”: творчая гісторыя, характар аўтабіяграфізму, праблематыка, ідэйны змест.
4 Проза Я.Коласа: жыццёвыя і літаратурна-фальклорныя вытокі, эвалюцыя Коласа-празаіка; Трылогія “На ростанях”.

*“У сусветную літаратуру Якуб Колас увайшоў як “беларускі Гамер”, стваральнік нацыянальнай «Іліяды» і «Адысеі» – менавіта такія аналогіі напрошваюцца пры думцы аб ягоных «Новай зямлі» і «Сымоне-музыку». Тут няма ніякага перабольшвання. Імя Якуба Коласа, аднаго з буйнейшых песняроў сялянства, стваральніка вобразаў маляўнічых беларускіх краявідаў, самабытнага філосафа, надзвычай натуральна глядзіцца ў шэрагу імёнаў класікаў сусветнай літаратуры” [4, с. 181].*

### 1 Біяграфія, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Якуб Колас – народны паэт Беларусі (1926), класік беларускай літаратуры. Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 3 лістапада 1882 г. | **Якуб Колас (**Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся ў засценку Акінчыцы Мінскага павета Мінскай губерні (цяпер у межах г. Стоўбцы Мінскай вобласці). |
| 2 | 1892-1894 гг. | разам са старэйшымі братамі вучыўся дома, у “дарэктара”, потым скончыў народнае вучылішча ў Мікалаеўшчыне. |
| 3 | 1898 –1902 гг. | вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (паступіў “на казённы кошт”). |
| 4 | 1902–1905 гг. | як настаўнік працаваў на Палессі ў вёсках Люсіна (цяпер Ганцавіцкі раён), Пінкавічы (цяпер Пінскі раён). |
| 5 | 9–10 ліпеня 1906 г. | ўдзельнічаў у нелегальным настаўніцкім з'ездзе, які адбыўся ў вёсцы Мікалаеўшчына; з'езд разагнала паліцыя, К. Міцкевіч у ліку іншых быў пазбаўлены права працаваць настаўнікам. |
| 6 | 1 верасня 1906 г. | у газеце “Наша доля” надрукаваны першы твор паэта – верш “Наш родны край”, падпісаны псеўданімам Якуб Колас. |
| 7 | 15 верасня 1906 г. | у “Нашай долі” пад псеўданімам Дзядзька Карусь змешчана апавяданне “Слабода” – першы надрукаваны празаічны твор пісьменніка; пачынае актыўна супрацоўнічаць у якасці аўтара з газетай “Наша ніва”. |
| 8 | Зіму 1906–1907 гг. | жыў у родных у леснічоўцы Смалярня, дзе без афіцыйнага дазволу адкрыў прыватную школу; складаў навучальны дапаможнік “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”. |
| 9 | 1907 г. | некалькі тыдняў працаваў загадчыкам літаратурнага аддзела ў “Нашай ніве”, але паводле загаду паліцыі быў вымушаны пакінуць горад. |
| 10 | 1908 г. | некаторы час выкладаў у прыватнай школе ў вёсцы Сані (цяпер Талачынскі раён); засуджаны на 3 гады турэмнага зняволення, тэрмін пакарання адбыў у Мінскім астрозе. |
| 11 | 1910-я гг. | пачынае працу над ліра-эпічнымі паэмамі “Новая зямля” і “Сымон-музыка”. |
| 12 | 1909 г. | У Санкт-Пецярбургу ў выдавецтве “Загляне сонца і ў наша аконца” выйшла кніга “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”. |
| 13 | 1910 г. | у Вільні надрукаваны першы зборнік вершаў “Песні жальбы”. |
| 14 | 1911 г. па 1914 г. | пасля турмы Колас займаўся настаўніцкай працай: у мястэчку Лунінец, у 1912–1914 гг. пасля атрымання пасведчання аб дабранадзейнасці – у в. Купяцічы недалёка ад Пінска, потым у Пінскім 3-ім прыходскім вучылішчы. |
| 15 | 1913 г. | узяў шлюб з настаўніцай пінскай чыгуначнай школы Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, мелі трох сыноў. |
| 14 | 1912 г. | у Вільні выходзіць зборнік “Апавяданні”. |
| | 1913 г. | у Пецярбургу асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні “Нёманаў дар”, “Тоўстае палена”, зборнік вершаваных апавяданняў “Прапаў чалавек”. |
| 15 | 1915 г. | падчас Першай сусветнай вайны разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню, дзе быў мабілізаваны на вайсковую службу. |
| 16 | 1916 г. | закончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча ў Маскве, служыў у запасным палку ў г. Пермі. |
| 17 | Летам 1917 г. | у званні падпаручніка накіраваны на Румынскі фронт, але ў хуткім часе ў сувязі з хваробай атрымаў адпачынак і паехаў да сям'і ў |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | | горад Абаянь (цяпер Курская вобласць Расіі); як настаўнік быў вызвалены ад вайсковай службы і працаваў выкладчыкам, школьным інструктарам у г. Абаяні і яго наваколлі. |
| 18 | 1921 г. | па выкліку ўрада Савецкай Беларусі вярнуўся ў Мінск; працаваў на розных пасадах, у тым ліку выкладчыцкіх (у Белпедтэхнікуме, на настаўніцкіх педагагічных курсах у Слуцку, у БДУ). |
| 19 | 1921 г. | у Коўне выйшаў зборнік апавяданняў “Казкі жыцця” (працу над цыклам аўтар працягваў і надалей). |
| 20 | 1922 г. | у Мінску выйшаў зборнік вершаў “Водгулле”. |
| | 1923 г. | у Мінску асобным выданнем выйшла паэма “Новая зямля”. |
| 21 | 1925 г. | у часопісе “Полымя” апублікавана трэцяя рэдакцыя паэмы “Сымон-музыка”. |
| 22 | Вільня, 1923 г. | выдае 1-ю палескую аповесць “У палескай глушы”. |
| 23 | Мінск, 1927 г. | выдае 2-ю палескую аповесць “У глыбі Палесся”;<br>пазней увайшлі як 1-я і 2-я часткі ў трылогію “На ростанях” |
| 24 | 1926 г. | выдадзена аповесць “На прасторах жыцця”, прысвечаная моладзі 1920-х гг. |
| 25 | 18 кастрычніка 1926 г. | Коласу нададзена званне народнага паэта Беларусі, прызначана пажыццёвая пенсія. |
| 26 | З 1928 г. | – акадэмік Акадэміі навук Беларусі. |
| 27 | з 1929 г. | член Прэзідыума і віцэ-прэзідэнт Акадэміі. |
| 28 | 1941–1944 гг. | паэт жыў пад Масквой у Клязьме, Ташкенце, Маскве. |
| 29 | 1944 г. | удастоены звання заслужанага дзеяча навукі Беларусі; напрыканцы 1944 г. вярнуўся ў Мінск. |
| 30 | з сяр. 1940-х гг. – да 13 жніўня 1956 г. | працаваў у Акадэміі навук Беларусі, быў вядомы як грамадскі дзеяч. |
| 31 | 1954 г. | завершана аповесць “На ростанях”: 3-я, апошняя частка аднайменнай трылогіі. |
| 32 | 1956 г. | пісьменнік напісаў ліст у вышэйшыя партыйныя інстанцыі, у якім выказаў занепакоенасць становішчам беларускай мовы ў грамадскім жыцці, прапанаваў меры па яе абароне. |
| 33 | 13 жніўня 1956 г. | **Якуб Колас** памёр за сваім рабочым сталом; пахаваны ў Мінску на Вайсковых могілках. |

“Асноўны сэнс сваёй творчасці Я.Колас спачатку бачыў у раскрыцці чалавечага “я” селяніна-працаўніка, у сцвярджэнні яго чалавечай годнасці, духоўнай, маральнай вартасці” [1, с. 213–214]. Аб гэтым яго дакастрычніцкая лірыка, проза, таксама паэмы. Але не толькі. “У лірыку яго шырока ўваходзілі думкі і перажыванні паэта як народнага інтэлігента, грамадскага дзеяча, чалавека арыгінальнай натуры. Асобнае месца ў дакастрычніцкай прозе Я.Коласа занялі казкі жыцця. Спецыфічна коласаўскі жанр, дзе героем была апаэтызаваная прырода і сама асэнсавальная думка пісьменніка – пошукі ім адказаў на адвечныя пытанні быцця, казка жыцця... стала таксама формай найбольш абстрагаванага выяўлення канцэптуальна-філасофскага разумення жыцця і чалавека... Канкрэтным іх выяўленнем сталі паэмы “Новая зямля”, “Сымон-музыка” – творы аб людскіх пуцінах у жыцці, аб лёсе народа, аб мастацтве як з’яве” [1, с. 214]. Пра што б ні пісаў творца, свет ён вымяраў народнымі меркамі: душой, сфарміраванай у сялянскай хаце, характарам, унаследаваным ад продкаў. Я.Колас выдатна ўсведамляў і асэнсоўваў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыроду свайго таленту, вытокі творчасці, пра што сведчыць уступ да “Сымона-музыкі”.

А.Адамовіч у кнізе “Шлях да майстэрства” адзначаў, што Колас як творчая індывідуальнасць вызначаецца тым, “што ніводная якасць, рыса яго таленту не засланяе сабой іншыя: ён у аднолькавай ступені лірык і эпік, філосаф і бытапісальнік, рамантык і па-народнаму мудры і практычны чалавек... Стыль гэтага чалавека просты і адначасова шматгранны і складаны...” [цыт.па: 1, с. 216]. Крытык падкрэсліваў, што Коласу ўласціва “надзвычайная цэласнасць светаадчування” [1, с. 217].

Творчасць Я.Коласа даследавалі шматлікія пакаленні літаратуразнаўцаў і крытыкаў. На сённяшні дзень цікавасць да яе не зменшылася. Змяняюцца толькі акцэнты ўспрыняцця спадчыны класіка. Па-ранейшаму праводзяцца Каласавіны. На сучасным этапе развіцця айчыннага літаратуразнаўства да асэнсавання спадчыны Я.Коласа звярталіся І.Навуменка, М.Мушынскі, І.Багдановіч, П.Васючэнка, В.Максімовіч, Т.Шамякіна, З.Сіцька і мн. інш. даследчыкі (гл. Спіс літаратуры ў канцы лекцыі).

**2 Лірыка Я.Коласа: асноўны пафас, этапы развіцця, мастацкія асаблівасці.**

Асноўны пафас вынікаў з агульнай ідэйна-палітычнай накіраванасці творчасці пісьменніка, з яе канцэптуальнай эстэтычнай сутнасці. Вядучыя тэмы (матывы): 1) родны край, 2) гаротнае сялянскае жыццё, 3) паднявольная праца, 4) краса роднай прыроды. Сюды можна дадаць астрожную тэматыку, заклікавыя, гумарыстычныя і сатырычныя вершы, філасофскія матывы (медытатыўная лірыка). У цэнтры лірыкі два лірычныя героі – 1) мужык-селянін і 2) народны інтэлігент. Асноўны тон – журботны, мінорны (“*Не пытайця, не прасеце // Светлых песень у мяне,...*”).

Этапы развіцця можна вызначыць вельмі ўмоўна: раннія вершы, напісаныя пад уплывам рускай паэзіі; раннія беларускія вершы, што ўвайшлі ў зб-к “Песні жальбы” (1910), вершы 1911–1916 гг.

Два асноўныя віды пачуцця ў душы беларуса – смутак, жальбы нядолі і сумная краса – дапаўняюцца гневам і гумарам. Час ад часу ў яго паэтычным маналогу тужлівую песню-скаргу перабіваюць заклікальныя інтанацыі, як у вершы “Беларусам”: “*Ўстаньце, хлопцы, ўстаньце, браткі! // Ўстань, ты, наша старана!*”. А таксама словы праклёну ўсемагчымым ворагам – багачам і панству ў вершы “Ворагам”, верным служкам улады ў вершы “Вобразы самаўладдзя” (гэта “каўняры”, “рылы”). Шматлікасць ворагаў з цягам часу пачынае выклікаць не толькі гнеў і абурэнне, а і здзеклівыя кпіны. Прыкладам такіх адносін да ворагаў служаць вершы “Што, брат Грышка, папраўляйся...”, “Мікалаю ІІ” (1907), “Асадзі назад”, “Канстытуцыя” (1908), “Не дамся” (1909). А ўжо ў вершы “Мужык” (1909) герой адкрыта супрацьпастаўляе сябе ўсім, хто глядзіць на яго звысоку, падкрэсліваючы, што цярпенне яго не бязмежнае.

Колас шукае адказ на пытанне аб вытоках духоўнай моцы беларуса, таму звяртае ўвагу і на вобразы нацыянальнай інтэлігенцыі (да якой належаў і сам),

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

без якой ніякі рух наперад немагчымы. Яго вабіла загадка чалавека з яго багатым унутраным светам, развітым інтэлектам. Так, у вершы “Горкая доля” (1909) ужо прысутнічае вобраз чалавека, “які свядома абраў шлях, што не абяцае яму ні долі, ні шчасця, а толькі пакуты і выпрабаванні” [2, с. 188]: “*Засадзілі ў клетку, // волю адабралі, вобраз чалавечы // Ў гразь яны ўтапталі...*”. Відаць такія думкі не раз наведвалі Коласа ў турме.

“Пачуццё любові да Радзімы ў Коласа было такім моцным і ўсёабдымным, што выцясняла з яго лірыкі тэму кахання, якая, калі і праяўлялася ў вершах паэта, то ў форме вершаванага жарту” ” [2, с. 189]: “*Ці помніш ты, Ганна, // Шчаслівы мамэнт...*”.

“Асобнае месца ў дарэвалюцыйнай лірыцы Коласа займаў “турэмны цыкл”. У ім паэт разважае і над сваім лёсам, і над лёсам сваіх сяброў-арыштантаў” [2, с. 189]. Мова гэтых твораў адкрыта публіцыстычная, без паэтычных метафар і паралелізмаў. Вершы вылучаюцца інтанацыяй смутку. У іх “выказваецца пачуццё стомленасці, якое перажывае чалавек, што зведаў на сабе нягоды і паражэнні, а таксама гучыць вера ў справядлівасць сваёй справы, яе плённасць” [2, с. 189]. Турма ў Коласа да ўсяго школа змагання і гартавання.

На першы план у лірыцы Коласа паступова вылучаецца вобраз чалавека-змагара, грамадскага дзеяча, правадыра нацыі, якая напружана шукае свой шлях у вялікі свет. У вершах з’яўляецца вобраз песняра. Так, у вершы “Песняру” (1910) Колас “выказвае свой погляд на ролю мастацтва ў вызваленчай барацьбе народа” [2, с. 191]. У народнага песняра ёсць высокая місія – абуджаць соннае балота, што “жыццём называем”, прымушаць звінець “усе струны душы”. Паэта непакоіла і будучыня літаратуры, уласнай творчасці. Ці будзе яна прынятая і зразумелая? У вершы “Песня” (1912) якраз і выяўлена трывога аўтара: “*Ці палíешся ты вольна па краі, // Вокліч ці знойдзеш сабе*?”. У заключэнне зазначым, што талент эпіка паступова засланяў Коласа як лірыка...

Зборнік **“Песні-жальбы”** выйшаў у Вільні ў верасні 1910 г., падчас Коласавага знаходжання ў мінскім астрозе. Складаецца ён з 5-ці раздзелаў (“Думкі”, “Родныя вобразы”, “Мужычае жыццё”, “На ростані”, “З турмы”). Зборнік не дае ўяўлення аб усёй дарэвалюцыйнай лірыцы Я.Коласа, бо ў ім няма ні гумару, ні сатыры. Тым не менш гэта яркая старонка ў дарэвалюцыйнай творчасці як самога аўтара, так і ў новай беларускай літаратуры наогул.

“«Песні жальбы» – гэта не толькі назва кнігі, але і *асноўны жанр* пачатку паэтавай творчасці, калі Колас адчуваў уплыў дэмакратычных традыцый Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, А.Гурыновіча. Пры гэтым дэмакратызм, народнасць, гуманізм у вершах паэта былі натуральным выяўленнем яго пачуццяў, а не перайманнем. Колас паэтызаваў беларуса-селяніна, не баючыся міжвольнай ідэалізацыі... Ён дзяліўся з чытачом сваімі ўражаннямі ад жыцця беларуса, памятаючы ўвесь час аб існаванні распаўсюджанага погляду на свайго героя, быццам ён не толькі бедны, але і цёмны, не толькі няшчасны, але і варты пагарды. Колас ледзь не ў кожным сваім вершы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

даводзіў простую думку, што ўмовы існавання селяніна сапраўды жахлівыя, аднак сам верыў : “Наша возьме” – так называецца адзін з яго ранніх вершаў” [2, с.183–184]. Заключныя радкі яго такія: “*Адно мы добра ведаем: // Хоць вечна мы блукаемся, // А ўсё ж такі, хоць некалі, А праўды дапытаемся*”.

## 3 Паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”: творчая гісторыя, характар аўтабіяграфізму, праблематыка, ідэйны змест.

| **“Новая зямля”** | **“Сымон-музыка”** |
|---|---|
| ***творчая гісторыя*** | |
| • Задума напісаць дзве велічныя паэмы ўзнікла ў Коласа ў 1911 г.<br>• “Новую зямлю” ён і пачаў пісаць вясною 1911 г., яшчэ знаходзячыся ў турме.<br>• Да 1917 г. было напісана 11 раздзелаў паэмы.<br>• Закончана яна была ў 1923 г. | • Першы варыянт паэмы выйшаў у 1918 г. асобным выданнем.<br>• Апошняя (трэцяя), кананічная рэдакцыя была закончана ў 1925 г.<br>• Другі варыянт, перапрацаваны Коласам у 1923-1924 гг., быў выкрадзены разам з чамаданам з цягніка, у якім аўтар вяртаўся з адпачынку летам 1924 г. |
| ***аўтабіяграфічная аснова*** | |
| • Прататыпамі герояў паэмы была сям’я Коласа, аўтар нават не змяніў імёнаў.<br>• Аўтабіяграфізм у “Нз” <u>знешні, падзейны</u>. | • ўспрымаецца як своеасаблівы працяг “Новай зямлі”.<br>• Чаму? У “Нз” з дзіцячых вобразаў вылучаецца Костусь, якога хвалюе таямніца быцця, які захапляецца хараством светабудовы.<br>• Паэма, бясспрэчна, аўтабіяграфічная, але характар аўтабіяграфізму тут іншы: не падзейны, а <u>ўнутраны</u>. |
| ***праблематыка*** | |
| • Колас у паэме, на думку М.Мушынскага, узняў “такія глабальныя праблемы, якія па-ранейшаму застаюцца надзённымі”. Гэта – <u>“чалавек і зямля, зямля і Бацькаўшчына, зямля і свабода”</u>. | • Праблема свабоды творчасці, еднасці мастака і народа (сапраўднае мастацтва – нацыянальнае мастацтва), мастака і Бацькаўшчыны. Каханне не ёсць перашкода для творчасці. |
| ***жанравыя асаблівасці*** | |
| • *ліра-эпічная паэма*.<br>• <u>Лірычная</u> плынь прысутнічае ў аўтарскіх адступленнях, у апісаннях пачуццяў Костуся, у пейзажных замалёўках. <u>Эпічнасць</u> прысутнічае ў паказе жыцця сям’і Міхала, яе паўсядзённых клопатах, службе галоўнага героя. | • *ліра-эпічная паэма.*<br>• <u>Лірычная</u> плынь прысутнічае ў аўтарскіх адступленнях. <u>Эпічнасць</u> – у паказе жыцця Сымона ў бацькавай хаце, бадзянне героя па свеце, жыццё ў хаце карчмара, у палацы багатага князя. |
| ***сэнс назвы*** | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | |
|---|---|
| • “Новая зямля” – гэта не столькі кавалак уласнай зямлі, колькі новая Айчына, “зямля абетаваная”, якую спрабавалі і спрабуюць знайсці не толькі беларусы.<br>• Варта ў гэтым кантэксце ўзгадаць славуты твор Гётэ “Фауст”, а таксама Біблію. | |

Ідэя “Новай зямлі”, на думку В.Максімовіча, “гэта не толькі ідэя новага нацыянальнага Дома, а перадусім Дома супольна-зямнога, супольна-касмічнага, – такога, дзе кожны, як герой з купалаўскага “Раскіданага гнязда”, мог бы ўпэўнена заявіць: “Цэлы свет – хата мая, усе людзі – радня мая, уся зямелька – поле маё роднае” [7, с. 274].

Паэма “Сымон-музыка”: Жыццё пасылае Сымону выпрабаванні, прайшоўшы праз якія ён становіцца самабытным музыкам, які ведае цану свайго таленту і ўсведамляе сваё прызначэнне на гэтай зямлі. Герой прыходзіць да разумення ідэалу творчасці як свабоды самавыяўлення (“*Думка ходзіць, дзе захоча*”).

Згодна з Т.Шамякінай, містычнасць кахання Сымона і Ганны – “у архетыпічным паўтарэнні сітуацыі з Арфеем, якому адзінаму з людзей багі дазволілі забраць з пекла падземнага царства сваю каханую Эўрыдзіку і які не здолеў гэта зрабіць. <…> Сымону ўдалося вызваліць з пекла (з пагружанасці ў падсвядомае падчас хваробы) душу Ганны <…>. У такой канцоўцы праявіўся аптымізм паэта, яго вера ў сілу таленту, сілу кахання <…>. У канцы паэмы Сымон адкрывае для сябе сэнс жыцця не ў служэнні народу, а ў каханні. Пра гэта недвухсэнсоўна гаворыць апошняя прытча твора, на якую не звярталі ўвагу даследчыкі, – пра кветку лілею і пташыну-песняра. І гэта не прыніжэнне вобраза Сымона, а наадварот, узвышэнне яго, бо найвышэйшая таямніца быцця – любоў...” [13, с. 41].

**4 Проза Я.Коласа: жыццёвыя і літаратурна-фальклорныя вытокі, эвалюцыя Коласа-празаіка; Трылогія “На ростанях”.**

Дэбютам Я.Коласа ў прозе стала сатырычнае кароткае апавяданне “Слабода”, надрукаванае ў “Нашай долі”. Пазней аўтар змяшчаў іх у “Нашай ніве”, “Лучынцы”, “Веліконднай пісанцы”. Да рэвалюцыі выйшлі 2 кнігі прозы Коласа “Апавяданні” (1912) і “Родныя з’явы” (1914), а таксама асобна ў 1913 г. былі выдадзены апавяданні “Нёманаў дар” і “Тоўстае палена”. Пісаў К.М.Міцкевіч таксама апавяданні для дзяцей, яны ўвайшлі ў кнігу “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”, што выйшла асобнай кнігай у 1909 г. Проза Коласа тады выходзіла пад псеўданімам Тарас Гушча.

Па прозе Коласа быў “выразна відзён шлях беларускай прозы ад этнаграфічна-бытавога апісальніцтва да сацыяльна-бытавой, сацыяльна-аналітычнай прозы; ад фрагментарнасці – да сюжэтнасці...; ад народнай казкі, анекдота, падання – да класічнай навелы; ад замалёвачнасці, эцюднасці – да шырокіх палоцен народнага жыцця; ад імпрэсіі, верша ў прозе – да прозы ўласна псіхалагічнай; ад маралізатарскага, дыдактычнага фабліё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(пераказ анекдатычнай падзеі ў прозе ці вершам – Т.Ф.) – на подступы да прозы філасофскай, прытчавай, ускладнена-шматслойнай” [1, с. 240].

**Колас-празаік**

“Шматгранны талент Коласа вольна і раскавана адчуваў сябе ў эпічных жанрах. Тут ён мог выявіць жыццё беларусаў шырока і поўна. Гэтае асабістае імкненне пісьменніка супадала з аб’ектыўнай патрэбай нацыянальнай літаратуры мець уласны эпас. Беларуская літаратура – адна з самых “сялянскіх” у свеце. Магчыма, ва ўсёй сусветнай літаратуры няма такога героя-мужыка, вобраз якога ўзняты Коласам да сімвалу” [4, с. 185].

“Пачаў Колас з *фальклорна-этнаграфічных* “вершаваных апавяданняў” (“Зяць”, “Паслушная жонка”, “Доктар дапамог”, “Як Янка забагацеў” і інш.), блізкіх сваім настроем да папулярных у беларусаў ананімных “гутарак”, а таксама балад Шылера, Міцкевіча, Някрасава, Сыракомлі, Лучыны, з *гумарыстычных* празаічных “эцюдаў”, “замалёвак”, “думак у дарозе” (“Слабода”, “Сацыяліст”, “Недаступны”). У *сацыяльна-псіхалагічных* апавяданнях “Бунт”, “Нёманаў дар”, “У старых дубах”, “Малады дубок” беларуская рэчаіснасць паказана аўтарам аб’ёмна і глыбока. Тут спалучана “высокае” і “нізкае”, “паэтычнае” і “празаічнае”, “трагічнае” і “камічнае”. Героі гэтых твораў і не дабрадзеі, і не носьбіты заганаў. Яны сцвярджаюць свой гонар і годнасць, выяўляюць мараль і філасофію народа, выпрацаваную і апрабаваную цягам доўгіх стагоддзяў” [4, с. 185].

“*Фальклорны*” этам у творчасці Коласа хутка мінуўся. І нават у першых апавяданнях адчуваўся подых вялікай літаратуры, што выяўлялася ў новых маштабах вымярэння беларускай рэчаіснасці. Вельмі ж прыкметна было аўтарскае жаданне ў форме анекдота або лірычнай імпрэсіі звярнуць увагу астатняга свету на гэтых нібыта “несамавітых” герояў і іх “нецікавае” жыццё. Так сцвярджаліся коласаўскі дэмакратызм, народнасць і гуманізм. З гэтага часу ўвага да так званага маленькага чалавека ў беларускай літаратуры робіцца пастаяннай і нязменнай...

Якуба Коласа з часоў настаўніцтва цікавілі вобразы народнай інтэлігенцыі. Па-мастацку пісьменнік асэнсоўвае гэтую тэму ў сваёй знакамітай трылогіі **“На ростанях”**. Галоўнага героя Андрэя Лабановіча даследчыкі вызначаюць як “сейбіта, які выйшаў на беларускую ніву, каб сеяць у душах людзей новыя ідэі” [4, с. 189]. Але найперш ён павінен быў разабрацца ў сабе, адказаць на пытанне, “дзеля чаго жыве чалавек” (герой ледзь не здзейсніў самагубства). І справа тут не толькі ва ўзросце Лабановіча, але і ў тым, што “маладая нацыя беларусаў сутыкнулася з праблемамі, якія суседнія нацыі ўжо вырашылі” [4, с. 189]. (праблема самавызначэння адна з іх). Праграма дзеяння Лабановіча тыпова “народніцкая”, “асветніцкая”.

Маладога настаўніка ратуе яго душэўнае здароўе, давер да людзей, любоў да роднага краю, захапленне паэзіяй, любоў да Ядвісі. Яго вабяць жыццёвыя прасторы… “Усё, што з ім адбываецца, успрымаецца героем як наканаванне, якое мусіш адолець, каб выйсці на вышэйшы ўзровень маральнага самаўдасканалення” [4, с. 190]. Лабановіч з захапленнем вывучае прыроду Палесся, характары палешукоў, жаночыя тыпы, норавы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“панямонскай інтэлігенцыі”. Жыццё і свет для Лабановіча – раскрытая кніга, якую трэба ўмець чытаць. Развага над экзістэнцыяльнымі праблемамі прыводзіць яго да вываду, што “сэнсам жыцця павінна стаць абуджэнне “забытага Богам” краю ад вечнага сну і адраджэнне ў народзе нацыянальнай самасвядомасці” [4, с. 189]. Гэта праграма яго працы ў школе і ўсюды, куды ён трапляе. Д’ябальскія спакусы (гарэлка, карты, грошы, дабрабыт, таннае каханне, кар’ера) шчасліва адольваюцца Лабановічам, бо ён распазнае ў гэтым “павольнае ўміранне душы”, і “зацягванне балотам”.

“**Казкі жыцця**” Колас пісаў 47 гадоў: першая “У балоце”, напісана ў 1908 г., апошнія (“Як птушкі дуб ратавалі”, “Адзінокі курган”, “Страказа”, “Цвіркун”) – у 1955. Сам пісьменнік лічыў іх адзіным і найбольш значным творам. “Казкі”, што напісаны ў апошні год жыцця пісьменніка даследчыкі лічаць найбольш мастацка дасканалымі. Прычына гэтага – надзённасць закладзеных у іх ідэй” [11, IX, с. 37].

“Не даючы якога-небудзь канкрэтнага, індывідуалізаванага вобраза, казкі жыцця... вырашалі *праблему выяўлення нацыянальнага характару*... У Коласавых казках улоўлена і выяўлена само светаўспрыманне, светаадчуванне народа, яго характар, асаблівасці” [1, с. 255]. Да ўсяго, казкі жыцця – творы глыбокага псіхалагізму.

Пятро Васючэнка называе Коласавы зборнік “Казкі жыцця” адной з самых складаных і “не расшыфраваных крытыкай кніг”, а яе з’яўленне тлумачыць імкненнем аўтара “дайсці да каранёў зямнога быцця, пранікнуць як глыбей у зямную трансцэндэнцыю”. “Відавочная **жанравая унікальнасць** гэтай кнігі, у якой *дзейнымі асобамі з’яўляюцца прыродныя стыхіі, праявы, рэчы, звяры, птушкі*. Пры гэтым прыродныя вобразы не падлягаюць алегарычнаму расчытанню, не ўяўляюцца персаніфікаванымі адбіткамі праяў сацыяльнага жыцця або псіхалогіі чалавека. Вядома, *змест «Казак жыцця» можна экстрапаляваць на сацыяльную праблематыку*, але варта ўлічваць тое, што дамінанта твора – анталагічны пошук, пранікненне ў таямніцы быцця.

<u>Большасць сюжэтаў гэтай кнігі маюць не проста іншасказальны, але – полісемічны, сімвалічны, мясцінамі падкрэслена цьмяны, нават містычна-ірацыянальны змест.</u>

Унікальнасць твора і ў тым, што ягоныя вобразы часам удаюць з сябе алегорыю, змяшчаюць намёк на прысутнасць кода, які нібыта можна адназначна расшыфраваць. *Але ў большасці выпадкаў гісторыі з жыцця дрэваў, жывёлаў, прыродных аб’ектаў і з’яваў унікаюць адназначнай расшыфроўцы, не паддаюцца спробам прымяніць гэтую трактоўку проста да чалавечага або сацыяльнага жыцця*. Бо коласаўскія вобразы тут не з’яўляюцца звыклай персаніфікацыяй або адухаўленнем. Яны ўбіраюць у сябе таямніцы самой прыроды, яе прыхаваную трансцэндэнцыю, і таму могуць трактавацца толькі ў дачыненні да гэтай прыхаванай субстанцыі” [5, с. 24–25].

“Зачараванасць пакрыёмнымі з’явамі прыроднага існавання збліжае «Казкі жыцця» з такімі раннімі творамі Максіма Гарэцкага, як апавяданне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Роднае карэнне», абразкі «Патаёмнае», «Стогны душы», «Страхаццё», «Што яно?». Сугучныя па настроі некаторыя імпрэсіі Змітрака Бядулі («Загадка», «Ці я вінават?..»), асобныя алегорыі Ядвігіна Ш. («Дуб-дзядуля», «Бярозка»).

Колас і ягоны нябачны апавядальнік вучыць не палохацца «страхаў жыцця», а ўмець суадносіць іх з той таямнічасцю, якая ёсць адвечнай і неадменнай уласцівасцю зямной трансцэндэнцыі. <...>

Ірацыянальнасць зямнога існавання прыводзіць да нечаканых, вонкава не матываваных падзеяў. Ратавалі птушкі дуб, выконвалі парады вучонага Крумкача, а Дубу ад таго рабілася ўсё горш і горш («Як птушкі дуб ратавалі»).

Жолуд з казкі «Зло – не заўсёды зло» выратоўваецца, ідучы насуперак бацькоўскім парадам, а прагная Свіння, зноў жа, насуперак логіцы, робіць яму не шкоду, а карысць.

У пошуку адказу на пытанне, чаму адбываецца так, а не інакш, заўжды прысутнічае нейкая недамоўленасць. Версіі, якія прапаноўвае апавядальнік, найчасцей варыябельныя, з альтэрнатывамі. У высновах няма канчатковасці” [5, с. 26].

Мова казак: “Алегарычныя апавяданні вызначаюцца выключна простай і стройнай кампазіцыяй, лагічнай суладнасцю частак і кампанентаў, дакладнасцю і выразнасцю мовы. Стыхія народнай мовы, фразеалогіі, першароднасць і своеасаблівасць ужывання лексікі, сінтэтычных канструкцый – усё гэта дапамагае пісьменніку перадаць дух свайго часу, яго асаблівасці.

Перад Я.Коласам як мастаком стаяла надзвычай цяжкая задача: у алегарычных (іншасказальных – Т.Ф.) вобразах разнастайных птушак, казюлек, красак, дрэў і г.д. паказаць грамадскае жыццё, узаемадачыненні людзей, іх маральныя, этычныя і філасофскія погляды. Трэба было, каб простая, зразумелая карціна значыла больш, чым у ёй адлюстравана, цягнула да глыбокіх маральна-этычных і філасофскіх высноў. Коласава ўспрыманне жыцця нельга назваць інакш, чым пантэістычным (пантэізм -- рэлігійнае філасофскае вучэнне, што атаясамлівае Бога з прыродай і разглядае прыроду як увасабленне бажаства)” [11, VIII, 20].

Галоўныя вобразы: дуб, вецер, хмарка, крыніца, балота, камень. Варта адзначыць, што ў “Казках жыцця” ў якасці персанажа адсутнічае чалавек. На гэта ў свой час звяртаў увагу І.Чыгрын, выказваючы меркаванне, “што *казкі жыцця з'яўляюцца прамым наследаваннем і творчым развіццём мастацкіх традыцый народных казак пра расліны і жывёл*”.

Праблемы: Больш за ўсё ў казках роздуму, філасофіі жыцця, глыбокага псіхалагізму, маралі, эстэтыкі. Асноўныя тэмы – сацыяльная, рэвалюцыйна-дэмакратычная (“У балоце”), роздум над падзеямі рэвалюцыі “Даль”, “Чортаў камень”, “Стары лес”, “Супраць вады”. І ўсё ж нават у іх Колас аддае перавагу гуманістычным асновам перад класавымі.

“Стыль (казак) вызначаецца нешматслоўнай апавядальнасцю, якая ніколі не бывае нейтральнай, бо амаль у кожным сказе ёсць ацэначнае слова. Яно эмацыйна насычанае. Таму апавядальны тон пісьменніка як бы падсвечаны то мяккім гумарам, то лірызмам, то драматычным узрушэннем” [11, IX, 36].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Жанр (асэнсаванне ў літ-зн-ве): алегарычныя апавяданні, філасофская проза, псіхалагічная проза, байкі ў прозе, прыпавесці.

Вытокі: фальклорныя (казкі), літаратурныя (Салтыкоў-Шчадрын)

“Казкі жыцця паставілі беларускую прозу перад неабходнасцю далейшага яе руху ў бок філасофскай прозы, у бок філасофскага рамана” [1, с. 260].

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989.

2 Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 176–237.

**Дадатковая**

3 Багдановіч, І.Э. Купалаўскі і коласаўскі канцэпты свабоды / І.Э. Багдановіч // Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мінск: Беларуская навука, 2001.

4 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 181–190.

5 Васючэнка, П.В. “Таемны вы, зямлі скрыжалі!..” Мастацкія таямніцы Якуба Коласа / Пятро Васючэнка // Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы. – Мінск: Галіяфы, 2009. – С. 19–28.

6 Казбярук, У. Паэма Я.Коласа “Новая зямля”: у святле славянскіх традыцый / У. Казбярук. – Мінск, 1979.

7 Максімовіч Валеры. Касмічны лад “Новай зямлі” / В.Максімовіч // Полымя. – 2002. – № 2.

8 Мушынскі, М. Паэма Я.Коласа “Сымон-музыка” / М.Мушынскі // Роднае слова. – 2000. – № № 5, 6.

9 Мушынскі, М. “Яна – асноўная паэма ва ўсёй маёй паэтычнай творчасці”. “Новая зямля” Я.Коласа / М.Мушынскі // Роднае слова. – 2001. – № 1.

10 Навуменка, І.Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя / І.Навуменка. – Мінск, 1981.

11 Навуменка, Іван. “Казкі жыцця” Я.Коласа / І.Навуменка // Роднае слова. – 2002. – №№ 8, 9.

12 Сіцька, Здзіслаў. Думка з-пад сэрца. “Новая зямля” ў прасторы і часе мікра- і макракосмасу / З.Сіцька // Роднае слова. – 1998. – № 5.

13 Шамякіна, Т. Вобраз музыкі ў беларускай літаратуры: паводле паэмаў Янкі Купалы “Курган” і Якуба Коласа “Сымон-музыка” / Т.Шамякіна // Роднае слова. – 1992. – № 12.

14 Ярош, М. Я.Купала і Я.Колас. Параўнальны аналіз творчасці / М.Ярош. – Мінск, 1988.

**Электронныя рэсурсы**

15 Колас, Я. Творы / Я.Колас // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jakub_Kolas/

16 Якуб Колас. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/yakub.kolas

## 1.6 МАКСІМ БАГДАНОВІЧ (1891–1917)

1 Біяграфія паэта, вытокі яго творчасці, значэнне дзейнасці.
2 Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі “Вянок”.
3 Проза М.Багдановіча.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4 М.Багдановіч – як літаратуразнаўца, крытык і перакладчык.

*М.Багдановіч – паэт, празаік, публіцыст, крытык і літаратуразнаўца, перакладчык. “Багдановіч, побач з Купалам і Коласам, – тое трэцяе вымярэнне, без якога немагчыма перспектыва. З Багдановічам нам стала далёка відаць ва ўсе канцы свету” – зазначае М.Стральцоў [15, с. 335].*

## 1 Біяграфія паэта, вытокі яго творчасці, значэнне дзейнасці.

Асноўныя біяграфічныя звесткі паэта пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 9 снежня 1891г., Мінск | **Максім Багдановіч** нарадзіўся будучы паэт у сям’і настаўніка, этнографа і фальклырыста Адама Ягоравіча Багдановіча і Марылі Апанасаўны, якая таксама не была пазбаўлена літаратурных здольнасцей. |
| 2 | лета 1892г. | сям’я пераязджае ў Гродна |
| 3 | восень 1896 г. | ад сухотаў памірае маці Максіма (пахавана ў Гродна). |
| 4 | | Бацька перавозіць сям’ю на жыхарства ў Ніжні Ноўгарад (неўзабаве жэніцца другі раз на роднай сястры першай жонкі М.Горкага). |
| 5 | 1902 г. | Максім паступае ў Ніжагародскую мужчынскую гімназію. За актыўны ўдзел у гімназічных беспарадках падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. быў пакінуты на паўторны год навучання. |
| 6 | 1908 г. | ад сухотаў памірае старэйшы брат Максіма Вадзім (праз год гэты самы працэс – сухоты – адкрываецца і ў яго), сям’я пераязджае на жыхарства ў Яраслаўль, дзе Максім працягвае навучанне ў Яраслаўскай гімназіі. |
| 7 | 1911 г. | М.Багдановіч заканчвае гімназію і паступае ў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй (замест філфака Пецярбургскага ўніверсітэта), наведвае Беларусь, Вільню, рэдакцыю “Нашай нівы”; жыве ў Ракуцёўшчыне. |
| 8 | 1913 г. | у Вільні ў друкарні Марціна Кухты выходзіць адзіны паэтычны зборнік паэта – “Вянок”. |
| 9 | 1916 г. | летам Багдановіч закончыў юрыдычны ліцэй, а восенню едзе працаваць на Беларусь, у Мінск; служыць у губернскай харчовай камісіі, актыўна ўдзельнічае ў рабоце Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны; жыве на кватэры ў З.Бядулі. |
| 10 | люты 1917 г. | па прычыне хваробы выязджае ў Ялту на лячэнне. |
| 11 | 25 мая 1917 г., Ялта | зямны шлях **М. Багдановіча** заканчваецца; пахаваны паэт там жа. |

**– вытокі творчасці:**

Ніжагародскі перыяд жыцця даследчыкі лічаць самым асноўным у фармаванні Багдановіча як паэта. Першым выхавацелем яго быў бацька. Ён прывіў сыну любоў да класічных твораў рускай і сусветнай літаратуры, да фальклору. Першымі кнігамі Максіма былі “Дзіцячыя казкі” Афанасьева, беларускія казкі ў запісе Адама Ягоравіча, а таксама з запісаў Шэйна і Раманава. Па словах самога Адама Ягоравіча, у яго бібліятэцы “было ўсё, што было лепшага ў свеце”. У гэты перыяд сям’я Багдановічаў была блізкая з сям’ёй рускага пісьменніка М.Горкага. Але збліжала іх не толькі швагроўства, а і агульнасць літаратурных інтарэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нараджэнне ў Багдановічу менавіта беларускага паэта М.Стральцоў растлумачвае наступным чынам: “Не, мусіць, і “кліч продкаў”, і талент, і воля маюць значэнне тады, калі іх прыводзіць у рух якая-небудзь вялікая, паграмадску значная ідэя. Для Багдановіча такой ідэяй была ідэя нацыянальнага і сацыяльнага разняволення роднага народа. А падказаў яе Багдановічу час” [15, с. 286]. М.Стральцоў таксама лічыць, што “смерць маці пазбавіла яго (М.Багдановіча – Т.Ф.) радзімы, любоў да памяці маці, любоў да радзімы, якую так часта і справядліва звязваюць з іменем маці, вярнула яго на зямлю продкаў” [15, с. 282].

Багдановіч менавіта як беларускі паэт складваўся таксама ў гэты час і пад уплывам ідэй і матываў творчасці Купалы і Коласа, газет “Наша доля” і “Наша ніва”. У гэтым яму дапамагла яго хросная маці Вольга Епіфанаўна Сёмава, што жыла ў Пінску і з якой ліставаўся Максім. Менавіта яна, па просьбе хрэсніка, выпісвала яму беларускія газеты, менавіта ёй 10–11-цігадовы хлопчык паказаў першыя беларускія вершы падчас яе прыезду ў Ніжні Ноўгарад у 1901 годзе.

Яраслаўскі перыяд жыцця – час актыўнай творчасці паэта, узвышэння яго як пісьменніка, крытыка, гісторыка роднай літаратуры (як паэт друкаваўся з 1909 г., як крытык – з 1911 г.). Да ўсяго, гэта і драматычны перыяд яго жыцця. Не спраўджваюцца намеры Максіма паступаць на філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (куды ён быў рэкамендаваны акадэміку Шахматаву). Бацька аргументаваў сваю забарону клопатамі пра здароўе сына. Паступіўшы ў юрыдычны ліцэй, Багдановіч не кідае справы свайго жыцця, якой было беларускае адраджэнне. Менавіта ў гэты перыяд выходзіць яго знакаміты “Вянок”.

**– значэнне дзейнасці:**

(больш падрабязна гл. *Барычэўскі Л.П., Васючэнка П.В., Тычына М.А. Беларуская літаратура і свет : ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 191–199.*)

“Творчасць Максіма Багдановіча засведчыла новы этап у развіцці беларускай літаратуры, калі ёй стала занадта цесна ў ранейшых межах “літаратуры для простага люду.” ...Максім Багдановіч стаў фактычна **першым** беларускім творцам, які цалкам усвядомлена і паслядоўна ўзяўся за выращэнне задачы *ўзвышэння роднага мастацкага слова* да найлепшых папярэдніх і сучасных яму еўрапейскіх і расійскіх узораў... Сваю творчую задачу Максім Багдановіч бачыў  і ва ўзбагачэнні формаў і жанраў новай беларускай паэзіі: шмат якія новыя формы, дзякуючы яму, былі створаныя па-беларуску ўпершыню” [5, с. 191].

“Культ прыгажосці дамінуе ў паэтычнай творчасці Максіма Багдановіча. У значнай ступені гэтая творчасць была запатрабаваная самой хадою “нашаніўскага” адраджэнскага працэсу. Сярод “нашаніўцаў”, акрамя ... братоў Луцкевічаў, вырашальную маральную падтрымку Максіму Багдановічу  аказалі Вацлаў Ластоўскі (гэта ўскосна адлюстравана і ў згаданым палемічным артыкуле “Сплачвайце доўг”) ды Сяргей Палуян. Адначасова творцы “народнага”, “вясковага” складу далёка не заўсёды

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разумелі асветніцкую скіраванасць багдановічавай лірыкі. Пазнаёміўшыся з дасланым у 1909 г. у рэдакцыю "Нашай нівы" сшыткам вершаў Максіма Багдановіча, Ядвігін Ш. і Аляксандр Уласаў назвалі гэтыя творы "дэкадэнтшчынай". І толькі з цягам часу шмат якія шчырыя прыхільнікі адраджэння дайшлі да высновы: "чыстая краса" ў паэзіі Багдановіча добра стасавалася з нацыянальнай адметнасцю і патрыятычным пафасам. Паэт увёў у новую беларускую літаратуру гістарычныя вобразы беларускіх інтэлектуалаў: таго ж Францішка Скарыны альбо невядомых беларускіх манахаў-перапісчыкаў кніг...

Светлы вобраз беларускай гераічнай мінуўшчыны заставаўся сімвалам "адвечнай красы" для Багдановіча да апошніх дзён яго жыцця (верш "Пагоня")... У катэгорыях Прыгажосці трактуецца і праблема сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення Беларусі (верш "Беларусь, твой народ дачакаецца...)

У яго пазнейшых "Вершах беларускага складу" мы бачым тыпізаваныя вобразы, якім толькі сляпы альбо тэндэнцыйна настроены чалавек мог бы адмовіць у іх беларускасці. Як зазначае сучасная даследчыца Ірына Багдановіч, "сімвалам мастацкасці, эстэтычнага вяршэнства і акрамя таго сімвалам патрыятычна напоўненым быў  для Багдановіча сціплы ды самавіты вобраз васілька. Васілёк успрымаўся як першааснова быцця, у адрозненне ад канкрэтных матэрыяльных, практычных рэчаў"  (верш "На чужыне").

Паняццем красы прасякнута ўся творчасць Багдановіча. Асаблівае месца тут, натуральна, займаюць жаночыя вобразы. Адметнымі выглядаюць спробы паэта стварыць свой ідэал "беларускай мадонны" [5, с. 193–196].

І.Багдановіч, асэнсоўваючы феномен Максіма Багдановіча, зазначала: "Ён адчыніў таямніцы гэтага спрадвечнага хараства, бо лічыў яго даступным для душы свайго народа, якая не можа чакаць спачатку выбаўлення з рабства, хлеба ў дастатку, а потым прыгожых вершаў. Хараство, як і свабода, доля, – гэта былі асноватворныя каштоўнасці аднаго парадку, роўнавартасныя ў сваім глыбінным філасофскім змесце. Апалогія (абарона – Т.Ф.) хараства ў беларускай паэзіі мела такое ж грамадскае значэнне, як апалогія свабоды і долі, якую найпаўней выразілі Купала і Колас. Багдановіч жа сваёй творчасцю стаў доўгачаканым водгукам на покліч Вацлава Ластоўскага: «Сплачвайце доўг!» – доўг адкрыцця і вяртання жывой красы жыцця, перастворанай у красу мастацтва, у змучаную шэрым штодзённым жыццём душу беларускага народа. Менавіта Багдановіч вяртаў гэтае хараство, раскінутае ва ўсім: у прыродзе роднага краю, у нацыянальным і сусветным мастацтве, у чалавечых душы і целе, пачуццях і думках. І нездарма Багдановіча з лёгкай рукі А.Луцкевіча называлі і называюць паэтам «чыстае красы», бо краса ж сапраўды – чыстая!" [4, с. 186–187].

**2 Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі "Вянок".**

Зб-к "Вянок" (адзіная прыжыццёвая кніга паэта, пра якую ён заўважаў, што гэта "кніжка... зусім маладая", але ў ёй ёсць "творчасць, і натхненне, і сур'ёзная праца") быў выдадзены ў 1913 г. і, бясспрэчна, "стаў выдатным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дасягненнем усёй беларускай літаратуры пачатку ХХ ст. Гэта – сапраўдны ўзор класічнага мастацтва, прыклад не толькі ідэйна-эстэтычнай дасканаласці, выверанасці, завершанасці, але і сведчанне інтэртэкставай адкрытасці, своеасаблівай паэтычнай і гістарычнай пасіянарнасці” [12, с. 188]. “Вянок”, як сцвярджае падзагаловак, – гэта кніга выбраных вершаў, кніга паэзіі “з арыгінальнай агульнай задумай, своеасаблівым унутраным “лірычным” сюжэтам” [1, с. 306].

Паколькі пры выданні “Вянка” была парушана яго кампазіцыя, то існуюць і розныя версіі яго задумы. Так, згодна з А.Лойкам [1], кніга была задумана ў трох частках (на манер класічнага, дантаўскага прынцыпу траічнасці). Назва першай з якіх – “Малюнкі і спевы”, другой “Мадонны”, трэцяй – “Каханне і смерць”. Аднак сталася так, што выдаўцы адкінулі трэцюю частку зб-ка. Да ўсяго, першы раздзел –“Малюнкі і спевы” – быў абазначаны рымскай лічбай І, а “Мадонны” (2-я ч-ка кнігі) аказалася без нумара. Раздзел “Мадонны” станавіўся ні то асобнай нізкай, ні то незразумелым прыдаткам да кнігі, калі ўлічваць той факт, што раздзел “Малюнкі і спевы” пабудаваны згодна з класічнай семярычнай цыклізацыяй. Назвы сямі яго раздзелаў наступныя: “У зачарованым царстве”, “Згукі бацькаўшчыны”, “Старая Беларусь”, “Места”, “Думы”, “Вольныя думы”, “Старая спадчына”. Парушэнне структуры парушала і першасную аўтарскую задуму кнігі.

Т.Чабан пагаджаецца з тым, што кніга была задумана ў трох частках, аднак кампазіцыю яе бачыць наступнай: І раздзел – “Малюнкі і спевы”, куды ўваходзяць нізкі “У зачарованым царстве”, “Згукі бацькаўшчыны”, “Старая Беларусь”, “Места”; ІІ раздзел – “Думы”, які складаецца з цыкла пад назвай “Думы”, “Вольныя думы”, “Старая спадчына”; ІІІ раздзел – “Мадонны”, куды ўваходзяць вершаваныя апавяданні “У вёсцы”, “Вераніка” і цыкл “Каханне і смерць”. Ускоснае пацвярджэнне гэтаму даследчыца знаходзіць у назвах нізак “Вянка”, якія паўтораны ў “Змесце” і называюцца менавіта нізкамі вершаў. “У той жа час “Малюнкі і спевы”, “Думы”, “Мадонны” такіх азначэнняў не маюць. Значыць, “Думы” – не назва нізкі, а хутчэй за ўсё назва раздзела другой часткі “Вянка” [17, с. 200], – дадае Т.Чабан. “<...> у кнізе ёсць еднасць глыбока ўнутраная, гарманічная. Менавіта яна стварае адчуванне жывой, рухомай цэласнасці.

*Зб-к аналізуецца згодна з версіяй Т.Чабан, пазнаёміцца з якой можна ў часопісе “Полымя” ці Зборы твораў (т. І) М.Багдановіча, а таксама ў поўным варыянце лекцыі з прадстаўленай прэзентацыяй.*

У новым, пашыраным і ўдакладненым выданні твораў М.Багдановіча (прымеркаваным да 100-годдзя паэта) “Вянок” упершыню пададзены ў тым выглядзе, у якім і быў задуманы.

Зразумела, што паэзія Максіма Багдановіча не абмяжоўваецца толькі зб-кам “Вянок”. Ёсць у яго многа вершаў розных гадоў, што не ўвайшлі ў знакамітую кнігу паэзіі. Матывы іх самыя разнастайныя. Ёсць таксама і вершы на рускай мове. Да ўсяго, за чатыры гады пасля выхаду “Вянка” (апошнія гады жыцця – 1914-1917) Багдановіч стварыў нямала паэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шэдэўраў, якія сведчылі пра яго мастакоўскі рост (балада "Страцім-лебедзь", паэмы "Максім і Магдалена", "Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык"; "Пагоня", "Маладыя гады", "Набягае яно", "Беларусь, твой народ дачакаецца").

**3 Проза М.Багдановіча.**

*Пазнаёміцца з артыкулам М.Мушынскага "Спадчына Багдановіча-празаіка", змешчаным у II томе Збору твораў.*

Уласна прозы ў Багдановіча адносна мала. Яна прадстаўлена апавяданнямі і нарысамі на беларускай і рускай мовах, а таксама перакладамі на рускую мову і з украінскай мовы (творы І.Франко і В.Стафаніка). Проза займае ў творчасці паэта досыць сціплае месца, тым не менш, Багдановіч быў адораны і як празаік. У ягоным таленце, на думку І.Навуменкі [13], ёсць нават якасці псіхолага-аналітыка.

Дэбютаваў Багдановіч якраз як празаік, у 1907 г. у "Нашай ніве" быў надрукаваны абразок-прытча/казка "Музыка", Максіму тады было ўсяго 16 год. У творы сцвярджаецца "неўміручасць народа, неўміручасць мастацтва, якое расце на народных каранях..." [1, с. 327]. На думку У.Конана "Багдановічаў "Музыка"... паходзіць з фальклору, але ў гэтым просценькім эскізе ёсць ужо свядомая ўстаноўка на стварэнне паэтычных міфаў-сімвалаў. У ім пазначана драма станаўлення новай нацыі, якую не хацелі прызнаць "злыя і сільныя людзі"; выкрываецца гістарычны падман, спроба чужых "туркаў" і сваіх "янычараў" падмяніць самую душу народа, падсунуць яму чужыя каштоўнасці" [9, с. 165].

Тэма мастацтва прадстаўлена таксама ў такіх (абавязковых для чытання) празаічных творах М.Багдановіча, як "Апокрыф" (1913), "Апавяданне аб іконніку і залатару" (1914), "Шаман (1914).

У прытчы "<u>Апокрыф</u>" таксама знойдзем асэнсаванне пісьменнікам філасофскай тэмы Красы, Прыгажосці. Мова твора стылізавана пад скарынінскія прадмовы і пасляслоўі да Бібліі. М.Багдановіч, на думку даследчыкаў [11], уклаў у гэты твор свае самыя патаемныя думкі пра чалавека і мастацтва. У творы спалучаюцца дзве тэмы, два сімвалічныя вобразы – музыкі і васілька. Музыка сімвалізуе мастака, народнага паэта-песняра, васілёк – яго мастацтва і народную песню, мастацкую культуру народа, яго духоўнае жыццё. Прытча Багдановіча такім чынам пра духоўнае жыццё і мастацтва народа. Бо "хлеб надзённы" гэта толькі пачатак чалавечых патрэб...

"<u>Апавяданне аб іконніку і залатару</u>" працягвае тэму карсы ў дачыненні твораў мастацтва і лагічна вядзе за сабою апраўданне мастацкае формы" [11, с. 27]. Багдановіч, сцвердзіўшы апрычонасць (адвечнасць / усеабдымнасць) хараства, гаворыць аб разнастайнасці і нятоеснасці яго праяў. Так, хараство паэт звязвае з формай, але паняцце формы ў яго рухомае. Форма не можа быць зразумелая сама па сабе. Наогул, каб зразумець красу і форму ў мастацтве – трэба выйсці па-за іх межы. "Гэтым апавяданнем Багдановіч паказваў важнасць у справах мастацтва ўмельства, рамесніцкага майстэрства,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

без якога няма нараджэння прыгожых форм, абараняў не шаблон, паўтор, стылізацыю, а неабходнасць наватарства, разумення таго, што мастацтва абнаўляецца толькі ў пошуку, у руху, дапытлівых спрэчках вакол праблем яго існасці, сутнасці яго зместу і формы” [1, с. 330].

Калі “Апокрыф” і “Апавяданне аб іконніку і залатару” – першыя агульныя і канечныя словы эстэтыкі М.Багдановіча, дык “Шаман” – ключ да яе. Гаворка пра хараство прыроды выяўляе другую, на першы погляд далёкую ад яе праблему – праблему прыроды (паходжання) хараства. [11, с. 27] – лічыць Ю.Пацюпа.

Апавяданне з’явілася ў 1914 годзе, ужо пасля нашаніўскай дыскусіі аб “сплочванні доўгу красе”. <...> У дадзенай сітуацыі Багдановіч развівае эстэтычную правакацыю Юркі Верашчакі і выказвае недавер песімістычным высновам пра невясёлую нашу старонку Беларусь, пра выклятый богам край. Ён паказвае сітуацыю больш тужлівую, чым у Беларусі. Аднак беларусы, як і тыя жыхары Нарымскага краю, пасля песні шамана, могуць прасякнуцца і захапленнем, і гонарам, за сваю зямлю ды сказаць: “Бач, значыцца, якая наша старонка” (II, 68). Т.ч.:

1) хараство Багдановіч разглядае як катэгорыю суб’ектыўную;

2) хараство ўзнікае не адным творчым намаганнем, а ў грамадскім развіцці: “Пачуццё хараства... не даецца чалавеку ў гатовым выглядзе, яно змяняецца, дасканаліцца развіццём асобы і ўсяго чалавечага роду” [11, с. 29];

Такія апавяданні, як “Марына”, “Гарадок”, “Сярод глухой пушчы...”, “Вясной” падкрэсліваюць шырокія патэнцыяльныя магчымасці іх аўтара як празаіка. А кароткія эцюды “Гарадок”, “Сярод глухой пушчы...”, “Вясной” адрозніваюцца выразным сацыяльным гучаннем, сацыяльна-бытавой напоўненасцю. Сярод празаічнай спадчыны М.Багдановіча ёсць і апавяданні на рускай мове: “Мадонна”, “Притча о васильках” і інш. Першае папярэджвала вершаваны цыкл Багдановіча “Мадонны”. Другое – рускі варыянт “Апокрыфа”.

## 4 М.Багдановіч – як літаратуразнаўца, крытык і перакладчык.

*Пазнаёміцца з артыкуламі М.Мушынскага “Спадчына Багдановіча-празаіка” і “Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М.Багдановіча”, змешчанымі ў II томе Збору твораў, а таксама з артыкулам У.Конана “Публіцыстыка Максіма Багдановіча”.*

М.Багдановіч унёс вялікі ўклад і ў беларускую крытыку. Ён па праву лічыцца адным з заснавальнікаў беларускага нацыянальнага літаратуразнаўства.

Аблічча Багдановіча як беларускага крытыка найбольш поўна выявілася ў артыкулах, прысвечаных сучаснай яму беларускай літаратуры: “Глыбы і слаі” (1911), “За тры гады” (1913). Першы з іх быў надрукаваны ў “Нашай ніве”, другі – у “Каляднай пісанцы”. У іх аўтар спрабаваў прааналізаваць увесь беларускі літаратурна-грамадскі рух і звярнуць увагу на кожнага яго ўдзельніка. І гэта яму, на думку А.Лойкі [1], шмат у чым удалося. Так, Багдановіч адзначаў 1) сувязь першых спроб усіх пісьменнікаў з традыцыямі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Багушэвіча і 2) працэс нараджэння адметных паэтычных індывідуальнасцей. І першы, і другі артыкулы адкрываліся аналізам творчасці Купалы і Коласа.

У цэнтры артыкула "Забыты шлях" (1915) – роздум аб развіцці нацыянальнай паэзіі, лёсе беларускай народнай культуры, яе будучыні.

М.Багдановіч як крытык выступаў таксама на рускай і ўкраінскай мовах (Ламаносаў, Лермантаў, Пушкін; Шаўчэнка, Франко).

На сённяшні дзень вядома каля 20-ці твораў М.Багдановіча, якія адносяцца да жанру публіцыстыкі. Прысвечаны яны праблеме нацыянальнага адраджэння беларусаў і інш. славянскіх народаў, іх мовы, літаратуры, культуры. У 10-ці з іх даследуецца гісторыя беларускага культурна-нацыянальнага руху. Гэта такія артыкулы, як "Сталецце руху беларускага народа", "Белорусское возрождение", "О гуманизме и неосмотрительности", "Белорусы", "Хто мы такія?", "На белорусские темы", "Белорусский беженский приют", "Аб веры нашых прашчураў", "Голос из Белоруссии", "Деятельность Минского белорусского комитета".

Калі ўлічыць тыя абставіны, што беларуская літаратра пачатку мінулага стагоддзя рэдка выходзіла за межы нацыянальнага рэгіёна, амаль не перакладалася на іншыя мовы, а нашы публіцысты друкаваліся пераважна ў беларускім друку, то прыходзіцца прызнаць, што Багдановіч-публіцыст выступаў у ролі беларускага паўнамоцнага прадстаўніка, звернутага да тагачаснай агульнарасійскай публікі. Яго папярэднікам на Украіне быў С.Палуян, які пачаў знаёміць (на жаль не доўга) украінскіх братоў з беларускім адраджэннем.

У якасці перакладыка М.Багдановіч выступіў у 1909 г. (перакладаў Г.Гейне, Ф.Шылера; П.Верлена; Авідзія; украінскіх паэтаў; свае вершы з беларускай мовы на рускую – "Зеленя"). Ён лічыцца заснавальнікам беларускай нацыянальнай школы перакладу. Пры перакладах Багдановіч, на думку даследчыкаў, карыстаўся двума асноўнымі прынцыпамі: 1) патрабаванне дакладнасці, блізкасці да арыгінала; 2) патрабаванне паэтычнага ўзнаўлення арыгінала, захавання яго мастацкасці.

"Цяжка пераацаніць ролю Максіма Багдановіча як перакладчыка. Да яго проста не было паэта, які мог бы гэтую работу здзейсніць. Ён хацеў даказаць і бліскуча даказаў, што беларуская мова прыдатная для перадачы самых тонкіх, складаных "інтэлігенцкіх" пачуццяў..." [3, с. 315].

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989.

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 265–318.

**Дадатковая**

4 Багдановіч, І.Э. Мастацкая апалогія характва: феномен Максіма Багдановіча / І.Э Багдановіч //Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мінск: Бел навука, 2001. – С. 171–193.

5 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 191–199.

6 Война... Войцікава, Людвіка. Пяць месяцаў у Менску. (З жыцця М.Багдановіча) / Л.Войцікава // На суд гісторыі. – Мн., 1994.

7 Гніламёдаў, У. Яго жыццёвая сіла / У.Гніламёдаў // Полымя. – 1992. – № 4.

8 Дышыневіч, В. “Але вось цераз цемень маланка блішчыць, асвячае мне вобраз Хрыста”: Хрысціянскія матывы ў творчасці М.Багдановіча / В. Дышыневіч // Роднае слова. – 1993. – № 6.

9 Конан, У. Святло паэзіі і цені жыцця / У.Конан. – Мінск, 1991.

10 Ластоўскі Вацлаў. Мае ўспаміны аб М.Багдановічу / В.Ластоўскі // На суд гісторыі. – Мн., 1994.

11 Максім Багдановіч // Крыніца. – 1999. – № 6 (53).

12 Максімовіч, В. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя / В.Максімовіч. – Мн., 2000. – С. 183–227.

13 Навуменка, І. [Серыя артыкулаў па тв-ці М.Багдановіча] І.Навуменка // Роднае слова: 1997. – №№ 9, 11, 12; 1998. – №№ 1, 2, 4.

14 Петрушкевіч, А. Палыновая горыч кахання. Максім Багдановіч і Ганна Какуева А.Петрушкевіч // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 83–85.

15 Стральцоў, Міхась. Загадка Багдановіча // Стральцоў Міхась. Выбранае. – Мн., 1987.

16 Тарасюк, Л. Пад зоркай Венеры: Лірыка кахання ў паэзіі М.Багдановіча / Л.Тарасюк // Роднае слова. – 1997. – № 4.

17 Чабан, Т. Космас “Вянка” / Т.Чабан // Полымя. – 1991. – № 12.

**Электронныя рэсурсы**

18 Максім Багдановіч. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/maksim.bahdanovich

19 20 нечаканых фактаў з жыцця Максіма Багдановіча [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: : http://www.nastaunik.info/node/15290

20 Багдановіч, М. Творы / М.Багдановіч // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: : http://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/

## 1.7 МАКСІМ ГАРЭЦКІ (1893 – 1938)

1 Біяграфія, асноўныя перыяды творчасці, мастацка-светапоглядныя прынцыпы.
2 Апавяданні М.Гарэцкага: разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм.
3 Гарэцкі-драматург (“Антон”, “Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы”).
4 Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”, аповесці “Меланхолія”, “У чым яго крыўда”, “Ціхая плынь”, “Дзве душы”.
5 Творчая гісторыя рамана “Віленскія камунары”; “Камароўская хроніка” як эпапея.

*“У гісторыі шэрагу народаў выдатную ролю адыгралі асобныя славутыя роды. Гонарам Беларусі ў ХХ стагоддзі сталі Янка Купала з жонкай Уладзіславай Францаўнай, Якуб Колас са сваім шматлікім атачэннем і, вядома ж, Гарэцкія, род разгалінаваны, які ўпэўнена сягнуў і ў ХХІ стагоддзе. У яго вельмі моцныя жыццёвыя карані і магутны маральна-этычны патэнцыял” – піша Дз.Бугаёў у прадмове да кнігі Р.Гарэцкага “Браты Гарэцкія”* [11].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**1 Біяграфія, асноўныя перыяды творчасці, мастацка-светапоглядныя прынцыпы.**

М.Гарэцкі – “асоба надзвычай шырокага творчага дыяпазону”: адзін з буйнейшых дзеячаў беларускага Адраджэння, *свядомы* і *нястомны* змагар за нацыянальнае адраджэнне; “адзін з пачынальнікаў беларускай прозы”; класік беларускай літаратуры; выдатны літаратуразнаўца; лексікограф; фалькларыст; публіцыст; перакладчык [3]. Разам з Купалам, Коласам, Багдановічам ён той чацвёрты слуп у падмурку беларускай літаратуры, на якім яна трымаецца.

Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 1893 г. | **М.Гарэцкі** нарадзіўся ў вёсцы Мал. Багацькаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай вобласці ў сям’і малазямельных сялян. |
| 2 | 1901 г. | бацькі аддалі Максіма ў школу граматы ў Вялікую Багацькаўку |
| 3 | 1903-1905 | вучыўся ў Вольшынскай царкоўна-прыходскай двухкласнай школе |
| 4 | 1905-1908 | вучыўся ў настаўніцкіх класах у в. Вольша. |
| 5 | 1909 г. | прыняты ў Горы-Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча на казённы кошт. |
| 6 | 1913 г. | працуе каморнікам на Віленшчыне. |
| 7 | ліпень 1914г. | адправіўся “вольнапісаным” у расійскае войска. |
| 8 | жнівень 1914г. | пачалася Першая сусветная вайна; ваяваў (сувязіст у артылерыйскай батарэі); быў паранены ў нагу, доўга лячыўся ў розных шпіталях. |
| 9 | 1916 г. | вучыўся ў Паўлаўскім ваенным вучылішчы ў Петраградзе, скончыў яго ў званні прапаршчыка; служыў у Іркутску, Гжацку. |
| 10 | 1917 г. | сустрэў на фронце, на Палессі. |
| 11 | люты 1917 г. | Цяжка захварэў, лячыўся ў Маскве, Жалезнаводску. |
| 12 | восень 1917 г. | звольнены з войска; жыў у Смаленску, служыў у гарадскім Савеце і супрацоўнічаў у газетах. |
| 13 | 1919 г. | разам з рэдакцыяй газеты “Звязда” выехаў у Мінск, затым у Вільню. Пасля захопу Вільні палякамі выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах і ў Віленскай (Беларускай) гімназіі. |
| 14 | 1919 г. | пабраўся шлюбам з Леанілай Чарняўскай, працавала настаўніцай у Віленскай беларускай гімназіі, пісала творы для дзяцей. |
| 15 | 1920 г. | Убачыла свет «Гісторыя беларускай літаратуры», якая доўгі час была адзіным падручнікам для школ і ВНУ. |
| 16 | канец 1923 г. | разам з сям’ёй пераехаў у Мінск; чытаў лекцыі на рабфаку БДУ, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце БССР, выконваў абавязкі навуковага сакратара літаратурнай камісіі Інбелкульта, быў яго правадзейным членам. |
| 17 | 1926–1928 гг. | узначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі |
| 18 | 1928 г. | з сям’ёй вярнуўся ў Мінск, працаваў вучоным спецыялістам Інстытута навуковай мовы Інбелкульта, застаўся на гэтай пасадзе і пасля рэарганізацыі інстытута ў Акадэмію навук |
| 19 | 1930 г. | быў арыштаваны па справе “Саюза вызвалення Беларусі”; вінаватым сябе не прызнаў; асуджаны да пяцігадовай высылкі ў Вятку; працаваў чарцёжнікам. |
| 20 | 1935 г. | пасля ссылкі ўладкаваўся настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе ў пасёлку Пясочня Калужскай вобласці. |
| 21 | 1937 г. | паўторна арыштаваны і прысуджаны да расстрэлу пастановай тройкі НКУС Смаленскай вобласці. |
| 22 | 10 лютага 1938 | прысуд быў выкананы. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | г. | |
| 23 | 1957 г. | **М.Гарэцкі** быў рэабілітаваны. |

Што да перыядаў творчасці М. Гарэцкага, то даследчыкі вылучаюць наступныя: 1) ранні (1913-1914); 2) ваенны (1915-1918), у які ўваходзіць і смаленскі (1917-1918); 3) віленскі (пач. 1919 - кастр. 1923); 4) савецкі (1923-1930 і 1930-1938).

Мастацка-светапоглядныя прынцыпы пісьменніка выкладзены ў артыкулах "**Наш тэатр**" і "**Развагі і думкі**". Іх называюць "творчым маніфестам празаіка". Гэтымі артыкуламі (таксама драматызаванай аповесцю "Антон") ён адрэагаваў на дыскусію ў "Нашай ніве" 1913 г. У артыкулах выкладзена ўласнае эстэтычнае крэда аўтара, сфармуляваны прынцыпы рэалістычнага мастацтва, узняты шэраг актуальных праблем гісторыка-літаратурнага і тэарэтычнага характару. Так, у артыкуле "Наш тэатр" М.Гарэцкі выступіў *з заклікам* да беларускіх пісьменнікаў стварыць вартыя народа драматычныя творы, якія б склалі аснову нацыянальнага тэатра. Да ўсяго аўтар у гэтым артыкуле адстойваў чысціню беларускай *мовы*. Працяг разваг пра маладую айчынную літаратуру – і ў артыкуле М.Гарэцкага "Развагі і думкі". Фармулюе іх аўтар як *заклік* да самой літаратуры беларускай:

"...Прозы, прозы, добрай, мастацкай прозы беларускай дайце нам!

Каб на стале ў нас, каля тоўстай кніжкі вершаў "Шляхам жыцця" ляжала б не танейшая кніжка прыгожай прозы".

## 2 Апавяданні М.Гарэцкага: разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм.

***– раннія апавяданні***

Дэбютаваў М.Гарэцкі ў 1913 г. апавяданнем "У лазні", надрукаваным у "Нашай ніве". А ўжо праз год выйшаў зборнік "Рунь", які стаў значнай падзеяй не толькі ў жыцці аўтара, а і літаратурнага жыцця Беларусі. Зб-к пашыраў тэматыку і праблематыку беларускай прозы, уводзіў новага героя – "інтэлігента ў першым пакаленні", што даследчыкі лічаць "мастацкім адкрыццём Гарэцкага" [5, с. 210]. "Ён маніфеставаў з'яўленне пісьменніка буйнога таленту, яскрава акрэсленай творчай індывідуальнасці" [3, с. 381].

У тэматычна-праблемным плане "Рунь" можна падзяліць на дзве групы асобных апавяданняў (А.Лойка [1]): 1) пра інтэлігентаў – сялянскіх хлопцаў, выхадцаў з вёскі, якія клапоцяцца пра тое, каб не парваць сувязей з народам, "роднымі каранямі" ("Рунь", "У лазні", "Роднае карэнне", "У чым яго крыўда"); 2) пра "патаёмнае", дзе раскрываецца філасофія жыцця, "душа" свайго народа ("Страхаццё", "Красаваў язьмін", "У панскім лесе", "Што яно?").

Герояў М.Гарэцкага вылучае сапраўдная інтэлігентнасць, якая праяўляецца ў тым, што яны ў любых абставінах застаюцца вернымі свайму народу і гатовыя для бацькаўшчыны пайсці на самыя цяжкія выпрабаванні. Аднак канкрэтныя шляхі да плённага служэння вялікай народнай справе і для герояў гэтага пісьменніка былі часта няясныя.

Героі пісьменніка не толькі клапоцяцца пра кавалак хлеба надзённага, <...> але і ўпарта шукаюць ісціны, адказаў на адвечныя пытанні пра сэнс жыцця, задумваюцца: "адкуль свет, адкуль што", "не толькі як яно, але і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

адкуль яно", "адкуль усё і што яно". У гэтых пошуках адчуваецца своеасаблівае бунтарства герояў М.Гарэцкага, іх упартасць у вялікім чалавечым імкненні да пазнання свету, да разгадкі яго таямніц і загадак. За гэтымі пошукамі вышэйшага сэнсу людскога існавання праглядваецца моцны характар асобы, якая прагне духоўна-інтэлектуальнай змястоўнасці і не баіцца сягнуць далей за штодзённы жыццёвы клопат, бо здагадваецца, што нельга "калодаю гнілою жыццё пражыць і нічым не цікавіцца"

Глыбокае даследаванне характараў "бунтаўнікоў па натуры" сродкамі мастацтва давала магчымасць Гарэцкаму-аналітыку, Гарэцкаму-псіхолагу закранаць вялікую і складаную інтэлектуальна-філасофскую праблематыку, якой менавіта і не ставала беларускай літаратуры пач. XX ст. <...>. Імкненне аўтара да гэткай праблематыкі было свядомае, бо ён, як і М.Багдановіч, ставіў перад сабой задачу ўсімі сіламі ўзбагачаць нацыянальную мастацкую традыцыю, узнімаць нашу літаратуру да ўзроўню больш развітых тады літаратур суседніх народаў <...>.

Апавяданні ранняй пары напісаны з пазіцый асветніцкага рэалізму. Канфлікт у іх найчасцей будуецца на сутыкненні юнака-рамантыка з вясковым асяроддзем, якое не разумее яго памкненняў. Герой апавяданняў Гарэцкага пачынае ўсведамляць дваістасць уласнага становішча адначасна як "прымака ў панстве" і "пасынка вёскі". <...> Пісьменнік адным з першых загаварыў пра неабходнасць беражлівага стаўлення з боку народа да нацыянальнай інтэлігенцыі, якой яшчэ не стае імунітэту, каб супрацьстаяць небяспечным ідэйным уплывам.

Наватарства М.Гарэцкага праявілася і ў распрацоўцы гістарычнай тэматыкі: апавяданні "Князёўна", "Войт", "Лірныя спевы". <...> Варта адзначыць, што ўжо на раннім этапе творчасці М.Гарэцкага выразна акрэсліліся дзве мастацкія тэндэнцыя – 1) адлюстраванне жыцця ў формах самога жыцця (рэалістычныя сацыяльна-псіхалагічныя апавяданні) і 2) лірыка-экспрэсіўнае спасціжэнне рэчаіснасці з выкарыстаннем жанрава-стылявых элементаў філасофскай прозы [3].

***– апавяданні часу Першай сусветнай вайны***

Другі (ваенны) перыяд творчасці з'яўляецца "новым этапам у творчым развіцці празаіка" [5, с. 211], і характарызуецца ўзмацненнем эпічнага пачатку, выяўленнем умення аўтара пераўвасабляцца ў вобразы іншых людзей. У гэты перыяд Гарэцкім створаны такія шэдэўры беларускага малога эпасу, як "Маці", "Хадзяка", "Генерал", "На этапе", "Амерыканец", "Прысяга", "Дзве сястры", "Рускі", "Літоўскі хутарок". Многія з іх прысвечаны тэме вайны, аднак далёка не ўсе. "Маці" – праблема пазашлюбнага мацярынства, "канфлікт між біялагічнай патрэбай арганізма і ўсталяванай мараллю грамады" [18, с. 78]; "Амерыканец" – праблема тых самых родных каранёў, як адсекчы іх беларусу – амерыканцу ў першым пакаленні (разбагацеўшаму за мяжой), каб душа па родным краі не балела. "Хадзяка" – твор "пра тое, як прыйшоў у родныя мясціны чалавек, які не быў тут большасць жыцця, каб у спакоі памерці на зямлі дзядоў-прадзедаў, і як грамада адмовілася прыняць яго" [18, с. 74]. "Твор гэты – пра адчужанасць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

людскога жыцця ў такой меры, што чалавек не атрымоўвае нават права і памерці ў родным краі” [18, с. 77]. і г.д.

Асветніцкае ўспрыманне пісьменніка змяняецца разуменнем неабходнасці дзейсных захадаў грамадска-палітычнага характару. У новых творах сюжэт, як правіла, мае *трагічную* развязку [3].

<...> Герой такіх апавяданняў, як “Генерал”, “На этапе”, “Рускі”, “Літоўскі хутарок” аказваецца *непасрэднай* ці *ўскоснай* ахвярай вайны. У іх гучыць пратэст супраць вайны. Заслуга аўтара – у выпрацоўцы традыцыі нацыянальнай мастацкай прозы – непрымання вайны як вялікай усенароднай трагедыі. Прыклады былі ўжо ў інш. літаратурах (Л.Талстой “Севастопольские рассказы”; творчасць пісьменнікаў “згубленага пакалення” – Р.Алдзінгтона, Э.Хэмінгуэя, А.Барбюса, Э.М.Рэмарка).

Найбольшай таямніцай для пісьменніка ў гэты час становіцца чалавек і яго душа <...>. Галоўнымі, у адрозненне ад першага перыяду творчасці, становяцца не тыповыя абставіны, а тыповыя характары. М.Гарэцкі <...> заглыбляецца ва ўнутраны свет герояў, спрабуе <...> высветліць пабуджальныя матывы іх учынкаў. Змены ў поглядах пісьменніка адбіліся на структуры апавяданняў:

– дыстанцыянаванне ад свайго героя;
– паслабленне суб’ектыўна-ацэначнага пачатку;
– аб’ектывізацыя апавядальнай манеры;
– навелістычнасць апавяданняў [3].

<...> На супярэчнасці грамадскага характару пісьменнік рэагуе эцюдамі “Габрыелевы прысады”, “Кіславодскія замалёўкі”, “Знібее сэрца” (усе 1917 г.). Ён спрабуе знайсці адказ на пытанні, якія тычыліся лёсу Бацькаўшчыны, будучыні свайго народа, задумваецца над мэтаю і сэнсам чалавечага жыцця, выказвае запаветную мару ўбачыць цэласнага гарманічнага, разняволенага чалавека. У гэты час Гарэцкі звяртаецца да публіцыстыкі, іншыя жанры адсоўвае на другі план [3].

### 3 Гарэцкі-драматург (“Антон”, “Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы”).

Першым драматургічным творам М.Гарэцкага з’яўляецца кароткі жалобны абразок **“Атрута”** (увайшоў у зб-к “Рунь”). Асноўная праблема твора – праблема п’янства. Менавіта гарэлку аўтар называе атрутай, што сапраўды труціць чалавека (у дадзеным творы Рамана), яго жыццё і нават пазбаўляе жыцця яго блізкіх.

Этапнай з’явай у творчасці М.Гарэцкага <...> стала драматызаваная аповесць **“Антон”** (Абразы жыцця; 1914, друкавалася ў 1918 і 1919 гг.), якая ўбірае ў сябе структурныя і вобразна-стылявыя пачаткі эпасу і драмы. <...> Галоўная тэма “Антона” – лёс беларускага народа на гістарычным зломе эпох, драматызм пошукаў выйсця з крызісу, у якім апынулася грамадства, розныя яго пласты. А, па словах **А.Адамовіча**, гэта і “развагі маладога Гарэцкага пра беларускую літаратуру, пра яе стан, пра яе задачы, будучыню” [4, с. 24]. На думку ж **І.Чыгрына** гэты твор і роздум пра тое, “які герой сёння патрэбен беларускай літаратуры, каб яна здолела на найлепшым узроўні заявіць пра сябе ў сям’і сталых літаратур свету” [18, с. 15].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Удзельнікамі канфлікту ў творы з’яўляюцца панскі ляснік Аўтух Жабон і яго сын Антон, яны – носьбіты супрацьлеглых уяўленняў пра дабро і зло, ісціну, справядлівасць. У кожнага героя свая праўда, свая логіка, шмат у чым справядлівая [3]. Так, Антон лічыць, што яго бацька жыве не па хрысціянскіх законах. <...> Аўтух жа не разумее душэўных памкненняў сына, смяецца з яго веры, увогуле лічыць непаўнацэнным <...>. Сваю схільнасць да гарэлкі тлумачыць душэўнай прыгнечанасцю, а нежаданне маліцца ў царкве – няшчырасцю людзей, якія там моляцца.

Антону, з аднаго боку, уласцівы высакародства, прага духоўнай чысціні, паважлівыя адносіны да людзей. З другога боку – празмерная чуллівасць да сябе і блізкіх, жаданне ахвяраваць сабою дзеля выпраўлення іншых [3]. Ці, па трапных словах **В.Максімовіча**, якія тычацца герояў ранніх апавяданняў Гарэцкага: “Усе яны ўскладаюць на сябе крыж праклящця, ідуць на раскрыжаванне, даючы тым самым іншым шанц на выратаванне душы” [13, с. 21]. Як сведчыць развязка твора, смерць Антона выпраўляе Аўтуха...

Вычарпаўшы, на свой погляд, усе сродкі ўздзеяння на старога, Антон <...> адважваецца перарваць род Жабона-п’яніцы. Ён забівае свайго сына і смяротна раніць сябе, дачка паспявае ўцячы [3].

<u>Адметнасць пабудовы сюжэта</u> аповесці ў тым, што са смерцю галоўнага героя дзеянне твора не заканчваецца. Яно перанесена ў Вільню, у іншы неназваны горад, на вясковыя дарогі. Самагубства Антона становіцца прадметам палемікі для прадстаўнікоў розных сацыяльных сіл. Так, наведвальнікі “Славянскай кафейні” (беларускі аўтар, польскі публіцыст і маскоўскі дэмакрат) перавялі гаворку ў шырокі сацыяльна-філасофскі план <...>. Польскі публіцыст і маскоўскі дэмакрат прычыны паводзінаў Антона “бачаць у эканамічнай адсталасці краю, у цемры і невуцтве” [5, с. 210]. А “беларускі аўтар” трагедыю Антона расцэньвае як спробу знайсці выйсце з цяжкага становішча, разабрацца ў трагедыйных праявах жыцця. Вытокі трагедыі Антона ён бачыць у духоўным крызісе грамадства, калі старыя багі “струпехлі”, а новыя (“багі цела”) прыйшліся недаспадобы беларускаму грамадству. Утылітарна-прагматычная мараль, заснаваная на прыярытэце матэрыяльных пачаткаў перад духоўнымі ўступае ў супярэчнасць з нацыянальным менталітэтам беларуса <...>. Але Антон, які дбаў пра душу, давёў уласную ідэю да абсурду, стаў яе ахвярай [3].

*Паводле А.Адамовіча*: “<...> Дастаеўскі моцна адчуваецца ў аўтарскім асэнсаванні рэальнай падзеі... Ад факта ісці да глабальных абагульненняў аб цэлым народзе, аб нацыянальным характары, да сацыяльных прагнозаў, нават прароцтваў” [4, с. 28].

*Паводле В.Максімовіча*: “Абодва творы (“Антон” і “Магіла льва” Купалы – Т.Ф.) лучыць адмыслова прэпарыраваны ніцшэанскі матыў бунту супраць маралі, што прыводзіць у выніку да прынцыпу ўсёдазволенасці” [14, с. 174].

*Паводле І.Чыгрына*: “М.Гарэцкі стварае выключна цікавы вобраз селяніна-багаборца” [18, с. 15]. “Чаму ж багаборца? Ды таму, што ідзе супраць законаў Бога (Бог жа творца жыцця-быцця). Чаму ён такі загадкавы?..

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ды таму, што ніхто не можа дапусціць думкі, што неадукаваны селянін здатны пераступіць законы створанага Богам людскога агульнаўпарадкавання. Менавіта ў тым ідэйны сэнс вобраза Антона Жабона” [18, с. 16].

*Паводле П.Васючэнкі*: “Што прымусіла... героя, рахманага і набожнага селяніна, зрабіць жудаснае, здавалася б, нематываванае злачынства, замахнуцца на жыццё ўласных дзяцей? <...> пісьменнік дае зразумець, што <...> таямніца Антона <...> надта глыбока схаваная ў прыцемках несвядомага, у тых глыбінях чалавечай душы, дзе можа ўтойвацца непрадказальнае, пачварнае [8, с. 44–45].

“**Чырвоныя ружы**” (1923, дапрац. у 1926) – чатыры абразкі з мінулага жыцця. Адлюстраванне падзей у іх “ахоплівае больш чым 50-цігадовы перыяд гісторыі народа – ад паншчыны да восені 1917 г. Гістарычны экскурс спатрэбіўся драматургу, каб праз лёс канкрэтных сялянскіх сем’яў (прыгонныя Мацей, Сцяпан, Мірон, іх дзеці і ўнукі) аналітычна-мастацкім хляхам устанавіць, з якімі ж маральнымі, духоўнымі набыткамі прыйшлі працоўныя масы да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вывад, да якога прыходзіць пісьменнік, несуцяшальны: стагоддзі прыгнёту, бяспраўнасці, здзеку прывялі да таго, што сялянства ў рэвалюцыі выступае носьбітам дзікага бунту, рабаўніцтва і разбурэння (“Рабяты, усё народнае! Бяры!”). Мастак-гуманіст не мог даць маральнага баслаўлення рэвалюцыі, якая вылівалася ў акт бяссэнснай помсты і вандалізму і не несла сцвярджальнага пачатку. М. Гарэцкі з глыбокім спачуваннем, але без ідэалізацыі і апалагетыкі малюе вобраз пана Нявольскага, вобраз яго экзальтавана-рамантычнай дачкі Марыні, што цалкам адпавядае гуманістычным поглядам пісьменніка ў віленскі перыяд яго творчай дзейнасці” [3, с. 402].

“**Жартаўлівы Пісарэвіч**” (1922): “Стварэнне завершанага нацыянальнага характару для любой літаратуры можна лічыць той кропкай адліку, з якой пачынаецца яе паўнацэннае жыццё. <...> Мастацкая канцэпцыя нацыянальнага характару, створаная ў <...> п’есе М. Гарэцкага «Жартаўлівы Пісарэвіч», стала пэўным прарывам для ўсёй беларускай літаратуры. <...>

Галоўны герой твора – Алесь Пісарэвіч. Ратуючыся ад немцаў, ён вымушаны разам з сям’ёй шукаць прытулку <...> «у глухім расійскім горадзе». Выкінуты вірам жыцця з роднай старонкі, Пісарэвіч актывізуе ўсе свае духоўныя сілы, каб падтрымаць родных і самога сябе ў тых умовах, якія склаліся. <...>

Зварот да тэмы бежанства ў «Жартаўлівым Пісарэвічу» невыпадковы. Гэта не проста паказ яшчэ адной трагічнай старонкі нашай гісторыі. Гэта <...> пэўны мастацкі прыём <...>. У дадзенай п’есе вельмі выразна праецыруюцца асноўныя, тыповыя рысы нацыянальнага характару. Пісарэвіча не прымаюць такім, які ён ёсць. Для людзей ён – «кручаны», паводзіны яго здаюцца дзіўнымі, незразумелымі. Вельмі часта ў яго адрас гучаць рэплікі кшталту: «вас таўкачом у ступе не зловіш», «не пазнаць, ці ён заможны, ці ён убогі», «колькі ў вас гэтага гонару», «усё вам жарцікі», «не дурыце вы», «падумаеш, паны дужа вялікія». Пісарэвіча і яго сям’ю лічаць уцекачамі з Польшчы, нідзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў творы не гучыць тое, што галоўны герой – беларус, і сам ён пра гэта ніколі не гаворыць. Але, як слушна адзначыў Дз. Бугаёў <...>, хоць «Пісарэвіч непасрэдна не атэстуецца ў творы як свядомы беларускі адраджэнец, уся сутнасць ягоная – тыпова беларуская, асабліва гумар, праз які нацыянальная адметнасць Пісарэвіча выяўляецца найбольш выразна». <...> Аўтар надзяляе героя багатай мовай. У Пісарэвіча для кожнага чалавека на любую жыццёвую сітуацыю знойдзецца трапнае выслоўе: «папаў, як у нерат: ні ўзад ні ўперад; відаць жа пана па халявах; дажыліся казакі – ні хлеба, ні табакі; быў конь, ды з'ездзіўся; у гасцёх добра, а ў сваёй хаце яшчэ лепей». М.І. Мушынскі ў пасляслоўі да п'есы піша: «Пісарэвіч – гэта сапраўдны герой гісторыі, гэта нацыянальны тып, які насуперак злому лёсу і чэрствым людзям сцвярджае высокую чалавечую годнасць, сілу і самапавагу». <...> Адразу пасля прыезду Пісарэвічаў у Расію пачынаюцца пакуты: спачатку некалькі дзён давялося жыць на вакзале, бо ніхто не хацеў браць сям'ю да сябе на кватэру <...>; потым <...> Пісарэвічам ніяк не ўдаецца забраць з прытулку дзяцей; не стала грошай, «задаўжалі» гаспадыні за кватэру, жонка вымушана цэлы дзень стаяць у чарзе за хлебам, а сам Пісарэвіч павінен боты мужыкам ладзіць за гнілую бульбу.

Здавалася б, што ўсе тыя няшчасці, якія зваліліся на іх галаву, павінны былі зрабіць гэтых людзей больш жорсткімі. Але нават у самы цяжкі момант Пісарэвіч не траціць уласнай годнасці, гатовы дараваць усё і ўсім. <...> Хоць фінал твора і трагічны («Мужа без абраду, без труны, як сабаку, у пясок закапалі, дзеці з голаду пухнуць», – крычыць у роспачы жонка Пісарэвіча), хоць гучыць п'еса даволі песімістычна, мы адчуваем, што сапраўдны беларус <...> незалежна ад таго, у якую жыццёвую сітуацыю ён трапіў, заўсёды здолее паказаць сябе належным чынам" [19, с. 3–6].

### 4 Дакументальна-мастацкія запіскі "На імперыялістычнай вайне", аповесці "Меланхолія", "У чым яго крыўда", "Ціхая плынь", "Дзве душы".

"У аповесці «**На імперыялістычнай вайне**» Гарэцкага (1914–1919, 1925) выявілася яшчэ адна асаблівасць яго таленту – імкненне быць дакладным і праўдзівым. Твор стаў такім жа «жывым сведчаннем», «чалавечым дакументам» пра вайну, як і раманы яго сучаснікаў Анры Барбюса «Агонь», Эрыха Марыі Рэмарка «На Заходнім фронце без зменаў», Эрнэста Хемінгуэя «Бывай, зброя!». У герояў гэтых пісьменнікаў, якія належаць да «згубленага пакалення», шмат агульнага, нягледзячы на іх розную нацыянальную і сацыяльную прыналежнасць, непадабенства характараў і ладу жыцця. Усе яны сапраўды «згубленыя»: для гісторыі, творчасці, шчасця. Яны вярнуліся з вайны расчараваныя ў галоўных жыццёвых каштоўнасцях, давяраючы толькі самім сабе, сваім франтавым сябрам, каханым.

Вальнапісаны Лявон Задума, ад імя якога ідзе апавяданне, належыць да тыпу людзей з «арыстакратычна-духоўным поглядам» на свет. Гэтым ён вылучаецца сярод астатніх. Трапіўшы на вайну, дзе ўсё супярэчыць яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

натуры, ён старанна фіксуе ў сваіх запісах жахі франтавога побыту, якія амаль да дэталяў паўтараюць падобныя апісанні яго еўрапейскіх калег па цэху, што сведчыць аб назіральнасці і глыбіні думак. Але Задума належыць да маладой нацыі, якая перажывае духоўнае Адраджэнне, і марыць пра час, калі пабачыць вызваленне свайго народа. Ад імя аднапалчан, жывых і мёртвых, ён сведчыць супраць братазабойчай вайны і прызнае толькі адну вайну – за свабоду і незалежнасць. Само прозвішча героя «Задума» не выпадковае: чалавек шукае адказы на свае пакутлівыя пытанні. Ён адкідае прэч усякае псеўдапатрыятычнае красамоўства пра подзвігі і славу: убачанае і перажытае стала надзейнай прышчэпкай ад мілітарысцкага захаплення зброяй. Лявон Задума адназначна становіцца на бок ахвяр вайны: «Між «паноў» няма столькі вялікіх душ, колькі ёсць у «простым народзе». Звычайны запіс у яго франтавым блакноце: «Я думаў пра сваіх братоў-сялян» <…>. Думка пра народ, які ўстае з каленяў, узвышае героя над падзеямі і ўласным лёсам. Яго хвалюе пытанне: «А ці вызваліцца мой народ? Што яму дасць гэта вайна?» Яго падтрымлівае вера: «І не дарэмна мы тут ваюем – да нечага даваюемся. І калі тут не заб'юць, то надыдзе пара – паваюем і за нешта другое»” [5, с. 212–213].

Аповесць «**У чым яго крыўда?**» створана на аснове ранніх апавяданняў. Гэта было прадыктавана, на думку М.Мушынскага [3], агульнай тэндэнцыяй развіцця прозы М.Гарэцкага, тэндэнцыяй умацавання яе эпічнай асновы, што выявілася ў новым ракурсе адлюстравання рэчаіснасці. Героі ранніх апавяданняў Гарэцкага акцэнтавалі ўвагу на негатыўных баках вясковага жыцця, “а Лявон Задума ўжо валодае здольнасцю выразней бачыць і станоўчыя з’явы ў жыцці вёскі <...>. На розных сэнсава-змястоўных узроўнях вырашаны і канфлікт героя з вясковым асяроддзем. У прыватнасці, па-новаму прачытваецца і сітуацыя з лістом Кастуся да Ганначкі. Там бесцырымонныя паводзіны вяскоўцаў, якія калектыўна чыталі інтымнае пасланне юнака да дзяўчыны, былі галоўнай прычынай яго “крыўды”. У аповесці ж сэнсавыя параметры “крыўды” вызначаюцца не толькі перажываннямі Лявона, але і ўсведамленнем сацыяльных прычын нізкай побытавай культуры сялян” [3, с. 404].

Аповесць «**Меланхолія**» (1916–1921, 1928), “з’яўляецца часткай трылогіі, у якую ўваходзяць аповесці «У чым яго крыўда?», <...> і «На імперыялістычнай вайне». Ва ўсіх названых творах дзейнічае адзін і той жа галоўны герой – Лявон Задума. Аўтар «Меланхоліі» адступае ў перадгісторыю падзеяў і паказвае перыяд духоўнага пасталення героя, адраджэнскія погляды і перакананні якога правяраюцца жыццём. Сутыкнуўшыся з жорсткай рэальнасцю непрыняцця яго захаплення беларушчынай, Задума пераконваецца ў тым, што многія праблемы немагчыма вырашыць без палітычнай свабоды і нацыянальнай незалежнасці. Пачуццё яго глыбокага патрыятызму абражана, прыніжана, кожная новая сутычка з «ворагамі беларушчыны» паглыбляе яго душэўныя пакуты. Звычайна разважлівы, зычлівы, юнак у такія моманты блізкі да псіхічнага зрыву. Яго цвеляць думкі пра марнасць існавання, ім авалодвае меланхолія,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хвароба душы многіх шчырых беларусаў. Лявон едзе ў родную вёску, дзе яго душа, засмучаная расчараваннямі, знаходзіць супакой у працы, штодзённых гаспадарчых турботах, простых зямных радасцях” [5, с. 214].

“**Ціхая плынь**”: “Погляд простага чалавека, неспакушанага ў вялікай палітыцы, на свет выяўляецца і ў аповесці “Ціхая плынь” (1917–1930). Хомку Шпаку, як і Аліндарку ў Францішка Багушэвіча, не шанцуе з першых дзён жыцця: невясёлае маленства, калі бацькі пакідаюць дзіця аднаго ў хаце, школьны настаўнік, былы унтэр-афіцэр, які паводзіць сябе з вучнямі, як звычайны салдафон, гаспадар карчмы, які ні з таго ні з сяго падазрае падлетка ў крадзяжы. У пачатку аповесці ствараецца эпічны вобраз старасвецкай Беларусі, некалі магутнай еўрапейскай дзяржавы з багатай культурай, якая пакрысе ператварылася ў «задворкі Еўропы». У іншых раздзелах твора чуецца песня «ціха шугаючага» цяпельца пра тое, што жыццё ў краі яшчэ не згасла канчаткова, і «ціхая песня», якая гучыць у душы Хомкі, «паэта ў душы». Гэтую песню заглушаюць грымоты гармат і грозныя зыкі сусветнай вайны-бойні” [5, с. 211–212].

«**Дзве душы**»: “Ігнат Абдзіраловіч, герой аповесці «Дзве душы» (1918–1919), <...> шмат разважае над сэнсам убачанага, намагаецца спасцігнуць тэндэнцыі грамадскага развіцця, папярэдзіць аб магчымых наступствах. Аповесць уражвае эмацыянальнай пераканаўчасцю ў паказе рэвалюцыйнага часу, калі ў жорсткай сутычцы сышліся супрацьлеглыя палітычныя сілы. У творы шмат замалёвак з натуры, якія дакладна выяўляюць маральную сутнасць бальшавіка Васіля, зводнага брата Ігната Абдзіраловіча, авантурыста Карпавіча, прапаведніка ваяўнічага амаралізму Гарэшкі, папуліста князя Гальшанскага, міліёншчыка Макасея і інш. Сваім дакументалізмам і дакладнасцю аповесць Гарэцкага становіцца ў шэраг такіх праўдзівых твораў пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну, як дзённік Івана Буніна «Праклятыя дні», нарысы Максіма Горкага «Несвоечасовыя думкі», лісты Уладзіміра Караленкі з Украіны. У творы, паводле ацэнкі крытыка Антона Луцкевіча, «раскрываецца духоўнае хараство барцоў за беларускую нацыянальную ідэю». Адны з герояў Гарэцкага, «свядомыя беларусы», настаўнікі Іра Сакавічанка і Мікола Канцавы ўжо зрабілі свой маральны выбар на карысць беларушчыны, а другія, такія, як Ігнат Абдзіраловіч, з прычыны сваёй адвечнай (генетычнай, псіхалагічнай, гістарычнай) раздвоенасці стаяць у нерашучасці на раздарожжы. Само жыццё прыводзіць Абдзіраловіча, сялянскага сына, які воляю лёсу выхоўваўся ў панскай сям’і, да неабходнасці таксама рабіць свой выбар. Ён не прымае «праўду» купца Макасея, заклапочанага толькі думкай «аб ратаванні маёмасці», хоць ведае, што пры гэтым губляе прыязнасць да сябе яго дачкі Алі, якую палка кахае. Спачуваючы змаганню «з панскай няпраўдай», узначаленаму бальшавікамі, ён, аднак, сумняваецца ў ажыццяўленні утопіі аб «зямным раі», тым больш што крывавая практыка рэвалюцыйнай бойкі («чразвычайкі») пераконвае яго ў адваротным. Але і «беларускую ідэю» ён не адразу прымае: перашкаджае школьная і універсітэцкая адукацыя, якую ён атрымаў на расійскай мове, нацыянальная індыферэнтнасць (абыякавасць), неразуменне ролі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нацыянальнага ў жыцці, інтэлігенцкая рэфлексія і інш. Назіраючы з сімпатыяй за спробамі беларускіх патрыётаў «абудзіць народ», ён становіцца на іх бок і дапамагае арыштаваным сябрам, Канцавому і Сакавічанцы, выбавіцца з чэкісцкіх засценкаў на волю. Абдзіраловіч перастае быць «толькі пабочным глядзеннікам і ціхім думаннікам», пакідае шэрагі «нядбайных», па тэрміналогіі яго сяброў, адольвае хваробу «дваістасці», «расхрыстанасць, разлезласць, мяккацеласць»” [5, с. 213–214].

**5 Творчая гісторыя рамана “Віленскія камунары”; “Камароўская хроніка” як эпапея.**

«**Віленскія камунары**»: “твор, напісаны ўжо тады, калі над лёсам Максіма Гарэцкага згушчаліся чорныя хмары, стаў спробай празаіка аддаць належнае подзвігу змагароў за свабоду, якія ахвяравалі сваім жыццём дзеля перамогі. Мацей Мышка, нашчадак беларускіх паўстанцаў, вачыма якога паказаны падзеі, добра ўпісаўся ў шэрагі абаронцаў славутай Віленскай тарыбы (гарадской рады), дзе былі беларусы і літоўцы, палякі і расійцы, эсэры, бундаўцы, меншавікі, бальшавікі, нацыяналісты і інтэрнацыяналісты – усе, каго яднала ідэя волі. У шматгалоссе ідэйных спрэчак, якія аўтар ўзнаўляе на дакументальным матэрыяле, герой уносіць голас здаровага сялянскага розуму, які не паддаецца настроям, за знешнім бачыць сутнасць. Мышка ўмее ўзняцца над акалічнасцямі, над уласным самалюбствам. У гэтым яму дапамагае іронія – сямейная рыса, уласцівая яго бацьку і дзеду. Гэтая іронія так ці інакш выяўляецца ў многіх творах Гарэцкага. Мацей Мышка пасмейва-ецца з сябе, дзеда, бацькі, якіх лёс кідае з агню ў полымя. Ён іранізуе, часта дасціпна, над прэтэнзіямі эфемерных партыек на ісціну ў апошняй інстанцыі. І толькі ў адным выпадку іронія героя саступае месца гераічнай пафаснасці, калі Мацей у якасці апошняга сведкі апавядае пра пакутлівую пагібель сяброў-камунараў, акружаных белапалякамі ў будынку Віленскага рэўкама. За многімі героямі рамана стаяць рэальныя гістарычныя асобы, штоператварыла раман у мастацка-дакументальны твор” [5, с. 214].

«**Камароўская хроніка**»: “Гэтаму раману-эпапеі было наканавана стаць “лебядзінай песняй” Максіма Гарэцкага. У падмурку яе зместу – лёс беларускага сялянства на працягу XIX і пачатку XX ст. Сюжэт хранікальна-біяграфічны: падзеі вясковага жыцця, вялікія і малыя, узнаўляюцца падрабязна, грунтоўна, наколькі дазваляў матэрыял, сабрана, запісаны аўтарам ад сведкаў. Тут моцны ўплыў летапіснай традыцыі: Камароўка, правобразам якой паслужыла Малая Багацькаўка, як Баркулабава ў славутым летапісе, адлюстравала ў сабе гісторыю беларусаў. Аўтар апавядае, як узнікла, разраслася вёска і як пачалося яе руйнаванне. Сюжэт хутка насяляецца шматлікімі постацямі яе жыхароў, усіх, пра каго памяць хоць што-небудзь захавала. У цэнтры ўвагі, аднак, сям’я Батураў-Задумаў. За постацямі гэтага сялянскага роду бачацца прататыпы, якімі сталі дзяды-прадзеды, бацькі, браты, сястра, блізкія і далёкія сваякі самога Гарэцкага. Купалаўскае “сыходзіш, вёска, з яснай явы” Гарэцкім успрымалася ў яго эпапеі-дзённіку як развітанне з патрыярхальным мінулым, з сялянскай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цывілізацыяй. Раман завяршаецца “Камароўскім парадам”: аўтар “абыходзіць” апошні раз усе хаты вёскі, лаканічна паведамляючы пра лёс іх жыхароў, апошніх з камароўцаў” [5, с. 215].

**Літаратура:**

**Асноўная**


1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989. – С. 351–363.

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998. – С. 386–413.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 319–334.


**Дадатковая:**


4 Адамовіч, А. “Браму скарбаў сваіх адчыняю” / А.Адамовіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1980. – 224 с.

5 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006.

6 Бугаёў, Дз. Максім Гарэцкі / Дз.Бугаеў. 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск, 2003.

7 Вабішчэвіч, В. “І вечнасць варушыцца ў маёй істоце”: М.Гарэцкі і гісторыя / В.Вабішчэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 7–8.

8 Васючэнка, П.В. Зачараванасць патаёмным. Максім Гарэцкі і сімвалізм / Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / Пятро Васючэнка – Мінск: Галіяфы, 2009. – С. 38–48.

9 Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4-х т. Т.1. Апавяданні / М.Гарэцкі. – Мінск: Маст.літ., 1984. – 446 с.

10 Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4-х т. Т.2. Аповесці. Драматычныя абразкі / М.Гарэцкі. – Мінск: Маст.літ., 1985. – 416 с.

11 Гарэцкі, Р. Браты Гарэцкія / Радзім Гарэцкі. – Мінск: Медысонт, 2008. – 344 с.

12 Кенька, М. Аўтабіяграфізм у творчасці М.Гарэцкага / М.Кенька // Роднае слова. – 1997. – № 2.

13 Максімовіч, В. Праблема “дзвюх душ” у ранніх апавяданнях М.Гарэцкага / В.Максімовіч // Роднае слова. – 2000. – № 5.

14 Максімовіч, В. Канцэпцыя асобы ў творчасці М.Гарэцкага / Максімовіч, В. // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. – Мінск, 2000. – С. 156–182.

15 Мушынскі, М. Максім Гарэцкі. Перыяды творчасці / М.Мушынскі // Полымя. – 1998. – № 5.

16 Мушынская, Т. “Ва ймя святога ўсім нам адражэння”. Агляд творчасці М.Гарэцкага / Т.Мушынская // Роднае слова. – 1993. – № 2.

17 Тычына, М. На выспе Патмас. Творчасць М.Гарэцкага / М.Тычына // Роднае слова. – 1993. – № 2.

18 Чыгрын, І. Паміж былым і будучым / І.Чыгрын. – Мінск: “Навука і тэхніка”, 1994. – 168 с.

19 Шышко, А.В. Альтэрнатыўны шлях стварэння нацыянальнага характару ў п’есе Максіма Гарэцкага «Жартаўлівы Пісарэвіч» / А.В. Шышко // Веснік БДУ. Сер. 4. – 2008. – № 1. – С. 3–6.


**Электронныя рэсурсы**


20 Гарэцкі, М. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/maksim.haretski

21 Гарэцкі, М. Творы / М.Гарэцкі. Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Maksim_Harecki/


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.8 ЗМІТРОК БЯДУЛЯ (1886–1941)

1 Біяграфія: умовы фарміравання і асаблівасці таленту
2 Паэзія З.Бядулі "нашаніўскага" перыяду і 20-х гг. (зб-к "Пад родным небам"); лірычныя імпрэсіі (зб-к "Абразкі"); апавяданні 1912 – 1915 гг.
3 Апавяданні 20-х гг.; аповесць "Салавей" і аўтабіяграфічныя аповесці "Набліжэнне" і "У дрымучых лясах".
4 "Язэп Крушынскі" як сацыяльна-псіхалагічны раман; праблематыка, сістэма вобразаў.

*Словам "парадокс" можна вызначыць прыход гэтага пісьменніка ў беларускую літаратуру. Як сталася, што ў той час, калі свае сыны, пазнаўшы адукацыю, часта адмаўляліся ад роднай мовы і культуры, яўрэйскі хлопчык насуперак сям'і і абшчыне (кагалу) адчувае сябе ў гэтай культуры родным сынам?*

### 1 Біяграфія: умовы фарміравання і асаблівасці таленту

Празаік, паэт, крытык, публіцыст, адзін з пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры, які займае ў ёй месца сярод зорак першай велічыні. Па дамінантнай рысе сваёй творчасці З.Бядуля – лірык, пісьменнік ліра-эпічнага складу. Сапраўднае імя – Самуіл Яфімавіч Плаўнік.

Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 1886 г. | Нарадзіўся ў небагатай яўрэйскай сям'і ў мястэчку Пасадзец на Віленшчыне (цяпер Лагойскі р-н Мінск. вобл.); бацька быў арандатарам, гандляром, прыказчыкам у купца-лесапрамыслоўца; маці працавала швачкай-каптурніцай; дзед – каваль і меднік, меў уласную бібліятэку. |
| 2 | 1893 г. | вучыцца ў хедары (пачатковай школе) у мястэчку Даўгінава. |
| 3 | прыкладна да 1901 г. | вучыцца ў ешыбоце (школе рабінаў) у Іллі; ешыбот не закончыў, прычыны даследчыкі называюць розныя (выключылі / пакінуў вучобу сам). |
| 4 | 1902 г. | пачаў працаваць канторшчыкам на лесараспрацоўках. |
| 5 | 1907 г. | пачаў пісаць вершы на рускай мове і пасылаць іх у пецярбургскія часопісы; вершы хвалілі, але не друкавалі. |
| 6 | 1910 г. | пачаў друкавацца: у газеце «Наша ніва» змешчана імпрэсія на беларускай мове «Пяюць начлежнікі». |
| 7 | 1912 – 1915 гг. | у "Нашай ніве" было надрукавана апавяданне "Малітва малога Габрусіка", пасля чаго Бядуля быў запрошаны В.Ластоўскім у Вільню на сталую працу (працаваў у расійскай газеце "Вечерняя газета", пасля ў "Нашай ніве". |
| 8 | 1913 г. | выдаў зборнік "Абразкі" (Пецярбург, выдавецтва "Загляне сонца..."). |
| 9 | 1915 г. | з набліжэннем фронту пакідае Вільню; некаторы час жыве ў бацькоў, потым едзе ў Мінск (сустракае дзве рэвалюцыі, перажывае нямецкую, затым белапольскую акупацыі, працуе ў Беларускім камітэце дапамогі ахвярам вайны). |
| 10 | 1919 г. | працаваў у газеце "Савецкая Беларусь", быў рэдактарам дзіцячага часопіса "Зоркі" (пазней – краязнаўчага ч-са "Наш край"). |
| 11 | 1922 г. | выйшла кнігі паэзіі «Пад родным небам», лічыцца самым лепшым зб-кам пісьменніка. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| 12 | 1923 г. | выйшаў зборнік апавяданняў «На зачарованых гонях». |
| 13 | прыкл.1924 – 1926 гг. | уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне "Маладняк" (у вершах гэтага перыяду (зб-к «Буралом», 1925) шмат штампаванай пафаснай рыторыкі і ўслаўлення «чырвоных датаў», няроўных рытмаў і «цыклапічных вобразаў»[14]), пасля – ва "Узвышша" (у аднаіменным ч-се друкаваліся "Салавей" і "Язэп Крушынскі"); працаваў у Інбелкульце. |
| 14 | 1927 г. | ажаніўся з Марыяй Ісакаўнай Плаўнік (мелі дачку (1929) і сына (1934)). |
| 15 | 1928 г. | выйшла кніга аповесцей «Салавей», прысвечаная мінуўшчыне, часам прыгоннага права. |
| 16 | 1929 г. | выйшаў двухтомны раман "Язэп Крушынскі". |
| 17 | 30-я гады | "сышоў у падполле", пісаў творы для дзяцей («Мурашка-Палашка» (1939), «Сярэбраная табакерка» (1940)). |
| 18 | ліпень 1941 г. | памёр у цягніку ад інфаркту падчас эвакуацыі па дарозе ў Ташкент (г. Уральск (Казахстан), там і пахаваны). |

## 2 Паэзія З.Бядулі "нашаніўскага" перыяду і 20-х гг. (зб-к "Пад родным небам"); лірычныя імпрэсіі (зб-к "Абразкі"); апавяданні 1912 – 1915 гг.

***– ранняя лірыка***

Бядулю было наканавана перажыць шмат крыўдаў і несправядлівасцяў. І адна з іх тая, што пры жыцці стала напаўзабытай багатая лірычная спадчына паэта [5].

"Побач з Багдановічам стаяў Бядуля ў асэнсаваным імкненні ўзбагаціць новую беларускую літаратуру паэтычнымі дасягненнямі пачатку XX стагоддзя, даць узоры разнастайных форм, памераў, рытмаў. Сваёй творчасцю пісьменнік як бы даказаў магчымасць беларускай мовы выказаць, перадаць самыя тонкія адценні пачуццяў і перажыванняў чалавечай душы" [5, с. 251].

Навучанне ў хедары і ешыбоце паўплывала на змест і форму яго твораў, "якія культурна ўзбагацілі жанрава-стылявую плынь нашай літаратуры, арыентуючы яе на ўзнёслую ўрачыстасць Талмуду і Бібліі. Як і Купала, ён аддаў даніну дэкадансу, у яго вершах і празаічных абразках відавочны ўплыў імпрэсіянізму" [14, с. 203].

Вядомыя вопыты Бядулі ў галіне формы: з белым вершам ("Каўказ", "Віленскія ўспаміны"), верлібрам ("Сны", "Чырвона-чорная жалоба"). Разам з Багдановічам ён спрабаваў "прывіць" беларускай паэзіі урбаністычную тэматыку ("Віленскія ўспаміны"). Нарэшце, як і многія сімвалісты, Бядуля надаваў выключнае значэнне музыцы твораў, аб чым гавораць іх назвы: "Пяюць начлежнікі...", "Здалося мне, што струны нейкія рваліся...", "Акорды", "Акорды мора", "Сымфонія", "Містэрыя". Аб рытмічным багацці і разнастайнасці лірыкі Бядулі сведчаць вершы "Доч месяца", "Ля срэбнай затокі".

Ранняй творчасці Бядулі ўласціва рэлігійная тэматыка і вобразнасць (цыкл "На біблейны лад"). Твораў з выразным рэлігійным зместам у Бядулі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вельмі многа. Але яны, уключаючы і згаданы цыкл, у далейшым не передрукоўваліся, а старанна замоўчваліся” [5, с. 244].

Багдановіч і Бядуля, бадай, адзіныя беларускія пісьменнікі пач. XX ст., у творчасці якіх узнікалі антычныя матывы. Бядулю было таксама характэрна і адчуванне катастрафічнасці жыцця, нетрываласці Хараства. Яго, як Купалу і Багдановіча, не мінае *тэма* раўнадушша і нават *варожасці сусвету* да чалавечага існавання. В.Максімовіч [8] лічыць, што характэрны стан лірычнага героя Бядулі – безупынная *пагоня за “імгненнямі красы”* (цыкл “Настроі”). Паэт імкнецца ўлавіць вібрацыю чалавечай душы, зменлівасць настрояў і перажыванняў. Скразным у яго метафарычнай сістэме з’яўляецца эфект “мігцення”, “дрыжання”, “трымцення”: “*зарніцы квітнелі ў мігценні*”, “*зоркі ў водным люстры мільгаюць*”, “*чулы аер дрыжыць*” і інш. Для многіх вершаў Бядулі, зазначае Максімовіч, характэрна асобая, *перарывістая структура*, калі іх радок дробіцца на часткі, на кароткія фразы, нярэдка ў адно слова, дзеліцца рэзкімі паўзамі (графічна гэта выражаецца мноствам працяжнікаў, шматкроп’яў). Тым самым ствараецца эфект пульсуючага хуткага рытму, рухомасці верша (“Снег”). Звяртаецца паэт і да прыёму супрацьпастаўлення: “*То не снег – то чаромха цвіце...*”. Ёсць у яго і і іншы тып верша – з замаруджаным рытмам, спакойнай мінорнай інтанацыяй, з нетаропкай зменай малюнкаў (“*Аздобіў сакавік у златаблеск даліны, // Быў чысты, нібы шкло, абшар-прастор нябёс, // Сінь-даль адзела туль з сярэбранай тканіны,// Здалёку цёмны бор вяршалінамі трос*”).

З.Бядуля – адзіны паэт з плеяды паэтаў-адраджэнцаў, для якога вялікую цікавасць уяўляла *сфера падсвядомага, ірацыянальнага*. Уся творчасць Бядулі да 1922 г., уключаючы зб-к “Пад родным небам”, праходзіць пад знакам умоўнасці, падтэксту, сімвалічнасці. У гэтым падабенства творчых манер Бядулі і Купалы. Але гэта і адна з прычын таго, лічыць Максімовіч, што вершы Бядулі менш “каціраваліся” ў беларускай літаратуры, амаль не былі прадметам засяроджанай увагі з боку літаратуразнаўцаў [8].

***– вершы аб Першай сусветнай вайне***

“Змітрок Бядуля не давяраў афіцыйнай прапагандзе (афіцыйнаму, казённаму патрыятызму – Т.Ф.) і змог стварыць сваю мастацка-вобразную канцэпцыю крывавай, трагічнай для народаў, у першую чаргу еўрапейскіх, карціну рэчаіснасці. У цэнтры гэтай карціны – разбурэнне, спустошанне, смерць” [6, с. 3] – зазначае даследчыца І.Кульбянкова ў артыкуле “Ад сусветнай тугі да веры ў беларускі шлях. Паэзія Зм.Бядулі 1914-1919 гг.” [6]. Яна вылучае некалькі жанрава-стылёвых груп у паэзіі Бядулі гэтага перыяду: а) вершы пра вайну (у іх паэт –выкрываў падпальшчыкаў / зачыншчыкаў вайны, – выкрываў вайну як антынародную справу, – выкрываў нацыяналістычны чад, што ахапіў у 1914-1915 гг. частку інтэлігенцыі царскай Расіі, а таксама Францыі і Германіі, – прыходзіў у асуджэнні вайны да апакаліптычных высноў, да бязвер’я ў чалавека, у прагрэс гісторыі); б**)** творы на біблейскую тэму; в) творы адраджэнскага гучання; г) сюжэтныя сцэнкі пабытавага характару; д) медытацыі пра мастацтва, паэта і паэзію.

І.Кульбянкова  зазначае, што верш “Сэрца прарока” (1914) – адзін з першых водгукаў паэта на вайну. <...> У стылі сімвалізму як літаратурнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

плыні ў вершы згадваюцца вобразы "*таемнай долі*", "*чорнага бога*", што рассявае "*атручаны мак*", ваўкалака, "*зачараванага*" сну "*пад цяжарам магілы*". <...> Жыццё ў вершы ператвараецца ў фантасмагарычны карнавал змрочных сілаў, атруты панавання сну над явай, забыцця над жывым жыццём. <...> Убачанае і перажытае паэтам у гэты час выявілася ў вершах антываеннага гучання. Пераважная большасць іх уваходзіць у цыкл "Вайна 1914 - 1917". У творах "Ад крыві чырвонай", "Не мы...", "Вайна", "... І сотнямі тысяч...", "Юда жэніцца...", "То не хаты, а курганы...", "Сухавеі", "Ты слязамі і крыжамі..." пісьменнік малюе не менш жахлівыя карціны, чым у вершы "Сэрца прарочa". На ўжо згаданыя наслойваюцца новыя сімвалы: *"чырвоная кроў", "Юда", "сухавеі", "слёзы", "крыжы"*. Замест хат паўстаюць курганы, якія сталі агульнымі дамавінамі для многіх невінаватых людзей (*"То не хаты, а курганы..."*). Сімволіка змрочная. <...> Вайна, на думку аўтара, – заўсёды злачынства, і ёй няма апраўдання. Да ўсяго паэт сцвярджае, што пасля крывавай вайны не застанецца не толькі пераможаных, але і пераможцаў ("*Ціхія сялібы нішчыў "свой" і "вораг". // Працу, пот гаротных панясло віхром*"; "*Пойдзе вой на воя, пойдзе брат на брата; // Так удзень да ночы, уначы да дня*"). <...>

Т.ч., Бядуля асуджае вайну як антыгуманную з'яву. Размову пра вайну паэт вядзе у двух планах: 1) сімволіка-алегарычным, філасофскім і 2) канкрэтным, жорстка рэалістычным.

Зборнік "**Пад родным небам**" (1922 г.), які лічыцца самым лепшым паэтычным зборнікам аўтара, "цэльны паэычным адзінствам бачання свету. Паэт выдатна адчувае жыццё прыроды, яго пейзажныя вершы вабяць дакладнасцю дэталяў, адухаўленнем лесу, поля, рэчкі, сонца, ветру, неба, зорак, месяца, птушак, звяроў, усяго таго, што акружае чалавека ад нараджэння да смерці. Даждлівы дзень, яснота дня. Усё зліваецца ў адно: стагі, дрэвы, прастор" [3, с. 248]. На жаль больш падрабязную інфармацыю пра зборнік знайсці цяжка. А прачытаць зб-к можна ў беларускай электроннай бібліятэцы "Беларуская палічка" [18].

***– лірычныя імпрэсіі (зб-к "Абразкі")***

Вышэй ужо адзначалася падабенства творчых манер Бядулі і Купалы, маючы на ўвазе іх лірыку. І заўважалася, што гэта адна з прычын таго, што вершы Бядулі менш "каціраваліся" ў беларускай літаратуры. А вось лірычныя празаічныя мініяцюры З.Бядулі, што часцей друкаваліся ў "Нашай ніве", зрабілі яму літаратурнае імя. Так, у 1913 г. у Пецярбургу ў выдавецтве "Загляне сонца..." выходзіць зб-к пісьменніка "**Абразкі**" (Новая з'ява ў тагачаснай беларускай літаратуры ў жанрава-стылявым сэнсе). А.Лойка [1] вылучае два віды імпрэсій Бядулі ў згаданым зб-ку: маналагічныя і замалёвачныя. Розняцца яны сваім лірычным героем. У першых з іх герой – незразумелая нікім асоба (чалавек-адзіночка), якая, па словах В.Каваленкі, узвышаецца над асяроддзем сваім багатым духоўным зместам, імкнецца да ўнутранага ўдасканалення, гатовая да самаахвярнасці ў інтарэсах чалавецтва, але асуджана знемагаць ад адзіноцтва і перажываць сваю бяздзейнасць ("Нуда мая", "Вечарам", "Як памру...", "Захаваю нуду сваю...", "У заваражаных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

казках”). У замалёвачных абразках лірычны герой ужо больш глядзіць навокал сябе і заўважае сацыяльную нядолю, што выявілася ў вобразах пастушкі, аратага, рабочых ля вапеннай гары, бабулькі, якая паміраe (“Пастушка”, “Кветка”, “Ля вапеннай гары”, “Без споведзі”). Сярод двух відаў імпрэсій многа прысвечаных жаночай долі <...>. Ёсць у зб-ку “Абразкі” і імпрэсіі-прызнанні лірычнага героя ў каханні. Матыў тугі і адчаю прысутнічае і ў іх <...> (“Прытуліся ка мне”, “Загадка”, “Аб ёй”, “Не пазірай на мяне”). “Па складзе свайго таленту Бядуля адносіцца да кагорты пісьменнікаў рамантычнага светаўспрымання – з вострай, нават балючай цягай да ідэалу, да прыгожага, з неадольнай прагай спасціжэння вечнай таямніцы жыцця” [8].

Акрамя “Абразкоў” Бядуля стварыў Цыкл “**Мініяцюры**”, які ўключае ў сябе такія імпрэсіі як “Зямля”, “Акорды мора”, “Акорды”, “Здалося мне, што струны нейкія рваліся...”, “Ралля”, “Ратай”, “Шаптаў чарот”, “У часе змяркання”, “Не пячы гэтак, сонейка!” і інш.

В.Максімовіч зазначае, што імпрэсіі Бядулі па светапогляднай дамінанце нагадваюць “лірыку ў прозе” рускага пісьменніка пач XX ст. Б.Зайцава. Асаблівасці іх пісьменніцкай манеры – гэта імпрэсіянізм, глыбокі лірызм, што прадыктавана павышанай цікавасцю да пейзажу (які не мае застылых форм і контураў), да ўсяго няўстойлівага, пераходнага, зменлівага [8].

***– апавяданні 1912 – 1915 гг.***

Многія апавяданні З.Бядулі сталі хрэстаматыйнымі: “Пяць лыжак заціркі” (1912), “На каляды к сыну” (1913), “Вялікодныя яйкі” (1913), “Малыя дрывасекі” (1914), “Летапісцы” (1914). Яны, па словах І.Навуменкі, могуць упрыгожыць самую развітую літаратуру. У іх Бядуля паказвае забітую, цёмную вёску. У свой час М.Багдановіч зазначаў, што “са змрочным гумарам малюе ён невясёлае беларускае жыццё і імкнецца адысці ад яго ў фантастычны, казачны свет”. Сам Бядуля пра свае празаічныя творы пісаў наступнае: “Што датычыць фабульных крыніц, то ніводнае апавяданне ў мяне не прыдумана, у аснову паложаны сапраўдныя факты”.

В.Максімовіч лічыць, што менавіта апавяданні задаюць тон трагедыйнай творчасці пісьменніка, у творах побытавага плана ставяцца не абстрактна-метафізічныя пытанні, але тыя праблемы, якія былі актуальныя, злабадзённыя для чалавека пачатку XX стагоддзя. “Бядулю перш за ўсё цікавяць людзі вясковага “дна”. Аўтар імкнецца даследаваць сацыяльныя вытокі, якія параджаюць адпаведныя тыпы чалавечых паводзінаў і псіхалогіі... <...> Канцэпцыя чалавека ў апавяданнях Бядулі ў асноўным рэалістычная, бо характар героя выводзіцца з абставінаў, умоў жыцця. З другога боку, сам чалавек паказваецца ўнутрана складаным, супярэчлівым” [8, с. 280].

“Ключавыя праблемы творчасці Бядулі – сацыяльныя і філасофскія праблемы адчужэння, адзіноты, абязлічвання чалавека, дэтэрмінацыі і свабоды чалавека. Адзіноцтва “асобнага чалавека” сярод мноства людзей – тое, што пасля ў мастацкай свядомасці XX ст. на Захадзе стане адным з неадлучных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кашмараў, найперш у літаратуры экспрэсіяністаў і экзістэнцыялістаў, у творах Кафкі, Сартра, Камю, Сімоны дэ Бавуар, – узрушыла Бядулю яшчэ ў пачатку стагоддзя” [8, с. 280–281].

А. Лойка падкрэслівае, што большасць з апавяданняў “заснавана на драматычным сюжэце з паэтызацыяй незвычайных абставін і незвычайных герояў, з трагічным фіналам” [1, с. 370]. “У цэлым сацыяльна-бытавыя апавяданні З.Бядулі даюць даволі панарамны паказ жыцця гаротнай вясковай і местачковай Беларусі...” [1, с. 372]. Пры гэтым трагічнае нярэдка выступае ў Бядулі ў іпастасі камічнага, як бы “смех праз слёзы” (“Пяць лыжак заціркі”, “Велікодныя яйкі”).

Часта даследчыкі раннія апавяданні Бядулі вызначаюць як навелы. “Сярод ранніх празаічных апавяданняў Бядулі няма твораў разгорнутых, з шырокім ахопам падзей. У навелах, як правіла, адзін-два героі, адна падзея, адна псіхалагічна-эмацыянальная настраёвасць” [3, с. 246].

“У ранніх апавяданнях Бядулі няма героя, з якім можна было б звязаць хоць невялікую надзею на палепшанне жыцця. У гэтым ён падобны да ранняга Гарэцкага, асобныя творы якога цяжка чытаць з-за велізарнага напалу ў іх адмоўнай энергіі (“Антон”, “Ціхая плынь”). Штосьці падобнае бачым і ў лірыцы Купалы ” [3, с. 246].

У прозе, як і ў паэзіі, З.Бядуля намаляваў шмат выдатных карцін навакольнай прыроды <...>. Гэта імпрэсіяністычны жывапіс. Настаўнікамі пісьменніка, на думку даследчыкаў, былі сучасныя яму беларускія і рускія літаратары – Колас, Чэхаў і інш.

**3 Апавяданні 20-х гг.; аповесць “Салавей” і аўтабіяграфічныя аповесці “Набліжэнне” і “У дрымучых лясах”.**

У пачатку 20-х гг. галерэя малюнкаў і партрэтаў папоўнілася апавяданнямі «Дванаццацігоднікі», «Бондар», «Панскі дух», «На балоце». З'яўляецца «новы герой», які нясе з сабой канфлікты савецкага перыяду («Маці», «Дэлегатка», «За годам год») [14].

Аповесць **“Салавей”** першапачаткова друкавалася ў ч-се “Узвышша”. Мае тры варыянты. Выдавалася тройчы: у 1928, 1929, 1932 гг. Апошні варыянт <...> на думку крытыкаў, не самы лепшы: утрымлівае зашмат натуралістычных сцэн. Пісьменнік залішне запалітызаваў, заідэалагізаваў свой твор. Былі меркаванні (М.Смолкін), што “Салавей” – гістарычны твор. На самой справе, аповесць не адпавядае ніводнай з умоў, якія вызначаюць жанр гістарычнага твора. Тут няма героя, які быў бы гістарычнай асобай, гістарычнай праблематыкі, адпаведнага каларыту. “Салавей” – твор, прысвечаны мінуўшчыне,.. дзікім часам прыгоннага права. Аповесць называюць (А.Бабарэка) таксама казачнай, прыгодніцкай, рамантычнай. І гэтага недастаткова, на думку І.Навуменкі, для характарыстыкі неардынарнага, шмат у чым цікавага, змястоўнага твора.

Паны ў аповесці чужыя, польскія. Яны абсалютна перакананы ў сваёй “вышэйшасці” над тутэйшым “быдлам”. Пісьменніку найбольш удаліся вобразы паноў-езуітаў Марцэвіча, Курачковіча, Завішы, Вольскага. Найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

псіхалагічна перакананльны вобраз старой пані Вашамірскай. Бядуля паказвае сябе добрым майстрам іроніі, сатыры. Гэтыя мастацкія сродкі аказваюцца надзвычай прыдатнымі для стварэння псіхалагічных партрэтаў адмоўных герояў.

Паводле аповесці «Салавей» З. Бядуля напісаў п'есу «Салавей», затым рэжысёрам Крошнерам па матывах аповесці быў пастаўлены балет «Салавей» [3].

Аповесць "**Набліжэнне"** асобным выданнем выйшла ў 1935 г. і, на жаль, больш не перавыдавалася і нават не ўвайшла ні ў адзін з двух збораў твораў пісьменніка.

Аповесць, безумоўна, пабудавана на добра знаёмым пісьменніку жыццёвым матэрыяле, але аўтабіяграфічнай яе назваць нельга. <...> Пра галоўнага героя аповесці Левіна, які выбіраецца з Вільні, што стала прыфрантавым горадам, пісьменнік нідзе не гаворыць, што ён літаратар, працаваў у "Нашай ніве". Мы здагадваемся пра літаратурныя практыкаванні героя, калі ён успамінае сваю яшчэ перадваенную пасаду ляснога прыказчыка... Аповесць невялікая па памеры, але мастак здолеў у ёй пераканаўча паказаць беларускую вёску часу першай сусветнай вайны, бежанства, страшэнную бядоту, нэндзу, пакуты простых людзей [3].

Аўтабіяграфічная аповесць **"У дрымучых лясах"** – апошні значны твор Бядулі. Аўтар малюе ў аповесці пра дзяцінства цэлую галерэю незвычайных людзей, а таксама падзей, якія мяжуюць з неверагоднымі і казачнымі [3].

## 4 "Язэп Крушынскі" як сацыяльна-псіхалагічны раман; праблематыка, сістэма вобразаў.

Раман «Язэп Крушынскі» быў нетыповым для творчасці З.Бядулі. <...> Можна даволі дакладна вызначыць жыццёвыя вытокі рамана <...>. Прататып галоўнага героя рамана пісьменнік бачыў, вывучыў яшчэ ў часы юнацтва, калі ва ўласнага бацькі працаваў канторшчыкам на сплаве лесу. Бацька пісьменніка прыкметным прадпрымальнікам не стаў, але былі, відаць, побач іншыя, якім пашанцавала значна больш.

З.Бядуля, душэўна захапляючыся міфам, казкай, легендай, дасканала ведаў свет жулікаў, махінатараў, гандляроў і прайдзісветаў. Менавіта гэтыя прайдзісветы, гандляры-махляры агалілі, спустошылі лагойскія лясы, якія ў часы дзяцінства пісьменніка былі сапраўды «дрымучымі». Мінск 20-х гадоў быў прыгранічны горад. У нэпманскай Беларусі ён быў вельмі прыцягальным цэнтрам для кантрабандыстаў, валютчыкаў, розных іншых ліхвяроў. Таму і ў цэнтр свайго рамана пісьменнік ставіць менавіта такога ліхвяра, авантурыста, псіхалогію якога ведаў з даўніх часоў.

Язэп Крушынскі – па-свойму яркая, таленавітая, нават бліскучая ў здольнасці абводзіць вакол пальца людзей натура. <...> Калі і параўноўваць яго з якім-небудзь адметным літаратурным персанажам, то найбліжэйшым яго родзічам акажацца Астап Бэндэр з вядомых раманаў Ільфа і Пятрова «Залатое цяля» і «Дванаццаць крэслаў».

Вядома, Язэп Крушынскі саступае ў талентах ліхвярства, махінатарства вялікаму камбінатару, поле ягонай дзейнасці вузейшае, але натура тая самая. Душа Язэпа Крушынскага, як і Астапа Бэндэра, прагне актыўнай дзейнасці і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

перш за ўсё ў імя грошай, натура гэтая невычэрпная ў канструяванні розных планаў, камбінацый, хітраспляценняў. <...> Раманы Ільфа і Пятрова па жанру сатырычна-гратэскавыя, «Язэп Крушынскі» З.Бядулі сацыяльна-бытавы са значным дамешкам фальклорна-родавай вобразнасці. Але сутнасці справы гэга не мяняе. Гутарка ідзе пра адну і тую ж значную сацыяльную з'яву. <...>

Дзеянне рамана пачынаецца з 1924 г. Калі ўважліва прыгледзімся да каларытнай, паўнакроўна намаляванай фігуры жуліка, прайдзісвета Язэпа Крушынскага, то пераканаемся, што ніякі ён не селянін, а значыць, і не культурны гаспадар. Ён не ведае, не любіць зямлі, сельскай гаспадаркі. Бо змалку, пасля смерці маці, ягоны бацька Сымон Чарнюк, «бондар і варажбіт», чалавек, «які ведаецца з нячыстай сілаю», адправіў чорненькага жвавага Язэпку ў Мінск да багатага дзядзькі, які меў там дом і рэстаран.

Да з'яўлення «Язэпа Крушынскага» беларуская літаратура мела аповесць «Лявон Бушмар» Кузьмы Чорнага, крыху пазней яго ж «Трэцяе пакаленне», раман «Мядзведзічы» К. Крапівы, «Вязьмо» М. Зарэцкага, прысвечаныя вёсцы пярэдадня калектывізацыі. Тым часам ні ў адным з названых твораў няма такой прывязанасці палітыкі, ідэалогіі да рэальных падзей калектывізацыі, як гэта бачым у «Язэпе Крушынскім», хоць твор адлюстроўвае толькі паасобныя эпізоды стварэння калектыўных гаспадарак у 20-я гады.

<...> Крушынскі надзявае маску рэвалюцыянера (пры паляках раздаў навакольным сялянам частку купленай за бесцань у памешчыка зямлі, за што арыштоўваўся, трохі сядзеў у турме, затым збег). Такім шляхам ён даводзіць сваё геraічнае мінулае барацьбіта за савецкую ўладу.

Крушынскі надзвычай спрытны дзялок, які, прыкрываючыся сацыяльнай дэмагогіяй, правільна вытрыманымі ў палітычным сэнсе прамовамі, паказной грамадскай дзейнасцю (канцэрт у Курганішчы), хавае ад людзей сваю сапраўдную натуру драпежніка, хціўца, хапугі. У яго кожны крок разлічаны. Купляючы, напрыклад, косы для сялян бліжніх вёсак Дразды і Дзятлы, ён загадзя прыкідвае, якую матэрыяльную карысць гэта яму прынясе.

Крушынскі – сапраўдны артыст. Ён настолькі ўдала карыстаецца сродкамі сацыяльнай мімікрыі, што нават людзі, якія яго добра ведаюць, не могуць на першым часе разгадаць ягоную натуру. Вось забіты пагранічнікамі памагаты Крушынскага Рахмілька. Тут жа каля ягонага трупа Крушынскі прамаўляе палкую, палымяную прамову ў абарону савецкай улады ад розных непажаданых для яе элементаў.

Ён страшэнна вынаходлівы. Едучы па дарозе і ўбачыўшы наперадзе нарад пагранічнікаў, ён выкідвае з вазка штуку замежнага сукна, якое зрэшты падбірае селянін Цыпрун Ярэмчык і на гэтым сукне пападаецца. Калі небяспека падступае ўшчыльную, Крушынскі раптам захворвае на «рак», пускаючы аб гэтым пагалоску на ўсё наваколле. <...>

Яшчэ адна любімая тэма пісьменніка прасочваецца ў «Язэпе Крушынскім» – тэма дзяцей, загубленага дзяцінства. <...> Не пашкадаваў Крушынскі дзяцей, звязаўся са Стэфкай, іхняй дамашняй настаўніцай. Пані Ганна, дазнаўшыся пра гэтую сувязь мужа, атруцілася. Увогуле Крушынскі цнатлівасцю не вызначаўся. Згвалціў Мэру, дачку каваля Лейбы, якая выйшла за «гоя»,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мясцовага сялянскага хлопца Марціна, не цырымоніўся з многімі іншымі дзяўчатамі і жанчынамі [3].

Вобраз «Льва Талстога» (празвалі так з-за яго пышнай барады) – селяніна Мірона Гарбочыка удаўся Бядулю. Герой не вельмі адукаваны і пісьменны, хоць дваццаць гадоў прасядзеў пісарам у земскага начальніка. Ад сялянскай работы за гэты час адарваўся, гаспадаркай правіла яго жонка Барбара. <...> Сялянскі «Леў Талстой» валодае вострым аналітычным розумам, назіральным вокам, схільнасцю разумець сапраўдную сутнасць людзей.[3]. Тры пісьменнікі – Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля і Міхась Зарэцкі – выявілі ў жыцці, па сутнасці, адзін і той жа тып старога чалавека, які цягнецца да новага жыцця. У Кузьмы Чорнага гэта стары Тамаш («Зямля»), які ладзіць з моладдзю і марыць пра боты, якіх у яго ніколі не было, у З. Бядулі – «Леў Талстой», і нарэшце ў М. Зарэцкага, у рамане «Вязьмо» – «Галілей» [3].

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989. – С. 351–363.

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998. – С. 386–413.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 319–334.

**Дадатковая**

4 Каваленка, В. Бядуля або згублены класік / В. Каваленка // Літ. і мастацтва. – 1994. – 23 снежня.

5 Каваленка, Вінцук. Самаразбурэнне ці Скамечаны лёс / В. Каваленка // Маладосць. – 1995. – № 10.

6 Кульбянкова, Іна. Ад сусветнай тугі да веры ў беларускі шлях. Паэзія Зм.Бядулі 1914-1919 гг. / І.Кульбянкова // Роднае слова. – 2000. – № 11.

7 Максімовіч, В. Паўтарэнне няпройдзенага / В. Максімовіч // Полымя. – 1999. – № 9.

8 Максімовіч, В.А. Дакастрычніцкая творчасць Змітрака Бядулі : сувязь з эстэтыкай сімвалізму і імпрэсіянізму / В.А. Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / В.А. Максімовіч. Мінск, 2000. – С. 261–283.

9 Навуменка, І. Ранні Бядуля / І.Навуменка // Полымя. – 1994. – № 11.

10 Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І.Навуменка. – Мінск, 1995. (2-е выданне – Мінск, 2004).

11 Навуменка, І. На струнах душы: Жыццё і творчасць З.Бядулі / І.Навуменка // Роднае слова. –1996. – № 4.

12 Мельнікава, З. П. “На горне душы...”: Творчасць З. Бядулі і бел. літ. першай трэці XX ст. / З.П.Мельнікава. – Брэст, 2001.

13 Стральцоў, М.Л. З плеяды першых / Міхась Стральцоў // Выбранае : проза, паэзія, эсэ / Міхась Стральцоў. Мінск, 1987. – С. 506–512.

14 Змітрок Бядуля // Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – С. 203–207.

15 Бядуля, З. Выбраныя творы / Змітрок Бядуля; Уклад., прадм., камент. У.Казберука. – Мінск: «Белкнігазбор», 2006. – 496 с.

16 Бядуля, З. Збор твораў: у 5 т. / З. Бядуля. – Мінск, 1985–1989.

**Электронныя рэсурсы**

17 Бядуля, Зм. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/zmitrok.byadylya

18 Бядуля, Зм. Творы / Зм.Бядуля. – Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Zmitrok_Biadula/

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 1.9 АЛЕСЬ ГАРУН (1887–1920)

1 Біяграфія паэта: асноўныя перыяды жыцця і творчасці.
2 Зборнік "Матчын дар" як найбольш поўная мастацкая выява творчай індывідуальнасці паэта; вершы 1917–1920 гг.
3 Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў А.Гаруна.
4 Дзіцячая драматургія (зб-к "Жывыя казкі").

*"Так ужо склалася ў нашай гісторыі, што жыццё рэдка песціла капрызлівым шчасцем сваіх песняроў, аднак лёс гэтага паэта быў асабліва сляпы і жорсткі. Несправядліва паставіўся ён да аўтара, неміласэрна аднёсся да яго нягучнай, надзвычай душэўнай, поўнай нутраной сілы паэзіі. Мабыць, не шмат трэба паэту для шчасця, але яму заўжды неабходна быць пачутым сваім народам. І, мусіць, найбольшаю карай для яго з'яўляецца немата, на якую ён бывае несправядліва асуджаны. Алесь Гарун прабыў у немаце удвая болей, чым ён пражыў на свеце..."* ***(Васіль Быкаў)***

## 1 Біяграфія паэта: асноўныя перыяды жыцця і творчасці.

Алесь Гарун – паэт, празаік, дзіцячы драматург і публіцыст – вядомы чытачу найперш як паэт-адраджэнец, паэт-нашанівец. Значна менш даследаваныя іншыя жанры яго творчай дзейнасці, у прыватнасці, проза пісьменніка.

Асноўныя біяграфічныя звесткі паэта пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 11 сакавіка 1887 г. | **Алесь Гарун** (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі) нарадзіўся ў Мінску (дакладней – у вёсцы ці фальварку Новы двор Мінска-кальварыйскага прыходу); паходзіў з беднай сям'і; бацькі – выхадцы з Навагрудскага павета. |
| 2 | у 5-ці гадовым узросце (1892г.) | будучы пісьменнік ужо чытаў па-руску і па-польску |
| 3 | 1894–1897 гг. | вучыўся 3 гады ў царкоўна-прыходскай школе ў Мінску |
| 4 | 1889–1902 гг. | вучыўся на дрэваапрацоўчым аддзяленні рамесніцкага вучылішча (3 гады); атрымаў кваліфікацыю столяра. |
| 5 | 1902 г. | пачынае працаваць у розных майстэрнях і на мэблевай фабрыцы ў Мінску. |
| 6 | 1904 г. | становіцца членам партыі эсэраў, вядзе прапагандысцкую дзейнасць. |
| 7 | 4 сакавіка 1907 г. | арыштаваны ў падпольнай друкарні ў Мінску. |
| 8 | 10 ліпеня 1908 г. | асуджаны (з другога разу) на пасяленне ў Сібір. |
| 9 | Да лютага 1917 г. | ссылку адбываў у Іркуцкай губерні, займаўся сталярскімі і цяслярскімі работамі, працаваў вадалівам на рацэ Лене (1914) і на прыісках у Бадайбо; там і сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю. |
| 10 | Верасень 1917 г. | вярнуўся ў Мінск; уключыўся ў ідэйна-палітычную барацьбу, займаўся літаратурнай і публіцыстычнай творчасцю (друкаваўся ў розных перыядычных выданнях і калектыўных зборніках). |
| 11 | Ліпень 1920 г. | абвастрыліся сухоты; сябры адправілі Гаруна санітарным цягніком у Закапанэ (курорт для сухотнікаў); Гарун даехаў толькі да Кракава, дзе і памёр у тым жа месяцы; пахаваны там жа на Вайсковых Ракавіцкіх могілках. |
| 12 | 1988 г. | адкрыты помнік на магіле А. Гаруна. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Перыяды творчасці А. Гаруна даследчыкі вызначаюць у адпаведнасці з яго этапамі жыцця (месцажыхарства): мінскі (1905–1908), сібірскі (1908–1917), другі мінскі (1917–1920).

**2 Паэзія А. Гаруна. Зборнік "Матчын дар" – мастацкая выява творчай індывідуальнасці паэта; вершы 1917–1920 гг.**

Пісаць вершы Прушынскі пачаў змалку, спачатку па-руску, затым па-беларуску (пасля прачытання "Гапона" Д.-Марцінкевіча, 1903-1904 гг.). Раннія творы не захаваліся. Дайшла толькі паэма "Мае коляды", напісаная ў 1905 г. (надрукаваная ў 1920 г.). Першыя друкаваныя вершы з'явіліся, калі Гарун сядзеў у астрозе. Надрукаваны яны ў "Нашай ніве": "Маці-Беларусі" (1907), "Януку Купале" і "Начныя думкі" – (1908). Больш стала і настойліва літаратурнай творчасцю А. Гарун заняўся ўжо ў Сібіры, адкуль пасылаў свае творы ў "Нашу ніву", потым у "Беларус", дзе друкаваў іх пад псеўданімам А. Сумны. Варта ўзгадаць, што туга па радзіме спрыяла творчасці не аднаго А. Гаруна, гэта тычыцца і М. Багдановіча, і ў некаторай ступені Цёткі, а раней А. Міцкевіча, і адраджэнца М. Гусоўскага.

"Паэтычная спадчына А.Гаруна ўключае ў сябе зб-к "Матчын дар" (напісаны да пачатку першай сусветнай вайны, выйшаў у 1918 г.) і вершы, апублікаваныя ў розных выданнях пад псеўданімамі А. Гарун, А. Сумны і Сальвэсь" [1, с. 322].

У свой час М. Багдановіч у артыкуле "Белорусское возрождение" зазначаў, што Алесь Гарун "знайшоў свае асаблівыя рытмы і час ад часу радуе нас вытанчанай арыгінальнасцю верша" [2, с. 281].

Што да зборніка "Матчын дар", то крытыкі лічаць яго адным з найвыдатнейшых паэтычных дасягненняў пачатку XX ст. і ставяць побач з такімі кнігамі, як зб-кі "Шляхам жыцця" Купалы і "Вянок" Багдановіча. У зборніку ўсё ідэйна і тэматычна звязана з эпохаю пярэдадня першай сусветнай вайны, і толькі ў некаторых вершах адчуваецца подых новага часу, пачатак якому паклала Лютаўская рэвалюцыя.

<u>Раздзелы</u> зб-ка: "Роднаму краю", "На чужыне", "Праявы роднага". Яны так ці інакш звязаны з радзімай, яе доляй, краявідамі, з лёсам народа. Асноўны <u>матыў</u> – патрыятычны (матыў суму па роднай старонцы, які пераходзіць у заклік да змагання за лепшую долю). А.Макарэвіч [3] у зборніку Алеся Гаруна "Матчын дар" вылучае наступныя матывы:

**Духоўныя хрысціянскія матывы**

1 *Адлюстраванне хрысціянска-духоўнага раздарожжа ў жыцці лірычнага героя*: "На смерць", "Ноч", "Хрыстос нарадзіўся! Хрыстос нарадзіўся!..".

2 *Адлюстраванне адназначнасці хрысціянска-духоўнага выбару для лірычнага героя*: "Навука".

3 *Адлюстраванне духоўнага разладу ў хрысціянскім свеце*: "Малітва".

**Выгнанніцкія матывы**

*Адлюстраванне патрыятычных (інтымных) адчуванняў лірычнага героя, які знаходзіцца на чужыне*: "У выгнанні", "Думы ў чужыне", "Дзяўчыначка, сэрца сабе не трывож".

**Экзістэнцыйныя матывы**

*Адлюстраванне праблемы пазнання і пазнавальнасці свету, пераходу адной экзістэнцыйнай формы ў другую*: "Nocturno", "Адбітак", "Як ліст вярбінкі маладой…", "Нязнаны госць", "Ідуць гады".

**Матыў адзіноты, нядолі, нявызначанасці памкненняў лірычнага героя**

*Адлюстраванне памкненняў лірычнага героя да адзіноты, пратэсту супраць нядолі*: "Літанне Адзіноце", "Слабасці".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Адлюстраванне нявызначанасці памкненняў лірычнага героя на фоне адпаведных з'яў (напр., прыроды), якія абвастраюць такую няяснасць*: "Восень".

*Адлюстраванне суму лірычнага героя па родным краі*: "Журба".

**Літаратурна-эстэтычныя матывы**

*Адлюстраванне памкненняў лірычнага героя ў кантэксце літаратурнай творчасці, яе вытокаў і перспектыў*: "Людзям", "Паэту", "Эх, сягоння ў гэту ночку…", "Думкі – дыяменты, краскі жыцця…", "Матчын дар"

*Адлюстраванне адноснасці ўяленняў чалавека пра добры лёс*: "Жыццё".

**Патрыятычныя матывы**

*Адлюстраванне захапленняў, мрояў лірычнага героя родным краем і імкнення ўславіць яго*: "Роднаму краю", "Начныя думкі".

*Адлюстраванне надзеі лірычнага героя на "паўстанне" да лепшага жыцця*: "Як надарыцца мінута…", "Мілая, родная старонка-маці!..", "Хай не льюцца даджы цёмна-хмарныя…".

*Адлюстраванне закінутасці роднага краю, безнадзейнасці (на момант мастацкай гутаркі) у адносінах да лепшай долі для яго; выкрыццё ворагаў беларушчыны*: "Ваўкалакі", "Мае думкі"; "Юдам".

*Адлюстраванне адной з умоў захавання нацыі – мовы*: "Ты, мой брат, каго зваць Беларусам…", "Песня-звон".

**Грамадзянскія матывы**

*Адлюстраванне грамадзянскай пазіцыі (памкненняў) лірычнага героя*: "Хто сказаў: «І я з народам»…", "Муляру".

**Побытавыя, пейзажныя матывы**

*Адлюстраванне побытавых праяў жыцця*: "Добрыя дзеці", "Мяцеліца", "Два каханні", "Хатка", "Габруська", "Жабрачка", "Сын", "Спрэчка", "Каму што", "Варожба", "Канец Паўлючонка".

*Адлюстраванне ў форме назіранняў лірычнага героя праяў у прыродзе*: "Вясна", "Вецер", "У прыпар", "Песня".

**Інтымныя матывы**

*Адлюстраванне інтымных уражанняў, памкненняў лірычнага героя*: "Дзяўчаці", "Хаўтуры", "Асенні спеў".

Своеасаблівай прадмовай да зборніка і споведдзю аўтара лічыцца верш "Людзям". У ім – трагічнасць настрою і ключ да разумення ўсёй кнігі. Аўтар – сапраўдны паэт – не можа поўнасцю прысвяціць сябе творчасці, бо яму перашкаджаюць умовы жыцця: "*Бо мой прыгон глытае час, мне воля – рэдкі дар*". Вершы, напісаныя ў Сібіры, адначасна водгулле пакуты і сімвал веры, споведзь і скарга выгнанніка, сведчанне нязломнай вытрымкі, неадольнае пачуццё духоўнай сувязі з родным краем і ўсім тым, што ў ім адбываецца ("Думы ў чужыне") [1].

Багата ў Гаруна песняў жальбы, плачу. Аднак прычына іх не толькі драма ўласнага лёсу, хутчэй шкадаванне аб тым, што ён мала можа зрабіць для свае радзімы, народу. І разам з тым паэт верыць, што пакуты і ахвяры лірычнага героя не могуць быць дарэмнымі ("Навука"). Ёсць у Гаруна і алегарычныя творы з глыбокім філасофскім роздумам над адвечнымі пытаннямі чалавечага быцця і грамадскіх працэсаў ("Nokturno"). Бессмяротнасць жыцця, абнаўленне яго форм, вечны рух у прыродзе і грамадстве становіцца тэмай гэтага верша [1].

Даследчыца І. Багдановіч адносна вершаў А.Гаруна зазначае: "Многія з іх вызначаюцца шырокай пастаноўкай нацыянальнай праблемы – **паэтычным апяваннем роднай мовы** як асновы самавызначэння народа, а таксама **зваротам да мінуўшчыны** з мэтай адрадзіць у свядомасці людзей былую дзяржаўную славу (верш "У чатырохлецце "Нашае нівы": Ты мой брат, каго зваць беларусам...)" [4, с. 204]. Разам з тым даследчыца лічыць творчасць А.Гаруна "даволі аднастайнай па настроі" [4, с. 206] з-за ўстаноўкі паэта на апяванне нядолі. "Тужлівую ноту ў паэзію А. Гаруна прыўносіла і традыцыйная тэма адарванасці ад радзімы. Матыў няласкавай чужыны як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

месца вымушанага выгнання, настальгічнае пачуццё напаўняюць вершы “У выгнанні”, “Мае думкі”, “Думы ў чужыне” і інш. Настрой вершаў А. Гаруна пераважна маркотны, сумны” [4, с. 206]. “Паэта хвалюе пытанне з’яўлення чалавека ў сусвеце, спасціжэння ўнутранай сувязі ўсіх кампанентаў светабудовы, разгадкі боскай задумы аб чалавеку (вершы “Адбітак”, “Нязнаны госць”)” [4, с. 206].

“У творчасці А.Гаруна 1912–1915 гг. заўважнае ўзмацненне псіхалагізму, паглыбленне мастацкай пластычнасці верша; усё большае месца ў лірыцы займае філасофская рэфлексія. «Яе вызначальнымі рысамі, – зазначае даследчык Юры Гарбінскі, – cтануць імпрэсіяністкі характар мастацкай формы й экспрэсія думкі, ідэйнага зместу, што ў сваю чаргу абумовіць асноўную іпастась А.Гаруна як паэта-трагіка. У гэтым сэнсе ён асабліва блізкі да мэтраў еўрапейскай паэзіі Ш.Бадлера, Р.Рыльке, Ц.Норвіда, а яшчэ, безумоўна, М.Багдановіча і М.Лермантава». Яскравы прыклад, што ілюструе сказанае, – верш “Адбітак” [5, с. 201].

У цэлым лірыцы А. Гаруна, на думку даследчыкаў, характэрна незвычайнае багацце і разнастайнасць інтанацый. У яго паэзіі такая энергія і дынамічнасць радка, страснасць пачуццяў, багацце і разнастайнасць рытму, рыфмаў, форм мастацкай вобразнасці, нечаканых паваротаў думкі, што ён мог спаборнічаць у гэтым сэнсе з Купалам [1].

**3 Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў А. Гаруна.**

Як вядома, свае празаічныя творы Аляксандр Прушынскі падпісваў псеўданімам І. Жывіца. І друкаваліся яны пры жыцці пісьменніка ў газетах “Наша ніва”, “Вольная Беларусь” і “Беларусь”. Сярод першых, хто звяртаўся да асэнсавання творчасці А. Гаруна, яго празаічнай спадчыны ў прыватнасці, быў М. Гарэцкі, які ў сваёй знакамітай “Гісторыі беларускае літаратуры” адзначаў “хараство мовы і стылю” прозы Гаруна, “дасканаласць тэхнікі”, “глыбіню думкі” [6, с. 345]. Разам з тым даследчык падкрэсліваў, што “яна ненацыянальна, нават змест яе даволі часта небеларускі” [6, с. 345]. Выключэнне М. Гарэцкі робіць толькі для апавядання “Пан Шабуневіч” (“З погляду беларускасці найлепей выйшаў “Пан Шабуневіч” – жывы беларускі тып пачатку адраджэння” [6, с. 345]). Сёння відавочна, што такая агульная ацэнка празаічнай спадчыны А.Гаруна станоўчая, яна ўказвае, як мінімум, на яе адметнасць у тагачасным айчынным літаратурным працэсе.

Вядомы даследчык жыцця і творчасці Алеся Гаруна У. Казбярук (на сённяшні дзень ці не адзіны, хто прааналізаваў усе набыткі Гаруна-празаіка) “найбольш адметнай асаблівасцю” прозы пісьменніка лічыць “яе ідэйна-тэматычнае багацце, смелы выхад за рамкі традыцыйнай тэматыкі, звязанай у творчасці пераважнай большасці беларускіх пісьменнікаў з жыццём вёскі, яе паўсядзённым побытам, трывогамі, спадзяваннямі і з няўхільным ростам грамадскай свядомасці, выяўленнем лепшых маральных якасцей” [1, с. 328]. А Т. Грамадчанка справядліва зазначае, што “і ў прозе Алесь Гарун нікога не паўтараў, ні на каго не быў падобны. Адарваны ад літаратуры і мастацка-культурнага асяроддзя, не спрактыкаваны ў тэорыі, ён шукаў і знаходзіў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адметныя жанравыя формы (апавяданне-прытча, апавяданне-казка, трыпціх і г.д.), смела звяртаўся да ўмоўнасці, сімволікі, шырокіх абагульненняў. Разам з тым, ён быў тонкім псіхолагам, знаўцам чалавечай душы, на што паказваюць такія апавяданні, як «Свята», «Пан Шабуневіч», «П'еро і Каламбіна»" [7, с. 11].

Увага большасці даследчыкаў прозы А. Гаруна звернута на празаічны трыпціх "П'ера і Каламбіна". Ужо згаданы намі М. Гарэцкі падкрэсліваў, што "<...> такія рэчы, як «П'еро і Каламбіна», здавальняюць літаратурнае вымаганне самага тонкага смакуна, даюць па-беларуску тое, што раней беларуская інтэлігенцыя знаходзіла выключна ў чужых мовах. Адносіны мужчыны і жанчыны, каторыя ў лірыцы Гаруна маюць заўсёды рэальна раскрыты канчатак, у гэтым апавяданні тройчы зводзяцца на трагічна накановaную, немінушчую развязку" [6, с. 345].

У. Казбярук таксама зазначае, што ў "шэрагу апавяданняў пісьменніка асобна стаіць «П'ера і Каламбіна»", "своеасаблівы празаічны трыпціх, паасобныя часткі якога <...> аб'ядноўваюцца толькі агульнай тэмай кахання, мастацкім роздумам аб загадкавай сіле гэтага пачуцця <...>" [1, с. 329]. Далей даследчык акцэнтуе ўвагу на тым, што "Алесь Гарун звярнуўся да *агульначалавечай, спрадвечнай* (вылучана намі – Т.Ф.) праблематыкі, не звязанай ні з канкрэтным часам, ні з месцам, ні з нейкімі нацыянальнымі рэаліямі" [1, с. 330].

Аўтары папулярных нарысаў "Беларуская літаратура і свет" [5], асэнсоўваючы "трохчасткавае" апавяданне "П'ера і Каламбіна", таксама лічаць гэты твор "знакавым" у творчай спадчыне А. Гаруна, бо "яго дзеянні адбываюцца зусім не ў звыклай беларускай вёсцы альбо беларускім мястэчку, і праблемы, з якімі сутыкаюцца героі, – не спецыфічна нацыянальныя, а хутчэй, агульначалавечыя [5, с. 202–203]. На іх погляд, "так новая беларуская проза зрабіла крок у кірунку вяртання да «высокай» еўрапейскай традыцыі" [5, с. 203].

Занадта катэгарычна, на наш погляд, ацэньвае трыпціх "П'ера і Каламбіна" А. Рагуля: "Для таго, каб выбраць свой шлях, беларуская нацыя, на думку А. Гаруна, павінна пераадолець падманлівасць навязаных ёй каштоўнасцяў. Напісанае ў час Першай сусветнай вайны апавяданне «П'ера і Каламбіна» адлюстроўвае сітуацыю «балю ў час чумы». Усё свята прасякнута духам бутафорыі і фальшу. Несапраўдным з'яўляецца пачуццё кахання найперш ва ўсіх трох «каламбін»" [8, с. 31]. Нам больш імпануе погляд на трыпціх як на твор, прысвечаны "агульначалавечай, спрадвечнай" праблематыцы. Што да свята, то яно прадстаўлена толькі ў трэцяй частцы трыпціха. І то дзіцячае... Наконт сапраўднасці/ несапраўднасці пачуцця кахання "каламбін" хочацца заўважыць наступнае – універсальнага адказу на пытанне "што ёсць (сапраўднае) каханне?" чалавецтва не вынайшла. Усе спробы класіфікаваць каханне, умясціць гэтае пачуццё ў пэўныя схемы і межы не прывялі да адназначных вынікаў. Каханне – пачуццё пазачасавае, пазанацыянальнае, пазасацыяльнае. Яно ігнаруе войны і рэвалюцыі, з'яўляецца ці сыходзіць не залежна ад іх. І якою мераю мерыць яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сапраўднасць, невядома... У кожнага мера свая...

Наўрад ці варта бачыць у трыпціху і папярэджанні беларускай нацыі: “Ідэйны змест апавядання «П’ера і Каламбіна» выходзіць далёка за межы павучальнай побытавай прыпавесці. Пісьменнік папярэджваў беларускую грамадскасць пра пагрозу экспансіі псеўдакультуры ва ўмовах дэнацыяналізацыі, каб нацыя не заблыталася ў «рэдзенькай, як бы з туману сетцы» на шляху да свайго сапраўднага свята” [8, с. 32].

Як ужо адзначалася, “П’ера і Каламбіна” складаецца з трох аповедаў пра каханне (хаця ў адносінах да трэцяй часткі пра гэтае пачуццё можна гаварыць даволі ўмоўна, хіба браць на веру словы рускага класіка “любви все возрасты покорны”). Наўрад ці аўтар меў на мэце раскрыць сутнасць феномена кахання ў адным асобна ўзятым творы. Аднак выявіць агульную тэндэнцыю, характэрную “неразздзеленаму каханню”, што і аб’ядноўвае тры гісторыі, аўтару, на наш погляд, удалося. Праблема недаўгавечнасці пачуцця кахання таксама закранута аўтарам.

Пра адсылку гэтага твора да італьянскага (і французскага) тэатра дэль’артэ пісаў У. Казбярук. Не паўтараючыся, зазначым, што вобраз П’ера, на наш погляд, пададзены Алесем Гаруном у той трактоўцы, як яго стварыў у XIX стагоддзі французскі актор-мім Батыст Дэбюро: П’ера – “адпрэчаны няшчасны закаханы” [9]. Менавіта такі стан рэчаў прадстаўлены ў кожнай з частак трыпціха беларускага аўтара, нягледзячы на той факт, што ў першых дзвюх героі маюць іншыя імёны (Антось і Альжбэта, Марыя і Паўлачка). Сітуацыя сыходу каханай (жанчыны, дзяўчыны, дзяўчынкі) паўтараецца тройчы, але ў розных варыянтах. І кожны раз чытач мае магчымасць назіраць за рэакцыяй героя на такую падзею ў сваім жыцці. А яна розная... Сыход каханай высвечвае ўсё добрае і дрэннае, што ёсць у партнёры, раскрывае яго сутнасць. Як відаць з твора Алеся Гаруна, такую праверку годна прайсці здольны не кожны “П’ера”.

Трыпціх “П’ера і Каламбіна” выяўляе яго аўтара як пісьменніка-псіхолага і адметнага аўтара-філосафа ў айчыннай літаратуры пачатку XX стагоддзя, спроба якога асэнсаваць феномен неразздзеленага кахання на прыкладзе розных узроставых катэгорый герояў, прасачыць магчымыя варыянты паводзінаў трох П’ера ў сітуацыі сыходу Каламбіны і магчымыя наступствы дзеянняў/ паводзінаў кожнага з іх аказалася даволі ўдалай. Гэта не прыгожая “казка пра каханне”, пра зараджэнне гэтага пачуцця, гэта глыбокі псіхалагічны аналіз яго магчымых наступстваў, выяўленне стэрэатыпаў мужчынскасці [10].

Што да тэматыкі іншых апавяданняў А.Гаруна, то, паўторымся, праблема нацыянальнага бяспраўя беларусаў пры самадзяржаўным ладзе пакладзена ў аснову апавядання “Пан Шабуневіч”. Яго герой, шавец, нястомна змагаецца за правы карыстацца роднай моваю, за права звацца беларусам.

У апавяданні “Чалавек без крыві” аўтар разважае, як астрожнае жыццё (якое Гарун ведаў непасрэдна) калечыць лёс чалавека, разбуральна дзейнічае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на яго псіхалогію. Герой ужо не можа адаптавацца на свабодзе, знайсці сэнс жыцця, таму і засільваецца.

Апавяданне “Свята” прысвечана апісанню жыцця і побыту палітычнага пасяленца-беларуса Грыневіча ў Сібіры. Твор, бясспрэчна, аўтабіяграфічны. У ім таксама рэалістычна пададзены побыт сібіракоў. Да ўсяго ў творы прысутнічае матыў рэвалюцыйных падзей розных гістарычных эпох. Так, Грыневіч трапіў у Сібір за ўдзел у рэвалюцыі 1905-1907 гг. А бабулька, што жыве ў сям’і, дзе заначаваў Грыневіч, з’яўляецца роднай сястрой яго бабулі. Арыенцірамі ў жыцці для гэтай бабулі з’яўляюцца паўстанні 1863 і ранейшага 1830 гг. Гістарычныя рамкі апавядання, як і яго прастора, шырокія. І Грыневіч, і бабулька трывала заснаваліся ў Сібіры, але паходжаннем і думкамі яны звязаны з далёкай Беларуссю. Варта звярнуць увагу на назву твора. Свята для Грыневіча – гэта не толькі Вялікдзень, які адзначаецца ў творы, а яшчэ і сустрэча з бабулькай, з роднай мовай, з гісторыяй Радзімы.

Фантастычнае апавяданне “У Панасавым сяле” (надрукавана ў 1920 г.) з’яўляецца своеасаблівым працягам апавядання З. Бядулі “Панас на небе”. Апавядальнікам у ім з’яўляецца чорт, які каларытна, з гумарам пераказвае пра перамены, што адбыліся на небе. Героямі гэтага апавядання з’яўляюцца палешукі з іх рэальнымі характарамі, звычкамі, яўленнямі. Панасава сяло – гэта нейкая частка Палесся, а “ўзнясенне” яго на неба вызваляе яго жыхароў ад зямных праблем, такіх як клопат пра хлеб надзённы, пра зямлю, працу. Яны быццам апынуліся ў раю, аднак сваіх паляшуцкіх адметнасцей не пазбавіліся, кожны з іх застаецца самім сабою. Гэтым аўтар нібы падкрэслівае, што дзе б ні апынуўся чалавек, з ім заўсёды застанецца тое, што ён атрымаў у спадчыну ад стагоддзяў, а таксама выпрацаванае ўласным лёсам, побытам, асяроддзем [1].

**4 Дзіцячая драматургія (зб-к “Жывыя казкі”).**

Драматургічная спадчына пісьменніка прадстаўлена 4 творамі. “Абразком А. Гаруна “Датрымаў характар” (“Зборнік твораў для дзіцячага тэатру”, 1920) беларуская літаратура распачала развіццё камедыйнага жанру п’ес, прызначаных для чытання дзецьмі. Канфлікт гэтай п’есы не мае драматычнай вастрыні, аднак ідэя працуе на канкрэтную надзённую праблему: праз канструяванне тыповых характараў аўтар высмейвае гультайства і адсутнасць сілы волі школьнікаў [11, с. 13]”.

У 1920 г. пісьменнік выдаў зб-к п’ес для дзіцячага тэатра “Жывыя казкі”. У яго ўвайшлі наступныя творы: “Хлопчык у лесе”, “Шчаслівы чырвонец”, “Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць”. Згодна з Я. Янушкевічам, у іх багацце фантазіі аўтара спалучаецца з народнай казачнай фантастыкай. Усё ў гэтых творах падпарадкавана ўслаўленню маральных прынцыпаў справядлівасці, спагадлівасці людзям і непрыняцця падману, фальшу. Да ўсяго, у казках А.Гаруна пераканаўча раскрываюцца дзіцячыя характары, паказваюцца іх гульні, уцехі, уяўленні [1].

Казка “Хлопчык у лесе”, напісана вершам, у ёй шмат песень з нотамі (што сведчыць пра шматграннасць таленту А. Гаруна). У творы прадстаўлена

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

"паэтычная гісторыя прыгод вясковага Хлопчыка" [1, с. 333], які, заблудзіўся і заснуў ў лесе (*а дакладней яго наўмысна там пакінула маці, бо не мела чым яго гадаваць*). А ў сне ён трапіў у царства магутнага чараўніка і выратаваў запалоненых ім дзяўчат. Гаспадарамі лесу былі добрыя духі, увасобленыя ў вобразах кветак, менавіта яны паспрыялі, каб Хлопчык трапіў у казачную краіну, дабыў там чароўную жалейку, пры дапамозе якой ён выгнаў гаспадара зачараванага чарства.

У творы прадстаўлена казачная фантастыка: у лесе, незалежна адзін ад аднаго, існуюць два зачараваныя светы, – добры і дрэнны – першы заселены добрымі духамі-кветкамі, другі знаходзіцца пад уладай чараўніка. Пра існаванне другога ведаюць толькі духі-кветкі, якія і насылаюць на Хлопчыка сон, у якім ён трапляе да запалоненых дзяўчат. Арыгінальным і незвычайным у творы з'яўляецца тое, што Хлопчык вяртаецца ў рэальны свет з падарункамі, што атрымаў ад вызваленых палонніц: ботамі-скараходамі, шапкай цемязень, незвычайным адзеннем, залатым клубочкам, а таксама з зачараванай жалейкай. У лес вяртаецца маці Хлопчыка (*яе таксама прыводзяць кветкі*), знаходзіць сына, будзіць яго, каецца за ўчыненае, абяцае, што яны больш ніколі не будуць разлучацца. Разам з маці і падарункамі Хлопчык ідзе ў сваю хату.

"Шчаслівы чырвонец" – твор таксама нетрадыцыйны, што выявілася ў паказе вобраза жабракоў, якія звычайна просяць міласціну ў людзей. У казцы А. Гаруна старая і хворая Жабрачка ходзіць па свеце з мэтай дапамагаць людзям. Яна раскідае па дарозе чырвонцы, якія прыносяць шчасце, аднак толькі людзям сумленным. У п'есе Гаруна, як і ў традыцыйных казках, перамагае дабро, справядлівасць, і праслаўляецца спагадлівасць.

Фантастычнай з'яўляецца і казка "Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць". Яе героі – малы вясковы пастушок, які перажывае нечаканыя прыгоды: знаходзіць лапаць-атопак, які ўмее гаварыць і дае магчымасць пастушку разумець чужыя думкі, і сам лапаць, ганарлівы і добразычлівы адначасна. Сцэнка з жыцця пастушка і яго канфлікт з местачковымі злодзеямі падаюцца на фоне рэвалюцыйных перамен у вёсцы, калі з суседняга маёнтка ўцёк пан, а рэальнымі гаспадарамі там сталі парабкі, якія ўтварылі свой камітэт [1].

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 319–334.

**Дадатковая**

2 Багдановіч, М. Поўны збор твораў. У 3 т. Т. 2. / М. Багдановіч. – Мінск, 1993. – 600 с.

3 Макарэвіч, А.М. Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX ст. [Электронны рэсурс] : дапаможнік : у 2 ч. / А. М. Макарэвіч. – Электронныя даныя. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2013. – Ч. 1. –256 с. – Рэжым доступу: http://libr.msu.by/handle/123456789/1195

4 Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э.Багдановіч. – Мінск: Бел навука, 2001. [Раздзел: "Кола паплечнікаў і паслядоўнікаў"].

5 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Жыццё і творчасць Алеся Гаруна / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына // Беларуская літаратура і свет:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 200–203.

6 Гарэцкі, М. Алесь Гарун / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускае літаратуры / Уклад. і падрыхт. тэксту Т.С. Голуб. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – С. 338–345.

7 Грамадчанка, Т. Радкі з любові народжаных слоў : Лёс і творчыя набыткі Алеся Гаруна // Роднае слова. – 2002. – № 3. – С. 7–11.

8 Рагуля, А. З чыстым сэрцам, з няласкавай доляй: сацыяльная і эстэтычная праблематыка твораў Алеся Гаруна // Роднае слова. – 2007. – № 3. – С.29–32.

9 Академик [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http://dic.academic.ru/dic.nsf/ruwiki/166643. – Дата доступа : 13.02.2017.

10 Фіцнер, Т. Апавяданне “П’ера і Каламбіна” Алеся Гаруна / Таццяна Фіцнер // Роднае слова. – 2017. – № 10. – С. 3–6.

11 Трафімчык, А.В. Беларуская дзіцячая драматургія / Трафімчык А.В. – Мінск, 2012. – 128 с.

12 А.А-к. Алесь Гарун (Аляксандр Прушынскі) / А. А-к // На суд гісторыі. – Мінск, 1994.

13 Будзька, Э. Пясняр у жыцці / Э.Будзька // На суд гісторыі. – Мінск, 1994.

14 Гарбінскі, Юрась. Дар Алеся Гаруна / Ю.Гарбінскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. –1991. – № 1.

15 Гарун, Алесь. Сэрцам пачуты звон. Паэзія, проза, драматургія, Публіцыстыка /А.Гарун. – Мінск, 1991.

16 Клікуноў, А. Адвечны крыж. Спроба разгляду паэтычнай спадчыны А.Гаруна ў кантэксце хрысціянскага светаўспрымання / А.Клікуноў // Роднае слова. – 1999. – № 1.

17 Кушаль, Францішак. Сорак два гады таму / Ф.Кушаль // На суд гісторыі. – Мінск, 1994.

18 Шыла, М.Алесь Гарун / М.Шыла // На суд гісторыі. – Мінск, 1994.

**Электронныя рэсурсы**

19 Гарун, А. Творы / А.Гарун. – Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ales_Harun/

20 Алесь Гарун. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/ales.harun

## 1.10 ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ (1883–1938гг.)

1 Біяграфія пісьменніка.
2 Разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм у прозе В.Ластоўскага.
3 Аповесць “Лабірынты”: спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця.
4 Роля В.Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі.

*Дзяржаўны і грамадскі дзеяч, адзін з ідэолагаў утварэння незалежнай Беларусі, выдатны пісьменнік, гісторык, крытык, публіцыст, паэт, мовазнаўца, этнограф, выдавец, бібліёграф, перакладчык, акадэмік АН БССР, аўтар больш за 300 публікацый.*

*Творчасць В.Ластоўскага стала вяртацца да беларускга чытача толькі напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, распачаў гэты працэс Б.Сачанка.*

### 1 Біяграфія пісьменніка.

Асноўныя біяграфічныя звесткі пісьменніка пададзены ніжэй у табліцы:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 1883 г. | **В.Ластоўскі** нарадзіўся ў былым засценку Калеснікі на Дзісеншчыне |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | |
|---|---|---|
| | | (Віленскі павет, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл.) ў сям'і дробнага арандатара (беззямельнага шляхціца). |
| 2 | 1898–1902 гг. | Вучыўся ў народнай, Старапагосцкай, школе. |
| 3 | 1902 г. | Звязаў свой лёс з нацыянальна-вызваленчым рухам. |
| 4 | 1904–1905 гг. | Наведваў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце. |
| 5 | 1906 г. | Жыў у Рызе (з жонкай Марыяй Іваноўскай, з якой у шлюбе з 1903 г.), займаўся самаадукацыяй, далучыўся да мясцовага беларускага руху (член БСГ). |
| 6 | 1908 г. | Адправіў свой першы ліст у "Нашу ніву" з Рыгі. |
| 7 | 1909 –1915 г. | Пераязджае ў Вільню і працуе на пасадзе сакратара рэдакцыі "Нашай нівы", дзе пачынаецца яго сталая літаратурная праца, якая працягвалася да закрыцця газеты (1915 г.). |
| 8 | 1910 г., Вільня | Выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі" – першую нацыянальную гісторыю на беларускай мове, у якой была спроба абгрунтаваць беларускі характар Вялікага княства Літоўскага. |
| 9 | 1916–1917 гг. | Рэдагуе Віленскую беларускую (грамадска-палітычную і літаратурную) газету "Гоман". Мела нацыянальна-дэмакратычны кірунак. |
| 10 | 1916 г. | Адзін з аўтараў "Мемарандума прадстаўнікоў Беларусі", у якім адстойваў права беларускага народа на нацыянальна-дзяржаўнае развіццё і які прадставіў на міжнароднай канферэнцыі ў Швейцарыі. |
| 11 | Студзень 1917г. | Быў вылучаны ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. |
| 12 | 23–25 сакавіка 1918 г. | Удзельнічае ў пасяджэнні Рады, дзе была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. |
| 13 | 1919 –1923 гг. | Жыў у Коўна, працаваў на пасадзе прэм'ер-міністра БНР, наведваў з дыпламатычнымі місіямі еўрапейскія краіны, адстойваў правы беларускага народа, асабліва пад Польшчай. Са снежня 1919 г. узначальваў Раду міністраў БНР. З урада выйшаў у 1923 г. Заняўся навуковай і літаратурнай дзейнасцю. |
| | 1923–1927 гг. | Рэдагаваў часопіс "Крывіч", які выходзіў у Коўна. |
| | 1924 г. | Надрукаваў "Падручны расійска-крыўскі слоўнік", які акрамя асноўнага лексічнага масіву ўключаў: руска-беларускі слоўнік асабовых імён; слоўнік тэрмінаў арніталагічных і батанічных. |
| | 1926 г., Коўна | Выдаў "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясніцельнай кнігапісі ад канца X да пачатку XIX стагоддзя". |
| | Красавік 1927 г. | Прызнаў савецкую ўладу і вярнуўся ў Беларусь; пераехаў з Коўна (Каўнаса) ў Мінск. |
| | 1927–1930 гг. | Займаў пасады: дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея; загадчыка кафедры этнаграфіі Інбелкульта; сакратара і акадэміка АН БССР. |
| | 1930 г. | Быў арыштаваны па справе "Саюза вызвалення Беларусі". |
| | Красавік 1931 г. | Высланы ў Саратаў на 5 гадоў, працуе на пасадзе загадчыка аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі Саратаўскага ўніверсітэта. |
| | 1937 г. | Паўторна арыштоўваецца і падвяргаецца катаванням. |
| | 23 студз. 1938 г. | Прыгавораны да расстрэлу як "агент польскай разведкі і ўдзельнік нацыянал-фашысцкай арганізацыі" (Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР). |
| | 1958 г. | Рэабілітаваны па другім прысудзе |
| | 1988 г. | Рэабілітаваны па першым прысудзе |
| | 1990 г. | **Вацлаў Ластоўскі** адноўлены ў званні акадэміка АНБ |

## 2 Разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм у прозе В.Ластоўскага.

Даволі актыўна праяўляў сябе В.Ластоўскі і як празаік: пісаў апавяданні, аповесці, апавяданні і казкі для дзяцей. Вядомы яго зборнік апавяданняў і легенд "Недацветы" (1918).

Да рэалістычнага кірунку даследчыкі [1] адносяць такія яго творы, як апавяданні "Лебядзіная песня", "Мост у Кутах", "Панас гуляе". Гісторыка-легендарная тэматыка знайшла сваё адлюстраванне ў такіх творах, як "Сож і Няпро", "Разбойнік", "Вітаўт і Ягайла", "Юга і Грамавік", "Каменная труна" і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інш. Звяртаўся Ластоўскі і да жанру імпрэсіі і алегорыі: імпрэсіі “Слёзы”, “Мары”, “Краскі”, “Апаўшае лісце”, апавяданне “Дзень ружавай кветкі”. Спынімся на некаторых з іх.

“Лебядзіная песня” – Ластоўскі асэнсоўвае лёс гараджаніна ў першым пакаленні. Горад не прымае Грыгора Лежню, але і вёска яго ўжо адрынула. Ён чужы і там, і тут. Спроба вярнуцца ў вёску для Лежні, няхай толькі ў думках, заканчваецца трагічна. Грыгор, падмятаючы вуліцу ў горадзе, чуе народную песню і на момант забываецца, пераносіцца на крылах мрояў у родную вёску, да крынічанькі, пра якую спяваў голас з расчыненага вакна. У гэты час яму крычыць карэтны фурман “Сцеражыся!”. “Грыгор не ўсцярогся...” – так сумна заканчвае сваё апавяданне В.Ластоўскі. У творы звернута ўвага і на заўсёдную для беларусаў праблему мовы.

“Мост у Кутах” – аповед пра двух “безгаспадарлівых гаспадароў” – Рыгора Задзіраку і Тамаша Неўступаку. Аўтар асуджае цемнату, бяздзейснасць, рабскую псіхалогію простага люду, які нічога не можа зрабіць без начальства, без загаду, без прымусу. Мост, неабходны абодвум гаспадарам, будуецца сялянамі пасля загаду ўрадніка. Ластоўскі адначасна выкрывае, спачувае і не прымае такую пазіцыю герояў-“гаспадароў”.

“Панас гуляе” – апавяданне напісана пад яўным уражаннем ад аднайменнага верша Я.Коласа, надрукаваным ў “Нашай ніве” і выкрывае такую загану як п’янства. Твор мае маралізатарскі падтэкст і шчаслівую канцоўку – Апанас Канцавы выпраўляецца (“знелюбіў насмерць карчму, гарэлку і Хаіма...”).

“Сож і Няпро” – паэтычная казка пра вялікага валадара старца Рыдана і яго карону, скрытую за 12-цю дзвярамі, 12-цю замкамі. Але варажбіты і знахары прыдумалі разрыў-траву і сон-траву, якія і дапамаглі выкрасці карону. Загадаў бацька сыну-Дняпру, у пагоню кінуцца, а затым і другі пайшоў на дапамогу першаму. І не вярнуліся яны. Плакаў стары бацька, прыгаворваючы: “Бадай вам, дзеткі мае, слязамі разліцца!”. Так і сталася.

“Вітаўт і Ягайла” – твор на гістарычную тэму. Героі – сапраўдныя гістарычныя асобы, стрыечныя браты Вітаўт і Ягайла, унукі Гедыміна, сыны адпаведна Кейстута і Альгерда. Твор услаўляе Вітаўта і яго намаганні ў адстойванні незалежнасці Беларусі і Літвы. Наватарства Ластоўскага выявілася ў распрацоўцы гістарычных сюжэтаў (“Каменная труна”, “Разбойнік”, “Князёўна Рагнеда”, “Часы былі трывожныя”, “Векавечная мяжа”, “Бяздоннае багацце”.

“Юга і Грамавік” – казка пра пражорлівую бабу Югу (Ягу), што насылае холад на зямлю, і Грамавіка (прыяцеля і апекуна людзей, ворага іх ворагаў), які забіў Югу і вярнуў цяпло – вясну-лета – на зямлю.

У 1912 годзе ў Пінску пад псеўданімам Арцём Музыка – выйшла аповесць В.Ластоўскага “Прыгоды Панаса і Тараса”. Галоўныя героі твора – Панас і Тарас – “седзячы на прызбе, гутарылі аб тым, як дзе жывуць людзі і аб іхніх звычаях і парадках”, і вырашылі праехацца, каб паглядзець на жыццё суседзяў-“мазуроў”. Убачанае імі і склала аснову твора. У аповесці бывалыя сяляне вучаць сваіх “бесталковых” суседзяў, як здабываць сонца ў хату, як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

замяшаць талакно, як пілаваць бэльку, як папарыцца ў лазні. Лагоднасць, міралюбнасць і разам з тым глыбінная мудрасць прасвечваюцца ў кожнай фразе гэтых простых людцаў. Мова іх перасыпана трапнымі прымаўкамі, прыказкамі.

Падарожжа з героямі па суседняй краіне падводзіць чытача да высновы, што “і мы не горш, а нат лепш жывём за суседзяў, значыць і культура, і звычаі, і мова наша не бядней, чым у іншых народаў” [12, с. 9].

Дз.Бугаёў [5] зазначае, што “Прыгоды “Панаса і Тараса” – твор жартоўна-гумарыстычны з відавочнай фальклорнай асновай і прыкметным казачным структурна-ўтваральным пачаткам, які свядома падкрэсліваецца, знарок дэманструецца, узмацняючы камізм твора. Бо арыентуецца пісьменнік <...> на побытава-жартоўную казку, блізкую да народнага анекдота, які выразна адгукаецца ў паэтыцы аповесці. <...> У згодзе з фальклорнай паэтыкай не маюць выразнай індывідуалізаванасці і героі аповесці, самі імёны якіх (Панас і Тарас) яўна перагукваюцца, рыфмуючыся, як у народным райку. І гэта таксама дадае гумарыстычны штрых у стылістыку твора. На гумарыстычную танальнасць працуе таксама *іранічная* падача жыцця мазуроў, з якімі ў час свайго падарожжа сустракаюцца ў розных камедыйных сітуацыях Панас і Тарас. Тыя мазуры і выступаюць галоўным аб’ектам насмешкі, бо яны ў вачах падарожнікаў выглядаюць як дзівакі, якія многае робяць не па-людску. Гэта ўжо адкрыта выкарыстоўваюцца пацяшальныя народныя анекдоты тыпу небыліц. У нас на магілёўшчыне анекдатычнымі недарэкамі звычайна называлі жыхароў краснапольскай вёскі Бакунавічы. <...> Гумар такога тыпу вядомы ў многіх народаў (варта ўзгадаць габраўскія анекдоты ці нашы аўцюкоўскія – Т.Ф.). І ўспрымаецца ён з-за сваёй знарочыста анекдатычнай перабольшанасці як сродак павесяліць душу заведамай небыліцай. Ластоўскі таксама на многае <...> не замахваўся. Але ягоная аповесць напісана ўсё ж дасціпна, вельмі зграбна і займальна, прываблівае добрай беларускай мовай і поўнай натуральнасцю самой фразы” [5, с. 37–39].

## 3 Аповесць “Лабірынты”: спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця.

“Сэнсам творчай працы Ластоўскага стала стварэнне нацыянальнага міфа аб беларусах. Думка пра глыбокія гістарычныя вытокі беларускага духу гучыць у верлібрах, прысвечаных часам паганства (“На радуніцу”, “На Каложы ў Гародні”, “Дума на Полацкім замчышчы”, “Баяну”). Гэтая мара-згадка пра “залатыя часіны” беларусаў прываблівае чытача аповесці-утопіі “Лабірынты”. Імкненне спасцігнуць метафізіку (быццё) беларускага этнасу прыводзіць Вацлава Ластоўскага да стварэння і навукова-мастацкага абгрунтавання міфічнай краіны Крывіі, правобраза Беларусі” [4, с. 327].

*І.Багдановіч*: “Падчас знаходжання ў Коўна (1923–1927гг.) у яго (В.Ластоўскага – Т.Ф.) выспявае канцэпцыя Беларусі як гістарычнай краіны Крывіі і генезісу (паходжання, узнікнення) беларусаў як гістарычнага этнасу крывічоў. <...> “Крыўская” канцэпцыя В.Ластоўскага знайшла адлюстраванне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў яго аповесці “Лабірынты” і ў вершах” (“О, Крыўская зямля...”, 1924 г.)” [3, с. 238].

Аповесць “Лабірынты” даследчык Я.Янушкевіч лічыць “самай яркай мастацкай рэччу ў літаратурнай спадчыне В.Ластоўскага” [12, с. 10]. “У гэтым творы аповед вядзецца ад імя аўтара. Тут паяднаны між сабой сівая даўніна (падзеі адбываюцца ў Полацку) і сучаснасць, блізкая В.Ластоўскаму. У творы моцныя фантастычныя і прыгодніцкія элементы, але грунт, на якім трымаецца дзеянне, рэальны. <...> Падарожжа ў скляпенні пад старадаўнім горадам, “магчымасць” убачыць бібліятэку, якая некалі была ў Полацку – яшчэ адно нагадванне, што гісторыя бясследна не знікае, у сілах чалавека, калі ён таго пажадае, супыніць працэс знішчэння. Адно можа нашкодзіць – бяспамяцтва, супраць якога і была накіравана творчасць В.Ластоўскага”.

На сённяшні дзень не вырашана і праблема жанравага вызначэння аповесці “Лабірынты”.

*Дз.Бугаёў*: “Жанр аповесці даследчыкі вызначаюць па-рознаму: фантастычная (Я.Лецка), прыгодніцка-гістарычная (А.Сідарэвіч) ці гістарычна-прыгодніцкая (А.Каўка)” [5, с. 40]. Бясспрэчна адно: у гэтым творы “фантастыка, заглыбленая ў наша гістарычнае мінулае, сапраўды арганічна паяднапася з вельмі займальным прыгодніцтвам...” [5, с. 40]. Яно “распачынала, прынамсі ў прозе, традыцыю вострасюжэтнага пісьма з элементамі загадкавасці і таямнічасці, нечаканымі паваротамі дзеяння і іншымі сакрэтамі займальнасці, якімі потым будуць вабіць вельмі многіх такія нашы славутыя майстры ў прыгодніцкім жанры, як Янка Маўр і асабліва... Уладзімір Караткевіч” [5, с. 40].

П.Васючэнка ў сваім артыкуле [7] вызначае жанр аповесці Ластоўскага “Лабірынты” як *утопія* – месца, якога няма, фантазія, мара. Пазней, у кнізе “Ад тэксту да хранатопа” даследчык пра спецыфіку жанра аповесці выкажацца наступным чынам: “Свайго роду загадкай твора застаецца і яго жанравая прырода. Даследчыкі дагэтуль не прыйшлі да адзінага меркавання пра жанравую прыналежнасць “Лабірынтаў”. Што гэта: дэтэктыў, філасофская аповесць, гістарычная, прыгодніцкая або містычная проза, жахі? На маю думку, “Лабірынты” набліжаюцца да *інтэлектуальнага дэтэктыву* – таго жанру, у якім створаны, прыкладам, раман Умберта Эка “Імя ружы”. Можна казаць і пра наяўнасць у творы прыкметаў “*сінтэтычнага рамана*” – той умоўнай жанравай мадыфікацыі, існаванне якой прыпадае на мяжу XX–XXI стагоддзяў. “Сінтэтычны раман” якраз і заклікаы аб’яднаць у сабе тыпалагічныя рысы розных жанраў і тым самым “прымірыць” паважную і масавую літаратуру. Ластоўскі, стварыўшы “Лабірынты”, зазірнуў у літаратурную будучыню.

Ён як бы прадбачыў той род літаратурнай гульні, пры якой канструююцца неіснуючыя мовы, краіны, ад імя класікаў пішуцца новыя тэксты або старыя тэксты прыпісваюцца неіснуючым творцам. Такога роду літаратурныя містыфікацыі асабліва пашыраныя ў творчасці Х.Л.Борхеса” [8, с. 59].

На думку А.Акуліча, “пра «Лабірынты» трэба гаварыць як пра

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*нацыянальную містэрыю*, дзе апісаны народны духоўны космас і асноўныя вехі нацыянальнага культурнага станаўлення, як пра адмысловую нацыянальную *практопію*, створаную на аснове старажытнай беларускай гісторыі" [14].

"Вельмі выразна патрыятычныя пачуцці Ластоўскага выказаны ў ягонай **паэзіі**… Яна прадстаўлена ўласна вершамі (іх каля трох дзесяткаў), пяццю вершамі ў прозе і вершаваным драматычным абразком "Адзінокі", прысвечаным Ф.Скарыне.

Ва ўсіх гэтых творах на першым плане – трагізм беларускай гісторыі, зноў жа яе самыя балючыя старонкі" [5, с. 41]. Да паэтычнай творчасці Ластоўскі звярнуўся амаль у 40 гадоў.

**4 Роля В.Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі.**

В.Ластоўскаму належаць артыкулы "Памяці Сяргея Палуяна", "Эліза Ажэшка", "Людвіг Кандратовіч", "Леся Украінка", рэцэнзіі на зб-кі "Васількі" Ядвігіна Ш., "Рунь" М.Гарэцкага, "Родныя з'явы" Т.Гушчы-Коласа. Лічыцца, што ён паказаў прыклад "прагнастычнай крытыкі" ў сваім водгуку на зборнік Я.Коласа "Родныя з'явы": уключыў творы беларускага пісьменніка ў шырокі агульналітаратурны кантэкст, прыгадаўшы вядомыя імёны В.Стэфаніка, А.Чэхава.

Праявамі плённага развіцця нашаніўскай крытыкі была яе абвостраная ўвага да тэарэтычных праблем і з'яўленне жанравай формы палемічнага артыкула – так званая дыскусія 1913 г. у "Нашай ніве", што звязаны таксама з імем В.Ластоўскага. Маецца на ўвазе артыкул "Сплачвайце доўг", надрукаваны ў 1913 г. ў "Нн". Дыскусія, па словах М.Мушынскага, прысвечана "абмеркаванню шляхоў развіцця нацыянальнага слоўнага мастацтва" [1, с. 76]. Па сутнасці, Ластоўскі дакараў беларускіх пісьменнікаў за тое, што іх творы прасякнуты матывамі смутку, тугі, расчаравання, нараканнямі на гаротны лёс. Хараства і прыгажосці роднага краю песняры не бачаць, як не бачаць і светлых момантаў жыцця селяніна, не будзяць актыўны пачатак у характары беларуса. "Крытык лічыў, што пры аднабаковым поглядзе на рэчаіснасць істотна звужаецца функцыя літаратуры, яе грамадска-пераўтваральная роля, недаацэньваюцца і творча-патэнцыяльныя магчымасці народа" [1, с. 76].

Яго апанентам выступіў Я.Купала (ёсць, аднак, меркаванні, што і "Адказ..." напісаў В.Ластоўскі) пад псеўданімам "Адзін з "парнаснікаў", надрукаваўшы вострыартыкул пад назвай "Чаму плача песня наша? Адказ Юрку Верашчаку". Купалу (??) праз некаторы час ("Наша ніва", №№ 33, 34 за 1913 г.) падтрымаў Л.Гмырак артыкулам "Яшчэ аб сплачыванні доўгу".

Дз. Бугаёў падкрэсліваў, што В.Ластоўскі падыходзіў да крытыкі з высокімі крытэрыямі: "І яго пранікнёнае крытычнае слова мае трывалую вагу і моц. Яно ніколі не было выпадкова-абыякавым, не зводзілася да трафарэтнай адпіскі, а вызначалася сваёй прынцыповасцю і патрабавальнасцю. Ён пісаў пра П.Багрыма і К.Каліноўскага, С.Палуяна і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У.Сыракомлю, заклікаў збіраць матэрыялы пра А.Рыпінскага і Ф.Тапчэўскага, А.Абуховіча і А.Гурыновіча, Я.Чачота, А.Вярыгу-Дарэўскага і В.Каратынскага, а таксама іншых пісьменнікаў, пра якіх тады мала што было вядома, шукаў праявы беларускага "народнага генія" ў творчасці А.Міцкевіча і Ф.Дастаеўскага, магутную стваральную сілу якім, на яго думку, дала наша зямля.

Адгукаючыся на выхад "Васількоў" Ядвігіна Ш., ён дасведчана гаварыў пра адметнасць гэтага мастака, але разам з тым схіляў яго дамагацца большага, у прыватнасці паспрабаваць сілы ў "абшырнай аповесці", у гістарычных апавяданнях...

Пра першую кнігу М. Гарэцкага "Рунь" Ластоўскі пісаў, што гэта не зборнік апавяданняў мляўка-стагнальных і не скалазубства з вяскоўца, з яго мазалёў і цемнаты, гэта першы ў нашай літаратуры паэмат-трагедыя Маладой Беларусі. Першы голас беларускай, маладой, набалеўшай душы "на ўвесь свет, на Белу Русь". "Не паўсяднеўнае айканне і не салодзенька-кіслае стагнанне няшчырых людзей..." Гарэцкі пра маўляе "як маючый сілу". Як сын народа... Малюе трагедыю і боль душы Маладой Беларусі не паверхнасна, а заглядае ўглыб, пад карэнне".

У гаворцы пра зборнік "Родныя з'явы" Якуба Коласа Ластоўскі не толькі звяртаў увагу на глыбокі псіхалагізм як вельмі каштоўную рысу твораў пісьменніка, але і прадказваў яму сусветнае прызнанне: "Трэба спадзявацца, што імя Т. Гушчы з часам будзе вядома далёка па-за межамі нашымі, услаўляючы імя беларускае, яно пойдзе далёка па свету".

Мара пра сусветны рэзананс нацыянальнай літаратуры і ўзвышэнне праз яе беларускага народа была любімай, запаветнай думкай Ластоўскага... І не стамляўся паўтараць, што сваю літаратуру, мы, як і ўсе цывілізаваныя народы, павінны мераць не паблажліва-правінцыйнай, а вялікай "меркай еўрапейскай", арыентавацца ... на вопыт "усясветнай класічнай літаратуры" [5, с. 43–45].

Што да дыскусійна-задзірыстага артыкула "Сплачвайце доўг", то Ластоўскі "хацеў, каб наша літаратура, не цураючыся паказу людскіх пакут, адлюстроўвала і прыгажосць Бацькаўшчыны, хараство яе прыроды, словам, бачыла, яшчэ і "красу свайго народа і краю". Гэта, як ужо адзначаў А.Лойка, было жаданне патрыятычнае. За ім стаяў клопат руплівца пра багацце і разнастайнасць нашай літаратуры" [5, с. 45].

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 427–446.

**Дадатковая**

2 Абрамовіч, Павал. Дубавец і Ластоўскі. Чаму ўдалася першая і не ўдалася апошняя літаратурная дыскусія XX ст. / П.Абрамовіч // ARCHE-Скарына. – 2000. – № 6.

3 Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э Багдановіч. – Мінск: Бел навука, 2001. – С. 237–242, 75–77.

4 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 327.

5 Бугаёў, Дз. Пра Вацлава Ластоўскага / Служэнне Беларусі / Дз.Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2003. – С. 31–48.

6 Вацлаў Ластоўскі // Крыніца. – 1994. – № 8 (2).

7 Васючэнка П. Захоплены лабірынтам: Таямніцы творчасці Вацлава Ластоўскага / П.Васючэнка // Роднае слова. – 2008. – № 11. – С. 3–6.

8 Васючэнка, П.В. Першаадкрывальнік з роду Ластаў. Мастацкія адкрыцці Вацлава Ластоўскага / Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П.Васючэнка. – Мінск: Галіяфы, 2009. – С. 53–62.

9 Ластоўскі, Вацлаў. Бяздоннае багацце. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мн., 2001.

10 Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.

11 Шамякіна, Т. “Лабірынты” Вацлава Ластоўскага і навуковыя пошукі ХХ – ХХІ стагоддзяў / Т.Шамякіна // Маладосць. – 2008. – № 10. – С. 103–110.

12 Янушкевіч, Язэп. Неадменны сакратар Адраджэння / Я.Янушкевіч. – Мінск, 1995. [Серыя “Нашы славутыя землякі”].

13 Санюк, З. Аповесць “Лабірынты” В. Ластоўскага / З.Санюк // Роднае слова. – 2000. – № 1.

14 Акуліч, А. Беларускія лабірынты. Дзяржаватворная канцэпцыя Вацлава Ластоўскага /Алік Акуліч // Літаратурная Беларусь. – 2013. – № 10 (86) ад 25 кастрычніка.

**Электронныя крыніцы**

15 Ластоўскі, В. творы. – Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Vaclau_Lastouski/

16 Ластоўскі, В. Выбраныя творы. – Кнігазбор [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://bk.knihi.com/lastouski/

17 Ластоўскі, В. – Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/vaclau.lastouski

## 1.11 ЦІШКА ГАРТНЫ (1887 – 1937)

1 Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага.
2 Адметнасць паэтычнай творчасці Ц.Гартнага
3 Празаічныя творы: аналіз зборнікаў.
4 Раман “Сокі цаліны”, яго значэнне для беларускай раманістыкі.

*Ц.Гартны ўвайшоў у айчынную літаратуру «песняром працы і змагання», «першым пралетарскім паэтам Беларусі», аўтарам першага закончанага беларускага рамана (“Сокі цаліны”). “Плённа працуючы амаль ва усіх літаратурных жанрах, пісьменнік пакінуў значную спадчыну. Не усё створанае ім вытрымала выпрабаванне часам”, разам з тым пісьменнік “заняў сталае месца ў гісторыі беларускай літаратуры”* [1, с. 358].

*Пісьменнік “значна пашырыў дыяпазон беларускай літаратуры. Яму належыць заслуга у асваенні тэмы горада, раскрыцці псіхалогіі рабочага чалавека, паэтызацыі яго працы. У гэтым выявілася наватарства пісьменніка. Разам з тым у яго творчасці знайшлі працяг лепшыя нацыянальныя традыцыі ў паказе жыцця сялянства. Творчая спадчына Ц.Гартнага з’яўляецца адметнай вяхой на шляху развіцця і станаўлення беларускай літаратуры ХХ ст.” [1, с. 380].*

### 1 Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага.

*Асноўная крыніца падрыхтаваных матэрыялаў – артыкул Дасаевай, Т.М.* [1]

Цішка Гартны – псеўданім Зміцера Хведаравіча Жылуновіча. Нарадзіўся будучы пісьменнік 4 лістапада 1887 г. у мястэчку Капыль у сям’і бедных сялян-чорнарабочых. «У нас не было ні каня, ні каровы, ні поля, каб рабіць», – пісаў Ц. Гартны ў аўтабіяграфіі. Яго бацькі ў розныя поры года працавалі то на падзёншчыне, то на здзельшчыне. На адзінаццатым годзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыцця Зм. Жылуновіч пайшоў у пастухі-найміты, пасабляючы грашыма сваім бацькам. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома («бацька сам навучыў мяне чытаць «поверху»), потым была вучоба ў «дарэктараў», хатніх настаўнікаў. Летам хлапчук пасвіў жывёлу, а зімой вучыўся. «За гэтыя зімы, – успамінаў Зм. Жылуновіч, – прайшоў усе царкоўнаславянскія кніжкі, якія толькі былі ў бацькі» (Абеглы саманарыс майго жыцця // Пяцьдзесят чатыры дарогі [2]). Грамата давалася лёгка. У 1902 г. Зм. Жылуновіч паступіў у двухкласнае Капыльскае народнае вучылішча, якое закончыў у 1905 г. У лютым 1906 г. паступіў на працу ў гарбарную майстэрню ў родным мястэчку.

Зм. Жылуновіч рана далучыўся да рэвалюцыйнай дзейнасці. «У Капылі – спагадным для рэвалюцыйнай прапаганды кутку, – пісаў у сваім дзённіку Ц. Гартны, – ужо з 80-х гадоў лунала вялікія ідэі вызвалення». Ён захапіўся «работніцкім рухам». Упершыню трапіўшы ў 1904 г. на мітынг сацыял-дэмакратаў, ён на доўгі час звязаў лёс з Капыльскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй, стаў адным з найбольш дзейсных яе сяброў. Гэта паслужыла галоўнай перашкодай пры паступленні ў 1906 г. у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (не прынялі з-за адсутнасці даведкі пра добранадзейнасць). У 1909–1912 гг. у пошуках працы ён аб’ездзіў многія гарады Беларусі і Украіны, Літвы і Латвіі.

У 1910 г. пры актыўным садзейнічанні Зм. Жылуновіча ў Капылі быў створаны літаратурна-грамадскі гурток «Самаадукацыя і развіццё», які наладзіў выпуск рукапіснага часопіса «Заря» на рускай мове. У другой палове 1910 г. часопіс спыніў сваю дзейнасць. У 1911 г. выпуск рукапіснага часопіса быў адноўлены, але ўжо пад назвай «Голос низа» і з дадаткам на беларускай мове «Вольная думка».

У 1912 г. Зм. Жылуновіч працаваў гарбаром у г. Вількамір Ковенскай губерні, вёў прапагандысцкую работу. У 1913 г. пераехаў у Пецярбург. Тут ён становіцца карэспандэнтам бальшавіцкай газеты «Правда». Пяць месяцаў працаваў на заводзе «Вулкан», затым тры месяцы быў беспрацоўным. У хуткім часе ўладкаваўся на працу ў выдавецтва «Новый человек». У 1915 г. быў мабілізаваны ў войска, але праз месяц адпушчаны. У 1916 г. працаваў у Беларускім бежанскім камітэце, выдаваў газету «Дзянніца». У сакавіку 1917 г. бежанскі камітэт беларусаў паслаў Зм. Жылуновіча сваім дэпутатам у Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Увесь перыяд з лютага да кастрычніка ён быў блізкім бальшавіцкай партыі, наведваў яе мітынгі, чытаў партыйную літаратуру.

Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі прынесла шмат перамен. У лютым 1918 г. Ц. Гартнага прызначаюць сакратаром Беларускага камісарыята пры ўрадзе РСФСР. 3 сакавіка гэтага ж года ён рэдактар першай беларускай савецкай газеты «Дзянніца». Пасля абвяшчэння Беларусі савецкай рэспублікай 1 студзеня 1919 г. Ц. Гартны – Старшыня Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада. Пазней у розныя гады быў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь» і часопіса «Полымя», дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, намеснікам міністра асветы БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Працаваў у інстытуце беларускай культуры. З 1929 г. з’яўляўся правадзейным членам Акадэміі навук Беларусі

Ц. Гартны стаў *ахвярай рэпрэсій*. Яго арыштавалі 15 кастрычніка 1936 г. па сфабрыкаванай справе «як актыўнага ўдзельніка контррэвалюцыйнай фашысцкай арганізацыі, выкрытай у Мінску».

Гэтаму папярэднічала знішчальная крытыка ў кнізе А. Канакоціна «Літаратура – зброя класавай барацьбы» (1931), дзе закрэслівалася лепшае з таго, што было зроблена пісьменнікам. У 1931 г. Ц. Гартнага выключылі з камуністычнай партыі. У газеце «Савецкая Беларусь» ад 21 студзеня 1931 г. была надрукавана Пастанова Прэзідыума і парткалегіі ЦК КП(б)Б ад 16 студзеня 1931 г. па справе У. М. Ігнатоўскага і З. Ф. Жылуновіча, у якой былі наступныя словы: «Нацыянал-апартуністаў – агентаў нацдэмаўскай контррэвалюцыі, рупараў класавага ворага, здраднікаў партыі – Ігнатоўскага і Жылуновіча – вон з кадраў КП(б)Б».

11 кастрычніка 1937 г., знаходзячыся ў зняволенні, не вытрымаўшы фізічных і маральных здзекаў, Зм. Жылуновіч (Ц. Гартны) памёр у Магілёўскай псіхалякарні.

Ён быў рэабілітаваны ў кастрычніку 1955 г. «за недаказанасцю злачынстваў» і толькі ў верасні 1987 г. – «за адсутнасцю саставу злачынства».

15 лістапада 1936 г. Ц.Гартны быў арыштаваны. “Знаходзячыся ў турме, быў абвешчаны псіхічна хворым, у сувязі з чым пераведзены ў Магілеўскую псіхіятрычную лячэбніцу, дзе памёр (па іншых звестках – скончыў жыццё самагубствам). 15.10.1955 г. рэабілітаваны ў грамадска-прававых адносінах, у 1988 г. адбылася поўная палітычная рэабілітацыя” [3].

## 2 Адметнасць паэтычнай творчасці Ц.Гартнага.

Першыя **вершы** на беларускай мове Зм. Жылуновіч напісаў у 1904 г. «Цяга да літаратурнай працы адзначылася ва мне яшчэ на школьнай лаўцы, – пісаў ён ва ўспамінах. – Да першых жа спроб пісання мяне заінтрыгавалі тэмы народных павер’яў і забабонаў». Вялікае ўздзеянне на маладога аўтара аказала паэзія М. Някрасава, творамі якога ён зачытваўся з дзяцінства. Аднак напісанне вершаў на рускай мове не задавальняла Зм. Жылуновіча. Усё больш прываблівала стыхія роднай мовы. У 1908 г. адбылося знаёмства з першай штотыднёвай беларускай газетай. «Прачытаўшы «Нашу Ніву» ад назвы да подпісу рэдактара, я быў у захапленні, – пісаў Ц. Гартны. – Мяне дзівіў не яе змест, не цікавасць раскладзенага у ёй матэрыялу, а, галоўным чынам, даступнасць яе, яе блізкасць «духу» вакольнага беларускага жыцця, нарэшце, самы факт друкавання яе на беларускай мове. Апошняе было для мяне адкрыццём. Да гэтага часу я не мог сабе ўявіць, каб тая мова, на якой гутарылі мае бацькі, сяляне, але якой не відаць было ў кніжках, у школе, у абыходзе крыху бывалых людзей, каб на гэтай мове можна было друкаваць газету...». «Прачытаныя ў ёй вершы мігам абудзілі ва мне цягу да пісання па-беларуску; я сеў і напісаў першы верш, які ў студзені 1909 года быў надрукаваны пад назваю «Бяздольны», і прысвяціў яго Янку Купалу» [2]. Гэта быў першы надрукаваны верш. У 1910 г. З’явіўся верш «Не хіліся, дуб зялёны», прысвечаны Я. Коласу. Творчасць выдатных беларускіх паэтаў аказала моцны ўплыў на Ц. Гартнага.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Першы паэтычны зборнік Ц. Гартнага «Песні» выйшаў у 1913 г. у Пецярбурзе. Ён складаўся з трох раздзелаў: «Песні працы», «Песні кахання» і «Жальбы і жаданні». Адметнасцю зборніка з’яўлялася тое, што Ц. Гартны выступіў як «пралетаркі паэт». *Упершыню* ў беларускай літаратуры побач з вобразам селяніна з’явіўся *вобраз рабочага*.

Цэнтральнае месца ў зборніку занялі «Песні гарбара». У вершах гэтага цыкла адлюстраваны невыносна цяжкія ўмовы працы рабочых у капіталістычным грамадстве. Разам з тым паэт паказвае, як рабочы пачынае ўсведамляць сваю годнасць і сілу, як абуджаецца ў ім сацыяльная актыўнасць, гатоўнасць рэвалюцыйным шляхам змяніць сацыяльныя абставіны, у якіх яму даводзіцца працаваць і жыць.

Зборнік «Песні» вызначаецца народным поглядам паэта на працу, якую ён лічыў не толькі асновай матэрыяльнага існавання, але і першай умовай духоўнага жыцця. У вершах «Красуй, збожжа!», «Песні жняі», «Касьба», напісаных у рэчышчы нацыянальнай традыцыі, Ц.Гартны паэтызуе сялянскую працу. Лейтматывам цыкла «Песень працы» з’яўляецца думка паэта аб тым, што людзі працы (сяляне і рабочыя) – творцы жыцця, стваральнікі ўсяго каштоўнага на зямлі (было ўжо ў Багушэвіча):

Праца ўвесь свет ускарміла,
Праца нам шчасце дала.

(«Касьба»)

Высока ацаніў «Песні» Я. Купала. Ён пісаў: «Цішка не «майструе вершаў», а пяе, пяе усёй сваёй набалелай душой, усім сваім сэрцам, гарачым, кіпучым. Нойдзеце тут і галубіныя песні кахання, і сумныя жальбы, і смелыя жаданні, і ва ўсім чуваць песняра праўдзівага, вынасіўшага кожнае слова ў сваіх набалелых грудзях».

У паэме «Паэт, маці і муза» (1915) Ц. Гартны вызначыў сваё паэтычнае крэда, назваў сваю музу «музай змагання», падкрэсліўшы тым самым сілу паэзіі, яе непарыўную сувязь з жыццём і барацьбой народа.

2

Паэтычны зборнік (другі) Ц. Гартнага, які выйшаў у Берліне ў 1922 г., меў назву «Песні працы і змагання». Ён тэматычна працягваў матывы першага зборніка «Песні» (раздзел «Песні працы»).

Змест двух другіх раздзелаў «Чырвоны золак» і «Змаганне» складаюць вершы, у якіх паэт вітае заваёвы рэвалюцыі («Работніцкая і сялянская рэвалюцыя»), («Гадавіна 25 кастрычніка»), пагражае яе ворагам («Далакопам рэвалюцыі»), пяе гімны яе абаронцам («Чырвонаармейцы»), аплаквае яе ахвяры («Сцешся»), заклікае да стваральнай працы («К працы»). У вершы «Замацуйма!» Ц. Гартны пісаў:

Вось цяпер, калі вораг разбіт —
Не спачынку чакаць мы павінны:
Кожны мусіцьме гартам быць зліт
Дзеля працы руплівай, няўпыннай.

Зборнік (трэці) «Урачыстасць» (1925) успрымаецца як лагічны працяг дзвюх папярэдніх паэтычных кніг Ц. Гартнага. Па трапным вызначэнні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М. Піятуховіча, «зборнік «Урачыстасць» становіць сабою яскравы вобраз бадзёрага светаадчування песняра, які бачыць усюды рух, дынаміку барацьбы і адначасна ўзаемную сувязь рэчаў. Прасякнуты такімі бадзёрымі настроямі, Ц. Гартны адгукаецца на ўсё пекнае і прыгожае: і рэвалюцыя, і прырода, і ўсё жыццё у цэлым стаіць у сваім святочным убранні». Даследчык заўважае не толькі *тэматычнае пашырэнне лірыкі паэта*, але і пэўныя *дасягненні ў галіне «фармальна-мастацкай»*: «Цішка Гартны з’яўляецца тут зусім у новай постаці музычнага песняра, які трапным злучэннем асанансаў і алітэрацыяй можа ўтварыць сапраўдныя гукавыя мелодыі». Асабліва адчувальна гэта музыкальнасць у лірычных вершах «Мая душа», «Я жыць хачу», «Я жыву», «Сімфонія», «Белым матылёчкам».

Белым матылёчкам,
Лёгкім ды вяртлявым,
Па зялёных травах,
Ў руцяных люточках,
Ясным днём і ночкай
Я б хацеў лятаці,
Я б хацеў лятаці.

*(«Белым матылёчкам»)*

І калі асобныя вершы цыкла «Урачыстасць рэвалюцыі» не пазбаўлены плакатнасці і схематызму, то ў вершах, аб’яднаных у цыкле «Урачыстасць жыцця», Ц. Гартны раскрываецца як тонкі лірык з багатым светаўспрыманнем, здольнасцю адчуваць прыгажосць навакольнага свету. Цікава нагадаць у сувязі з гэтым, што, выступаючы ў ролі літаратурнага крытыка, Ц. Гартны будзе адмаўляць «эстэтычную» сутнасць паэзіі, выступаць супраць «чыстага мастацтва». У артыкуле «Этапы развіцця беларускае літаратуры», напрыклад, разглядаючы творчасць М. Багдановіча, ён палічыць вялікай заганай ухіл паэта ад «грамадскіх напеваў», яго захапленне «лёгкімі матывамі аб лесавіках ды русалках, аб гнедых жывёлах, што плывуць па небу». Але гэта будзе крыху пазней. Пакуль жа сам Ц. Гартны ў захапленні ад «зачараванага царства прыроды», населенага чарадзеямі, лесунамі, духамі, німфамі, ведзьмамі, вадзянікамі. Аб іх згадвае паэт у вершы «Каля бору сонца ходзіць» (1924), знаходзячы для гэтага яркія рамантычныя фарбы:

Каля бору сонца ходзіць
На высокіх ценкіх дыбах,
Чарадою песні водзіць
Па кустох — густых сядзібах —
Даўгакосых,
Таўстаносых,
Цемнатварых
Лесуноў.
З-пад кустоў,
З-пад тайных схаваў
Вабам,зовам
На палянкі,
На гулянкі
Насустрэчу светлай ночы
Духаў скрытных зазывае,
І ў сляпыя цемні-вочы
Сітам промень рассявае.
Вузкіх шляхаў выгіб ломкі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Машастовай рунню ўбраны,
І шнуруюць скокам ёмкім
Німфы-ведзьмы, феі-панны...

Гартны выступаў і ў жанры сатырычнага верша, байкі, фельетона. У гэтай сферы яго літаратурнай дзейнасці, паводле вызначэння М. Гарэцкага (“Гісторыя беларускае літаратуры”), было багата «аўтарскай арыгінальнасці і творчай жывасці». Пад псеўданімам «Авадзён» у перыядычным друку з’явіліся вершы Ц. Гартнага «Пан, якіх многа», «Папоўскія гадкі», «Сымон-пан», «Бог памагае» і інш. Такім чынам, у паэтычнай творчасці Ц. Гартнага знайшлі ўвасабленне самыя розныя матывы і тэмы.

Як ідэолаг пралетарыяту, бальшавік, Гартны-пісьменнік цесна знітаваны са сваімі палітычнымі поглядамі. Яго творчасці ўласцівы класавы падыход да падзей і з’яў рэчаіснасці, але адначасова у ёй выразна акрэслена і гуманістычная тэндэнцыя. Кірунак гэтай тэндэнцыі быў вызначаны яшчэ ў нашаніўскі перыяд, калі пісьменнік знаходзіўся пад жыватворным уплывам паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа, разам з якімі, паводле слоў Л. Клейнбарта, Ц. Гартны паднімаў на свае плечы «цяжкі цяжар «беларускага адраджанізму».

**3 Празаічныя творы: аналіз зборнікаў.**

*Як празаік* Ц. Гартны спрабаваў свае сілы ў розных формах эпічнага жанру: пісаў нататкі, нарысы, абразкі, апавяданні, аповесці, раман «Сокі цаліны». Яго апавяданні аб’яднаны ў зборнікі «Трэскі на хвалях» (1923) і «Прысады» (1927).

У творах, прысвечаных адлюстраванню дарэвалюцыйнай рэчаіснасці, празаік паказвае абумоўленасць учынкаў сваіх герояў сацыяльна-эканамічнымі абставінамі, жорсткую залежнасць ад іх. Каб пракарміць сям’ю, рабочы Анупрэй («Штрэйкбрэхер») насуперак свайму сумленню, рабочай годнасці парушае працоўную салідарнасць, становіцца штрэйкбрэхерам, бо не можа дапусціць, каб яго дзеці галадалі. Цяжкае матэрыяльнае становішча вясковай жанчыны Палуты («Лайдак») прыглушае ў ёй святое мацярынскае пачуццё жалю і спагады да свайго сына, які, не вытрымаўшы маральных і фізічных здзекаў, што чыніў над ім пан, у якога ён служыў, вярнуўся дахаты. Грабар Антось («Велікодная каробка») дзеля сваіх дзяцей, праз ваганні і пакуты сумлення, становіцца злодзеем. Не можа ён растлумачыць сыну і дачцэ, што гаспадар не выплаціў яму грошай, а таму на святы яны застануцца без падарункаў. Маладая жанчына Аўдоцця («Распусніца») – маці траіх дзяцей. Пакінутая мужам, яна без сродкаў для існавання вымушана прадаваць сябе.

Рэвалюцыя, грамадзянская вайна, выпрабаванні і пакуты людзей у час акупацыі – такія тэмы знаходзяць асвятленне ў большасці апавяданняў зборніка «Трэскі на хвалях». Хісткае становішча чалавека ў грамадстве падчас грозных сацыяльных катаклізмаў адпавядае сімвалічнай назве кнігі. Пісьменнік спрабуе асэнсаваць драматычныя з’явы рэчаіснасці, выяўляе заклапочанасць лёсам сваіх герояў. У апавяданнях «Дойдзем, сынок» (1920), «На руінах» (1923) праўдзіва паказаны жудасныя рэаліі разбурэння, тыя маральныя і фізічныя пакуты, якія давялося перажыць людзям у час

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грамадзянскай вайны і акупацыі Беларусі белапалякамі. Нягледзячы на выпрабаванні, героі гартнаўскіх апавяданняў захавалі ў сабе лепшыя чалавечыя якасці, вялікую прагу да жыцця і стваральнай працы.

*Падрабязна пра апавяданні гл.: Дасаева, Т.М. Цішка Гартны / Т.М.Дасаева // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – С. 358–380.*

Шмат супярэчлівых думак выклікае вобраз галоўнай гераіні апавядання «Спатканне». Дачка заможных сялян Агапа кахае камандзіра Чырвонай Арміі, бальшавіка Костуся Акрайца. Бацькі супраць, каб іх дачка звязала лёс з гэтым чалавекам. Дзяўчына ж усёй душою рвецца да каханага, нават хоча паехаць на фронт, стаць «чырвонаю сястрою», каб толькі быць побач са сваім абраннікам. На гэтым пабудаваны сюжэт апавядання.

<...>Ей і самой хочацца з вінтоўкай і кулямётам разам з Костусем «біцца супроціў паганых шляхтаў ды паноў» (с. 99). «Эх, змяць бы іх усіх, – думае Агапа. – Костуська, удар на гэту сволач і раздаві шляхту у шпэлах» (с. 100). Паўстае пытанне: чаму Агапа не адчувае горычы, сумнення, што яе каханы забівае (і не толькі легіянераў)? <...> Хутчэй за усё гэта падцягванне персанажа да пэўнага стэрэатыпу – вобраз ваяўнічай дзяўчыны-патрыёткі, знаёмы па маладнякоўскай прыгодніцкай аповесці.

Чырвонаармеец з апавядання «Панкел Ліпа» вытрымаў многа выпрабаванняў. Ён восьмы год знаходзіцца на фронце, пяць разоў быў паранены і ўвесь гэты час не бачыў ні жонкі, ні дзяцей. Чарговы раз вярнуўшыся пасля шпіталя ў сваю часць, герой перажывае душэўную скруху, бо, паводле яго слоў, «чалавек не сталь – не можа трываць бясконца». Панкелу здаецца, што калі б толькі ён даведаўся, дзе яго сям’я, угледзеў жонку, дзяцей, то «больш нічога не трэба», тады б ён зноў «гадзіўся на справу». Але вярнуўшыся са шпіталя, перад чарговай адпраўкай на фронт ён каторы раз чуе ад сваіх камандзіраў пра «святую павіннасць кожнага з чырвонаармейцаў забыць усё, што злучана з прыватным жыццём» (с. 70), пра самаахвярнасць у імя рэвалюцыі.

Другі галоўны персанаж апавядання Проў знаходзіцца ў Чырвонай Арміі з мэтай агітацыі чырвонаармейцаў перайсці змагацца ў стан казацтва. Адчуўшы настрой Панкела Ліпы, ён распальвае ў яго свядомасці незадавальненне сваім становішчам, уладай бальшавікоў. На супрацьстаянні гэтых герояў і пабудавана апавяданне. <...>

Герой апавядання «Больш за усіх» Платон Гічка вярнуўся да мірнай працы, але праблема грамадскага і асабістага паўстае ў яго жыцці паранейшаму востра. Вернасць рэвалюцыйным ціэалам існуе не толькі ў свядомасці Платона, але і ў кожным яго ўчынку. Пачуццё грамадскага бярэ верх над усімі іншымі пачуццямі героя. Усё, што не звязана з рэвалюцыяй, тое, безумоўна, ніжэй яе па значнасці, – лічыць Платон Гічка. Можна сказаць, што ён ахвяруе асабістымі інтарэсамі ў імя грамадскіх. Аб гэтым сведчаць факты яго біяграфіі. «Дзеля рэвалюцыі ён ахвяраваў пачуццём кахання, пакінуўшы без адказу просьбу каханай дзяўчыны не выязджаць на падпольную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

працу пры немцах. Дзеля ідэі рэвалюцыі ён забываў бацькоў, не ведаючы, як і што яны жывуць, як іх становішча пад палякамі» (с. 175).

<...> Упэўненасць Платона ў тым, што рэвалюцыянер не павінен мець «жаднае спагады» (с. 175), упершыню пахіснулася тады, калі ён павінен быў пакінуць дома хворую маці і паехаць на працу ў павятовы горад. Пісьменнік прасочвае ўнутраную барацьбу, якая адбываецца ў свядомасці героя паміж асабістым і грамадскім. «Я і сам не ведаю, што рабіць... Не паехаць – здрадзіш рэвалюцыі, нарушыш дысцыпліну і... бачыш, як думаюць другія. А паехаць – можаш мацеру пахаваць» (с. 177). Платон просіць людзей прыгледзець за маці і едзе, але гэта каштуе яму вялікіх душэўных пакут. Заглушыўшы свой боль, ён даводзціць Тамашу: «Рэвалюцыя не павінна цярпець ад таго, што ў мяне баліць што або ў сям’і якое няшчасце; мы мусім аддавацца ёй да апошняй мажлівасці» (с. 179). Калі Платон вяртаецца дамоў, там яго чакае вестка пра смерць бацькі (ён памёр у дарозе ад тыфу) і горкі папрок маці: «Нашто табе больш за усіх». У фінале апавядання пісьменнік пакідае свайго героя ў поўнай разгубленасці. «Цяжкая жаласць раптам спаралізавала ўсе яго сілы» (с. 184). Пісьменнік сумняваецца ў правільнасці паводзін чалавека, які ахвяруе ў імя справы бацькам, ігнаруючы агульначалавечыя нормы маралі. Раскрываючы свет думак і пачуццяў героя ў складаны для яго момант, празаік дае магчымасць адчуць і зразумець, што за прынцыповасцю і бескампраміснасцю героя стаяць боль, пакуты, немагчымасць паступіцца абавязкам нават у адносінах да самых блізкіх людзей – бацькоў. А гэта даецца чалавеку нялёгка, каштуе вялікіх душэўных намаганняў. І не заўсёды бывае патрэбным, апраўданым.

<...> У цэнтры увагі пісьменніка – беражлівыя адносіны да чалавека. Платон Гічка патрабавальны перш за ўсё да сябе, але свой максімалізм ён не пераносіць слепа на іншых. Як прадстаўнік улады, ён, перш чым ускласці на кагосьці з аднавяскоўцаў поўныя абавязкі, імкнецца зразумець іх патрэбы, клопаты, быць справядлівым у адносінах да іх. Платон адмаўляе метад прымусу, загаду. Яго зброя – перакананне, просьба, асабісты прыклад сумленных адносін да справы.

Такая лінія паводзін героя верагодная і псіхалагічна матываваная. Яна бярэ свой пачатак у рэвалюцыйным мінулым героя, з’яўляецца лагічным яго працягам. У той жа час вобраз Платона Гічкі нясе ў сабе пэўную супярэчнасць: адстойваючы гуманныя адносіны да людзей, герой, па сутнасці, бесчалавечна ставіцца да свайго бацькі. Маральная пазіцыя героя, яго розум, сумненні пацвярджаюць аўтарскую думку пра тое, што любы прадстаўнік улады павінен быць чалавекам маральным, гуманным. Інакш яго дзейнасць, скіраваная насуперак інтарэсам людзей, становіцца бессэнсоўнай і нават шкоднай.

Як адзначыў Дз. Бугаёў, «у савецкай літаратуры, і чым далей, тым больш, з рэвалюцыянерамі ўвогуле было нялёгка. Яны абавязкова меліся быць станоўчымі героямі эпохі, хаця ў рэальным жыцці на бездакорную станоўчасць нярэдка ніяк не цягнулі. У звычайных чытачоў не маглі выклікаць захаплення нават зусім бескарыслівыя і самаахвярныя фанатыкі ад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

марксізму, якія, выконваючы жорсткія партыйныя ўстаноўкі, павінны былі парываць з агульначалавечымі маральнымі нормамі.

Але пісьменнікам, якія падпарадкоўвалі сябе партыйнаму дыктату новай улады, гэтую жорсткасць трэба было не толькі прымаць, але паэтызаваць...»

<...> У зборніку «Прысады» адлюстраваны пераважна падзеі мірнага жыцця, народжаныя новай рэчаіснасцю: выхаванне ў людзей творчых адносін да працы, беражлівага стаўлення да дзяржаўнай маёмасці, фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі («Свае блінцы»), раскрыццё багатага духоўнага свету будаўнікоў новага жыцця («Прысады»), паказ складаных узаемаадносін у сям'і («Дыягназ»), самаахвярнасці кахання («Ядзя-Жучок»). Героямі апавяданняў з'яўляюцца чырвонаармейцы, сяляне, адказныя работнікі савецкай улады, сельскія актывісты, працаўнікі народнай асветы.

У цэнтры апавядання «Свае блінцы» (1926) былы чырвонаармеец Вінцусь Шавель, які ў мірных абставінах адстойвае інтарэсы сялян. Усе яго намаганні скіраваны на тое, каб адрамантаваць стары млын, наладзіць там танны памол. Герой лічыць гэта надзвычай важным, бо «хлеб – бліжэйшая справа» (с. 229). <...>

Апавяданне «Свае блінцы» вызначаецца нетрадыцыйным падыходам да праблемы «чалавек і калектыў». Ц. Гартны парушае агульнапрынятае ўяўленне адносна таго, што калектыў у адрозненне ад асобнага чалавека, які можа памыляцца, заўсёды прадвызначае правільную лінію ў вырашэнні важных пытанняў. Вінцусь Шавель перакананы ў сваёй праўдзе. Ён ведае патрэбы сялян. «Трэба прыслухоўвацца да іх голасу – то голас зямлі (с. 240), – гаворыць герой. Вінцусь, адстойваючы сваю пазіцыю, па сутнасці, паўстае супраць дэмагогіі начальства, якое абстрактна разважае аб светлай будучыні, не звяртаючы ўвагі на канкрэтныя праблемы людзей; ён ідзе супраць калектыву партыйнай ячэйкі, абураецца яе маўчаннем. «Што сабе таварышы думаюць! — злосна выказаў ён сам сабе, забываючы пра партыйную этыку, калектыўную думку і таварыскія пачуцці» (с. 233). Вінцусь Шавель дасягае пастаўленай мэты. У рэшце рэшт яго падтрымліваюць прадстаўнікі акруговай улады, убачыўшы ў ім разумнага чалавека, руплівага гаспадара, які да справы адносіцца творча, з натхненнем.

<...> Апавяданне «Свае блінцы» давала ўзор новых адносін да працы. Раскрывала тыя недахопы, якія перашкаджалі аднаўляць разбураную гаспадарку, паляпшаць дабрабыт людзей.

**4 Раман "Сокі цаліны", яго значэнне для беларускай раманістыкі.**

Найбольш значным творам Ц. Гартнага з'яўляецца раман **«Сокі цаліны»**, над якім пісьменнік працаваў з 1914 па 1929 г. Твор складаецца з чатырох частак (квадраў): «Бацькава воля», «На перагібе», «Крыжовыя дарогі», «Чырвоныя зарніцы». Па сутнасці – гэта першы закончаны беларускі раман. Пісьменнік паставіў перад сабой мэту стварыць вобраз станоўчага героя свайго часу.

У беларускай літаратуры праблема новага героя – актыўнай у духоўных і грамадскіх адносінах асобы – непазбежна была звязана з асваеннем тэмы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рабочага класа. Менавіта ў рабочым-рэвалюцыянеры пісьменнікі перш за ўсё бачылі новага героя часу.

Ц. Гартны выявіў сябе наватарам, калі узяўся за напісанне рамана, прысвечанага рабочаму класу. Зварот пісьменніка да жанру рамана адпавядаў унутранай патрэбе развіцця беларускай ліаратуры, якая яшчэ ў дарэвалюцыйны час шукала подступы да эпічнага асэнсавання нацыянальнай рэчаіснасці. Ствараючы вобраз рабочага-рэвалюцыянера Рыгора Нязвычнага, Ц. Гартны ў нейкай ступені апераджаў час, пракладваў дарогу новаму сацыяльна-псіхалагічнаму тыпу. Задума пісьменніка з улікам таго, што ён прадстаўляў літаратуру, якая не мела традыцый эпічнай прозы і паказу рабочага-рэвалюцыянера, была глабальнай. У «Соках цаліны» прасочваецца шлях мастацкага асэнсавання чалавека рэвалюцыі пісьменнікам-наватарам. Аўтар узняў надзвычай важныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-бытавыя, маральна-этычныя праблемы тагачаснага жыцця, прасачыў працэс фарміравання рэвалюцыйнай свядомасці ў рабочым і сялянскім асяроддзі, калі «багатая сокамі цаліна агромнай краіны расціла маладыя пасынкі» (Ц.Гартны).

Агульнапрызнана, што найбольш удалай у мастацкіх адносінах з'яўляецца першая частка рамана «Бацькава воля», пабудаваная на сацыяльна-побытавым матэрыяле. У ёй аўтар намаляваў аб'ектыўную панараму жыцця мястэчка Сілцы, раскрыў сацыяльную дыферэнцыяцыю яе жыхароў, паказаў іх норавы, звычаі, побыт, выявіў псіхалагічнае майстэрства ў стварэнні яркіх запамінальных характараў, апаэтызаваў сялянскую працу, даў цудоўныя пейзажныя замалёўкі. Адчуваецца, што аўтар пісаў аб тым, што добра ведаў і любіў, акрамя таго, ён абапіраўся на традыцыі нацыянальнай прозы ў адлюстраванні вясковага жыцця. У такім жа рэчышчы напісаны лепшыя старонкі другой часткі твора «На перагібе» (аб гэтым сведчаць сцэны касавіцы, жніва, каларытныя малюнкі ўладзін і вяселля Зосі Прыдатнай і Васіля Берага), хоць тут ужо пісьменнік аддае перавагу паказу горада, рабочага асяроддзя – сферы мала асвоенай тагачаснай беларускай прозай.

У «Бацькавай волі» Ц. Гартны асэнсоўвае маральна-этычныя праблемы, у прыватнасці узаемаадносіны бацькоў і дзяцей у сувязі з новымі грамадска-палітычнымі абставінамі, што ўплывалі на традыцыйныя, шмат у чым састарэлыя погляды на шлюб, дзе «бацькава воля» дамінавала над воляй дзяцей, пазбаўляючы іх права на ўласны выбар спадарожніка жыцця.

У «Соках цаліны» адбіўся супярэчлівы погляд пісьменніка на ролю сялянства і пралетарыяту ў грамадскім працэсе. Дз. Бугаёў адзначыў, што Ц. Гартны падзяляў такую «догму марксісцкай ідэалогіі, як недаацэнка сялянства, – сцверджанні пра яго непаўнацэннасць у параўнанні з рабочымі». Аб гэтым сведчаць выказванні Рыгора Нязвычнага і іншых герояў твора. Разам з тым, як ужо адзначалася вышэй, у ім прысутнічае паэтызацыя сялянскай працы, паказваецца любоў селяніна да зямлі, яго моцнае жаданне быць на ёй гаспадаром (лейтматыў большасці твораў беларускай літаратуры таго перыяду). Асабліва яскрава раскрываецца гэта ў вобразе Сёмкі, сябра Рыгора Нязвычнага, які, нягледзячы на вялікую павагу да Рыгора, захапленне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яго разумовымі і арганізатарскімі здольнасцямі, адхіляе яго прапанову ехаць у горад, бо бачыць сваё прызначэнне ў працы на зямлі. «Ды ўжо радзіліся для працы: каму пры зямлі, з сахою, каму з молатам пры кавадле. А каму — гатовае» (т. 1, с. 166), – гаворыць Сёмка. Стары Хведар з цеплынёй і гордасцю называў сына «хлебаробам». Ён глыбока перакананы ў тым, што яго месца не ў горадзе, а тут, на зямлі.

Цэнтральнае месца ў рамане займае вобраз Рыгора Нязвычнага. Новы герой у асобе рабочага-рэвалюцыянера бачыўся Гартнаму (як, дарэчы, і многім іншым пісьменнікам у 20-я гады) як з'ява выключная, неардынарная (адсюль пэўная зададзенасць вобраза, яго ідэалізацыя). Такі герой, на думку пісьменніка, павінен быў выявіць сябе перш за ўсё ў дзеянні, таму ў творы назіраецца павышаная ўвага да знешняга дзеяння і пэўнае занядбанне псіхалагічнай матывіроўкі гэтага дзеяння. Задума стварыць мужны характар героя актыўнага рэвалюцыйнага дзеяння, безумоўна, прадугледжвала паказ эвалюцыі героя, таму сюжэт твора ахоплівае значны адрэзак часу, насычаны важнымі гістарычнымі падзеямі, на фоне якіх і ў сувязі з якімі адбываецца наўленне галоўнага героя. Пісьменнік імкнецца да эпічнасці ў абмалёўцы героя. Паводле аўтарскай задумы, рабочы-рэвалюцыянер як пераўтваральная сіла гісторыі павінен быць паказаны ў шматлікіх сувязях са светам, у суаднесенасці з гістарычным і маральнымі праблемамі свайго часу. У рамане «Сокі цаліны» ўпершыню ў беларускай літаратуры вобраз рабочага-рэвалюцыянера «даваўся з бытавой, маральнай, духоўнай і палітычнай біяграфіяй» (В.Каваленка, М.Мушынскі, А.Яскевіч "Шлях развіцця бел.савецк.прозы").

У «Бацькавай волі» – першай частцы рамана – накрэсліўся шматпланавы паказ Рыгора Нязвычнага ў розных жыццёвых выяўленнях. Тут прасочваюцца лінія сацыяльнага паходжання героя, вытокі яго рэвалюцыйнай свядомасці. Нязвычны паказаны як клапатлівы сын, пяшчотны закаханы, аўтарытэтны сябар сілцоўскай моладзі.

У «Бацькавай волі» ёсць эпізоды, дзе вобраз Рыгора Нязвычнага паўстае ў гарманічнай зладжанасці яго думак, пачуццяў і дзеянняў. Знаёмыя краявіды абуджаюць у Рыгора ўспаміны пра дзяцінства. Праз плынь думак пісьменнік перадае псіхалагічны стан героя, раскрываючы яго «знутры», што надае вобразу Нязвычнага індывідуальную непаўторнасць, робіць яго па-чалавечы зразумелым. «Сапло прыемнай свежасцю. У Рыгора ваксрослі ўспаміны дзіцячых гадоў, тае пары, калі ён з другімі хлопцамі-таварышамі, малыя і распусныя яшчэ, кралі бручку з гародаў, зрывалі мак і шчаўе... Так бывала летам, калі ўсё спела. А вясною, чуць паказвалася цяпло, пачынаў раставаць снег, часцей выблюквала сонца, Рыгор з хэўраю сваіх таварышаў кожную нядзелю бегалі ў хвойнік і шукалі ў ім голых мясцін зямлі; дзе знаходзілі — разуваліся і ступалі босымі нагамі» (т. 1, с. 109).

Рыгор адчувае сапраўдную асалоду, узяўшы ў рукі касу, прайшоўшы за плугам. Яго хвалюе знаёмая з дзяцінства стыхія сялянскай працы, радуе вока выгляд жыта. Хораша і паэтычна перадае пісьменнік пачуцці героя ў такія моманты. «Рыгора абудзіў рэдкі бразг металу; ён прыслухаўся — кляпалі касу. Знаёмы, прыемны напеў прыпарнае працы. Касьба? У полі пачынала красаваць жыта — Рыгор любаваўся перакатамі хваль, над якімі, як пырскі, шарым туманам паднімаўся красоўны пылок. На шырокім галу сточаных каласамі ніў бегалі палкія ўзрокі маладога рабочага» (т. 1, с. 185).

Паказ героя ў родным асяроддзі раскрываў Нязвычнага як натуру багатую, шматгранную. Тут вобраз Нязвычнага найбольш гарманічны. У

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бытавой сферы, звязанай перш за усё з паказам мястэчка Сілцы, Гартнаму ўдалося паказаць героя псіхалагічна больш дакладна, чым выявіць, раскрыць унутраны свет заводскага чалавека. Сцэны наведвання Нязвычным родных мясцін, якія раскрываюць псіхалогію героя, – лепшыя ў рамане. Тут выявіліся моцныя бакі таленту Гартнага.

Разам з тым ёсць у «Бацькавай волі» мясціны, дзе паводзіны героя, яго выказванні супярэчаць самой логіцы развіцця характару. Напрыклад, пісьменнік спачатку перадае пачуццё радасці, якое перажывае герой, вярнуўшыся ў родныя мясціны пасля двух гадоў разлукі, а потым «прымушае» героя думаць і адчуваць нешта супрацьлеглае (усё ў Сілцах у параўнанні з Рыгай здаецца яму не цікавым, не вартым увагі), што ў канчатковым выніку, калі не цалкам адмаўляе папярэдне перададзеныя пачуцці героя (бо цяжка паверыць у тое, што месца, дзе нарадзіўся і вырас герой для яго толькі кладка «для пераходу з аднаго берага на другі» (т. 1, с. 89), то прымушае задумацца, у якім выпадку герой шчыры. Часткова гэтыя супярэчнасці вытлумачваюцца тым, што «Бацькава воля» мае дзве рэдакцыі (В.Каваленка, М.Мушынскі, А.Яскевіч) (першая напісана ў 1914–1916 гг., другая – у канцы 20 – пачатку 30-х гадоў), істотная розніца паміж якімі заключаецца ў трактоўцы вобраза галоўнага героя. У шырока вядомай сучаснаму чытачу другой рэдакцыі «Бацькавай волі» многае засталося ад першапачатковай аўтарскай задумы, таму вобраз Рыгора Нязвычнага іншы раз нібы «дваіцца», супярэчыць сам сабе. <...> якраз тое, ад чаго імкнуўся пісьменнік «ачысціць» вобраз Рыгора Нязвычнага (ад тых пачуццяў, думак, паводзін, што выяўлялі ў ім звычайнага сялянскага хлопца і, на думку пісьменніка, нейкім чынам зніжалі рэвалюцыйную сутнасць героя), было найбольш плённым і каштоўным у мастацкім паказе чалавека. Першапачатковая задума прадугледжвала павольнае, абумоўленае абставінамі і часам, фарміраванне былога местачкоўца ў свядомага рэвалюцыянера (у такім напрамку развіваўся вобраз Нязвычнага ў першай рэдакцыі). У другой рэдакцыі Гартны фарсіруе рост свайго героя, які павінны быў паступова сфарміравацца на працягу часу, ахопленага раманам.

Задача Гартнага – стварыць вобраз новага чалавека – ускладнялася тым, што яму прыходзілася даследаваць новы пласт жыцця. Для паказу горада, рабочага асяроддзя патрэбен быў арсенал новых мастацкіх сродкаў (у 2–4-й частках твора герой дзейнічае ў абставінах, якія вельмі адрозніваюцца ад тых, што адлюстраваны ў «Бацькавай волі»). Як адзначыў В. Жураўлёў, «задумай вымагалася на шырокім фоне грамадскіх і гістарычных падзей паказаць духоўны і палітычны рост рабочага – фігуру ў беларускай літаратуры па сутнасці новую. Традыцыйная сістэма выяўленчых сродкау і традыцыйнасць самой мастацкай формы, што больш ці менш маглі адпавядаць матэрыялу сялянскай тэматыкі ў першай кнізе «Сокаў цаліны», у далейшым патрабавала сур’ёзных змен, бо круты паварот рабіла аўтарская задума. Пісьменнік адчуваў гэта і прыкладаў пэўныя намаганні на аднаўленне мастацкай палітры жанравай і сюжэтна-кампазіцыйнай структуры» (Жураўлёў, В. Структура твора).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У «Соках цаліны» ўпершыню ў беларускай літаратуры шырока прадстаўлена жыццё горада, рабочае асяроддзе (тут Гартны дасягнуў пэўных поспехаў), праўдзіва адлюстравана грамадска-палітычная абстаноўка таго часу. Як заўважыў І. Навуменка, «пасля Гартнага не было ў беларускай літаратуры пісьменніка, хто б так арганічна і глыбока. як ён, здолеў намаляваць горад, завод, рабочы калектыў...» (Навуменка, І. Якуб Колас. Духоўны воблік героя).

Аўтар імкнецца раскрыць эвалюцыю Рыгора Нязвычнага У сувязі з барацьбой пралетарыяту ў такіх буйных цэнтрах рэвалюцыйнага руху, як Пецярбург, Рыга, Мінск. Герой праходзіць праз мноства выпрабаванняў, якія загартоўваюць яго волю. Ён адчувае сябе шчаслівым ад таго, што жыве ў час вялікіх гістарычных падзей і з’яўляецца ўдзельнікам барацьбы за перабудову свету, разняволеную працу. «Я блаславаю той момант, у які я стаў на шлях змагання. Сіла яго збіралася ва мне гадамі, гартавалася, а зараз вось выбухае наповерх. І кажу я вам: майму жыццю няма і не будзе іншае дарогі, як дарога несупыннага, кіпучага, самазабыўнага класавага змагання за свабоду...» (Т. 1, с. 258), – прызнаецца Рыгор свайму настаўніку па рэвалюцыйнай барацьбе Міхасю Комару. Страснае жаданне барацьбы дамінуе над астатнімі жаданнямі героя.

Але перабольшванне ролі сацыяльнай прыналежнасці Нязвычнага да рабочага класа з’яўляецца прычынай схематызму і прасталінейнасці, у выніку якой неардынарнасць героя паварочваецца спрашчэннем на самай справе складанай чалавечай прыроды. Адзін з герояў, а ўслед за ім і сам аўтар, лічыць, што Рыгор Нязвычны ўжо цалкам падрыхтаваны да выканання вельмі высокай і адказнай функцыі – «вучыць, а не вучыцца» (т. 1, с. 222). Катэгарычнасць такога меркавання відавочная, таму што па-мастацку зусім не матывавана, як відавочны і той факт, што прыналежнасць да класа рабочых не гарантуе аўтаматычна кожнаму яго прадстаўніку высокі ўзровень светаразумення і духоўнасці. «Як прымірыць настойлівае імкненне Гартнага гераізаваць Нязвычнага, паказаць яго з самага лепшага боку і аб’ектыўна-мастацкую праўду вобраза, якая часта нават дыскрэдытуе задуму аутара, робіць Нязвычнага прымітыўна-лозунгавым, нецікавым?» (Стральцоў, М. Жыццё ў слове), – зазначыў М. Стральцоў, гаворачы аб супярэчнасці паміж задумай і яе мастацкім увасабленнем у творы Гартнага.

<...> Чым, напрыклад, можна вытлумачыць празмерны рацыяналізм, нават эгаізм героя ў адносінах да маці ці Зосі? Відаць, гэта свядомая аўтарская ўстаноўка: не даць герою «размякчыцца». У тым, што пісьменнік свядома «стрымліваў» героя, баючыся паказаць яго сапраўдную сутнасць, была даніна існуючаму у той час уяўленню пра рэвалюцыянера як чалавека з «драцянымі нервамі і каменным сэрцам» (т. 1, с. 327), для якога праяўленне звычайных чалавечых пачуццяў (спагада, чуласць, каханне) падобна адмаўленню ад сваёй рэвалюцыйнай сутнасці. Такі герой больш падобны на манумент, чым на чалавека. Ідэалізуючы свайго героя, у многіх выпадках свядома пазбавіўшы яго сумненняў і памылак, праяўлення эмоцый, Гартны схематызаваў вобраз Нязвычнага. Аднак у творы намячаецца выразная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэндэнцыя да пераадолення схематызму, спрошчанасці вобраза, зусім апраўданае жаданне пісьменніка пераадолець «узвышанасць», манументальнасць героя. Аддаючы перавагу паказу героя ў дзеянні, Гартны тым не менш імкнецца зазірнуць ва ўнутраны свет героя.

У заключных частках твора пісьменнік паказвае Нязвычнага, які шмат у чым адрозніваецца ад таго Нязвычнага, якім паўстае ён у пачатку твора. Эвалюцыя героя відавочная, але выяўляецца яна цяпер не шляхам аўтарскіх дэкларацый (як гэта было раней), а праз думкі і пачуцці героя, якія сведчаць пра тыя якасныя змены, што адбыліся з Нязвычным. Ён сам многае перажыў, прайшоў праз шэраг выпрабаванняў, страціў дарагіх яму людзей.

Цяпер Нязвычны здольны адчуць боль другога чалавека. Паўсядзённыя чалавечыя клопаты, жыццёвыя варункі ўжо не здаюцца Рыгору дробязнымі, не вартымі ўвагі. Яго радуюць самыя звычайныя праяўленні чалавечых пачуццяў у адносінах да сябе. «Простыя, але шчырыя ды замілаваныя праводзіны кранулі яго» (т. 2, с. 415), – паведамляе пісьменнік пра адчуванні героя, у момант развітання з гаспадыняй дома, простай сялянкай, якая з павагай і любоўю адносціца да Рыгора і шчыра шкадуе, што ён едзе ў Мінск. У «Бацькавай волі» Рыгор як належнае ўспрымае захапленне сваёй асобай і адпаведныя адносіны да сябе. Разам з тым праяўленне такіх жа пачуццяў у адносінах да сваіх таварышаў уласцівы цяпер і самому Нязвычнаму. Напрыклад, сум ад расстання з сябрам ужо не здаецца Рыгору праяўленнем слабасці. Ды і сам аўтар прызнае за героем права на пачуцці, уласцівыя кожнаму чалавеку незалежна ад таго, да якога сацыяльнага асяроддзя ён належыць: «Якім ні быў Рыгор загартаваным ваякам, якою халоднасцю ні абдавала яго сэрца ў пытаннях змагання – усё ж Пятрусь займаў у яго нутры месца, вакол якога магла бліснуць слязіна сантыменту» (т. 2, с. 149). <...>

«Пачуццёвасць» героя ніякім чынам не зніжае яго рэвалюцыйнай сутнасці. Нязвычны па-ранейшаму апантаны рэвалюцыйнай барацьбой, ён чуе музыку класавага змагання, захапляецца маштабамі і значнасцю гістарычных падзей, успрымае іх як нешта вельмі асабістае.

У працэсе работы над раманам «Сокі цаліны» (з 1914 па 1929 г.) мяняўся погляд пісьменніка на героя, таму што змяняўся і ўзбагачаўся пісьменніцкі вопыт Ц. Гартнага, змяняўся сам час. У заключных раздзелах рамана ён спрабуе ўбачыць і адлюстраваць складанасці жыцця, больш тонка падысці да раскрыцця ўнутранага свету персанажа, пазбегнуць аднолінейнасці ў раскрыцці характару. Асабліва гэта адчуваецца ў паказе сферы інтымнага жыцця героя. У першых частках рамана Нязвычны катэгарычна адмаўляе асабістае жыццё, каханне, лічачы, што гэта перашкаджае рэвалюцыйнай барацьбе. Ён гаворыць, што прыватнае жыццё ў параўнанні з агульным жыццём – «то ж мізэрная нікчэмнасць» (т. 1, с. 266). Пазней погляды яго на гэтае пытанне мяняюцца. У заключных раздзелах рамана пісьменнік адкрывае ў сваім героі новую грань характару: Рыгор прыходзіць да думкі, што без кахання, сямейнага жыцця нельга абысціся і рэвалюцыянеру. Такія прызнанні героя робяць яго характар больш жывым, праўдзівым і чалавечным. У дадзеным выпадку эвалюцыя героя была і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

эвалюцыяй самога пісьменніка, які зрабіў прыкметны крок уперад на шляху пераадолення схематычнага погляду на праблемы суаднесенасці асабістага і грамадскага.

Шлях, які з такой цяжкасцю праклаў Ц. Гартны, быў для нашай літаратуры плённым. Тое, што ў рамане «Сокі цаліны» абмалявана толькі контурна, штрыхамі, знайшло развіццё ў творчасці іншых пісьменнікаў. Мастацкую эстафету Гартнага падхапілі такія пісьменнікі, як Р. Мурашка, М. Лынькоў, Б. Мікуліч, Хв. Шынклер, якія разам з Ц. Гартным закладвалі асновы нацыянальнай традыцыі ў распрацоўцы тэмы горада.

Раман Ц. Гартнага атрымаў шырокі рэзананс у тагачаснай крытыцы (як з боку зместу, так і з боку формы). Аб ім пісалі М. Гарэцкі, М. Піятуховіч, Ю. Замбржыцкі, Ю. Бярозка, М. Байкоў, П. Бузук, Л. Клейнбарт і інш. Сучаснікі далі самыя розныя ацэнкі твору: ад узнёсла хвалебных да з’едліва знішчальных. <...>

М. Гарэцкі ў 4-м выданні «Гісторыі беларускае літаратуры» (Мн., 1926), калі твор Ц. Гартнага быў яшчэ не закончаны, пісаў: «Сокі цаліны» з’яўляюцца, безумоўна, каштоўным укладам у нашу прыгожую культуру, хоць, як першая спроба аўтара ў гэтым кірунку, раман мае нямала й заган, галоўным чынам, тэхнічнай якасці...» [с. 225]. У пазнейшых выказваннях М. Гарэцкага ацэнка твора паглыблялася і канкрэтызавалася. <...> У артыкуле «Беларуская літаратура пасля «Нашае Нівы» (1928) М. Гарэцкі адзначыў: «Цішка Гартны напісаў раман «Сокі цаліны», і ў гэтым яго галоўная і, бадай, адзіная пакуль што сур’ёзная заслуга ў беларускай літаратуры. Раман, як вядома, мае значныя недахопы, але у ім шмат і праўдзіва-мастацкіх апісанняў жыцця людзей» [с. 335].

<...> У сучасным літаратуразнаўстве падрабязны аналіз творчасці Ц. Гартнага (у тым ліку і рамана «Сокі цаліны») зроблены ў даследаваннях А. Александровіча, Дз. Бугаева, В. Жураўлёва, А. Клачко, І. Навуменкі, М. Стральцова, І. Чыгрына.

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Дасаева, Т.М. Цішка Гартны / Т.М.Дасаева // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мн., 1999. – С. 358–380.

**Дадатковая**

2 Гартны, Ц. Абеглы саманарыс майго жыцця / Ц.Гартны // Пяцьдзесят чатыры дарогі : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск : ДВБ, 1963. – С. 133–136.

**Электронныя рэсурсы**

3 Цішка Гартны // Беларускія пісьменнікі: 1917–1990. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 42–43 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://www.rulit.me/books/belaruskiya-pismenniki-1917-1990-read-442013-42.html

4 Цішка Гартны / Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/tsishka.hartny

5 Гартны, Ц. Творы (Выбраныя апавяданні і Збор твораў, Т. 1–3) / Ц.Гартны. – Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ciska_Hartny/

6 Ялугін, Э. Без эпітафіі: Дакум. аповесць / Прадм. М.С.Станкевіча, А.С.Караля / Э. Ялугін. – Мінск : Беларусь, 1989. – 256 с. (*Можна таксама паглядзець відэа на Беларускай палічцы:* http://knihi.com/Ciska_Hartny/)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 1.12 МАСАВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧ. ХХ СТ.

1 Літаратурна-крытычныя ідэі і канцэпцыі А.Луцкевіча і С.Палуяна.
2 Агляд творчых набыткаў К.Каганца.
3 Агляд творчых набыткаў У.Галубка.
4 Рысы "нашаніўскай" эстэтыкі і паэтыкі ў лірыцы К.Буйло і З.Верас.

## 1 Літаратурна-крытычныя ідэі і канцэпцыі А.Луцкевіча і С.Палуяна

**Антон Луцкевіч** (Навіна) (1884-1946 (?))

*Крытык, літаратуразнаўца, гісторык, публіцыст.*

Нарадзіўся ў студзені 1884 г. у Шаўлях Ковенскай губерні (г. Шаўляй Літоўскай Рэспублікі) у сям'і служачага. Род паходзіў са шляхты, меў нават свой герб "Навіна", што паслужыла выбару аднаго з самых вядомых псеўданімаў А.Луцкевіча – "Антон Навіна". Бацька яго быў вайскоўцам, потым служыў на чыгунцы. Вучыўся Луцкевіч ў гімназіі г.Лібавы, а пасля смерці бацькі і пераезду ў Мінск – у Мінскай класічнай гімназіі. У 1902 г. ён паступае ў Пецярбургскі універсітэт на прыродазнаўчае аддзяленне. Удзельнічаў у рэвалюцыі 1905 г. Быў адным з кіраўнікоў Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, перайменаванай пазней у Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Арыштоўваўся за распаўсюджванне рэвалюцыйнай літаратуры. Універсітэцкую вучобу закончыў, здаўшы курс экстэрнам (прыродазнаўчы ў Пецярбургскім і юрыдычны ў Юр'еўскім, зараз Тартускім). Адзін з заснавальнікаў газеты "Нд", адзін з кіраўнікоў газеты "Нн". Рэпрэсаваны ў 1939 г.

А.Луцкевіч, будучы фактычным кіраўніком газеты «Наша ніва», шмат друкаваўся на яе старонках, падпісваючыся рознымі псеўданімамі, крыптанімамі (Генрык Букавецкі, Іван Мялешка, Кумальга, Г.Б.). Толькі за 1906-1908 гады ён апублікаваў у «Нашай ніве» каля дваццаці артыкулаў на сацыяльна-філасофскія і палітычныя тэмы. Пачынаючы з 1909 года, ў публіцыстыцы А.Луцкевіча на першае месца выходзіць нацыянальная праблематыка. Пра тое сведчаць загалоўкі яго нашаніўскіх публікацыяў : «Справа аб беларускай школе ў Думе», «Кароткая гісторыя Беларусі» (рэцэнзія на кніжку Вацлава Ластоўскага), «Родная мова і яе культурнае значэнне», «Наш шлях», «Аб эміграцыі», «Школа і граматнасць Беларусі», «З нашага жыцця» і іншыя.

Актывізацыя А. Луцкевіча як крытыка пачалася яшчэ пазней, чым публіцыста. Гэта адбывалася толькі ў 1913–1914 гг. Увагу крытыка, які выступаў у дарэвалюцыйны час усё ж не вельмі часта, прыцягвала творчасць «прадвеснікаў адраджэння» – Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Ц.Гартнага, Цёткі, К.Буйло, З.Бядулі. Характэрна, што многія ацэначныя палажэнні знойдуць свой працяг у наступных працах, дзе выяўна засведчана эвалюцыя поглядаў самога крытыка.

**– кніга "Нашы песняры"**

З гісторыі вядома, што А.Луцкевіч на працягу 1916–1918 гадоў друкаваўся ў беларускай віленскай газеце «Гоман». Менавіта ў ёй даследчык надрукаваў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цыкл крытычных артыкулаў пад рубрыкай «Нашы песняры», якія сталі асновай для аднайменнай кніжкі крытыкі, што ўбачыла свет у 1918 годзе ў Вільні. Па-сутнасці, гэта была першая кніжка крытыкі па-беларуску [3, 448].

Кніжка вылучаецца прадуманай пабудовай. Яе адкрывае ўступны артыкул «Прадвеснікі адраджэння». У ім А.Луцкевіч падае беларускае адраджэнне ў кантэксце агульнаеўрапейскіх працэсаў, паказвае яго заканамернасць і непазбежнасць: “Тая сіла, каторая адрадзіла чэхаў, украінцаў, літвіноў, латышоў, эстаў і іншых, у канцы сагнала сон і з вачэй беларусаў, і беларускі народ, пераступіўшы парог XX стагоддзя, меў у душы сваёй вялікі запас творчай энергіі, каторая ждала толькі адпаведнага моманту, каб выбіцца наверх” [3, 449].

Першым песняром маладой Беларусі А.Луцкевіч лічыў Францішка Багушэвіча. Ён указваў на той факт, што Ф.Багушэвіч ведаў народ, ён “вывучаў біццё пульсу” яго, “балеў яго болем”. Ён абураўся з прычын ганебнага рабства народа, таму што яно, па меркаваннях крытыка, пазбавіла народ пачуцця чалавечай годнасці. А самае галоўнае, Ф.Багушэвіч заклікаў прыгнечаны народ да дзеяння: “Ён горача зваў наш народ скінуць путы духоўнага рабства, горда падняць галаву і смела – на ўвесь свет – заявіць, што ён толькі спаў, а цяпер збудзіўся і трэбуе для сябе належнага месца ў сям`і братніх народаў” [3, с. 449].

Наступны артыкул прысвечаны Якубу Коласу. Крытык лічыць, што яго варта адносіць да творцаў, які займае “адно з першых мейсц у беларускай літаратуры часу адраджэння”. Крытык заўсёды вывучае ў творчасці адраджэнцаў тое, што робіць кожнага з іх адметным, непадобным да астатніх. Праз апісанне прыроды, беларускіх краявідаў, адзначае А.Луцкевіч, Я.Колас выказвае сваю любоў да Бацькаўшчыны: “Яго патрыятызм абнімаў увесь родны край і праявы яго, а лепш за ўсё родную прыроду” [3, с. 449].

Не абмінуў А.Луцкевіч у сваім зборніку і аналізу творчага метаду Янкі Купалы. Паводле яго, асноўная рыса творчасці Я.Купалы – спантаннасць, незапраграмаванасць, “бо Купала запраўды пясняр “з волі Божай”, і вершы яго – гэта адгалоскі ўсяго, што ён бачыць навакол, што перажывае з дня на дзень” [3, с. 449]. Крытык падзяліў творчасць Я.Купалы на два перыяды :

1) перыяд 1905-1906гг., “у каторым наш пясняр, седзячы на вёсцы, жыў толькі вузкім кругам спраў і інтарэсаў, калі ўся яго псіхіка злівалася з псіхікай масы” [3, с. 449];

2) перыяд у жыцця паэта ў Вільні, Пецярбурзе, калі “Я.Купала як быў, так і астаўся песняром вёскі, але – пры гэтым усё ярчэй пачынае выступаць індывідуальнасць яго” [3, с. 449].

На думку А.Луцкевіча, адным з найвышэйшых дасягненняў паэта з`яўляецца паэма «Сон на кургане». Ён адзначае, што “русальчыны песні – то чыстая музыка гукаў. Словы слухаюцца думкі песняра...” [3, с. 449].

Нягледзячы на вялікую ўвагу крытыка да ўласнапаэтычнай, мастацкай значнасці твораў Я.Купалы, ён адзначае выключную ролю паэта ў фарміраванні ідэалогіі нацыянальнага руху:“Купала – адзін з найбольш яркіх ідэолагаў беларускага адраджэння... Душа песняра вывучае той пераварот, які

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адбываецца ў самай глыбіні народных мас” [3, с. 449]. Падводзячы вынікі сваім разважанням, А.Луцкевіч зноў-такі ўпэўнена гаворыць, што “Я.Купала мае бясспорнае права насіць імя беларускага нацыянальнага песняра...” [3, 449]. Немалаважную ролю Я.Купалы бачыць крытык у літаратурным станаўленні беларускай мовы, у словатворчасці, што ён лічыць “адной з найбольш сур`ёзных заслуг гэтай бясспорна найвялікшай сілы ў беларускай літаратуры”, а таксама яго “выдатнае становішча ў грамадскім жыцці беларусаў як рэдактара часопіса «Наша ніва» у Вільні” [3, с. 450].

“Даволі выдатнага прадстаўніка работніцкай ідэалогіі” бачыць А.Луцкевіч у асобе Ц.Гартнага. Сацыял-дэмакрат па перакананнях, Луцкевіч заўсёды сімпатызываў прадстаўнікам пралетарскага руху ў беларускай культуры. Таму ён так высока ацэньваў Цішку Гартнага, якога ён называў “песняром працы”. Тон яго паэзіі крытык вызначае, як “жывы, бодры, з рытмам, напамінаючым шыбкія ўдары молата ці рух гарбарскага скрэбла” [3, с. 450].

Аддаў А.Луцкевіч належную ўвагу і свайму ўлюбёнаму ў беларускай літаратуры паэту – Максіму Багдановічу, для якога творы песняра – “гэта чыстая паэзія, без жадання каго-колечы навучаць, без якіх-небудзь староннiх тэндэнцый...” [3, с. 450]. На думку А.Луцкевіча, “агульналюдскі момант” у паэзіі М.Багдановіча прымушае “яго верш гэтаксама гаварыць беларусу, як і чужынцу”. Крытык заўважае, што М.Багдановіч “мае незвычайна сільнае пачуццё красы, гармоніі”. Заслугу паэта А.Луцкевіч бачыць у “прысваенні беларусам новых форм верша”. Акрамя таго, адзначае ён, “Багдановіч – першы між беларусамі пясняр места, каторае дае яму натхненне не менш, чым жывая прырода...” [3, с. 450] .

Што датычыцца асобы Алаізы Пашкевіч (Цёткі), то А.Луцкевіч лічыць яе асобай фанатычна захопленай беларускім адраджэннем. Цётка была адной з “тэй невялічкай жмені людзей, каторыя тварылі беларускую ідэю” і для якіх “справа беларуская станавіла быццам... неаддзялімую частку іх душы” [1, с. 125]. Гэта было асноўным для А.Луцкевіча ў разуменні творчай і грамадзянскай пазіцыі Цёткі. Менавіта беларуская справа і служыла неабходнаю ўмоваю для росквіту паэтычнага таленту паэткі. Яе жыццё нагадвае яму ахвярнае самаспаленне : “Праз усё сваё жыццё Цётка папраўдзе гарэла, і шыбка таялі яе сілы, каторыя так шчодра аддавала беларускай справе...” [3, с. 450].

У кнізе «Нашы песняры» А.Луцкевіч стаў фактычна першым біёграфам Цёткі, першым яе літаратурным крытыкам, першым, хто даў высокую грамадскую ацэнку ўсёй яе нацыянальна-адраджэнскай дзейнасці: “Незвычайная разнароднасць грамадскай працы, жаданне ўсюды прылажыць руку да святой справы адраджэння беларускага народа сведчаць найлепей аб духоўным багацці гэтай першай беларускай паэткі і пісьменніцы” [1, с. 125].

Характэрнай адзнакай для А.Луцкевіча-крытыка з`яўляецца яго здольнасць пераўвасабляцца, аналізуючы творчасць розных мастакоў слова. Здаецца, няма ў літаратуры нічога вартаснага, што магло б схавацца ад яго добразычлівага, заклапочанага погляду. У гэтым мы можам пераканацца, чытаючы ягоныя радкі пра Канстанцыю Буйло. А.Луцкевіч трактуе паэтку як “маладую, поўную сіл і ахвоты да жыцця дзяўчыну, каторая глядзіць на свет такімі вачыма, як павінна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

глядзець дзяўчына з гарачым сэрцам і чыстай душой, маючы 18-20 гадоў” [3, с. 451]. На думку А.Луцкевіча, К.Буйло – супрацьлегласць Цётцы ў жыцці. А жыццёвы тон, паводле крытыка, адыгрывае вялікую ролю ў станаўленні творчай асобы. Таму ён робіць выснову, што “не дзіва, што на першым мейсцы ў яе вершах чуюцца гарачыя словы кахання, што яна жджэ тэй любові, якую бачыць толькі ў марах-снах, якую душою яна прачывае” [3, с. 451]. У якасці тыповай адзнакі вершаў К.Буйло крытык лічыць “эратычную інтуіцыю”. Менавіта таму “мы маглі б назваць «песнямі кахання» вершы яе, сабраныя ў томіку пад загалоўкам «Курганная кветка». Гэтыя ж матывы кахання асвятляюць усё, да чаго дакранаецца паэтка: “Буйла горача любіць свой край і народ, бо не можа не любіць : каханнем сагрэта ў яе ўсё, што яна робіць, што яна піша” [3, с. 452].

Апошні артыкул зборніка «Нашы песняры» пра Змітрака Бядулю. У ім крытык разглядае ролю яўрэяў у сусветнай культуры, дзе яны, нягледзячы на рознасць культур, у якіх тварылі, здолелі захаваць сваё аблічча. Па словах А.Луцкевіча, З.Бядуля – “арыгінальны малады пясняр”, якога здолела ў нейкай ступені прывабіць і інтэграваць беларуская культура.

Такім чынам, зборнік «Нашы песняры» ўяўляе сабой першую беларускую кніжку крытыкі. А.Луцкевіч вельмі ўдала падаў адметнасці творчасці “прадвеснікаў адраджэння” – Я.Купалы, М.Багдановіча, Я.Коласа, Цёткі і іншых.

Канец 20-х гадоў – асобны перыяд у жыцці Луцкевіча-крытыка. У 1929 годзе ў Вільні выйшла новая кніжка яго крытыкі «Адбітае жыццё» з падзагалоўкам : «Лекцыі і стацці з беларускае адраджэнскае літаратуры. Кніжка 1», у якую сабраны, па меркаванні аўтара, артыкулы, напісаныя за гэты час. Яна ўяўляе сабой зборнік лекцый і крытычных артыкулаў розных гадоў. Паводле задумы гэта была першая кніжка, падрыхтаваная аўтарам як дапаможнік па беларускай літаратуры для настаўнікаў, студэнтаў і вучняў.

На думку крытыка Уладзіміра Конана, гэтая кніжка “магла б стаць сапраўдным адкрыццём беларускай літаратуры для еўрапейскага чытача, каб у свой час яе пераклалі на французскую, нямецкую ці англійскую мову. Тут крытык паспрабаваў развіць тую плынь літаратурна – эстэтычнай думкі, якую гвалтоўна спынілі рэпрэсіі супраць «Узвышша»: хацеў “упісаць” нашу літаратуру ў кантэкст агульнаеўрапейскай эстэтыкі і мастацкай культуры”.

**Літаратура:**


**Асноўная**

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999.

**Дадатковая**

2 Багдановіч І. Цётка і Луцкевічы // Полымя. – 1996. – № 11.

3 Багдановіч І. Э. Авангард і традыцыя... – Мінск: Беларуская навука, 2001. ( Раздзел: “Алаіза Пашкевіч (Цётка) і браты Іван і Антон Луцкевічы”).


## Сяргей Палуян (1890 - 1910)

*Публіцыст, пісьменнік, крытык, гісторык, педагог, грамадскі і палітычны дзеяч – цэлае сузор`е талентаў у адной асобе.*

Нарадзіўся ў Брагіне 7 кастрычніка 1890 г. Быў трэцім дзіцям у сям'і (усяго – восем). Дзед быў прыгонным селянінам, пазней атрымаў ад улад кавалак зямлі і саслоўнае званне мешчаніна г. Рэчыцы. Бацька быў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

арандатарам, пазней (1897 г.) дзякуючы спадчыне і пасагу жонкі (паходзіла з маёмасных брагінскіх сялян), купіў зямлю – маёнтак Крышычы Юравіцкай воласці (цяпер Калінкавіцкі раён), што недалёка ад мележаўскіх Глінішчаў. Там і правёў сваё дзяцінства С.Палуян. Праблем з зямлёю і банкаўскімі даўгамі хапала, таму зямля паступова прадавалася, а потым і дом.

Вучыўся ў Мазыры ў шасцікласнай прагімназіі. Пасябраваў з сынам аднаго рабочага, пачаў хадзіць на маёўкі, разносіць пракламацыі. Пра што даведаўся дарэктар, навісла пагроза выключэння. Пры наведванні родных Сяргей вёў рэвалюцыйную агітацыю сярод моладзі, палохаючы мясцовае начальства. Бацька тэрмінова забірае Сяргея з Мазыра і адвозіць яго ў Прыбалтыку, у Мітаву (цяпер Елгава, Латвія). Там працуюць гімназічнымі выкладчыкамі два дзядзькі па маці, там вучацца сёстры Сяргея.

У гэты час пачынаецца рэвалюцыя 1905 г. Рабочыя Мітавы будуюць барыкады. Студэнты і гімназісты бастуюць. Сяргей прымае ўдзел у мітынгах, дэманстрацыях, забастоўках. Яго строга папярэджвае дырэкцыя гімназіі, хлопца збіраюцца выключаць. Бацька, не чакаючы, калі сына выключаць, забірае яго дадому, загадвае займацца гаспадаркай, ва ўсякім разе, пакуль не сціхне палітычная завіруха.

У выніку рэвалюцыі, як вядома, нараджаецца легальны беларускі друк: газеты, выдавецкія суполкі. Беларускія газеты і кнігі трапляюць і на Гомельшчыну. Так з імі знаёміцца С.Палуян. Ён па-ранейшаму вядзе работу сярод мясцовай моладзі. І пасля чарговага “падбухторвання моладзі” у дом Палуянаў прыязджае прыстаў, просіць у апошні раз уціхамірыць сына, бо яго чакае арышт. Адбываецца скандал паміж бацькам і сынам. Сяргей пакідае дом і едзе ў Кіеў. Жыве спачатку ў дзядзькі, потым здымае пакой. Збіраецца экстэрнам здаць экзамены за восем класаў гімназіі, каб пасля паступіць ва універсітэт. Жыве на выпадковыя заробкі. Звязваецца з мясцовымі сацыял-дэмакратамі. Жыве ў нястачы, пачынае здаваць здароўе, нагадваюць пра сябе сухоты, спадчынная хвароба з боку маці.

1908–1909 гг. часта бывае ў кіеўскай кнігарні, у беларускім аддзеле. Тады ж спрабуе свае сілы ў літаратуры і дасягае значнага творчага плёну. Пачынае ліставанне з “Нашай нівай”... На пачатку лета 1909 г. пераязджае ў Вільню, але часта наведвае і Кіеў, друкуецца і там у перыёдыцы.

У пачатку сакавіка 1910 г. парывае з рэдакцыяй “Нн”, едзе зноў у Кіеў. А 7 (20 па н.ст.) красавіка яго не стала.

Ацэньваючы **літаратурную дзейнасць** Сяргея Палуяна, трэба памятаць, што прадаўжалася яна маленькі кавалачак часу – паўтара года. Многае са спадчыны пісьменніка яшчэ не адшукана, а магчыма, страчана назаўсёды. Асобныя задумы С.Палуяна засталіся неажыццёўленымі. Аднак тое, што пакінуў нам малады пісьменнік, сведчыць аб незвычайным таленце гэтай асобы.

Такім чынам, паўтара года, не больш, рэальнай працы ў літаратуры: у прозе, паэзіі і драматургіі, крытыцы і публіцыстыцы. З прозы вядома яго адно апавяданне “Вёска” і верш у прозе “Хрыстос уваскрос”. Вершы і драмы пакуль што не знойдзены. Найшырэй прадстаўлены публіцыстыка і крытыка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

С.Палуяна, што публікаваліся перш за ўсё на старонках “Нашай нівы”, а таксама ва ўкраінскай перыёдыцы.

З усёй упэўненасцю можна сказаць, што творчасць С.Палуяна – не дастаткова вывучаная з`ява на старонках беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Толькі ў 1986 годзе Таццяна Кабржыцкая і Вячаслаў Рагойша сабралі творы Сяргея Палуяна, раскіданыя раней па старонках розных перыядычных выданняў і выдалі асобнай кніжкай. Да ўсяго гэтага даследчыкі зрабілі дэталёвыя каментарыі, а таксама напісалі грунтоўны артыкул пра яго жыццё і творчасць.

Дзевяццю гадамі раней, даследчык літаратуры Ісідар Бас паспрабаваў пазнаёміць чытачоў з жыццём і творчасцю Сяргея Палуяна. І гэта яму ўдалося. Свой артыкул ён прысвяціў крытычнай і публіцыстычнай дзейнасці маладога пісьменніка. У сваёй працы І.Бас, канешне, не поўнасцю ахапіў творчасць С.Палуяна.

З **мастацкай спадчыны** захавалася толькі апавяданне “Вёска” і верш у прозе “Хрыстос уваскрос!”.

Апавяданне “**Вёска**” ўпершыню было змешчана ў кіеўскім часопісе “Українска хата” у 1910 годзе ў перакладзе на ўкраінскую мову М.Шапавала. Упершыню апублікавана ў арыгінале ў “Нашай ніве” праз шэсць месяцаў пасля смерці самаго аўтара. “Вёска” па сюжэтна-кампазіцыйным ладзе нагадвае верш-элегію. Твор глыбока сімвалічны. У ім дакладнае рэалістычнае апісанне беларускай вёскі перарастае ў сімвалічны малюнак бед і крыўд усяго “забранага краю”: “Гніе вёска ў гразі і брудзе... А бакі чорныя, струхлеўшыя. Парахня сыплецца са сцен, мох паўсыхаўся на стрэхах...” [10, с. 36]. Рытміка апавядання заснавана на экспрэсіўны вобразах паўторах смерці, што стаяла “ў струхлелай капліччы на могілках іківала пальцам”[10, с. 36] на вёску.

У “Вёсцы” у алегарычнай форме паказваецца разарэнне, гібель старой беларускай вёскі, асуджанай на смерць варожаю ёй сілаю. Сіла ж гэта (хоць яе Палуян прама не называе) – жосткі сацыяльны і нацыянальны прыгнёт, які пісьменнік увасобіў у вобразе-сімвале смерці. Зусім іншы сімвал – сімвал надзеі на абнаўленне ўвасоблены ў кволым вобразе сонечнага промня.

Твор глыбока сумны па інтанацыі. Надзея на абнаўленне, на новае жыццё ёсць, але яна на столькі кволая, што варожыя сілы без усялякіх намаганняў перамагаюць і вёска памірае. Але мэтай чужынцаў была не толькі гібель старой вёскі, яны ўжо прыглядаюцца да леса, каб і яго знішчожыць.І тут ужо няма ніякай надзеі: ”ён ведаў, што чарада прыйдзе і да яго. Панаходзяць чужынцы і знішчожаць і лішкі былой красы. Адны пні ды нізкі хмызняк будуць успамінкам аб вялікім лесе” [10, с. 37].

У творы вёска паўстае перад чытачамі нібы жывая. Гэта было дасягнута тым, што аўтар выкарыстаў такі сродак мастацкай мовы як метафара. Пісьменнік удыхнуў у яе душу і цяпер яна жывая: ”выпаўзла на ўзгорак і грэецца ў гарачым сонечным свеце. То той ,то другі бок падстаўляе яркім праменням” [10, с. 35].

А ажывіў пісьменнік старую вёску для таго, каб паказаць праз пакуты, менавіта жывой істоты, свой асабісты боль, боль за родную зямлю на якой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

няма месца для такіх маленькіх старых вёсак. “Вочы яе ўжо даўно патухлі. Але яна яшчэ міргае імі, хоча ўгледзіць сонечнае святло... Вочы вёскі ўжо загніліся, зацвілі плесняй. Міргае яна імі нічога не бачачы...” [10, с. 36]. “Вёска” – гэта не этнаграфічная замалёўка. Аўтар стварыў абагульняючы вобраз вёскі, якой пагражае канчатковае згаленне і пагібель пад націскам прамысловага капіталу.

Думкай пра светлую будучыню роднай Беларусі прасякуты апошні друкаваны твор Палуяна “**Хрыстос уваскрос**!”. Гэты верш у прозе супрацьлеглы “Вёсцы” па настрою і інтанацыі. У ім, па словах М.Багдановіча, “на ўсім працягу б`ецца хваля напружанага пачуцця” [10, с. 24]. У гэтым творы С.Палуян паказаў сябе чалавекам веруючым, але веруючым не толькі ў Бога, у Хрыста, але і ў лепшае жыццё свайго народа. Пісьменнік узгадвае біблейскую легенду аб уваскрэсенні Хрыста. Паводле якой “над ім здзекваліся. Яго білі па твары, сцябалі бізуном. Плявалі на яго. Кпілі з яго. У канцы распялі... Ён памёр на крыжы паміж двух разбойнікаў. Але ўсё ж ткі

- Хрыстос уваскрос!” [10, с. 39].

З Хрыстом параўноўвае С.Палуян беларускі народ: “ад вякоў пагарджалі табой, тваёй мовай; ад вякоў мелі за быдла, годнае толькі на цяжкую, надсільную работу. Не давалі табе расці і развівацца” [10, с. 39]. Менавіта праз параўнанне раскрывае аўтар сацыяльную тэму. Усе тыя здзекі і пакуты, што цярпеў Хрыстос, многія вякі цярпеў і церпіць беларускі народ.

Але ў адрозненні ад апавядання “Вёска” тут ёсць надзея, надзея на вызваленне ад сацыяльнага ўціску. Але пісьменнік лічыць, што не адзінай надзеяй павінен жыць чалавек і таму звяртаецца да народа з заклікам мацаваць сілы, каб ”скінуць з шыі ярмо адвечнага гора і нуды... Прачынайся ад сну , Беларусь! Годзе стагнаць ды жаліцца, жальба нічога не дасць табе. Уставай! Ідзі будаваць зруйнаваную бацькаўшчыну!” [10, с. 40].

Вершам у прозе С.Палуян перадаў сваю глыбокую веру ў вялікія магчымасці народа, у яго немінучаю перамогу над сіламі зла і несправядлівасці. Як заўважыў М.Багдановіч, тут пісьменнік, “перш, чым патушыць свечку свайго жыцця, паслаў народу сваё гладыятарскае “Mariturite salutant” (“Паміраючы, вітаю вас!”) [6, с. 7].

Такім чынам трэба адзначыць, што мастацкая спадчына Сяргея Палуяна сведчыць аб смеласці творчых пошукаў, аб наватарскіх імкненнях аўтара, яго спробах адшукаць новыя формы ідэйна-мастацкага разумення сацыяльнай рэчаіснасці.

**Літаратурная крытыка:** С.Палуяну належыць першы ў беларускай крытыцы гадавы агляд літаратуры – “*Беларуская літаратура ў 1909 гаду*”. Ім ён распачаў літаратурна-крытычны жанр, які затым плённа працягваў і развіваў М.Багдановіч. У артыкуле С.Палуян коратка ахарактарызаваў творчасць беларускіх літаратараў за адзін год. Найбольш увагі ён, канешне, удзяліў Янку Купалу, якому крытык адвёў “асаблівае месца” [10, с. 105] сярод тых пісьменнікаў, хто найбольш вызначыўся ў 1909 годзе. “Ад гэтага песняра, - зазначае крытык, – Беларусь можа чакаць многа...перад Купалам вялікая будучыня, калі толькі ён не сойдзе з выбранага гасцінца” [10, с. 106]. У

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сярэдзіне 1909 года С.Палуян заўважае змены да лепшага ў творчасці Я.Купалы: “новыя творы яго акуратна абдуманыя, тэм розных многа, форма лёгкая, усюды артыстычна апрацаваная” [10, 106].

З іншых літаратараў, творчасць якіх заслугоўвае ўвагі, крытык вылучае Цётку, Якуба Коласа, М.Багдановіча, Ядвігіна Ш., К.Буйло і А.Паўловіча. Прычым, гаворачы пра Якуба Коласа, ён падкрэслівае,што “ненармальныя ўмовы яго жыцця не даюць яму можнасці акуратна развівацца” [10, с. 106]. Якуб Колас у той час у мінскім астрозе. На гэтую акалічнасць якраз і ўказваў С.Палуян. Разглядаючы творы вышэйзгаданых літаратараў, малады крытык адзначаў і іх вартасці, і іх недахопы. Нельга не пагадзіцца, што аўтар агляду прадэманстраваў высокі ўзровень крытычнага мыслення, здольнасць схопліваць найбольш характэрныя асаблівасці творчай манеры паэта, прагназаваць кірунак развіцця яго таленту.

Справядліва вылучае С.Палуян і ставіць на першы план Ядвігіна Ш. Падводзячы вынікі літаратурнай дзейнасці цэлага года, крытык піша, што ў 1909 годзе Ядвігін Ш. “заняў першае месца як па чыслу... так і па здольнасці сярод беларускіх белетрыстаў” [10, с. 106]. І тут жа адзначае і недахопы такіх апавяданняў Ядвігіна Ш., як “Пазыка”, “З маленькім білецікам”, у якіх ёсць вульгарызмы. Акцэнтуе ўвагу С.Палуян не толькі на “старых” [10, с. 105] пісьменніках, але і на маладых, якія на той час толькі заявілі пра сябе, на такіх як М.Багдановіч, К.Буйло, Ц.Гартны і іншых. З радасцю адзначае аўтар артыкула, што беларуская літаратура “расце і прыемна дзівіць нас сваім поступам і сваімі заваяваннямі” [10, с. 105]. А 1909 год – быў “лепшым годам у нашай новай гісторыі” [10, с. 105].

Пісьменнік і народ – гэтае пытанне Палуян неаднойчы закранае ў сваіх артыкулах. На яго думку, мастацкая вартасць літаратуры знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з культурным узроўнем народа. Калі ж прыходзіць у заняпад літаратура, то гэта адбіваецца і на духоўным жыцці народа. “Толькі адна глеба можа ўзгадаваць пісьменніка, – піша ён, – гэта глеба – чытачы” [10, с. 105]. Вось таму трэба як мага больш пашыраць чытацкую аўдыторыю, каб кніжку пісьменніка чыталі ў кожным глухім кутку Беларусі.

**Літаратура:**

1.Бас І. Сявец у родных слоў сяўбе // Бас І. Літаратуразнаўчыя эцюды. – Мінск, 1977. – С.35–73.

2.Ермаловіч М. Сустрэча назаўседы // Полымя. – 1987. – № 1 – С. 212–215.

3.Кабржыцкая Т., Рагойша В. Акрылены рэвалюцыяй. – Полымя. – 1985. – №12. – С. 179–185.

4.Кабржыцкая Т.В., Рагойша В.П. Карані дружбы. – Мінск: 1976. – 256 с.

5.Кабржыцкая Т., Рагойша В. Слядамі знічкі : Аповесць аднаго пошуку. – Маладосць. – 1980. – № 10. – С. 150–169.

6.Конан У. Талент светлы і трагічны // ЛІМ. – 1986. – 24 кастр. – С. 6–7.

7.Марціновіч А. Як месяц – адзінокі. Да 110-годзя з дня нараджэння Сяргея Палуяна // ЛІМ. – 2000. – 20 кастр. – С.13.

8.Мушинский М. Светлый след будет вечно живым // Нёман. – 1987. – № 8 – С. 165–167.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

9.Палуян, С.: Бібліяграфічны спіс да 110-годдзя нараджэння // Новыя кнігі. – 2000. – №5. – С.26.

10. Палуян, С. Лісты ў будучыню: Проза. Публіцыстыка. Крытыка. – Мінск: Маст. літ., 1986. – 215с.

11. Палуян, С. // Першацвет адраджэння. – Мінск: 1995. – С.234.

12. Палуян, С. Хрыстос уваскрос : Апавяданне. // Бацькаўшчына: Зб.гіст.літ. – Мінск: 2000. – С. 250.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 2 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ЭВМК

## 2.1 ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ”

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1
***ТЭМА*: Янка Купала**

1 Біяграфія; набыткі і дасягненні купалазнаўства.
2 Мастацкая эвалюцыя Я.Купалы ў зб-ках “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”.
3 Рамантычныя паэмы 1910–1913 гг., іх мастацкія адметнасці.
4 Драматычныя паэмы: праблематыка, мастацкія асаблівасці; драматургія: літаратурныя традыцыі і эстэтычныя вытокі.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Я.Купалы (паэтычныя зб-кі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”; раннія паэмы: “Зімою”, “Калека”, “Нікому”, “Адплата кахання”, “У піліпаўку”, “За што?” (тры на выбар); драматычныя паэмы “Адвечная песня”,“Сон на кургане”; паэмы: “На куццю”, “На дзяды”, “Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”; п’есы: “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя”; прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры 3 крытычныя артыкулы.

На 9-10 балаў – патрэбна ведаць змест твораў і прачытаць, акрамя лекцыі і падручніка, 3 крытычныя артыкулы розных даследчыкаў па творчасці Я.Купалы.

На 7-8 балаў – неабходна добра арыентавацца ў змесце твораў, умець іх аналізаваць, грунтуючыся на змесце лекцыі і падручніка, пазнаёміцца з 1 крытычным артыкулам па творчасці пісьменніка.

На 5-6 балаў – ведаць змест асноўных твораў вывучаемага пісьменніка, пазнаёміцца з тэкстам лекцыі.

На 4 балы – мець уяўленне пра аўтара і яго творчасць, ведаць змест паасобных твораў.

**Літаратура:**

**Асноўная**
1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989. – С. 351–363.
2 Гісторыя беларускай літаратуры. (ХІХ – пач. ХХ ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998.
3 Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 121–175.
**Дадатковая**
4 Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – С. 150–170, 194–203.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5 Ваданосава, Ф. “Гэй, да сонца, гэй, да зор!”: Да 80-годдзя з дня выхаду ў свет зборніка Я.Купалы “Шляхам жыцця” / Ф.Ваданосава // Роднае слова. – 1993. – № 4.

6 Ваданосава, Ф. “Грай, мая жалейка...”: Да 90-годдзя першага зборніка вершаў Я.Купалы / Ф.Ваданосава // Роднае слова. – 1998. – № 6.

7 Васючэнка, П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П.Васючэнка. – Мінск, 1994.

8 Васючэнка, П. Я.Купала і сімвалізм / П.Васючэнка // Роднае слова. – 2002. – № 8.

9 Гніламёдаў, У. Янка Купала. Новы погляд / У.Гніламёдаў. – Мінск, 1995.

10 Максімовіч, В.А. Эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.: Дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ / В.Максімовіч. – Мінск, 2000. – С. 70–113, 114–144.

11 Навуменка І. На пераломе эпох: Творчасць Я.Купалы (зб. “Гусляр”, 1910) / І.Навуменка // Роднае слова. – 1995. – № 7.

12 Рагойша В. Бацька нацыі / В.Рагойша // Полымя. – 1992. – № 6.

13 Санюк, Дз. “Не хачу весяліцца, гуляць”: Трагедыйнасць дакастрычніцкай творчасці Я.Купалы / Дз. Санюк // Роднае слова. – 1992. – № 1.

14 Санюк, Зм. Харызматычны статус творчасці Янкі Купалы / Зміцер Санюк // Роднае слова. – 2000. – № 1.

15 Ярош, М. Я.Купала і Я.Колас. Параўнальны аналіз творчасці / М.Ярош. – Мінск, 1988.

**Электронныя рэсурсы**

16 Купала, Я. Творы / Я.Купала // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Janka_Kupala/

17 Купала, Я. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/yanka.kupala

***Індывідуальныя заданні (выконваюцца пісьмова, 15–20 мін.):***

1) Выканаць тэставае заданне па біяграфіі і творчасці Я.Купалы. Прыклад тэставага задання:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся Я.Купала? | |
| 2 | Знайдзіце няправільны варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Я.Купалы. | |
| 3 | Які верш Я.Купалы набыў статус нацыянальнага гімна? | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |
| 7 | | |
| 8 | | |
| 9 | | |
| 10 | | |

2) Прааналізаваць інтымную лірыку Я. Купалы: “Даўгажданая”, “Явар і каліна”, “Пакахай мяне, дзяўчынка”, “Як у лесе зацвіталі”, “З недацветаў”, “Над ракою ў спакою”, “Песня” (“Зайшло ўжо сонейка, цень лёг на гонейка...”), “Мая жонка”, “Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея...”, “А яна...” і інш. – 3 вершы на выбар.

3) Ахарактарызаваць вобраз Машэкі з паэмы Я. Купалы “Магіла льва”.

4) Давесці ўвасабленне ў вобразе Мужыка (паэма “Адвечная песня”) універсальнасці людскога лёсу; абгрунтаваць вызначэнне твора “як містэрыі”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2
## *ТЭМА*: Якуб Колас

1 Біяграфія, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.
2 Лірыка Я.Коласа: асноўны пафас, этапы развіцця, мастацкія асаблівасці.
3 Паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”: творчая гісторыя, характар аўтабіяграфізму, праблематыка, ідэйны змест.
4 Проза Я.Коласа: жыццёвыя і літаратурна-фальклорныя вытокі, эвалюцыя Коласа-празаіка; Трылогія “На ростанях”.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Я.Коласа (паэтычныя зб-кі “Песні жальбы”, “Водгулле”; апавяданні: “Нёманаў дар”, “Малады дубок”, “Соцкі падвёў”, “Пісаравы імяніны”, “Недаступны” і інш.; “Казкі жыцця” (5 на выбар); паэмы: “Новая зямля”, “Сымон-музыка”; трылогія “На ростанях”); прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры 3 крытычныя артыкулы.

На 9-10 балаў – патрэбна ведаць змест твораў і прачытаць, акрамя лекцыі і падручніка, 3 крытычныя артыкулы розных даследчыкаў па творчасці М.Багдановіча.

На 7-8 балаў – неабходна добра арыентавацца ў змесце твораў, умець іх аналізаваць, грунтуючыся на змесце лекцыі і падручніка, пазнаёміцца з 1 крытычным артыкулам па творчасці пісьменніка.

На 5-6 балаў – ведаць змест твораў вывучаемага пісьменніка, пазнаёміцца з тэкстам лекцыі.

На 4 балы – мець уяўленне пра аўтара і яго творчасць, ведаць змест паасобных твораў.

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989.

2 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 176–237.

**Дадатковая**

3 Багдановіч, І.Э. Купалаўскі і коласаўскі канцэпты свабоды / І.Э. Багдановіч // Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мінск: Беларуская навука, 2001.

4 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 181–190.

5 Казбярук, У. Паэма Я.Коласа “Новая зямля”: у святле славянскіх традыцый / У. Казбярук. – Мінск, 1979.

6 Максімовіч Валеры. Касмічны лад “Новай зямлі” / В.Максімовіч // Полымя. – 2002. – № 2.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Мушынскі, М. Паэма Я.Коласа “Сымон-музыка” / М.Мушынскі // Роднае слова. – 2000. – № № 5, 6.

8 Мушынскі, М. “Яна – асноўная паэма ва ўсёй маёй паэтычнай творчасці”. “Новая зямля” Я.Коласа / М.Мушынскі // Роднае слова. – 2001. – № 1.

9 Навуменка, І.Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя / І.Навуменка. – Мінск, 1981.

10 Навуменка, Іван. “Казкі жыцця” Я.Коласа / І.Навуменка // Роднае слова. – 2002. – №№ 8, 9.

11 Сіцька, Здзіслаў. Думка з-пад сэрца. “Новая зямля” ў прасторы і часе мікра- і макракосмасу / З.Сіцька // Роднае слова. – 1998. – № 5.

12 Шамякіна, Т. Вобраз музыкі ў беларускай літаратуры: паводле паэмаў Янкі Купалы “Курган” і Якуба Коласа “Сымон-музыка” / Т.Шамякіна // Роднае слова. – 1992. – № 12.

13 Ярош, М. Я.Купала і Я.Колас. Параўнальны аналіз творчасці / М.Ярош. – Мінск, 1988.

**Электронныя рэсурсы**

14 Колас, Я. Творы / Я.Колас // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jakub_Kolas/

15 Якуб Колас. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/yakub.kolas

***Індывідуальныя заданні (выконваюцца пісьмова, 15–20 мін.):***

1) Выканаць тэставае заданне па біяграфіі і творчасці Я.Коласа. Прыклад тэставага задання:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | Дэбют Я.Коласа адбыўся ў газеце | |
| 5 | Ранняя проза Коласа выходзіла пад псеўданімам | |
| 6 | Героямі якога твора Я.Коласа з’яўляюцца дзед Курыла і дзед Даніла? | |
| 7 | | |
| 8 | | |
| 9 | | |
| 10 | | |

2) Пісьмова растлумачыць сэнс назвы паэмы Я.Коласа “Новая зямля” і вызначыць праблематыку твора.

3) Выявіць адметнасць вобраза Сымона у кантэксце вобразаў мастакоў айчыннай літаратуры (“Музыка” М. Багдановіча, “Курган” і “Раскіданае гняздо” Я. Купалы) – пісьмова.

4) Пісьмова прааналізаваць “казку жыцця” Я.Коласа “Зло не заўсёды зло”.

5) Пісьмова ахарактарызаваць вобраз Лабановіча / Ядвісі (на выбар) з трылогіі Я.Коласа “На ростанях”.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3
## *ТЭМА*: Максім Багдановіч

1 Біяграфія паэта, вытокі яго творчасці, значэнне дзейнасці.
2 Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі “Вянок”.
3 Проза М.Багдановіча.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4 М.Багдановіч – як літаратуразнаўца, крытык і перакладчык.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю М. Багдановіча (паэтычны зб-к "Вянок"; апавяданні "Музыка", "Апокрыф", "Апавяданне аб іконніку і залатару", "Шаман" і інш.); законспектаваць крытычныя артыкулы: "Глыбы і слаі", "За тры гады", "Забыты шлях"; прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры 3 крытычныя артыкулы;

На 9-10 балаў – патрэбна ведаць змест твораў і прачытаць, акрамя лекцыі і падручніка, 3 крытычныя артыкулы розных даследчыкаў па творчасці М.Багдановіча.

На 7-8 балаў – неабходна добра арыентавацца ў змесце твораў, умець іх аналізаваць, грунтуючыся на змесце лекцыі і падручніка, пазнаёміцца з 1 крытычным артыкулам па творчасці пісьменніка.

На 5-6 балаў – ведаць змест твораў вывучаемага пісьменніка, пазнаёміцца з тэкстам лекцыі.

На 4 балы – мець уяўленне пра аўтара і яго творчасць, ведаць змест паасобных твораў.

**Літаратура:**

**Асноўная**

1 Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч.2. / А.А.Лойка. – Мінск, 1989. – С. 351–363.

2 Гісторыя беларускай літаратуры. (XIX – пач. XX ст.) / Пад. рэд. М.А.Лазарука і А.А.Семяновіча. – Мінск, 1998. – С. 386–413.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 тамах. – Т. 1. (1901 – 1920 гг.). – Мінск, 1999. – С. 265–318.

**Дадатковая**

4 Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э Багдановіч. – Мінск: Бел навука, 2001.

5 Баршчэўскі, Л.П., Васючэнка, П.В., Тычына, М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – С. 191–199.

6 Войцікава, Людвіка. Пяць месяцаў у Менску. (З жыцця М.Багдановіча) / Л.Войцікава // На суд гісторыі. – Мн., 1994.

7 Гніламёдаў, У. Яго жыццёвая сіла / У.Гніламёдаў // Полымя. – 1992. – № 4.

8 Дышыневіч, В. "Але вось цераз цемень маланка блішчыць, асвячае мне вобраз Хрыста": Хрысціянскія матывы ў творчасці М.Багдановіча / В. Дышыневіч // Роднае слова. – 1993. – № 6.

9 Конан, У. Святло паэзіі і цені жыцця / У.Конан. – Мінск, 1991.

10 Ластоўскі Вацлаў. Мае ўспаміны аб М.Багдановічу / В.Ластоўскі // На суд гісторыі. – Мн., 1994.

11 Максім Багдановіч // Крыніца. – 1999. – № 6 (53).

12 Максімовіч, В. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / В.Максімовіч. – Мн., 2000.

13 Навуменка, І. [Серыя артыкулаў па тв-ці М.Багдановіча] І.Навуменка // Роднае слова: 1997. – №№ 9, 11, 12; 1998. – №№ 1, 2, 4.

14 Петрушкевіч, А. Палыновая горыч кахання. Максім Багдановіч і Ганна Какуева А.Петрушкевіч // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 83–85.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

15 Стральцоў, Міхась. Загадка Багдановіча // Стральцоў Міхась. Выбранае. – Мн., 1987.

16 Тарасюк, Л. Пад зоркай Венеры: Лірыка кахання ў паэзіі М.Багдановіча / Л.Тарасюк // Роднае слова. – 1997. – № 4.

17 Чабан, Т. Космас “Вянка” / Т.Чабан // Полымя. – 1991. – № 12.

**Электронныя рэсурсы**

18 Багдановіч, М. Цікавыя звесткі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://belarusianheroes.com/maksim.bahdanovich

19 20 нечаканых фактаў з жыцця Максіма Багдановіча [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.nastaunik.info/node/15290

20 Багдановіч, М. Творы / М.Багдановіч. – Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка: http://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/

***Індывідуальныя заданні (выконваюцца пісьмова, 15–20 мін.):***

1) Выканаць тэставае заданне па біяграфіі і творчасці М.Багдановіча. Прыклад тэставага задання:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |
| 7 | Радкі з якога апавядання М.Багдановіча прыведзены ніжэй:<br>*“Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека, – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае.*<br>*Бо спяваюць нават і жабы ў багне, а ці ж не лепшымі будзеце вы ад іх?”* | |
| 8 | Вызначце твор М.Багдановіча па наступным урыўку:<br>*Хвалююць сэрца нам дзявочыя пастаці,*<br>*І душы мацярэй нас могуць чараваці;*<br>*Вышэйшая краса – ў іх злітнасьці жывой!*<br>*Артысты-маляры схіляліся прад ёй,*<br>*Жадаючы з’явіць цераз свае халсціны*<br>*Пачуцці мацеры у вобліку дзяўчыны...* | |
| 9 | У якім годзе і дзе быў надрукаваны зборнік М.Багдановіча “Вянок”? | |
| 10 | | |

2) На прыкладзе такіх твораў, як вершаванае апавяданне “У вёсцы”, паэма “Вераніка” і верша-песні “Ізноў пабачыў я сялібы...”) давесці асноўную думку раздзела “Мадонны”.

3) Пісьмова прааналізаваць прытчу М. Багдановіча “Апокрыф”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 3 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ЭВМК

## 3.1 Прыкладныя пытанні да экзамена па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку XX ст.” для студэнтаў 2 курса філалагічнага факультэта завочнай формы навучання спецыяльнасці “Беларуская філалогія”

1. Агульная характарыстыка беларускай літаратуры пач. 20 ст.
2. Роля газеты “Наша ніва” ў станаўленні беларускай літаратуры пач. 20 ст., дыскусія 1913 г. на старонках газеты.
3. Жыццёвая і творчая біяграфія **Ядвігіна Ш.**
4. Ядвігін Ш.- апавядальнік (зб-кі “Бярозка”, “Васількі”).
5. Раман “Золата” Ядвігіна Ш. і яго месца ў гісторыі беларускай літаратуры.
6. Жыццёвая і творчая біяграфія **Цёткі.**
7. Паэзія Цёткі: традыцыі і наватарства.
8. Проза і публіцыстыка Цёткі.
9. Значэнне Цёткі для беларускай літаратуры і культуры.
10. Жыццёвая і творчая біяграфія **Я.Купалы**.
11. Лірыка Я.Купалы да 1917 г.: аналіз зб-каў “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”.
12. Лірыка Я.Купалы паслякастрычніцкага часу: набыткі і страты.
13. Рэалістычна-побытавы і ўмоўна-сімвалічны план у драматычнай паэме Я.Купалы “Адвечная песня”; паэма як містэрыя.
14. Драматычная паэма Я.Купалы “Сон на кургане”: сімвалічная шматзначнасць вобразаў, складанасць кампазіцыі, эвалюцыя галоўнага персанажа.
15. Паэмы Я.Купалы “Курган”, “На куццю”, “На дзяды”: тэмы, ідэі, асноўныя вобразы.
16. Ідэйна-мастацкі аналіз паэм Я.Купалы “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”
17. Камедыя Я.Купалы “Паўлінка”. Камедыйнае і драматычнае ў творы.
18. Драма Я.Купалы “Раскіданае гняздо” як драма ідэй; аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар твора.
19. Трагікамедыя Я.Купалы “Тутэйшыя”: праблематыка і жанравая адметнасць.
20. Роля і значэнне творчасці Я.Купалы ў развіцці бел.літ-ры пач. 20 ст.;
21. Набыткі купалазнаўства.
22. Жыццёвая і творчая біяграфія **Я.Коласа**.
23. Асноўныя ідэі, вобразы, асаблівасці лірыкі Я.Коласа.
24. Эвалюцыя Я.Коласа-празаіка (на прыкладзе 3-5 твораў).
25. Філасофская праблематыка і алегарычнасць “Казак жыцця” Я.Коласа.
26. Агульная характарыстыка паэмы Я.Коласа “Новая зямля”.
27. Агульная характарыстыка паэмы Я.Коласа “Сымон-музыка”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

28. Трылогія Я.Коласа “На ростанях”: праблематыка твора.
29. Роля і значэнне творчасці Я.Коласа ў развіцці бел.літ-ры пач. 20 ст.;
30. Аналіз крытычных і літаратуразнаўчых прац па творчасці Я.Коласа.
31. **М.Багдановіч**: біяграфія і фармаванне асобы паэта.
32. М.Багдановіч як заснавальнік паэзіі “чыстай красы” ў бел. літаратуры
33. Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі М.Багдановіча “Вянок”.
34. М.Багдановіч-празаік.
35. М.Багдановіч – крытык і перакладчык.
36. Значэнне дзейнасці М.Багдановіча.
37. Літаратуразнаўчыя і крытычныя матэрыялы пра творчасць М.Багдановіча.
38. Жыццёвая і творчая біяграфія **З.Бядулі**.
39. Тэматычная і паэтычная разнапланавасць лірыкі З.Бядулі пач. 20 ст.
40. Зборнік З.Бядулі “Абразкі”; тэматыка, вобраз лірычнага героя.
41. Адметнасць апавяданняў З.Бядулі.
42. Раман З.Бядулі “Язэп Крушынскі”: праблематыка, сістэма вобразаў, мастацкія асаблівасці.
43. Біяграфія і ідэйна-творчыя ўстаноўкі **М.Гарэцкага**.
44. Праблематыка і мастацкая спецыфіка апавяданняў М.Гарэцкага.
45. Аповесць-драма М.Гарэцкага “Антон”: шматпланавасць і філасафічнасць твора.
46. Трылогія М.Гарэцкага пра інтэлігенцыю: “Меланхолія”, “У чым яго крыўда?”, “На імперыялістычнай вайне”.
47. Ідэйны пафас аповесці “Ціхая плынь”. Псіхалагізм і гуманізм М.Гарэцкага.
48. Аповесць М.Гарэцкага “Дзве душы”: праблема духоўнай раздвоенасці, сістэма вобразаў.
49. “Камароўская хроніка” М.Гарэцкага: эпічнасць мастацкай задумы.
50. Драматургія М.Гарэцкага (“Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы”).
51. Роля і значэнне дзейнасці М.Гарэцкага.
52. Аналіз літаратуразнаўчых артыкулаў і манаграфій па творчасці пісьменніка.
53. Жыццёвая і творчая біяграфія **А.Гаруна**.
54. Паэтычная спадчына А.Гаруна (зб-к “Матчын дар”).
55. Проза і драматургія (зб-к “Жывыя казкі”) А.Гаруна.
56. Грамадска-літаратурная дзейнасць **В.Ластоўскага.**
57. Аповесць В.Ластоўскага “Лабірынты”: спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця.
58. **Ц.Гартны**: асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча.
59. Аналіз малой прозы Ц.Гартнага (3 творы на выбар)
60. Раман Ц.Гартнага “Сокі цаліны”, яго значэнне для беларускай раманістыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 4 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ЭВМК

## 4.1Вучэбная праграма

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” (уваходзіць у Модуль “Гісторыя беларускай літаратуры”) вывучаецца студэнтамі 2 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць) і ўваходзіць у сістэму літаратуразнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў, якія вывучаюць гісторыю беларускай літаратуры ў якасці будучай спецыяльнасці.

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” заклікана адыграць пазітыўную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, у прапагандзе дасягненняў і набыткаў нацыянальнага мастацтва слова.

Засваенне курса дае магчымасць будучаму спецыялісту ўзброіцца веданнем фактычнага і эмпірычнага матэрыялу пра змест і асноўныя кірункі развіцця нацыянальнага літаратурнага працэсу пачатку ХХ стагоддзя, высветліць мастацка-крэатыўную ролю ў ім шматлікіх творчых індывідуальнасцей (пісьменнікаў). Глыбокія і рознабаковыя веды, якія студэнты мусяць набыць пры вывучэнні курса, паспрыяюць у далейшым высокапрафесійнай працы ў разнастайных навучальных установах, у тым ліку і вышэйшых, а таксама ў магчымай навукова-даследчай дзейнасці.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны – даць аптымальны аб'ём ведаў па гісторыі беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя, спрыяць далейшай выпрацоўцы навыкаў прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу; сфарміраваць у студэнтаў-філолагаў сістэму прафесійных ведаў і ўменняў, што забяспечыць самастойную творчую дзейнасць настаўніка-славесніка.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

– паказаць нацыянальную спецыфіку, ідэйна-мастацкія асаблівасці беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя;

– засвоіць веды пра ролю класікаў беларускай літаратуры ў станаўленні характэрных рыс айчыннага мастацтва слова адзначанага перыяду;

– сфарміраваць навыкі аналізу літаратурных тэкстаў;

– выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў;

– выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– шляхі і галоўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры;

– канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мастацкіх твораў, сучасныя ацэнкі мастацкіх з’яў папярэдніх эпох, праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі;

**умець:**

– спалучаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з’яў, вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;

– каменціраваць тэксты твораў, характарызуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых пунктаў гледжання;

**валодаць:**

– адпаведным паняційным і літаратуразнаўчым апаратам;

– сучаснай метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчых даследаванняў, навыкамі разнастайных спосабаў аналізу мастацкіх твораў.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяду”, згодна са стандартам, павінна забяспечыць фарміраванне ў спецыяліста наступных **кампетэнцый**:

БПК-8. Характарызаваць розныя этапы развіцця беларускай літаратуры, яе асноўныя напрамкі, плыні і мастацкія метады.

БПК-9. Характарызаваць мастацкі тэкст з пункту гледжання яго аўтарства і суаднесенасці з літаратурным кірункам, школай, працаваць з тэкстам мастацкага твора на аснове методык аналізу і інтэрпрэтацыі.

БПК-10. Выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, гісторыка-культурныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, што знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творах беларускай літаратуры.

Вучэбная дысцыпліна дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” цесна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Гісторыя рускай літаратуры”, “Тэорыя літаратуры”, “Літаратура бліжняга замежжа”.

Вучэбная праграма па дысцыпліне дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя” прызначана для студэнтаў 2 курса завочнай формы навучання. У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца агульная колькасць гадзін – 120 (3 залiковыя адзiнкi); аўдыторная колькасць гадзін для *дзённай* формы навучання – 70, з іх: лекцыі – 40 гадзін, практычныя заняткі – 30 гадзін; аўдыторная колькасць гадзін для *завочнай* формы навучання – 18, з іх: лекцыі – 12 гадзін, практычныя заняткі – 6 гадзін. Форма справаздачы – экзамен (4 семестр).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДЗІНЫ

ХХ стагоддзе як гістарычная эпоха. Галоўныя гістарычныя падзеі: Першая і Другая сусветныя войны; рускія рэвалюцыі (1905 г., 1917 г. і 1991 г.); ліквідацыя трох еўрапейскіх імперый (Германскай, Аўстра-Венгерскай і Расійскай); утварэнне і распад СССР (1922—1991); знікненне сусветнай каланіяльнай сістэмы; аднаполюсны свет на мяжы стагоддзяў.

Асноўныя сацыяльна-палітычныя і эканамічныя працэсы ХХ ст.: развіццё тэхнасферы; гістарычная “праверка” ідэі сацыялізму ў СССР; глабалізацыя; сусветны тэрарызм; інфармацыйная вайна. Трагічныя абставіны, у якіх развівалася мастацкая культура. Іншыя, чым у ХІХ ст., светапоглядныя ўяўленні пра рэчаіснасць, пра характар руху гісторыі. Рыверсія гістарычнага працэсу.

Нацыянальныя беларускія архетыпы, народны ідэал справядлівага і шчаслівага грамадства і яго скажэнне гісторыяй. Беларусы — нацыя пераважна сялянская. Творчы характар сялянскай працы.

Савецкая гісторыя: знакавыя падзеі, вынікі і ўрокі. Праблемы развіцця заходняй цывілізацыі ў момант найвышэйшай дасягнутай ёю фізічнай магутнасці. Крытыка лепшымі розумамі свету, у тым ліку пісьменнікамі, капіталізму, буржуазнай псіхалогіі — эгаізму і індывідуалізму.

Эпоха і творчая асоба. Надзеі на прагрэс у дзеячаў культуры пачатку ХХ ст. і разбурэнне ілюзій у яго канцы. Адсутнасць у ХХ ст. адзінага творчага кірунку, што характарызуе эпоху. Паралельны, а не паслядоўны, рух рэалізму і авангардызму. Гуманістычныя традыцыі савецкай культуры. “Вялікі стыль” у мастацтве СССР. Пошук новай культурнай парадыгмы ў канцы ХХ — пачатку ХХІ ст.

Тып мастацтва і мастацкая мова. Чалавек і розныя формы соцыуму — цэнтральная праблема мастацкай культуры ХХ ст.

Страта надзеі — пасля крушэння сацыялізму — на новыя формы быцця. Інтэлектуальны хаос эпохі постмадэрнізму, адыход ад рацыянальнасці мыслення. Рэфлексіі ў сувязі з адчуваннем катастрафічнасці гісторыі.

Падзел мастацкай культуры на элітарную і масавую. Актуалізацыя ў сувязі з гэтым рэцэптыўнай праблематыкі.

Паглыбленне семантыкі мастацкага твора ў ХХ ст., што стымулявала пошукі ў галіне літаратуразнаўства і крытыкі. Правамернасць розных інтэрпрэтацый аднаго і таго ж мастацкага твора.

Анейроід савецкай і постсавецкай інтэлігенцыі: жыццё сярод міфаў. Выхад — пошук салідарнай жыццебудовы, увага да чалавека, характэрная для гуманістычнай культуры.

Суадносіны традыцый і наватарства ў розных напрамках літаратуры ХХ ст. (рэалізм, мадэрнізм, постмадэрнізм). Прынцыпы постмадэрнісцкай эстэтыкі.

Уплыў іншых відаў мастацтва і СМІ на літаратуру ХХ ст. Маніпуляцыйныя магчымасці СМІ ў працэсе змен ментальнасці сучаснай цывілізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Паскарэнне развіцця мастацкага працэсу — і сусветнага, і ўласнабеларускага. Спецыфіка паскоранасці развіцця беларускай літаратуры. Нарастанне інтэнсіўнасці ўзаемадзеяння нацыянальных культур. Глабалізацыя — і дабро, і зло.

## *РАЗДЗЕЛ 1.* БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ (1900–1930)

Перыядызацыя беларускай літаратуры XX ст. Яе нацыянальна-гістарычныя і мастацка-эстэтычныя асновы. Літаратурнае XX стагоддзе як цэласная гісторыка-культурная з'ява.

Беларуская літаратура і нацыянальна-вызваленчы рух. На мяжы стагоддзяў — XIX і XX: нацыянальныя традыцыі і мастацкае наватарства. Дынамічны малюнак лёсавызначальных момантаў развіцця беларускай літаратуры Новай і Навейшай гісторыі — ад ідэі мясцовага, рэгіянальнага патрыятызму да ідэі нацыянальнага духоўна-культурнага адраджэння. Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч, А. Абуховіч, Ф. Тапчэўскі, М. Косіч, К. Каганец, Ядвігін Ш. як выразнікі глыбіннага імкнення народа да свабоды і прадвеснікі навейшай беларускай літаратуры, якая стваралася пісьменнікамі-прафесіяналамі. Прадмовы Ф. Багушэвіча ў якасці гісторыка-літаратурных маніфестаў і іх роля ў актывізацыі беларускага сацыякультурнага руху.

Беларуская літаратура на фоне агульнаеўрапейскага гістарычнага працэсу як натуральнае выяўленне нацыянальнага духу. Агульначалавечае і нацыянальна-самабытнае ў змесце, характары і напрамку ідэйна-эстэтычнага станаўлення беларускай літаратуры. Унікальнасць "нацыянальнай сітуацыі", элементы "крызіснай свядомасці" і парадоксы творчага пошуку, якія выявіліся ў ідэі паскоранага грамадска-культурнага і мастацка-літаратурнага развіцця, у з'явах мастацкага сінкрэтызму "старога" і "новага", "традыцыйнага" і "наватарскага", "аптымістычнага" і "песімістычнага", "трагікамічнага".

Літаратурацэнтрызм беларускага вызваленчага руху і роля творчай інтэлігенцыі ў абуджэнні нацыянальнай і чалавечай годнасці беларусаў. Багацце творчых індывідуальнасцей, шматстайнасць ідэйнага і эстэтычнага пошуку. Асноўныя філасофска-мастацкія ідэі, архетыпы і вобразы, міфалагемы і лейтматывы беларускай літаратуры XX стагоддзя. Жанрава-стылёвы абсяг мастацкай літаратуры, міжродавыя формы і дыфузія жанраў.

**а) Літаратура пачатку XX стагоддзя.**

"Ліхаманкавы попыт на ідэалагічныя каштоўнасці" (М. Багдановіч) у перадрэвалюцыйныя і рэвалюцыйныя гады. Масавая папулярнасць ідэй сацыялізму, сацыял-дэмакратычных партый (эсэры, Польская партыя сацыялістаў, Бунд, РСДРП, Беларуская сацыялістычная грамада) і грамадскіх рухаў (пецярбургскі гурток польскай, літоўскай і беларускай моладзі, маскоўская студэнцкая арганізацыя, мінскі гурток па вывучэнні Беларусі, "Круг беларускай народніцкай прасветы", Беларускі настаўніцкі хаўрус). Рэвалюцыя 1905 г. і яе ўплыў на літаратуру.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асветніцка-выдавецкая і грамадска-палітычная дзейнасць братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Аляксандра Уласава, Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Антона Лявіцкага (Ядвігіна Ш.), Каруся Каганца, Браніслава Эпімах-Шыпілы, Вацлава Ластоўскага, Алеся Бурбіса і інш. Першы часопіс на беларускай мове “Свабода” (1902). Газета “Голос Белоруссии” (1903). Літаратурныя зборнікі на гектографе “Калядная пісанка” (1903), “Велікодная пісанка” (1904), зборнік вершаў Янкі Лучыны “Вязанка” (1903), зборнік “Песні” (1904), “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання” (1906), укладзены Цёткай і аформлены Карусём Каганцом, “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (1906), укладзенае Цёткай, “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” (1909), укладзенае Якубам Коласам і аформленае Карусём Каганцом.

Беларускі рух і рускамоўная прэса (“Белорусский вестник”, “Голос провинции”, “Жизнь провинции”, “Окраина”, “Северо-Западный край” “Минский курьер”, “Минский листок”, “Минское эхо”, “Минская речь”, “Минское слово”, “Минское русское слово”, “Отклики Белоруссии”).

Царскі маніфест “Аб свабодзе слова, друку, сходаў, партый” (ад 17 кастрычніка 1905 года) і яго ўплыў на беларускі культурніцкі рух. Выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца” (Пецярбург), таварыства “Наша хата” (Вільня), прыватнае выдавецтва А. Грыневіча (Пецярбург). Газеты “Гоман”, “Светач”, “Дзянніца”, часопісы “Саха”, “Маладая Беларусь”, “Лучынка”.

Штотыднёвік “Наша доля” (1906) — легальная “першая беларуская газета для вясковага і мястэчковага рабочага люду”. Асветніцка-публіцыстычныя і літаратурна-мастацкія матэрыялы штотыднёвіка. Вершы і апавяданні Алаізы Пашкевіч (Цётка, Мацей Крапіўка), вершы і апавяданні Якуба Коласа (“Наш родны край”, “Асенні вечар”, “Беларусам”, “Слабода”), апавяданне Ядвігіна Ш. “Суд”, мастацкія творы, падпісаныя псеўданімамі.

Газета “Наша ніва” (1906—1915) і яе клопат аб усебаковым духоўным развіцці беларусаў. Роля газеты ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа, у абгрунтаванні адраджэнскай ідэалогіі, у збіранні маладых літаратурных талентаў, у стварэнні кола нацыянальнай інтэлігенцыі. Дэмакратычная атмасфера ў рэдакцыі газеты, талерантныя адносіны паміж прадстаўнікамі розных палітычных плыняў, рухаў, творчых стыляў.

Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Янка Купала, Якуб Колас, Сяргей Палуян, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Алесь Гарун, Язэп Лёсік, Лявон Гмырак, Янка Журба, Рамуальд Зямкевіч як стваральнікі нацыянальна-культурнай і мастацка-эстэтычнай праграмы “нашаніўства”: 1) адраджэнне гістарычнай самасвядомасці беларусаў; 2) змаганне за дзяржаўную і нацыянальную незалежнасць; 3) адраджэнне беларускай мовы і культуры; 4) уваходжанне беларускай літаратуры ў еўрапейскі культурны кантэкст; 5) стварэнне літаратурнага класічнага (“вялікага”) стылю.

Дыскусіі на старонках “Нашай нівы” па нацыянальным пытанні (сцвярджэнне права беларусаў на дзяржаўную самастойнасць, на сваю мову і культуру, спрэчкі з мясцовымі шавіністамі і чарнасоценцамі, з ідэалогіяй “западноруссизма”, станоўчая ацэнка вялікай рускай класічнай літаратуры,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адносіны да тэорыі “малых спраў”, маральна-асветніцкая пропаведзь ідэй свабоды, роўнасці і братэрства, праблемы правапісу “кірыліцай” і “лацініцай”).

Дыскусія 1913 года аб шляхах развіцця беларускай літаратуры і яе рэха ў літаратурна-крытычным працэсе ХХ стагоддзя (Власт, Адзін з парнаснікаў, Л. Гмырак, М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Я. Лёсік, А. Луцкевіч і інш.).

Эстэтычная шматграннасць беларускай літаратуры гэтага перыяду. Мадэрнісцкія тэндэнцыі. Дынаміка мастацкіх плыняў: рамантызм, рэалізм, сімвалізм, імпрэсіянізм і інш.

Сузор’е талентаў (“нашаніўцаў”, “адраджэнцаў”, “парнасцаў”). Пісьменнікі-“самавукі”, якія друкавалі свае творы пад псеўданімамі (Мікіта Чашчавік, Баўтрук, Юзя Шчупак, Паўлюк Жыбуля, Дзяніс Валынец, Ілля Дзяжко, Зоська Верас (Людвіка Войцік), Дзед Дзяніс (Мікалай Савасцюк), Дзядзька Пранук (Франц Умястоўскі), Стары Улас (Сівы-Сівіцкі), Пётра Просты (Ільдэфонс Бобіч) і інш.). Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) як адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы. М. Гарэцкі пра творчасць гэтага пісьменніка.

*Карусь Каганец* (1868—1918) — паэт, празаік, мастак, грамадскі дзеяч. Радавод пісьменніка (сваяцтва з французскім паэтам Гіёмам Апалінерам). Мастацкае ўзнаўленне беларускай тапанімікі ў літаратурных апрацоўках народных легендаў і паданняў (“Навасадскае замчышча”, “Прылукі” і інш.). Фальклорная аснова вершаў-песень (“Нёман”, “Згадка пра Галубка”, “Старажовы курган”, “Кабзар” і інш.). Камедыя “Модны шляхцюк” у кантэксце беларускай драматургіі. Публіцыстыка. М. Багдановіч пра творчасць К. Каганца.

*Гальяш Леўчык* (1880—1944) — паэт, перакладчык, аўтар народнай песні “Не шукай ты мяне...”. Зборнік вершаў “Чыжык беларускі” (1912): арыентацыя на народную песеннасць, “нашаніўская” вобразнасць, рамантычны антураж, паэтычная экзальтацыя, вобраз паэта-вешчуна. Эсэ “Харaство” і “Чалавек”. Загадкі, жарты, казкі. Пераклады. Апрацоўкі народнай творчасці.

*Альберт Паўловіч* (1875—1951) — аўтар гумарыстычных вершаў і падручніка “Бухгалтэрыя” (на беларускай мове). Вобраз беларуса ў яго лірыцы (дасціпнасць, кемлівасць, здаровы смех, высакародства, патрыярхальнасць). Сувязь яго паэзіі з народнай гумарыстычнай апавядальнай традыцыяй. Гарадскі фальклор у вясёлых фацэціях, байках, жартах. М. Багдановіч і М. Гарэцкі пра лірыку і гумар А. Паўловіча.

*Андрэй Зязюля* (1878—1921) — пачынальнік беларускай духоўнай лірыкі. Зборнік вершаў на лацініцы “З роднага загону” (1914). Біблейскія вобразы і матывы ў яго лірыцы. Хрысціянская канцэпцыя нацыянальнага характару беларуса.

*Янка Журба* (1881—1964) — паэт-“нашанівец”. Пейзажная лірыка. Публіцыстыка (“Лісты з Украіны”). Вершы для дзяцей.

*Уладзіслаў Галубок* (1882 — 1937) — драматург, празаік, акцёр, мастак, народны артыст Беларусі. Аўтар кнігі “Апавяданні” (1913), у якой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выяўляецца ўплыў эмпірычна-побытавага рэалізму, спалучаны з элементамі сентыменталізму. Драматургія У. Галубка. Камедыя “Пісаравы імяніны”. М. Гарэцкі пра п’есы драматурга.

Рысы “нашаніўскай” эстэтыкі і паэтыкі ў лірыцы Канстанцыі Буйло, Зоські Верас, Кандрата Лейкі, Алеся Гурло, Цішкі Гартнага. Літаратурна-крытычныя ідэі і канцэпцыі Сяргея Палуяна, Антона Луцкевіча, Лявона Гмырака, Альгерда Бульбы.

Беларуская літаратура “нашаніўскага перыяду” ў ацэнках М. Горкага, А. Пагодзіна, Я. Карскага, М. Караліцкага, В. Брусава, І. Свянціцкага, Е. Янкоўскага, С. Руднянскага, М. Янчука, Л. Гіры.

## 1.1. ЯДВІГІН Ш.

(1868—1922)

Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі) як адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы. Біяграфія. Роля пісьменніка ў літаратурным і грамадска-культурным жыцці.

Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы “Бярозка” (1912) і “Васількі” (1914). Алегарычныя апавяданні з іх пранікнёным лірызмам (“Бярозка”, “Дуб-Дзядуля”), лагодным гумарам (“Сакатушка”, “Важная фіга”), з’едлівай сатырай (“Павук”, “Падласенькі”, “Сабачча служба”, “Цырк”). Перапрацоўка народных анекдотаў і сюжэтаў (“Вучоны бык”, “З маленькім білецікам”, “Заморскі звер”). Апавяданні рэалістычна-побытавыя, сацыяльна-псіхалагічныя (“Гаротная”, “З бальнічнага жыцця”, “Зарабляюць”, “Жывы нябожчык”), лірычна-філасофскія (“Васількі”, “Раны”), прытчава-дыдактычныя (“Баба”, “Чалавек”). Майстэрства пісьменніка-навеліста, мова твораў.

“Золата” (1920) як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы, спроба стварэння псіхалагічнага рамана з напружаным драматычным сюжэтам, прыгодніцка-дэтэктыўнымі элементамі, псіхалагічна змястоўнымі характарамі.

Паэма “Дзед Завала”, нарысы “Лісты з дарогі”, “Думкі з падарожы”, успаміны, артыкулы.

Асоба і творчасць пісьменніка ў ацэнках Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, інш.

## 1.2. ЦЁТКА

(1876—1916)

Асоба Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у кантэксце пачынальнікаў беларускай класічнай літаратуры.

Біяграфія. Творчая і грамадская дзейнасць. Традыцыі паэзіі Ф. Багушэвіча і наватарства лірыкі Цёткі. Зборнікі паэзіі “Скрыпка беларуская”, “Хрэст на свабоду” (1906). Адраджэнскі і рэвалюцыйны пафас лірыкі, ахвярнасць у імя Бацькаўшчыны, вера ў лепшую будучыню роднага краю, паэтызацыя змагання, выкрыццё несправядлівасці грамадскага ладу, выкарыстанне рамантычнай сімволікі, алегорыі, маштабных вобразаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прамоўніцкіх інтанацый (“Вера беларуса”, “Суседзям у няволі”, “Хрэст на свабоду”, “Мора”, “Добрыя весці”). Верш-гімн і верш-заклік. Рытміка твораў, іх лексіка і стылістыка. Цётка як пранікнёны лірык і палымяны агітатар.

Матывы грамадзянскага суму, выкліканыя расстаннем з радзімай і хваробай (“З чужыны”, “На магіле”), і ўзнёслыя парыванні (“Арлы-брацці, дайце скрыдлы...”) у вершах 1908—1914 гг. Выяўленне ў яе творах літаратурна-творчай пазіцыі, эстэтычных прынцыпаў. Эвалюцыя, разнастайнасць, багацце, мастацкая дасканаласць і адраджэнскае гучанне яе лірыкі. Роздум у вершах аб прызначэнні мастацтва, погляды на ўзаемадачыненні творцы і грамадства (“Скрыпка”, “Артыст грайка”, “Музыкант беларускі”). Сувязь паэзіі Цёткі з фальклорам (“Вясковым кабетам”, “Сірацінка”, “Гаданне”, інш.). Песенныя матывы ў яе творах. Пейзажная лірыка (“Лес”, “Мой сад”). Прырода, яе фарбы і гукі ў выяўленні Цёткі. Услаўленне прыгажосці жыцця і навакольнага свету. Асаблівасці індывідуальнай паэтыкі Цёткі.

Праблематыка, вобразы, стылёвая адметнасць алегарычнага апавядання “Прысяга над крывавымі разорамі” (1906). Апавяданні для дзяцей (“Сварба”, “З прыску ды ў агонь”, “Сірата”) з “Першага чытання для дзетак беларусаў” (1906). Псіхалагізм, экспрэсіўнасць, драматызм і гуманістычны змест апавяданняў 1910—1914 гг. (“Зялёнка”, “Міхаська”, “Асеннія лісты”, “Лішняя”). Гумар, іронія ў апавяданнях “Навагодні ліст”, “Зваротлівы”. Прыкметы рамантызму і рэалізму, асваенне новых жанравых формаў апавядання, паглыбленне псіхалагізму.

Асветніцкая дзейнасць Цёткі. Кнігі для дзяцей “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання”, “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, “Гасцінец для малых дзяцей (усе — 1906). Выхаваўчы пафас і мастацкія асаблівасці твораў для дзяцей.

Публіцыстыка Цёткі. Патрыятычны змест, навукова-пазнавальная і мастацкая каштоўнасць артыкулаў “Як нам вучыцца”, “Шануйце роднае слова!”, “Газа”, “Наша народная беларуская песня”, нарысаў “Аб душы маладзёжы”, “Пералётныя птушкі” і інш. Маральна-выхаваўчая, гуманістычная скіраванасць публіцыстычных твораў пісьменніцы. Уражанні Цёткі ад падарожжаў па замежных краінах (“З дарогі”, “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю”). Духоўныя запаветы пісьменніцы.

Значэнне Цёткі для беларускай літаратуры і культуры.

Постаць і творчасць паэтэсы ў ацэнках Я. Купалы, М. Гарэцкага, інш. Цётка ва ўспамінах С. Кайрыса, Ю. Вітан-Дубейкаўскай, інш. Вобраз пісьменніцы ў беларускай літаратуры і мастацтве.

Бібліяграфія выданняў твораў Цёткі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.3. ЯНКА КУПАЛА
(1882—1942)

Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) — народны паэт Беларусі (1925), класік беларускай літаратуры. Глыбокая народнасць, адраджэнскі пафас, мастацкая арыгінальнасць, нацыянальная адметнасць яго творчасці. Філасофскае асэнсаванне ім сутнасці жыцця і чалавека, багацце і непаўторнасць выкарыстання жанрава-стылёвых формаў.

Радавод. Гісторыя роду Луцэвічаў і яе водгук у творчасці паэта. Сацыяльныя і нацыянальныя ўмовы фарміравання творчай асобы Я. Купалы. Роля З. Чаховіча, У. Самойлы, А. Бурбіса, Ядвігіна Ш., Б. Эпімах-Шыпілы, В. Іваноўскага ў літаратурным лёсе паэта. Вільня, Пецярбург, Акопы, Мінск у яго жыцці. Я. Купала як рэдактар "Нашай нівы". Роля ў беларускім літаратурна-грамадскім руху. Жыццё паэта ў савецкі час. Духоўныя пошукі ў 20-я гады, драматызм і ўнутраная эміграцыя 30-х, трагічная смерць у гады вайны.

Вершы на польскай мове. Творы Ф. Багушэвіча і В. Дуніна-Марцінкевіча ў станаўленні Я. Купалы як беларускага паэта. Раннія вершы 1904—1907 гг. Ідэі, вобразы і асаблівасці лірыкі Я. Купалы пачатку ХХ ст.

Мастацкая эвалюцыя Я. Купалы ў зборніках "Жалейка" (1908), "Гусляр" (1910), "Шляхам жыцця" (1913) ад канкрэтна-пабытавага паказу жыцця, ад тэм і матываў пераважна сялянскіх, ад парадаксальна складанай прастаты да індывідуалізаванага, вытанчанага, артыстычнага, паглыбленага і энцыклапедычнага выяўлення асобы паэта і духоўнага вобліку яго героя. Эстэтычнае ўзбагачэнне беларускай паэзіі, шматграннасць і агульначалавечая каштоўнасць лірыкі Я. Купалы.

Цыклічная структура паэзіі Я. Купалы. Архетыпы і вобразы-сімвалы. Асноўныя матывы, танальнасці, іх трансфармацыя. Санаты, сімфоніі, трэны (плачы), гімны ў купалаўскай творчасці.

Я. Купала як прарок нацыянальнага Адраджэння. Паэтызацыя і адкрыццё праз вобраз мужыка беларускага народа, сцвярджэнне яго чалавечай годнасці і неўміручасці, імкненне абудзіць яго. Вобразы мужыка, народа, роднай старонкі і лірычнага героя ў паэзіі Я. Купалы ("Мужык", "Грай, мая жалейка...", "З песень аб сваёй старонцы", "Я мужык-беларус", "А хто там ідзе?", "Што ты спіш?..", "Там", "Ворагам Беларушчыны", "Мая малітва", "Наша мінуўшчына", "Гэй, наперад!", "Нашай ніве" ("Не загаснуць зоркі ў небе..."), "Маладая Беларусь" ("Вольны вецер напеў вольных песень табе..."), "Песня званара", "Над Нёманам", "Цару неба й зямлі", "Годзе!", "Выйдзі...", "Сярод раз'юшаных сатрапаў...", "Бацькаўшчына" і інш.). Самаахвярнае служэнне роднай зямлі. Разнастайнасць у раскрыцці лірычнага пачуцця. Грамадзянскі пафас, трагічнае і жыццесцвярджальнае гучанне гэтых вершаў. Канцэпт Бацькаўшчыны як адзін з галоўных у творчасці Я. Купалы.

Філасофская ("Мой дом", "Песня сонцу", "Мая думка", "Сон" ("Дарогай змучаны далёкай..."), "Прарок", "Дзве таполі", "Маё цярпенне", "На суд", "Ўвесь да дна..." і інш.) і пейзажная лірыка ("Лета" ("Лета ты, лета , "Зімой у лесе", "Спека", "Снег" і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Міфалагічныя вобразы, сюжэты і матывы (“Чорны Бог”, “Ваўкалак”, “Хохлік”, “На Купалле”, “У купальскую ноч”, “Адцвітанне”, “Ў вечным боры...”, “У ночным царстве” і інш.). Імкненне паэта пераадолець бездань паміж ідэалам і быццём, захапленне прыгажосцю навакольнага свету і роздум пра трагічны лёс чалавека, сутнасць жыцця і смерці, дабра і зла. Язычніцкае, пантэістычнае яднанне з прыродай і разлад у душы героя з прычыны таямнічасці і неспазнанасці гэтай прыроды, змагання ў ёй цёмных і светлых сіл.

Інтымная лірыка Я. Купалы: “Даўгажданая”, “Явар і каліна”, “Пакахай мяне, дзяўчынка”, “Як у лесе зацвіталі”, “З недацветаў”, “Над ракою ў спакою”, “Песня” (“Зайшло ўжо сонейка, цень лёг на гонейка...”), “Мая жонка”, “Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея...”, “А яна...” і інш. Непаўторнасць, таямніца, сіла і глыбіня пачуцця, прыгажосць яго выяўлення. Меладычнасць вершаў, іх народна-песенная аснова.

Рамантычнае светаадчуванне і характар асобы ў лірыцы Я. Купалы. Крыніцы купалаўскага рамантызму (нацыянальнае Адраджэнне, гістарычная мінуўшчына, фальклор, славянская міфалогія, суровая рэчаіснасць). Праблемы волі і абавязку, суадносіны ідэалу і рэчаіснасці, сродкі ўвасаблення рамантычнага ідэалу. Драматызм пачуццяў, вольналюбівыя матывы і гераічны пафас купалаўскай лірыкі. Асаблівасці паэтыкі Я. Купалы, павышаная экспрэсіўнасць, надзвычайная музычнасць, метафарызацыя, увага да выключнага, прыхільнасць да паэтычнай умоўнасці, маштабных вобразаў. Рытміка-інтанацыйнае багацце верша.

Рамантычнае, сімвалічнае і рэалістычнае ў паэзіі Я. Купалы. Традыцыі фальклору Літаратурныя традыцыі ў ёй. Адметнасць лірычнага таленту паэта-неарамантыка.

Антываенная лірыка — “Песні вайны”, “1914-ты”, “Вясна 1915-ая”. Сатырычныя вершы і байкі “Дэпутаты і грамадзяне”, “Чын, герб і лапаць”, “Груган і салавей”, “Селянін і конь” і інш.

Раннія паэмы Я. Купалы: “Зімою”, “Нікому”, “Калека”, “Адплата кахання”, “У Піліпаўку”, “За што?” (1906—1908). Ідэі. Жыццёвыя вытокі. Сацыяльны, рэалістычны, апавядальна-побытавы характар і рамантычныя прыкметы ў абмалёўцы герояў і абставінаў.

Рамантычныя паэмы 1910—1913 гг. Духоўная веліч героя, услаўленне непадкупнасці, свабоды мастака, чалавечай годнасці, фальклорны каларыт і непаўторнасць выяўленчых сродкаў у паэмах “Курган” (1910) і “Бандароўна” (1913). Роздум над сутнасцю беларускага нацыянальнага быцця, адметнасць асэнсавання і мастацкага ўвасаблення ніцшэанскай ідэі пра звышчалавека, трагедыя выключнай асобы, яе канфлікт з грамадствам і духоўнае падзенне, дэманічнае і гераічнае ў персанажах паэмы “Магіла льва” (1913). Услаўленне кахання, жанчыны і працы, гармонія і прыгажосць жыцця ў паэме-ідыліі “Яна і я” (1913), яе мастацкія асаблівасці. Твор у сусветным і нацыянальным літаратурным кантэксце (“Песня песняў” Саламона, “Буколікі”, “Георгікі” Вергілія, “Дафніс і Хлоя” Лонга, “Герман і Даратэя” Ё.-В. Гётэ, першы раздзел “Леснікова пасада” з паэмы “Новая зямля” Я. Коласа і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гістарызм паэм “Курган”, “На Куццю” (1911), “Гарыслава” (1912), “На Дзяды” (1912), “Бандароўна”, “Магіла льва”. Рамантычная ідэалізацыя мінуўшчыны ў іх і пошукі адказаў на балючыя пытанні сучаснасці. Асэнсаванне гісторыі праз народную песню і легенду. Героіка-рамантычны і фальклорна-рамантычны характар паэм Я. Купалы, іх праблематыка, кампазіцыйная будова, мастацкая дасканаласць, вобразы і паэтыка.

Драматычныя паэмы. Праблематыка “Адвечнай песні” (1908). Міфалагічна-фалькорная сімволіка ў паэме. Твор у літаратурным кантэксце (п’есы “Жыццё чалавека” Л. Андрэева, “Адвечная казка” С. Пшыбышэўскага, інш.). Мастацкая адметнасць “Адвечнай песні”. Кампазіцыя і вобразна-выяўленчыя сродкі. Імкненне чалавека да шчасця і трагізм яго жыцця. Увасабленне ў жыцці і смерці Мужыка універсальнасці людского лёсу. Рэалістычна-побытавы і ўмоўна-сімвалічны план у паэме. “Адвечная песня” як містэрыя.

Мастацкія асаблівасці драматычнай паэмы “Сон на кургане” (1910). Міфалагічныя вобразы — увасабленне таямнічых, невядомых, злых і варожых чалавеку сіл, што ўплываюць на яго лёс. Галоўны герой Сам як праўдашукальнік і змагар, які хоча зразумець сэнс жыцця, даць волю і шчасце народу. Неразуменне героя духоўна несвядомай масай. Праблема канфлікту паміж прарокам і натоўпам. Эвалюцыя галоўнага персанажа ад наіўнага летуценніка, ахвяры злых сіл, ад яго разладу з рэчаіснасцю і непаразумення грамадой да лірніка-вешчуна, што абуджае народ. Трагізм яго духоўных пошукаў. Сімвалічная шматзначнасць вобразаў, складанасць кампазіцыі, майстэрства Я. Купалы. Эстэтычныя адкрыцці Я. Купалы ў кантэксце сусветнай літаратуры (А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, С. Выспянскі, Ё.-В. Гётэ).

Адметнасць купалаўскага сімвалізму ў драматычным абразку “На папасе” (1913). Драматычныя паэмы ў мастацкай эвалюцыі Я. Купалы.

Драматургія. Літаратурныя традыцыі і эстэтычныя вытокі драматургіі Я. Купалы. Камедыя “Паўлінка” (1912). Прататыпы дзейных асоб. Праблематыка і вобразы. Высмейванне дамастроеўскіх асноў засцянковай шляхты і нацыянальна-культурны аспект у п’есе. Камедыйнае і драматычнае ў ёй. Мастацкая змястоўнасць характараў. Нацыянальны каларыт, дух твора. Адмысловасць і выразнасць купалаўскага смеху. Майстэрства Я. Купалы-камедыёграфа ў арганізацыі інтрыгі, разгортванні сцэнічнага дзеяння, стварэнні камічных сітуацый, індывідуалізацыі мовы персанажаў, увядзенні вакальных і харэаграфічных элементаў, звароце да гумару, іроніі, сатыры, шаржу, гратэску, буфанады. Гісторыя сцэнічнага ўвасаблення п’есы.

Сцэнічны жарт “Прымакі” (1913).

Драма “Раскіданае гняздо” (1913). Аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар. Сінтэз у творы мастацкіх набыткаў Я. Купалы. Роздум пра лёс чалавека, пошукі ім шчасця і волі. Нацыянальная адметнасць вобраза раскіданага гнязда як сімвала “раскіданай Беларусі” (М. Гарэцкі) і універсальнасць гэтага вобраза. “Раскіданае гняздо” як драма ідэй. Унутраная змястоўнасць персанажаў, іх сімвалізм, духоўныя пошукі кожнага з сям’і Зяблікаў. Моцная сувязь з зямлёй і пошукі праўды Лявонам, яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мастацкая адметнасць як вобраза-тыпу, блізкасць з такімі вобразамі-тыпамі, як Міхал у паэме “Новая зямля” Я. Коласа, Міхал Тварыцкі ў рамане “Трэцяе пакаленне” К. Чорнага, Васіль Дзяцел у “Палескай хроніцы” І. Мележа, Пятрок Багацька ў аповесці “Знак бяды” В. Быкава.

Бунтарства і непакорлівасць Сымона. Свая праўда жыцця ў пачуццях закаханай Зоські. Эстэтычная місія і разважлівасць музыкі Данілкі. Памяркоўнасць, цярплівасць і міласэрнасць Марылі. Жыццёвая мудрасць Старца. Вобраз Незнаёмага як вяшчуна. Прагматызм і звыродлівасць Паніча. Жабрацтва ў паэме як выратаванне роду і трансфармацыя яго ў “паязджанства”.

Выяўленчая сутнасць сімвалаў-рэчаў (тапор у руках Сымона; крыж, які нясе Сымон на магілу бацькі; вянок на галаве ў Зоські; Данілкава скрыпка і інш.).

Вобраз Цмока-ўпыра як увасабленне тыраніі, дэспатызму, цемры і зла. Эвалюцыя гэтага вобраза ў творчасці Я. Купалы. Сімволіка Вялікага Сходу. Пошукі шляху да Бацькаўшчыны. Глыбіня, шматграннасць, сіла і маштабнасць драмы “Раскіданае гняздо” ў выяўленні праблем беларускага нацыянальнага быцця. Традыцыі еўрапейскага сімвалізму (С. Выспянскі, Г. Ібсен, К. Гамсун і інш.) у п’есе і творчасці Я. Купалы. Гісторыя сцэнічнага ўвасаблення твора.

Роздум пра народнае жыццё, праблемы нацыянальнай свядомасці, асаблівасці і шляхі развіцця беларускай літаратуры ў публіцыстыцы (“З Фінляндыі”, “Ці маем мы права выракацца роднай мовы?”, “Вера і нацыянальнасць”, “Чаму плача песня наша?” і інш.).

Пераклады (з А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, М. Канапніцкай, Т. Шаўчэнкі, М. Някрасава і інш.), іх значэнне для разумення асобы паэта.

Творчы ўзлёт Я. Купалы ў вершах 1918—1919 гадоў, іх патрыятычны, філасофскі і гуманістычны змест (“Свайму народу”, “На сход”, “Спадчына”, “Час”, “Паязджане”, “Забытая карчма”, “Паўстань” і інш.). Структура, праблематыка і мастацкія асаблівасці зборніка паэзіі “Спадчына” (1922).

Асэнсаванне Я. Купалам хрысціянскай культуры (трансфармацыя вобраза Лазара Беднага ў рамантычных героях Гусляра, Дудара, Лірніка і Прарока; эсхаталагічныя матывы і інш.). Я. Купала як паэт-прарок, нацыянальны Месія. Маштабнасць яго мыслення, роздум над глабальнымі праблемамі быцця.

Патрыятычная скіраванасць, дэмакратычны пафас і сцвярджэнне агульначалавечых духоўных каштоўнасцей у публіцыстычных артыкулах 1919—1920 гг. (“Больш самачыннасці”, “Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год”, “Беларускае войска”, “Моладзь ідзе!”, “Незалежная дзяржава і яе народы”, “Справа беларускага нацыянальнага гімна”, “Незалежнасць”, “Торжышча” і інш.).

Лёс Бацькаўшчыны ў пераломныя моманты гісторыі і шляхі духоўных пошукаў чалавецтва ў кантэксце часу, што выявіліся ў перакладах “Слова аб палку Ігаравым” (празаічны ў 1919 і паэтычны ў 1921 гг.), “Міжнароднага гімна” Э. Пацье (1921), драмы Е. Жулаўскага “Эрас і Псіха” (1921—1926) і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інш.

Трагікамедыя “Тутэйшыя” (1922). Праблематыка і жанравая адметнасць. “Тутэйшасць” як вынік трагічнага гістарычнага лёсу Беларусі. Выкрыццё нацыянальнага нігілізму і рэнегацтва, польскага і рускага шавінізму. Сутнасць прыстасавальніцтва Мікіты Зноска. Янка Здольнік як выразнік патрыятычнага ідэалу Я. Купалы. Адметнасць вобразаў Ганулі Зношчыхі, Лявона Гарошкі, Усходняга вучонага, Заходняга вучонага і інш. Трагізм купалаўскага смеху, выяўленага праз іронію, сарказм, шарж і гратэск. Майстэрства драматурга ў раскрыцці характараў. Гісторыя сцэнічнага ўвасаблення твора.

Часовая радасць (вершы “Арлянятам”, “Дзве сястры”) і трывожны, балючы роздум пра ўласны лёс і лёс Беларусі ў паэзіі 1921—1926 гг. (вершы “А зязюлька кукавала...”, “Перад будучыняй”, “Пазвалі вас”, “...О так! Я — пралетар!..”, “Шляхам гадоў”, “Акоў паломаных жандар...”, “І прыйдзе”, “Царскія дары”, “За ўсё...”, “У лесе” і інш.).

Паэма “Безназоўнае” (1924). Сімволіка і паэтыка паэмы. Увасабленне вобраза Беларусі ў творы.

Сатыра, гумар ( “Гутарка аб кепскім гаспадару”, “Гутарка аб кепскай гаспадыні”, “І што я ёй зрабіў такое?”, “Праз гультайства”).

Ілюстрацыйнасць і рыторыка ў паэзіі другой паловы 20-х гадоў (паэма “З угодкавых настрояў” (1927), вершы “Дыктатура працы”, “Сыходзіш, вёска, з яснай явы...”).

Лёс Я. Купалы ў 30-я гады і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Даніна часу ў творах паэта той пары, духоўная апазіцыйнасць у атмасферы страху і рэпрэсій, яго патрыятызм, выкліканы падзеямі вайны. Паэма-рэпартаж “Над ракой Арэсай” (1933). Святочна-каляндарныя, рамантычна-ідэалізаваныя вершы (“Я — калгасніца”, “На нашым полі”, “Сыны”, “Госці”, “Лён”, “Вечарынка”, “Алеся”), і вершы задуменна-сцішаныя, філасофскія (“Сосны”, “Генацвале”, “Шоў я пушчаю”). Грамадзянскае, асабістае ў гэтых творах, іх народная песеннасць.

Я. Купала як пясняр інтэрнацыянальных пачуццяў, дружбы народаў (“Грузія”, “Джамбулу”, “Шляхі”) і як аўтар вершаў для дзяцей (“Бай”, “Хлопчык і лётчык”).

Культаўскія творы Я. Купалы (“Табе, правадыр...”, “Аб Сталіне-сейбіту, “Святочныя вершы”, інш.). Услаўленне ў іх Сталіна, тагачаснага ладу, іх лірызм, а таксама пэўная зашыфраванасць, прыхаваная іронія ў асобных строфах.

Мастацкі пераклад у часы таталітарызму як сродак самавыяўлення і мастацкага пераўзбраення паэта. Пошукі Я. Купалам у свабодалюбівых і грамадзянскіх творах Т. Шаўчэнкі (“Сон”, “Гайдамакі”, “Каўказ” і інш.), А. Пушкіна (“Медны коннік”) адказаў на многія пытанні, якія яго хвалявалі.

Нізка вершаў “На заходнебеларускія матывы”. Паэма “Тарасова доля” (1939). Вылучэнне ў ёй трагічных матываў з жыцця Кабзара, паказ яго сувязяў з Беларуссю. Роздум аўтара пра агульнасць гістарычнага лёсу беларусаў і ўкраінцаў. Выкарыстанне ў паэме фальклорнай паэтыкі і сродкаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паэтычнай выразнасці, характэрных для Т. Шаўчэнкі.

Вершы (“Беларускім партызанам”, “Зноў будзем шчасце мець і волю...”) і публіцыстыка (“Кліч да беларускага народа”) перыяду Айчыннай вайны.

Уплыў Я. Купалы на беларускую літаратуру. Яго месца ў сусветным літаратурным кантэксце.

Шматграннасць і маштабнасць таленту Я. Купалы, яго наватарства як выдатнага майстра слова. Народнасць яго твораў. Стыль паэта.

Бібліяграфія асноўных выданняў Я. Купалы на беларускай мове. Пераклады яго твораў на іншыя мовы.

Набыткі і дасягненні купалазнаўства.

Я. Купала ў мастацтве і духоўным жыцці беларускага народа.

## 1.4. ЯКУБ КОЛАС
(1882—1956)

Веліч постаці Якуба Коласа (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча), народнага паэта Беларусі (1926), класіка нацыянальнай літаратуры. Шматграннасць яго таленту. Нацыянальныя і сацыяльныя ўмовы ў фарміраванні яго творчай асобы. Вучоба ў Нясвіжскай семінарыі (1898—1902). Праца настаўнікам. Удзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе (1906), турэмнае зняволенне (1908—1911), іншыя факты біяграфіі. Роля Я. Коласа ў грамадска-культурным і навукова-педагагічным жыцці.

Вершы на рускай мове. Уплыў на яго рускай класічнай літаратуры (А. Пушкін, М. Гогаль, М. Някрасаў, А. Майкаў і інш.) Праблематыка нашаніўскай паэзіі Я. Коласа. Зборнік “Песні-жальбы” (1910).

Адзінства і эвалюцыя тэм, вобразаў і матываў у паэзіі Я. Коласа. Дамінантныя ментальныя паняцці. Вобразныя малюнкі, кантрастныя супастаўленні.

Матывы грамадзянскага суму, балючага роздуму мастака над лёсам роднага краю і яго народа (“Вёска”, “Не пытайце, не прасеце”, “Наш родны край”, “Родныя вобразы”, “Каля акна ў астрозе”) і радасць жыцця, захапленне прыгажосцю роднай зямлі, вера ў яе лепшую будучыню, думка пра ўласную знітаванасць з яе лёсам (“Я не знаю”, “Многа слаўненькіх куточкаў”, “Наша гуменца”, “На полі вясною”).

Грамадска-публіцыстычныя вершы. Іх заклікі да вытрымкі і мужнасці, сцвярджэння велічы і магутнасці чалавечай асобы, яе няскоранасці і вернасці патрыятычнаму абавязку: “Беларусам”, “Ворагам” (“Багачы і панства...”), “Не бядуй!”, “Мужык” (“Я — мужык, бядак пахілы”), “Будзь цвёрды”.

Сатырычныя вершы “Асадзі назад!”, “Канстытуцыя”, “Вобразы самаўладдзя”. Філасофская лірыка, яе ідэйна-мастацкая змястоўнасць. Сінтэз пачуцця і думкі ў вершах “Покліч” (“Гэй, чуеце, хлопцы?”), “Я хачу аб табе”. Я. Колас як майстар пейзажнай лірыкі. Паэтыка вершаў “Нёман”, “Усход сонца”, “Чыгунка”, “Вясна” (“Вясна, вясна...”), “Адлёт жураўлёў”, “Ручэй”, “Зіма” (“Белым снегам замятае...”), “Першы гром”, “Дуб”, “Палескія вобразы”, інш. Міфапаэтычныя рысы ва ўспрыманні прыроды. Сістэма пейзажных вобразаў у паэзіі Я. Коласа як адлюстраванне нацыянальнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свету.

Вершы для дзяцей “Зіма” (“Надышлі марозы...”), “На рэчцы зімою”, “Песні аб вясне”.

Мастацкія асаблівасці паэзіі Я. Коласа: мастацкая прастата, гарманічнасць, багацце матываў, элегічная песеннасць, лірычная ўсхваляванасць, роздумнасць, эпічнасць, адухоўленасць, рэалістычная вобразнасць, класічныя вершаваныя формы, нюансаваcць, малюнкавасць.

Проза Я. Коласа. “Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле” (канец 90-х гг. XIX ст.) і празаічныя творы з “Другога чытання для дзяцей беларусаў” (1909) у творчай спадчыне пісьменніка. Эвалюцыя Я. Коласа ад фальклорных, этнаграфічна-побытавых замалёвак, маралізатарска-дыдактычнай імпрэсіі, верша ў прозе да апавяданняў сацыяльна-бытавых, сацыяльна-аналітычных, да псіхалагічна заглыбленай, прытчавай і філасофскай прозы з яе шматграннасцю і класічнай завершанасцю (“Слабода”, “Думкі ў дарозе”, “Васіль Чурыла”, “Бунт”, “Нёманаў дар”, “Малады дубок”). Мастацкая змястоўнасць сатырычна-гумарыстычных апавяданняў (“Соцкі падвёў”, “Пісаравы імяніны”, “Недаступны”).

Філасофская праблематыка і алегарычнасць “Казак жыцця” (1906—1956). Фальклорныя і літаратурныя вытокі, выяўленне душы народа і асобы аўтара. Іх адметнасць і арганічнасць у мастацкім самавыяўленні аўтара. Характарыстыка “Казак жыцця” як унікальнага жанру, які пісаўся на працягу ўсяго творчага шляху пісьменніка (за выключэннем 30—40-х гг.). Архетыповыя вытокі мастацкага мыслення, адметнасць сэнсаўтваральных мадэляў. Патрыятычны змест, багацце праблематыкі, неадназначнасць у трактоўцы вобразаў. “Казкі жыцця”, напісаныя ў нашаніўскі перыяд (“Дудар”, “У балоце”, “Жывая вада”, “Адзінокае дрэва”, “Зло — не заўсёды зло”, “На чужым грунце”, “Хмарка”, “Камень”, “Крыніца”, “Вадаспад” і інш.).

Складанасць, драматызм жыцця і творчасці Я. Коласа ў гады Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Характарыстыка “Казак жыцця”, напісаных у гэты час (“Супраць вады”, “Стары лес”, “Даль”, “Чортаў камень”, “Што лепей?”), у 20-я (“Гусі”, “Што яны страцілі?”, “Купальскія светлякі”, “Ноч, калі папараць цвіце”, “Залаты прамень”, “На ўсё ёсць прычына”) і ў 50-я гады (“Цвіркун”, “Адзінокі курган”, “Страказа”). Паэтыка “Казак жыцця”. Аўтарская ацэнка і асэнсаванне іх у літаратуразнаўстве.

“Новая зямля” (1911—1923). Аўтабіяграфічнасць твора. Гісторыя яго напісання. Жанравыя асаблівасці і праблематыка. Ідэйны змест паэмы. Энцыклапедызм “Новай зямлі”. Выяўленне ў паэме духоўнага багацця народа, яго этычнага, эстэтычнага свету, яго філасофіі. Сувязь твора з мастацкім вопытам чалавецтва (Біблія, “Праца і дні” Гесіёда, “Песня пра зубра” М. Гусоўскага, “Чатыры пары года” К. Данелайціса, “Яўгеній Анегін” А. Пушкіна, “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча, творчасць К. Гамсуна, Р. Тагора, карэла-фінскі народны эпас “Калевала”).

Глыбінная народнасць вобразаў Міхала, Антося, Ганны. Маштабная і агульначалавечая змястоўнасць іх характараў. Іх пошукі сацыяльнай незалежнасці, сцвярджэння сваёй чалавечай годнасці. Выяўленне велічы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускага народа праз вобразы галоўных герояў паэмы. Іх трактоўка ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Свет маленства. Яго хараство і непаўторнасць у "Новай зямлі".

Паэтызацыя сялянскага побыту, працы селяніна як сцвярджэнне народнай сілы, неперамажнасці яго нацыянальнага духу. Маральная прыгажосць і духоўнае багацце чалавека, непрыманне ім гвалту. Шматграннасць дачыненняў герояў з людзьмі і жыццём. Прырода ў "Новай зямлі". Роля пейзажу ў абмалёўцы чалавечых характараў, у паказе беларускага краю, у выяўленні патрыятычных пачуццяў аўтара, філасофскіх глыбінь твора. Прыёмы і сродкі мастацкай індывідуалізацыі вобразаў. Лірычныя адступленні і іх значэнне ў раскрыцці ідэйнага зместу паэмы, роздуму паэта пра лёс роднай зямлі і яе народа ў кантэксце гісторыі. Верш, рытміка, строфіка. Сюжэт і кампазіцыя. Адметнасць стылёва-выяўленчай сістэмы "Новай зямлі", яе рэалістычны характар, выключная разнастайнасць і дасканаласць, сувязь з народнымі традыцыямі, фальклорам. Уменне аўтара паэтызаваць звычайнае, будзённае.

Мова твора, яе шматслойнасць, багацце і хараство, роля ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы, у развіцці стылёвай шматграннасці беларускай літаратуры.

Рэалістычная дакладнасць паэмы. Яе гістарызм. Поліфанічнасць, маштабнасць і народнасць твора. Наватарства "Новай зямлі" і яе значэнне ў беларускай літаратуры, у развіцці жанраў шматпланавай эпічнай паэмы і рамана.

Паэма "Сымон-музыка" (1911—1925). Творчая гісторыя першай, другой і трэцяй рэдакцый твора. Адмоўны, сацыялагізатарскі ўплыў ідэалагічных установак 20-х гадоў на змены ў мастацкай канцэпцыі позніх рэдакцый паэмы, яе вобразнасці, сюжэта, канцоўкі. Адмаўленне Я. Коласа ў канчатковым варыянце ад рэлігійна-хрысціянскай сімволікі на карысць раскрыцця пантэістычнага яднання чалавека з прыродай. Філасафічнасць і выяўленчыя сродкі. Жанр, ідэя, праблематыка. Гістарычны аспект у паэме. Народныя вытокі яе філасафічнасці. Аўтабіяграфічнасць у творы.

Асэнсаванне ў паэме праблемы мастака і народа. Яе унікальнасць у еўрапейскім мастацтве як рамантычна-сімвалічнага лірычна-эпічнага твора. Шматграннасць і сэнсавая напоўненасць вобраза Сымона. Яго адметнасць у кантэксце вобразаў мастакоў айчыннай і сусветнай літаратуры (Арфей у антычнай, героі твораў "Янка-музыка" Г. Сянкевіча, "Сляпы музыка" У. Караленкі, "Музыка" М. Багдановіча, "Курган" і "Раскіданае гняздо" Я. Купалы, "Казка пра Музыку" М. Танка і інш.). Сымон як пясняр, у якім "дух сусвету з духам лучыцца зямлі". Адраджэнскае гучанне твора і сувязь яго з фальклорам.

Вобраз народа (дзед Курыла, парабак Яхім, дзед Даніла). Каханне ў творы. Сімвалічнасць вобразаў Ганны і Сымона як ўвасабленне Беларусі і народнай інтэлігенцыі. Вобразы жабрака, карчмара, князя-магната. Лірычныя адступленні, філасафічнасць і патрыятычнае гучанне твора. Яго сімволіка (адметны лісток, адзінокі колас, чуллівы звон, блукаючы прамень, дубок і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інш.), паэтыка, ідэя. Ацэнка паэмы крытыкай і літаратуразнаўствам.

Зборнік вершаў “Водгулле” (1922). Роздум над лёсам Беларусі ў вершах 1917—1921 гг. (“Да працы”, “На чужыне”, “Крыж”, “Звон шыбаў”, “Ценістрахі”, “Покліч” (“Гэй, чулыя сэрцам!”), “Беларускаму люду” і інш.). Заклікі да абуджэння роднага краю і пачуццё разгубленасці, нявер’я ў творах.

Пратэст супраць вялікадзяржаўнага шавінізму і нацыянальнага нігілізму ў вершах 1926 г. “Свіная філасофія” і “Свінні пад дубам”.

Адлюстраванне Я. Коласам у апавяданнях 20-х гадоў падзей рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і савецкай рэчаіснасці (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “У двары пана Тарбецкага”, “Адукацыя”, “Хатка над балотцам”). Рэалізм і гуманізм гэтых апавяданняў, псіхалагічная дакладнасць у абмалёўцы характараў, жыццёвых сітуацый, адносін людзей. Трапнасць мастацкіх дэталяў, дасціпнасць гумару, з’едлівасць іроніі, моўнае майстэрства.

Трылогія “На ростанях” (1921—1954). Творчая гісторыя, кампазіцыя, жанравыя асаблівасці. Аўтабіяграфічнасць і прататыпы герояў. Праблематыка твора.

Андрэй Лабановіч як прадстаўнік перадавой часткі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, як асветнік і шукальнік сэнсу жыцця. Яго дачыненні з іншымі персанажамі. Эвалюцыя вобраза. Роздум героя над сутнасцю быцця, над прызначэннем інтэлігенцыі і гістарычным лёсам Беларусі, над неабходнасцю абуджэння і адраджэння свайго народа. Уплыў жыцця на фарміраванне светапогляду Лабановіча. Мастацкія сродкі ў абмалёўцы вобраза.

Праблема народа і інтэлігенцыі ў трылогіі. Умовы жыцця беларускага сялянства на пачатку XX ст. Вобразы бабкі Мар’і, Аксёна Каля і іншых сялян. Дэмакратычная інтэлігенцыя ў трылогіі — Садовіч, Тукала, Турсевіч.

Сістэма жаночых вобразаў. Прыгажосць, шматграннасць і таямнічасць кахання ў творы. Вобразы Ядвісі, Людмілы, Вольгі Андросавай, Ліды Мураўскай. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы багатага духоўнага свету жанчыны.

Сатырычнае выкрыццё найбольш адыёзных прадстаўнікоў чыноўніцтва і духавенства (Дубейка, Бацяноўскі, Анцыпік і інш.). Асуджэнне мяшчанскай бездухоўнасці (сатырычныя вобразы “панямонскай” інтэлігенцыі). Рэалістычная, не толькі чорнымі фарбамі, абмалёўка Саханюка, а. Кірыла, панямонскага ўрадніка.

Сюжэт і стыль трылогіі. Вобразна-выяўленчыя сродкі і мова. Псіхалагічнае майстэрства ў адлюстраванні персанажаў і жыццёвых сітуацый. Роля партрэта ў характарыстыцы вобраза. Гумар у трылогіі. Дасканаласць мастацкай дэталі. Пейзажныя апісанні. Лірычнае, публіцыстычнае і філасофскае ў трылогіі.

Народнасць трылогіі, яе значэнне для станаўлення і развіцця беларускай прозы.

Незакончаная паэма “На шляхах волі” (1926—1956). Эвалюцыя светапогляду. Падзеі і час у паэме.

“Юнацкая” аповесць “На прасторах жыцця” (1925—1926). Сцяпан

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Барута і Аленка Гарнашка — тыповыя прадстаўнікі моладзі новага сацыялістычнага грамадства. Пранікнёнасць мастака ў выкрыцці карыслівага фразёрства і пустазвонства (Марцін Шулевіч). Стыль аповесці. Яе паэтычнасць і лірызм. Сюжэт і мова твора.

Паэт у эпоху культу асобы. Матывы лірыкі Я. Коласа 30-х гадоў.

Аповесць “Адшчапенец” (1930—1931). Праблемы калектывізацыі сельскай гаспадаркі і іх мастацкае вырашэнне ў творы. Вобраз Пракопа Дубягі. Псіхалагічная глыбіня і дакладнасць у паказе “нехацімца” — селяніна-серадняка. Павярхоўнасць у адлюстраванні поспехаў калгаснага жыцця.

Аповесць “Дрыгва” (1933). Гісторыя напісання і фактычная аснова твора. Змест і праблематыка. Вобразы дзеда Талаша і яго баявых паплечнікаў. Раскрыццё партызанскай барацьбы на Палессі. Каларытнасць жаночых вобразаў (Аўгіння і іншыя). Вобразы абаронцаў старога свету, белапольскіх інтэрвентаў. Элементы спрашчэння і павярхоўнасці ў абмалёўцы адмоўных персанажаў. Характар і роля пейзажу. Алегарычны сэнс некаторых малюнкаў. Сюжэт і кампазіцыя. Паэтычная стыхія моўна-выяўленчых сродкаў. Рамантызацыя ў творы і яе выдаткі. Традыцыі “Дрыгвы” ў творах беларускай літаратуры, прысвечаных тэме грамадзянскай і Айчыннай войнаў.

Драматургія Я. Коласа. П’есы “Вайна вайне” (1926—1938), “У пушчах Палесся” (1937). Іх праблематыка, героі. Сцэнічнае жыццё твораў Я. Коласа і нацыянальны тэатр.

Творчасць пісьменніка для дзяцей.

Творчасць Я. Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Публіцыстыка і паэзія. Пранікнёнасць патрыятычнага пачуцця ў вершах (“Голас зямлі”, “Чымган”). Выкрыццё фашызму.

Асаблівасці коласаўскай сатыры ваеннага часу.

Паэмы “Суд у лесе” (1943), “Адплата” (1945). Спрошчанасць у паказе партызанскай барацьбы.

Паэма “Рыбакова хата” (1939—1946). Кан’юнктурнасць зместу і праблематыкі. Псеўданародныя вобразы Сымона Латушкі, Данілы і Марыны, шаржыраванасць у абмалёўцы асадніка Богута. Павярхоўнасць у паказе барацьбы народа Заходняй Беларусі. Моц лірычных адступленняў у паэме. Паэтычнасць малюнкаў прыроды. Рытміка, страфіка і моўна-выяўленчыя сродкі паэмы.

Раскрыццё паэтычнага таленту Я. Коласа ў інтымнай і філасофскай лірыцы пасляваеннага часу (“Ці дома я, ці ў паходзе...”, “У бяссонне”, “Я хворы. Спяшаецца сэрца...” і інш.).

Навуковая і грамадская дзейнасць. Падручнік “Методыка роднае мовы” (1926). Асветніцкія ідэі і погляды Я. Коласа. Публіцыстычная спадчына. Эпісталярый пісьменніка.

Я. Колас — перакладчык (“Палтава” А. Пушкіна, творы М. Лермантава, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі і інш.).

Я. Колас у кантэксце сусветнай літаратуры (А. Пушкін, М. Гогаль, М. Някрасаў, І. Бунін, А. Міцкевіч, У. Фолкнер, інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бібліяграфія асноўных выданняў Я. Коласа на беларускай мове. Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Коласаўскія творы ў перакладах на іншыя мовы.

Вобраз Я. Коласа ў мастацтве. Яго творчая спадчына ў духоўным жыцці беларускага народа.

## 1.5. МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
(1891—1917)

Феномен М. Багдановіча як творцы і дзеяча нацыянальнага Адраджэння. Біяграфія паэта. Асаблівасці сямейнага выхавання, далучэнне да сусветнай культуры і беларушчыны. Роля антычнай (Гарацый, Авідзій), рускай (А. Пушкін, Ф. Цютчаў, А. Фет, А. Блок, В. Брусаў), французскай (П. Верлен, Э. Верхарн, Ш. Бадлер) і іншых еўрапейскіх літаратур (А. Дантэ, Г. Гейнэ, А. Міцкевіч, Т. Шаўчэнка), фальклору і міфалогіі ў фарміраванні светапогляду М. Багдановіча.

Энцыклапедызм, артыстызм, паэтычная культура М. Багдановіча. Патрыятычны і гуманістычны змест яго творчасці. Наватарства паэта. Паглыбленне эстэтычных асноў, зварот да новых тэм і форм у беларускай літаратуры, яе жанрава-стылёвае ўзбагачэнне. Распрацоўка М. Багдановічам праблем класічнай мастацкай спадчыны.

Творчасць М. Багдановіча як арыгінальная і сінтэтычная мастацкая сістэма. Спалучанасць з рознымі культурна-гістарычнымі кантэкстамі. Імпрэсіянізм, сімвалізм і неакласіцызм у яго паэзіі. Арфічны пачатак у яго паэзіі. Паэтычныя санаты, гімны, сімфоніі. Вар'іраванне мелодый і матываў. Паэтыка колеру і гуку.

Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі "Вянок" (1913). Задума, гісторыя выдання, структура. М. Багдановіч як паэт "чыстае красы" (А. Луцкевіч) і адраджэнскае гучанне яго паэзіі. Шматграннасць таленту М. Багдановіча. Фальклорныя матывы, найбольш значныя топасы, міфалагемы і сімвалы. "Зачарованае царства" і прырода. Гістарызм мастацкага мыслення паэта (нізкі "Старая Беларусь", "Старая спадчына"). Нізка "Места" як вытток мастацкага урбанізму. Паэтызацыя горада. Філасафічнасць, роздум над лёсам чалавека, Бацькаўшчыны і вечнымі праблемамі быцця. Класічныя анталагічныя традыцыі і набыткі фальклору. Свет кахання, матывы жыцця і смерці (нізкі "Мадонны", "Каханне і смерць", інш.). Асаблівасці паэтыкі і майстэрства: вершы "Чуеш гул? — Гэта сумны маркотны лясун...", "Раманс" ("Зорка Венера ўзышла над зямлёю..."), "Не кувай ты, шэрая зязюля...", "Слуцкія ткачыхі", "Краю мой родны! Як выкляты Богам...", "Жывеш не вечна, чалавек...", "Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...".

Мастацкі свет нізак "Эрас", "Лясун"; вершаў "Прыйдзе вясна", "Дзед", "Народ, Беларускі Народ!", створаных у 1908—1913 гг. Рацыянальнае і эмацыянальнае ў эстэтычнай сістэме паэта ("Ліст да п. В. Ластоўскага").

М. Багдановіч як літаратуразнаўца і крытык. Асэнсаванне ім літаратурнага працэсу. Досвед рускай культурна-гістарычнай школы і эстэтычныя погляды М. Багдановіча. Артыкулы "Глыбы і слаі" (1911), "За

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тры гады” (1913), “Забыты шлях” (1915). Асэнсаванне мастацкіх набыткаў і праблем развіцця беларускай літаратуры, роздум пра яе народнасць, сусветную каштоўнасць, пра запачаткаванне ў ёй асноў рэалізму, рамантызму, сімвалізму і іншых мастацкіх кірункаў.

М. Багдановіч і ўкраінская літаратура. Артыкулы “Краса і сіла” (1914), “Памяці Т. Р. Шаўчэнкі” (1914).

Проза М. Багдановіча. Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў “Музыка” (1907), “Апокрыф” (1913), “Апавяданне аб іконніку і залатару...” (1914). Біблейскія архетыпы і матывы. Роздум аб прызначэнні і эстэтычнай сутнасці мастацтва. Публіцыстыка М. Багдановіча.

М. Багдановіч — перакладчык. Шырыня перакладчыцкай зацікаўленасці. Выпрацоўка прынцыпаў нацыянальнай перакладчыцкай школы. Роля мастацкага перакладу ў творчым самавыяўленні паэта і ўзбагачэнне яго паэзіі.

Паэзія 1914—1916 гг. Адметнасць і філасафізм думкі ў вершах “Мяжы”, “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...”, Як Базыль у паходзе канаў...” і інш. Вершы беларускага складу “Бяседная”, “У Максіма на кашулі вышыты галубкі...”, “Лявоніха” і інш., іх сувязь з фальклорам. Ліра-эпас паэта (паэмы “Максім і Магдалена”, “Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык”, апакрыфічная легенда “Страцім-лебедзь”). Светлы сум, трагедыйнае і жыццесцвярджальнае гучанне яго паэзіі.

Лірыка апошняга перыяду, канца 1916 — пачатку 1917 гг. (вершы “Пагоня”, “Маладыя гады”, “Беларусь, твой народ дачакаецца...”, “Ты не згаснеш, ясная зараначка...” і інш.).

Ацэнка асобы і творчасці М. Багдановіча ў беларускім літаратуразнаўстве. Вобраз паэта ў беларускім мастацтве. Музычныя творы на словы паэта.

Бібліяграфія асноўных выданняў М. Багдановіча на беларускай мове.

Пераклады твораў М. Багдановіча на іншыя мовы.

Літаратурныя творы аб жыцці і творчасці паэта.

## 1.6. МАКСІМ ГАРЭЦКІ
(1893—1938)

Максім Гарэцкі як класік беларускай літаратуры. Значнасць і маштаб яго творчай асобы.

Біяграфія. Інтэлектуальна-філасофская і глыбока псіхалагічная проза М. Гарэцкага як новая ступень развіцця беларускай літаратуры. Тэматычнае і жанрава-стылёвае багацце творчасці пісьменніка.

Зборнік апавяданняў “Рунь” (1914). Патрыятычны, лірычна-аналітычны лад мыслення і высокая культура творчасці. Вобраз інтэлігента, выхадца з сялянскага асяроддзя, асветніка і філосафа (апавяданні “Рунь”, “У лазні”, “Роднае карэнне”, “У чым яго крыўда?”). Скіраванасць пісьменніцкай думкі да “патаёмнага”, імкненне зразумець душу свайго народа (апавяданні “Страхаццё”, “У панскім лесе”, “Што яно?”). Пошукі героямі адказаў на пытанні быцця. Праблема інтэлігенцыі і народа. Асэнсаванне мінуўшчыны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(“Рунь”, “Лірныя спевы”).

Гуманістычная скіраванасць у паказе чалавека на вайне і праблематыка апавяданняў 1915—1917 гг. (“Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На этапе”, інш.). Майстэрства псіхалагічнага аналізу, эстэтычная дасканаласць твораў.

Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне” (1915—1919). Гісторыя напісання і аўтабіяграфізм твора. Праўда пра вайну і людзей на вайне. Аналітызм і псіхалагізм, рэалізм і гуманістычны, антываенны пафас. Мастацкія асаблівасці, традыцыі і літаратурны кантэкст (Л. Талстой, А. Барбюс, Л. Франк, Э. М. Рэмарк, Э. Хемінгуэй і інш.). Уплыў аповесці на развіццё дакументальнага жанру ў беларускай літаратуры.

Аповесць “Дзве душы” (1919). Сістэма вобразаў, жанр і стыль твора. Праблема духоўнай раздвоенасці і вырашэнне ў аповесці такіх пытанняў, як бацькаўшчына і рэвалюцыя, адносіны рэвалюцыі да нацыянальных праблем, стаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі да рэвалюцыі.

Характарыстыка апавяданняў 1921—1922 гг. пра падзеі рэвалюцыі і станаўленне беларускай дзяржаўнасці (“У 1920 годзе”, “Фантазія”, “Апостал”, “Усебеларускі з’езд 1917-га года”).

Гістарычная тэматыка ў апавяданнях “Бітва на Уле”, “Уцёкі Сярэбранага” (1921); “Прысяга”, “Панская сучка”, “Страшная музыкава песня” і інш. (зборнік “Досвіткі”, 1926). Іх мастацкая адметнасць і патрыятычная скіраванасць. Погляд пісьменніка на падзеі мінуўшчыны. Задума М. Гарэцкага стварыць цыкл твораў, якія адлюстравалі б гісторыю беларускага народа на працягу значнага прамежку часу.

Пашырэнне тэматычных гарызонтаў беларускай літаратуры ў апавяданнях з кніг “Сібірскія абразкі” (1926—1928), “Люстрадзён” (1929—1930). Гісторыя напісання, праблематыка, выяўленчыя сродкі. Месца твораў у гісторыі беларускай літаратуры.

Непаўторнасць і шматграннасць таленту М. Гарэцкага-драматурга. Жанравая адметнасць яго п’ес. Драматычны абразок “Атрута” (1913), спецыфіка раскрыцця ў ім вобраза Рамана.

Драма “Антон” (1914). Шматпланавасць і філасафічнасць твора, яго жанравыя асаблівасці. Трагізм і маральная чысціня, глыбокая духоўнасць галоўнага героя. Выяўленне ў ім істотных рыс нацыянальнага характару, “дваістасці” беларуса. Шматграннасць і сэнсавая напоўненасць іншых вобразаў. Канцэптуальнасць сцэны ў “Славянскай кафейні”. “Драма чалавецкага духу” ў асэнсаванні М. Гарэцкага і адначасова жыццесцвярджальны і шматгранны фінал твора.

Праблема інтэлігенцыі ў п’есах “Гапон і Любачка” (1914), “Мутэрка” (1921).

Драматычны абразок “Жартаўлівы Пісарэвіч” (1922). Стварэнне яркага нацыянальнага тыпу пакутніка-беларуса. Паказ яго чалавечай годнасці і жыццялюбства.

Тэматычная разнастайнасць і псіхалагічная напоўненасць драматычных абразкоў “Салдат і яго жонка”, “Свецкі чалавек”, “Не адной веры” і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пранікнёны погляд на лёс беларускага народа ад часу прыгону да восені 1917 г. у п’есе “Чырвоныя ружы” (1922).

Раскрыццё істотных граняў беларускага нацыянальнага жыцця ў аповесці “Меланхолія” (1916—1921). Трывожны, балючы роздум галоўнага героя пра долю роднай зямлі і вера ў яе лепшую будучыню. Аўтабіяграфізм і псіхалагічны аналітызм твора. Яго месца ў творчай эвалюцыі пісьменніка на шляху да эпічнага спасціжэння жыцця.

Погляд у аповесці “Ціхая плынь” (1917—1930) на родны край як на “забыты” і адначасова як на блізкі і дарагі. Глыбіня псіхалагічнага аналізу пры паказе вясковай рэчаіснасці і раскрыцці сацыяльна-грамадскіх праблем пачатку ХХ ст. Гуманізм пісьменніка ў разуменні антынароднага характару імперыялістычнай вайны. Стылёвыя асаблівасці твора.

Творчая гісторыя рамана “Віленскія камунары” (1931—1933). Яго жанрава-стылёвыя асаблівасці. Эпічная шырыня і гістарызм мыслення пісьменніка. Вобраз Мацея Мышкі, яго роля ў сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора. Героі як носьбіты вопыту папярэдніх пакаленняў і мінулых эпох. Праўдзівае ўзнаўленне каларыту і духу часу ад прыгону да першай трэці ХХ ст. Аналітызм мастацкага мыслення аўтара. Асаблівасці гумару ў творы.

“Камароўская хроніка” (1930—1932, 1937) як эпапея, як унікальная з’ява ў творчасці пісьменніка і гісторыі беларускай літаратуры. Хранікальна-летапісны і дзённікавы характар твора. Спалучэнне аб’ектыўнага і суб’ектыўнага пачаткаў. Аўтабіяграфічнасць “Камароўскай хронікі”. Сувязь твора з “Баркулабаўскім летапісам”. Маштабнае і глыбока асабістае асэнсаванне М. Гарэцкім глабальных праблем быцця і лёсу свайго народа ў кантэксце часу і гісторыі. Праблематыка і асноўнае кола вобразаў у творы.

Падарожныя нататкі-дзённікі “Кіпарысы” (1929) і алегарычная аповесць “Лявоніус Задумекус” (1931—1932).

“Скарбы жыцця” (1935—1936, 1937(?)) як “лебядзіная песня”, споведзь душы і запавет М. Гарэцкага. Філасафічнасць, прыпавесцевасць, алегарычнасць і сімволіка твора, яго трагедыйнае гучанне і агульначалавечы змест.

Асаблівасці мовы ў творах М. Гарэцкага.

Публіцыстычная, крытычная і літаратуразнаўчая спадчына М. Гарэцкага. Праблемнасць і эстэтычная каштоўнасць артыкулаў “Наш тэатр” (1913), “Развагі і думкі” (1914). Роля “Гісторыі беларускае літаратуры” (1920) у развіцці айчыннай літаратуразнаўчай думкі.

М. Гарэцкі — перакладчык.

Уплыў творчасці пісьменніка на беларускую літаратуру ХХ ст.

Бібліяграфія выданняў М. Гарэцкага на беларускай мове.

Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы пра творчасць пісьменніка.

## 1.7. ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

(1886—1941)

Феномен творчай асобы Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Біяграфія. Умовы фарміравання і асаблівасці таленту. Уплыў Бібліі, Талмуду, Кабалы, хасідызму, беларускага фальклору і міфалогіі на яго творчасць.

Лірычнае і рамантычнае ў паэзіі З. Бядулі нашаніўскага перыяду (“На горне душы”, “Пяюць начлежнікі”, “Мары паэта” і інш.). Сувязь з паэтыкай сімвалізму, імпрэсіянізму і акмеізму. Захапленне прыгажосцю жыцця, сацыяльная і гістарычная тэматыка. Антываенны цыкл вершаў (“Ад крыві чырвона”, “Юда жэніцца”, “Кат” і інш.).

Зборнік “Абразкі” (1913), яго месца ў гісторыі беларускай прозы. Рамантычны характар і матывы лірычных імпрэсій і мініяцюр З. Бядулі (“Плач пралескаў”, “Прытуліся ка мне”, “Кветка”). Выяўленне ў іх фальклорных, біблейскіх, кніжных традыцый, раскрыццё ідэальнага, прыгожага. Імпрэсіянізм і алегарызм абразкоў.

Трагедыйнае, сацыяльнае і рэалістычна-побытавае, філасофскае і “змрочны гумар” (М. Багдановіч), псіхалагізм і праблема мастацкіх талентаў з народа, вера ў лепшую будучыню Беларусі і асуджэнне рэнегацтва часткі нацыянальнай інтэлігенцыі ў апавяданнях 1912—1915 гг. (“Ашчасліўіла”, “Пяць лыжак заціркі”, “Малыя дрывасекі”, “Велікодныя яйкі”, “На Каляды к сыну”, “Летапісцы” і інш.).

Публіцыстыка З. Бядулі, яго ўдзел у грамадска-культурным жыцці.

Праблемы красы і беларускага Адраджэння ў творчасці З. Бядулі 1918—1922 гг. Узлёт мастацкага таленту пісьменніка, узмацненне ў яго творчасці гэтага часу ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі. Актыўная публіцыстычная і палітычная дзейнасць з дэмакратычных незалежніцкіх пазіцый у 1918—1920 гг. Паглыбленне філасафічнасці і майстэрства ў вершах і паэмах зборніка “Пад родным небам” (1922).

Выяўленне духоўнага надлому ў лірыцы З. Бядулі першай паловы 20-х гг. Фальклярызм, рыторыка, схематызм, дэкларатыўнасць у яго зборніках паэзіі “Буралом” (1925), “Паэмы” (1927).

Аповесць “Салавей” (1927). Тры рэдакцыі. Фальклорна-рамантычны характар у асэнсаванні падзей далёкай мінуўшчыны. Праблемы мастака і мастацтва. Сюжэт, кампазіцыя і мова твора.

Спрашчэнне пры паказе савецкай рэчаіснасці ў аповесцях “Год за годам”, “Таварыш Мінкін”, апавяданнях “Дэлегатка”, “Тры крыжыкі”, “Рунь”.

“Язэп Крушынскі” (1928—1932) як сацыяльна-псіхалагічны раман пра складаныя працэсы грамадскага жыцця 1920-х гадоў у Беларусі. Праўдзівы паказ рэчаіснасці ў першай кнізе рамана. Стварэнне яскравага вобраза прадстаўніка заможнай часткі сялянства Язэпа Крушынскага. Імкненне Крушынскага да лідэрства на вёсцы, яго станоўчыя і адмоўныя рысы. Праблематыка, сістэма вобразаў. Мастацкія асаблівасці твора.

Спрашчэнні і скажэнні ў духу ідэйных абвінавачванняў афіцыйнай палітыкі канца 20-х — пачатку 30-х гадоў пры паказе пярэдадня калектывізацыі, сялянскай масы, інтэлігенцкага асяроддзя і нацыянальна-культурнага руху на Беларусі ў другой кнізе рамана. Выдаткі ў змесце і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

форме. Моўна-выяўленчыя сродкі.

Аўтабіяграфічныя аповесці З. Бядулі "Набліжэнне" (1935) і "У дрымучых лясах" (1939).

З. Бядуля — дзіцячы пісьменнік. Паэма-казка "Мурашка-Палашка" (1940), паэма "Хлопчык з-пад Гродна" (1940), вершы для дзяцей.

Аповесць-казка "Сярэбраная табакерка" (1940), глыбіня яе філасофскага зместу. Праблематыка і алегарычнасць твора. Фальклорныя і міфалагічныя сродкі ў выяўленчым ладзе і стылі аповесці.

Месца і значэнне З. Бядулі ў гісторыі беларускай літаратуры.

Бібліяграфія беларускіх выданняў З. Бядулі.

З. Бядуля ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 1.8. АЛЕСЬ ГАРУН
(1887—1920)

Алесь Гарун (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі) як адзін з пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры. Біяграфія паэта.

А. Гарун і беларускае Адраджэнне. Газеты "Наша ніва" і "Bielarus" ("Беларус") у творчым лёсе паэта. Вобразная адметнасць вершаў "Януку Купале" і "Начныя думкі" (абодва — 1908).

Зборнік "Матчын дар" (1918). Творчая гісторыя, структура, канцэптасфера. Асноўныя матывы і вобразы. Тварэнне паэтам нацыянальнага міфа. Канцэпцыя Беларусі, народа і яго лёсу. Думкі пра волю, народнае шчасце, сэнс быцця, будучыню. Асэнсаванне паэтам праблемы роднай мовы. Патрыятычны і сацыяльна-філасофскі змест вершаў "Чаму з маленства, з ураджэнства...", "Як надарыцца мінута...", "Ты мой брат, каго зваць Беларусам...", "Юдам", "Матчын дар", інш. Пранікнёны лірызм, глыбокая рэфлексія, публіцыстычнасць, трагізм паэзіі А. Гаруна, яе сувязь з фальклорам. Жанравая і рытміка-інтанацыйная разнастайнасць яго лірыкі: верш-роздум, верш-зварот, гімн, элегія, малітва, песня, інш. "Лёгкасць і мілазычнасць верша, рупная шліфоўка яго, новае і вельмі пекнае счэпліванне рыфм" (М. Багдановіч).

Пачуццё грамадзянскага абавязку і адказнасці перад народам, часам, будучыняй. Энергія паэтычнага радка, заклікальныя і запытальныя інтанацыі. Вершы А. Гаруна 1917—1920 гг. "Народ", "Брацця, к агульнаму шчасцю...", інш. Разнастайнасць вобразна-выяўленчых сродкаў і формаў у яго паэзіі. Біблейска-хрысціянскія вобразы і матывы ("Мае Каляды", "Самсон", інш.). Гумар, іронія, сатыра ў вершах і байках паэта ("Мяцеліца", "Галасуюць", "Апякун", "Кліч", інш.).

Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў А. Гаруна "Першы снег", "Пан Шабуневіч", "П'ера і Каламбіна" і інш. Нацыянальнае і агульначалавечае ў творах. Наватарства празаіка. Асаблівасці аўтарскага стылю.

П'есы для дзяцей А. Гаруна з яго зборніка "Жывыя казкі" (1920): "Хлопчык у лесе", "Шчаслівы чырвонец", "Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць". Іх вобразы, праблематыка і эстэтычная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адметнасць.

Творчасць паэта ў славянскім і сусветным літаратурным кантэксце (М. Лермантаў, В. Брусаў, А. Блок, Т. Шаўчэнка, І. Франко, У. Б. Йейтс, інш.).

Публіцыстыка А. Гаруна (“Одгукі”, “Увагі да нацыянальнага руху”).

Бібліяграфія выданняў А. Гаруна.

Ацэнка творчасці А. Гаруна ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 1.9. ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ
(1883—1938)

Вацлаў Ластоўскі — адзін з пачынальнікаў і лідэраў беларускага нацыянальнага Адраджэння пачатку ХХ ст. Біяграфія пісьменніка. Яго грамадска-палітычная, літаратурная, навуковая і выдавецкая дзейнасць.

Эстэтычныя пошукі В. Ластоўскага, наватарскі характар яго творчасці. Зварот да мінуўшчыны, распрацоўка гістарычных сюжэтаў. Стварэнне пісьменнікам літаратурна-гістарычнага міфа. Вобразы і падзеі мінулага, іх асэнсаванне. Выкарыстанне фальклорна-міфалагічнага летапіснага матэрыялу. Праблематыка, жанрава-стылёвая разнастайнасць, сімвалізм у апавяданнях, абразках, легендах, казках і прыпавесцях “Лебядзіная песня”, “Прывід”, “Дзень ружавай кветкі”, “Каменная труна”, “Сож і Няпро”, “Беларускі радавод”, “Князёўна Рагнеда”, “Вітаўт і Ягайла”, інш. Ацэнка М. Багдановічам апавяданняў В. Ластоўскага.

Мастацкая адметнасць аповесці “Прыгоды Тараса і Панаса” (1912).

Аповесць “Лабірынты” (1923). Элементы дэтэктыва, фантастычнай і прыгодніцкай літаратуры, прыкметы містэрыі і утопіі ў творы. Спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця ў “Лабірынтах”. Вобраз Крывіі ў светапогляднай і эстэтычнай сістэме пісьменніка і ў кантэксце беларускай літаратуры ХХ ст.

Паэзія В. Ластоўскага. Патрыятычная тэматыка, філасофска-інтэлектуальны змест, разнастайнасць формаў (“Наперад, змагарна наперад!”, “О, Крыўская зямля”, “Чала я не хіліў прад сілай”).

Роля В. Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі, сцвярджэнні думкі пра эстэтычнае развіццё і ўзвышэнне беларускай літаратуры. Рэцэнзіі на зборнікі “Васількі” Ядвігіна Ш., “Родныя з’явы” Т. Гушчы (Я. Коласа), “Рунь” М. Гарэцкага, артыкулы “Сплачывайце доўг”, “Па сваім шляху!” і інш.

Навуковая дзейнасць. Значэнне “Кароткай гісторыі Беларусі” (1910), “Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка” (1924), “Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі” (1926) у абгрунтаванні беларускай нацыянальнай ідэі.

Пераклады пісьменнікам твораў іншамоўных аўтараў — Э. Ажэшкі, Р. Кіплінга, А. К. Талстога, інш.

В. Ластоўскі як мемуарыст. Каштоўнасць яго ўспамінаў пра М. Багдановіча і Я. Купалу.

Творчасць В. Ластоўскага ў кантэксце беларускай і еўрапейскай літаратур (Я. Купала, М. Багдановіч, Х. К. Андэрсен).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 1.10. ЦІШКА ГАРТНЫ
(1887—1937)

Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага (Зміцера Хведаравіча Жылуновіча). Рэдактарская дзейнасць (газета “Дзянніца”). З. Х. Жылуновіч — старшыня Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі.

Праца ў Інбелкульце, дзейнасць як акадэміка АН БССР. Апалагетыка савецкага ладу жыцця і неабходнасці рэвалюцыйных змен. “Нашаніўскія” матывы ў лірыцы і пераход да трыбуннай паэзіі, публіцыстычнасць вершаванай творчасці (“Песні”, 1913; “Песні працы і змагання”, 1922; “Урачыстасць”, 1925; “Вершы”, 1927). Мастацкі эклектызм яго паэтычнай творчасці, яе сувязь з купалаўскім адраджэнскім пафасам (“Роднай краіне”, “Званар”), паэтызацыяй сялянскай працы Я. Коласа (“Касьба”, інш.). Рамантызацыя вобразаў і пачуццяў у цыкле “Песні кахання”.

Празаічныя творы. Мазаічнасць рэчаіснасці. “Трэскі на хвалях” (1924), “Прысады” (апавяданні і п’есы, 1927), “Гаспадар” (1930), “Гоман зарніц” (1932), “Наступ на горны” (апавяданні, нарысы, вершы, 1932), аповесці “На новым месцы” (1930), “Зялёны шум” (1931). Пошукі творчага самавыяўлення. Спроба стварэння буйнамаштабнага эпічнага палатна ў ранняй беларускай літаратуры.

Раман “Сокі цаліны” ў чатырох квадрах (1922—1930). Асаблівасці хранатопа вёскі і вобраз зямлі як Маці-карміцелькі, выяўленне яе жыватворнай сілы, шматгалосся жыцця. Адметнасці кампазіцыйнай пабудовы рамана, стылёвая інварыянтнасць, арнаменталізм прозы, роля дыялектнай мовы. Рэалістычныя тэндэнцыі ў паказе нацыянальнай псіхалогіі селяніна-беларуса. Значэнне кнігі ў чатырох частках у беларускай раманістыцы.

Драмы “Хвалі жыцця” (1918), “Сацыялістка” (1924), “Дзве сілы” (1927).

Выступленне з літаратурна-крытычнымі артыкуламі — “Узгоркі і нізіны” (1928), інш. Палемічны характар і тэндэнцыйнасць ацэнак літаратурнага працэсу 20—30-х гадоў XX ст.

Артыкул “Янка Купала — пясняр вызвалення (“Янка Купала ў літаратурнай крытыцы”, 1928). Сацыялагізацыя літаратурнай крытыкі.

Пераклад на беларускую мову рамана А. Фадзеева “Апошні з удэгэ” (1932).

Роля і месца Ц. Гартнага ў літаратурным працэсе, станаўленні і развіцці ранняй беларускай прозы XX стагоддзя.

Кніга Э. Ялугіна пра Ц. Гартнага “Без эпітафіі” (1989).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ – ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткі | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў | Усяго гадзін | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забяспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і г.д.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лекцыі | практычныя (семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | КСР | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | **Гісторыя беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.** | **18** | **12** | **6** | **-** | **-** | | | |
| 1.1 | *Беларуская літаратура пачатку ХХ ст.: агульная характарыстыка*<br>1 Агульная ацэнка перыяда.<br>2 Штотыднёвік “Наша доля”.<br>3 Газета “Наша ніва”; дыскусія 1913 года аб шляхах развіцця беларускай літаратуры. | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4] | |
| 1.2 | *Ядвігін Ш.*<br>1 Біяграфія пісьменніка.<br>2 Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы “Бярозка” і “Васількі”.<br>3 “Золата” як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы.<br>4 Паэма “Дзед Завала”, нарысы, успаміны, артыкулы | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.3 | *Цётка* (Алаіза Пашкевіч)<br>1 Біяграфія, творчая і грамадская дзейнасць.<br>2 Паэзія Цёткі: традыцыі і наватарства.<br>3 Проза і публіцыстыка Цёткі.<br>4 Значэнне дзейнасці Цёткі ў развіцці беларускай культуры і літаратуры. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.4.1 | *Янка Купала*<br>1 Біяграфія; набыткі і дасягненні купалазнаўства.<br>2 Мастацкая эвалюцыя Я.Купалы ў зб-ках “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”.<br>3 Рамантычныя паэмы 1910–1913 гг., іх мастацкія адметнасці. | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[17]<br>[31]<br>[32]<br>[55] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4 Драматычныя паэмы: праблематыка, мастацкія асаблівасці. | | | | | | | | |
| 1.4.2 | *Янка Купала*<br>1 Камедыя “Паўлінка”: праблематыка і вобразы, камедыйнае і драматычнае ў п’есе.<br>2 “Раскіданае гняздо” як драма ідэй: аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар п’есы.<br>3 Трагікамедыя “Тутэйшыя”: праблематыка і жанравая адметнасць. | **2** | - | 2 | **-** | **-** | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[72]<br>[74]<br>[144]<br>[168]<br>[186] | |
| 1.5.1 | *Якуб Колас*<br>1 Біяграфія, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.<br>2 Лірыка Я.Коласа: асноўны пафас, этапы развіцця, мастацкія асаблівасці.<br>3 Паэма “Новая зямля”: творчая гісторыя, аўтабіяграфічная аснова, праблематыка, жанравыя асаблівасці, ідэйны змест, сэнс назвы. | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[17]<br>[31]<br>[55]<br>[88] | |
| 1.5.2 | *Якуб Колас*<br>1 Паэма “Сымон-музыка”: творчая гісторыя, характар аўтабіяграфізму.<br>2 Філасофская праблематыка і алегарычнасць “Казак жыцця”.<br>3 Трылогія “На ростанях”: творчая гісторыя, кампазіцыя, жанравыя асаблівасці; аўтабіяграфічнасць твора, праблематыка. | **2** | - | 2 | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1], [5]<br>[17]<br>[31]<br>[55]<br>[88]<br>[144]<br>[167] | |
| 1.6.1 | *Максім Багдановіч*<br>1 Біяграфія паэта, вытокі яго творчасці, значэнне дзейнасці.<br>2 Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі “Вянок”.<br>3 Праблематыка, ідэйна-мастацкая канцэпцыя твораў, якія не ўвайшлі ў зб-к “Вянок”.<br>4 Лірыка 1914-1916 гг. і паэзія апошняга перыяду (к. 1916 - пач. 1917 гг.). | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[31]<br>[55]<br>[122]<br>[144] | |
| 1.6.2 | *Максім Багдановіч*<br>1 Проза М.Багдановіча.<br>2 М.Багдановіч – як літаратуразнаўца і крытык.<br>3 Асэнсаванне мастацкіх набыткаў і праблем развіцця бел.літ. | **2** | - | 2 | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[31]<br>[55] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | (арт. “Глыбы і слаі”, “За тры гады”, “Забыты шлях”)<br>4 М.Багдановіч-перакладчык. | | | | | | | [122]<br>[144] | |
| 1.7.1 | *Максім Гарэцкі*<br>1 Біяграфія, асноўныя перыяды творчасці, мастацка-светапоглядныя прынцыпы.<br>2 Апавяданні М.Гарэцкага: разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм.<br>3 Гарэцкі-драматург (“Антон”, “Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы”). | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1]<br>[5]<br>[55]<br>[69]<br>[78]<br>[79] | |
| 1.7.2 | *Максім Гарэцкі*<br>1 Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”: гісторыя напісання, аўтабіяграфізм твора.<br>4 Аповесць “Ціхая плынь”: стылёвыя асаблівасці твора.<br>3 Творчая гісторыя і жанрава-стылёвыя асаблівасці рамана “Віленскія камунары”.<br>4 “Камароўская хроніка” як эпапея. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.8.1 | *Змітрок Бядуля*<br>1 Біяграфія: умовы фарміравання і асаблівасці таленту<br>2 Паэзія З.Бядулі “нашаніўскага” перыяду і 20-х гг. (зборнік “Пад родным небам”);<br>3 Лірычныя імпрэсіі (зб-к “Абразкі”); апавяданні 1912 - 1915 гг.;<br>4 Апавяданні 20-х гг.; аповесць “Салавей” і аўтабіяграфічныя аповесці “Набліжэнне” і “У дрымучых лясах”. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.8.2 | *Змітрок Бядуля*<br>1 Аповесць “Салавей”: праблема мастака і мастацтва.<br>2 Аўтабіяграфічныя аповесці “Набліжэнне” і “У дрымучых лясах”.<br>3 “Язэп Крушынскі” як сацыяльна-псіхалагічны раман; праблематыка, сістэма вобразаў.<br>4 З.Бядуля як дзіцячы пісьменнік | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.9.1 | *Алесь Гарун*<br>1 Біяграфія паэта: асноўныя перыяды жыцця і творчасці.<br>2 Зборнік “Матчын дар” як найбольш поўная мастацкая выява творчай індывідуальнасці паэта;<br>3 Вершы 1917–1920 гг. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.9.2 | *Алесь Гарун*<br>1 Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў А.Гаруна.<br>2 Наватарства А.Гаруна-празаіка.<br>3 Дзіцячая драматургія (зб-к “Жывыя казкі”). | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.10.1 | *Вацлаў Ластоўскі*<br>1 Біяграфія пісьменніка.<br>2 Разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм у малой прозе.<br>3 Мастацкая адметнасць аповесці “Прыгоды Тараса і Панаса” | **2** | 2 | - | - | - | Лічбавы праектар, метадычны дапаможнік | [1], [5]<br>[8]<br>[55]<br>[67]<br>[87] | |
| 1.10.2 | *Вацлаў Ластоўскі*<br>1 Аповесць “Лабірынты”: спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця; жанравая адметнасць твора.<br>2 Паэзія В. Ластоўскага: патрыятычная тэматыка, філасофска-інтэлектуальны змест, разнастайнасць формаў.<br>3 Роля В.Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.11.1 | *Цішка Гартны*<br>1 Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага.<br>2 Паэзія: аналіз зборнікаў (“Песні”, “Песні працы і змагання”, “Урачыстасць”, “Вершы”).<br>3 Празаічныя творы: мазаічнасць рэчаіснасці (зб-кі “Трэскі на хвалях”, “Прысады”, “Гаспадар”, “Гоман зарніц”. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.11.2 | *Цішка Гартны*<br>1 Раман “Сокі цаліны”: адметнасці кампазіцыйнай будовы, значэнне для беларускай раманістыкі.<br>2 Вобразная сістэма рамана.<br>3 Роля і месца Ц.Гартнага ў станаўленні і развіцці бел. прозы XX ст. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| 1.12 | *Масавая беларуская літаратура пачатку XX ст.*<br>1 Літаратурна-крытычныя ідэі і канцэпцыі А.Луцкевіча і С.Палуяна.<br>2 Агляд творчых набыткаў К.Каганца.<br>3 Агляд творчых набыткаў У.Галубка.<br>4 Рысы “нашаніўскай” эстэтыкі і паэтыкі ў лірыцы К.Буйло і З.Верас. | **На самастойнае вывучэнне** | | | | | | | |
| | | | | | | | | | кантр. раб. |
| | | | | | | | | | экзамен |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.2 Рэкамендаваная літаратура

### Асноўная

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 1. (1901 – 1920) / НАН Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; Навук.рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мн. : Беларуская навука, 1999. – 583 с.

2 Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура XX ст. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мн : Вышэйшая школа, 2001. – 352 с.

3 Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей : культур.-гіст. і літ. аспекты прабл. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн. : Беларуская навука, 2002. – 363 с.

4 Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей : у 4 кн. Кн. 2. Пач. XX ст. 1900 – 1917 / АН Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн. : Навука і тэхніка, 1994. – 444 с.

5 Гісторыя беларускай літаратуры (пачатак XX стагоддзя) для спецыяльнасці 1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках); напрамак спецыяльнасці 1-21 05 02-01 Руская філалогія (Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), 1-21 05 02-02 Руская філалогія (Камп'ютарнае забеспячэнне): вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне [Электронны рэсурс] / склад. Т.А.Фіцнер. – Рэжым доступа: : http://dot3.gsu.by/course/view.php?id=1378

### Дадатковая

5 Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І.Абдзіраловіч // Вобраз – 90: літ. – крытыч. арт. / Уклад. С. Дубавец; рэдкал.: Н. Пашкевіч (рэд.) і інш. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 43–86.

6 Адамовіч, А. Беларускі раман : станаўленне жанра / А. Адамовіч. – Мн. : Выд-ва АН БССР, 1961. – 292 с.

7 Адамовіч, Алесь. "Браму скарбаў сваіх адчыняю" / А. Адамовіч. – Мн. : Навука і тэхніка, 1980. – 224 с.

8 Андраюк, С. Пісьменнікі. Кнігі : літ.-крытыч. арт. / С. Андраюк — Мн. : Маст. літ., 1997. – 346 с.

9 Арабей, Л. Стала песняй у народзе : жыццё і творчасць Цёткі. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мн. : Маст. літ., 1998. – 270 с.

10 Багдановіч, І. Авангард і традыцыя : беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мн. : Беларуская навука, 2001. – 387 с.

11 Багдановіч, І. Э. Янка Купала і рамантызм / І. Багдановіч. — Мн. : Навука і тэхніка, 1989. – 220 с.

12 Бельскі, А. І. Класікі і сучаснікі ў школе / А Бельскі. — Мн. : Народная асвета, 2005. – 246 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

13 Бугаёў, Д. Максім Гарэцкі / Д. Бугаёў. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн. : Беларуская навука, 2003. – 239 с.

14 Бяляцкі, А. Антон Луцкевіч – літаратурны крытык / А.Бяляцкі // Вобраз-90. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 125–154.

15 Васючэнка, П. В. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. Васючэнка. – Мн. : Галіяфы, 2009. – 200 с.

16 Васючэнка, П. В. Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм / П. Васючэнка. — Мн. : Беларуская навука, 2004. – 346 с.

17 Васючэнка, П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П. Васючэнка. – Мн. : Навука і тэхніка, 1994. – 173 с.

18 Гарадніцкі, Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гарадніцкі. — Мн. : Беларуская навука, 2005. – 234 с.

19 Гаранін, Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пач. XX ст. / Л. Я. Гаранін. – Мн. : Беларуская навука, 1996. – 176 с.

20 Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі; уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб.– Мн. : Мастацкая літаратура, 1992. – 479 с.

21 Гарэцкі, Р. “Ахвярую сваім “Я”... (Максім і Гаўрыла Гарэцкія). — Мн. : Беларуская навука, 1998. – 287 с.

22 Гарэцкі, Р. Браты Гарэцкія / Р. Гарэцкі. – Мн. : Медысонт, 2008. – 344 с.

23 Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларус. паэзію / У. Гніламёдаў. — Мн. : Мастацкая літаратура, 2001. – 246 с.

24 Гніламёдаў, У. В. Янка Купала : жыццё і творчасць / У. Гніламёдаў. — Мн. : Беларуская навука, 2002. – 238 с.

25 Гніламёдаў, У. Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 232 с.

26 Грынчык, М. М. Некаторыя асаблівасці жанравага развіцця беларускай літаратуры XIX – пач. XX стагоддзяў / М. М. Грынчык // Беларуская літаратура. : рэспубліканскі міжведамасны зборнік. Вып. 3. – Мн. : Універсітэцкае, 1975. – 182 с.

27 Дасаева, Т. М. Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т. М. Дасаева. — Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 85 с.

28 Дасаева, Т. М. Максім Гарэцкі і Янка Брыль : тыпалогія малых жанраў / Т. М. Дасаева. — Мн. : Беларуская навука, 2004. – 115 с.

29 Жураўлёў, В. П. Актуальнасць традыцый : Якуб Колас у пісьменніцкім асяродку / В. П. Жураўлёў. — Мн. : Беларуская навука, 2002. – 184 с.

30 Жураўлёў, В. П. У пошуку духоўных ідэалаў : на матэрыяле беларускай літаратуры XIX — пачатку XX ст. / В. П. Жураўлёў — Мн. : Беларуская навука, 2002. – 191 с.

31 Жураўлёў, В. П. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана / В. П. Жураўлёў. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн. : Беларуская навука, 2004. – 208 с.

32 Жураўлёў, В. П. На шляху духоўнага самасцвярджэння / В. П. Жураўлёў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

33 Кабржыцкая Т. Слядамі знічкі : пра С. Палуяна. / Т. Кабржыцкая, В. Рагойша. — Мн. : Бібліятэка часопіса “Маладосць”, 1990. – 80 с.

34 Каваленка, В. Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. — Мн. : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.

35 Каваленка, В. Самаразбурэнне ці Скамечаны лёс / В. Каваленка // Маладосць. – 1992. – № 12. – С. 112–126.

36 Казбярук, У. На хвалі беларускага адраджэння. Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. / У. Казбярук // Роднае слова. – 1993. – №№ 5, 7.

37 Казбярук, У. Прарок беларускага адраджэння / У. Казбярук // Полымя. – 1993. – № 10. – С. 189–196.

38 Казбярук, У. М. Светлай волі зычны звон : А. Гарун / У. М. Казбярук. — Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 63 с.

39 Калеснік, У. Усё чалавечае : літ.-крытыч. арт. / У. Калеснік. — Мн. : Мастацкая літаратура, 1993. – 381 с.

40 Кісліцына, Г. М. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры / Г. Кісліцына. – Мн. : Беларуская навука, 2000. – 118 с.

41 Коваленко, В. Трагическая мечта о буйном колошении… Философия национальной жизни в творчестве М.Горецкого // Нёман. – 1995. – № 3. – С. 198–204.

42 Колас, Г. Карані міфаў : жыццё і творчасць Янкі Купалы / Г. Колас. — Мн. : Бел. гуманіт. адукац.-культ. цэнтр, 1998. – 348 с.

43 Конан, Ул. Святло паэзіі і цені жыцця : лірыка Максіма Багдановіча / Ул. Конан. – Мн.: Маст. літ., 1991. – 208 с.

44 Корань, Л. Цукровы пеўнік : літ.-крыт. арт. / Л. Корань – Мн. : Маст.літ.,1996. – 286 с.

45 Коўтун, В. Стала песняй у народзе : нарыс жыцця і творчасці Цёткі / В. Коўтун. — Мн. : Народная асвета, 1998. – 143 с.

46 Кульбянкова, І. Ад сусветнай тугі да веры ў беларускі шлях. Паэзія Зм.Бядулі 1914 – 1919 гг. / І. Кульбянкова // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 54–62.

47 Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М. А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М. А. Тычына. – Мн.: Беларуская навука, 2007. – 363 с.

48 Лявонава, Е. А. Агульнае і адметнае : творы беларус. пісьменнікаў ХХ ст. у кантэксце сусветнай літаратуры / Е. А. Лявонава. — Мн.: Мастацкая літаратура, 2004. – 198 с.

49 Лявонава, Е. А. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і еўрапейскі літаратурны вопыт : дапам. для студэнтаў філал. фак. / Е. А. Лявонава — Мн. : Бел. дзярж. ун-т, 2002. – 128 с.

50 Лявонава, Е. А. Плыні і постаці / Е. А. Лявонава. – Мн. : Рэд. часопіса “Крыніца”, 1998. – 336 с.

51 Максімовіч, В. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку 20 стагоддзя : дапам. для студэнтаў філалаг. фак. ВНУ / В. Максімовіч. – Мн. : Аракул, 2000. – 351 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

52 Мельнікава, А. Беларуская літаратура XX ст. ў еўрапейскім кантэксце: курс лекцый / А. Мельнікава. – Гомель : УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2007. – 126 с.

53 Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.

54 Навуменка, І. Я. Максім Багдановіч / І. Я. Навуменка. — Мн. : Навука і тэхніка, 1997. – 126 с.

55 Навуменка, І. Я. Якуб Колас : духоўны воблік героя. – 2-е выд., дап. і перапрац. / І. Я. Навуменка. – Мн. : Выд-ва БДУ, 1981. – 238 с.

56 Навуменка, І. Я. Янка Купала / І. Я. Навуменка. — 2-е выд., дап. — Мн. : Народная асвета, 1980. – 198 с.

57 Рагойша В. Бацька нацыі / В. Рагойша // Полымя. – 1992. – № 6. – С. 178–192.

58 Рагойша, У. Этапы Алеся Гаруна / У. Рагойша // Полымя. – 1990. – № 7. – С. 180–188.

59 Санюк, Дз. Эстэтыка творчасці Янкі Купалы / Дз. Санюк . – Мн. : Беларускі кнігазбор, 2002. – 212 с.

60 Семяновіч, А. А. Гісторыя беларускай драматургіі XIX – пачатак XX ст. / А. А. Семяновіч. – Мн. : Вышэйшая школа, 1985. – 167 с.

61 Стральцоў, М. Выбранае / М.Стральцоў. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1987. – 406 с.

62 Тарасюк, Л. К. Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX — пачатку XX стст. — Мн. : Навука і тэхніка, 1999. – 222 с.

63 Тычына, М. Карані і крона : фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры / М. Тычына. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.

64 Фіцнер, Т. А. Гендэрны аспект у беларускай літаратуры XX ст. : курс лекцый па спецкурсе / Т. Фіцнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 183 с.

65 Чабан, Т. Космас "Вянка" // Максім Багдановіч. Поўны збор твораў : у 3 т. Т.1. Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 752 с.

66 Чарота, І. Пошук спрадвечнай існасці : беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І. Чарота. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.

67 Чыгрын, І. Рэальнае і магчымае. Проза Я.Коласа / І. Чыгрын – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 224 с.

68 Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым : проза Максіма Гарэцкага. — 2-е выд., выпр. — Мн. : Беларуская навука, 2003. – 232 с.

69 Шаблоўская, І. Драма абсурду ў славянскіх літаратурах і еўрапейскі вопыт. Паэтыка. Тыпалогія / І. Шаблоўская. – Мн. : БДУ, 1998. – 20 с.

70 Шамякіна, А. І. "Вобразы мілыя роднага краю..." : прастора і час у трылогіі Я. Коласа "На ростанях" / А. І. Шамякіна. — Мн. : Беларуская навука, 2004. – 228 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

71 Шамякіна, Т. І. Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія / Т. І. Шамякіна. — Мн. : Беларуская навука, 2001. – 262 с.

72 Штэйнер, І. Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру / І. Штэйнер. — Мн. : Навука і тэхніка, 2003. – 196 с.

73 Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар Адраджэння: В. Ластоўскі / Я. Янушкевіч. — Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 36 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ